








# Мая Лёзненшчына

А. І. Грачышнікава

# Мая Лёзненшчына

Нарысы па гісторыі і культуры краю

ЛЁЗНАЗНАЎСТВА

Лёзна, 2018

**ББК 63**

**УДК**

Грачышнікава, А.І. Мая Лёзненшчына: нарысы па гісторыі і культуры  краю / Алена Іванаўна Грачышнікава. – Лёзна, 2018. – 342 с. – (Лёзназнаўства)

## Уводзіны

**“Чужое ведаць цікава, а сваё – абавязкова”.**

Даследваць гісторыю роднага краю, зазірнуць у скарбонку нацыянальнай культуры, каб захаваць усё гэта для нашчадкаў – вось аснова для фарміравання ўсебакова развітай духоўнай асобы, патрыёта і грамадзяніна сваёй Радзімы.

Лёзненшчына – гэта край цудоўнай прыгажосці, дзе мы нарадзіліся і жывём. Для нас няма лепшага месца ў свеце, як тут, бо гэта наша Малая Радзіма. Тут перакрыжоўваліся і мірныя, і гандлёвыя шляхі, і дарогі крывважэрных захопнікаў. Тут сустракаліся, уплываючы адна на адну, заходняя і ўсходняя культуры, тут досыць спагадна суіснавалі розныя рэлігіі, тут знаходзілі надзейны прытулак адусюль гнаныя народы.

Гісторыя нашага краю сваімі каранямі ўваходзіць у глыбіню тысячагоддзяў – 9-5 тыс. г. да нашай эры.

Праз наш край праходзіў шлях “з варагаў у грэкі”. З нашага куточку пачалося вызваленне Беларусі. Уся наша зямля ўсеяна помнікамі Вялікай Айчыннай вайны, бо тут 9 месяцаў стаяў фронт, гінуў кожны другі…

Край жа даследаваны слаба, вельмі мала гістарычнага матэрыялу ( толькі кніга “Памяць. Лёзненскі раён”) і публікацыі краязнаўцаў у мясцовай газеце.

Кожны чалавек павінен ведаць гісторыю сваёй малой Радзімы, свае карані, сваіх продкаў. Народ, які не ведае сваёй гісторыі, не мае будучыні. Лёзненшчына ўзрасціла шмат вядомых людзей.

Сярод іх: генерал-фельдмаршал І. У. Гурка, вядомы беларускі пісьменнік М. Ц. Лынькоў, сусветна вядомы мастак М. З. Шагал, абаронца Брэсцкай крэпасці палкавы камісар Я. М. Фамін, спікер Парламенту Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанка і шмат іншых.

Падручнік будзе цікавы як для вучняў і настаўнікаў школ, так і для ўсіх тых, хто хоча больш даведацца пра гісторыю свайго роднага краю.

Матэрыялы яго можна выкарыстоўваць на факультатыўных занятках, на занятках турысцка-краязнаўчага гуртка, а таксама экскурсаводам для правядзення экскурсій па краязнаўчых маршрутах.

Распрацаваны ён на матэрыялах гістарычна-краязнаўчага фонду, створанага творчай групай настаўнікаў-краязнаўцаў у 1995 годзе пад кіраўніцтвам загадчыка Віцебскага абласнога аддзела беларусазнаўства і краязнаўства **Куржалава Алега Васільевіча.**

Матэрыялы гістарычна – краязнаўчага фонду ўзяты:

- з археалагічных і гістарычных музеяў рэспублікі, Віцебскай вобласці і нашага раёна,
- дзяржаўных архіваў,
- газет нашай краіны, а больш за ўсё раённай газеты “Сцяг Перамогі”,
- сустрэч з вядомымі асобамі – нашымі землякамі і старажыламі раёна,
- творчых краязнаўчых рэфератаў вучняў ДУА “СШ № 1 г. п. Лёзна”
- даследаванняў навучэнцаў гуртка “Мая Лёзненшчына”.

Аўтар гэтага гістарычна-краязнаўчага падручніка настаўнік гісторыі, які спрабуе сістэматазаваць краязнаўчы матэрыял. Таму ён стварае яго так, каб па ім можна было б вывучаць не толькі свой край, а і гісторыю Беларусі (ад першабытнага грамадства і да нашых дзён).

У падручніку змешчаны малюнкі і фотаздымкі, зробленыя членамі творчай групы настаўнікаў-краязнаўцаў. Большая частка фотаздымкаў зроблена самім яго аўтарам, або ўзяты з інтэрнэта.

Вялікі дзякуй былой настаўніцы СШ №2 Собалевай Ірыне Іванаўне за яе малюнкі да краязнаўчага маршрута "Край герояў, творцаў і вучоных", а таксама настаўніку гэтай жа школы Міхеенку Валерыю Андрэевічу за зробленыя фотаздымкі.

Шмат матэрылаў ўзята з публікацый мясцовых краязнаўцаў. Такіх як: Бандарэнка Уладзімір Карпавіч, Цімчанка Галіна Аляксандраўна, Ціхамірава Ніна Канстанцінаўна, Ціхамірава Ірына Мікалаеўна, Космыкаў Міхаіл Міхайлавіч, Агнішчанка Рыгор Цімафеевіч, Пячонава Вольга Усеваладаўна, Ермалаева Марыя Данілаўна, Іваноў Канстанцін Іванавіч, Карпекін Канстанцін Рыгоравіч, Бондарава Алена Міхайлаўна.

Непасрэдную дапамогу ў стварэнні гэтага краязнаўчага падручніка аказваў Лёзненскі ваенна – гістарычны музей, Раённая бібліятэка, Раённы аддзел адукацыі і Райвыканкам.

Вялікі дзякуй Самушчанка Вользе Мікалаеўне, Малахавай Зінаідзе Фёдараўне, Кулаковай Ганне Уладзіміраўне, Бахмацкай Алене Аляксееўне, Садомавай Святлане Іванаўне, Варонінай Людміле Мікалаеўне, Піваварy Мікалаю Васільевічу, Карпекіну Канстанціну Рыгоравічу.

Жырным шрыфтам у тэксце выдзелены значымыя даты, асобы, паняцці. У канцы кожнага параграфа ёсць пытанні і заданні, якія дапамогуць запомніць даты, падзеі і вядомых асоб нашага краю.

У канцы кнігі ёсць храналагічная табліца асноўных дат гісторыі раёна. Аўтар дапускае свае меркаванні і прапановы па праблеме:
" Што трэба зрабіць, каб не знікла гісторыя Лёзненшчыны."

А яшчэ ён спадзяецца, што гэты падручнік дасць магчымасць лёзненцам асэнсаваць гісторыю свайго раёна, сваіх дзядоў і бацькоў.

Дазволіць пераканацца ў тым, што наш раён і наогул Рэспубліка Беларусь мае сваю багатую гісторыю, якой можна ганарыцца, якую неабходна добра ведаць і перадаваць нашчадкам ад " пакалення да пакалення."

# ЗМЕСТ


Уводзіны ........................................... .........................................4 - 5

**РАЗДЗЕЛ I. Лёзненшчына – мой родны край**.................................8

§1. Лёзненскі раён на карце Рэспублікі Беларусь.................................9
§2. Лёзна – цэнтр Лёзненскага раёна.....................................................19
§3. Населеныя пункты раёна і іх тапаніміка ......................................26

**Раздзел II. Старонкі гісторыі. Зямля нашых продкаў ад часоў старажытных і да нашых дзён**.................................42

§4. Гісторыя Лёзненшчыны на стужцы часу.......................................43
§5. Першабытныя людзі на тэрыторыі нашага краю..........................45
§6. У складзе старажытных дзяржаў......................................................55
§7. Уладальнікі нашых зямель у Рэчы Паспалітай..............................61
§8. У складзе Расійскай імперыі............................................................67
§9. Бабінавічы – былы горад Магілёўскай губерні................................74
§10. Вайна 1812 года ў нашых мясцінах.................................................78
§11. Сляды паўстанцаў - касінераў у нашым краі...................................84
§12. Царква і адукацыя да рэвалюцыі 1917 года ..................................91
§13. Лёзненшчына ў пачатку XX стагоддзя.............................................94
§14. Устанаўленне ўлады Саветаў ...........................................................99
§15. Утварэнне Лёзненскага раёна.........................................................106
§16. ”Вернутыя імёны” нашых землякоў..............................................113
§17. Акупацыя нашага раёна нацысцкай Германіяй..............................121
§18. Ішла вайна народная (1941-1943гг.)...............................................126
§19. ”Вогненныя вёскі”. Асташэва – сястра Хатыні..............................138
§20. Вызваленне нашага краю ...............................................................144
§21. Пераход да мірнага жыцця...............................................................150
§22. Сац.-эк. і культурнае развіццё раёна ў 60 – 90 гг. XX ст. ...................157
§23. Царква і школа пад час Савецкай ўлады........................................162
§24. Жыццё насельніцтва Лёзненшчыны ў канцы XX пачатку XXI стст......169

**Раздзел III. “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына”**.......181

§25. Старажытныя помнікі раёна ..........................................................182
§26. Помнікі Вялікай Айчыннай вайны ...................................................188
§27. Легенды і паданні нашага краю ......................................................197
§28. Нашы славутыя землякі.....................................................................203
§29. Вядомыя людзі Лёзненшчыны...........................................................217
§30. “Алея Славы” – Героі вайны і працы...............................................239
§31. Традыцыі роднага краю.....................................................................251

**Раздзел IV. “Я спадчыну ад продкаў атрымаў…”**……………………...269

§32. Маё уласнае “Я”…………………………………………………………..270
§33. Мая сем’я …………………………………………………………………272
§34. Мой радавод ……………………………………………………………...275
§35. Мая родная мясціна ……………………………………………………...277

**РАЗДЗЕЛ V. Турысцка-краязнаўчыя магчымасці Лёзненшчыны. ( З вопыту педагагічнай работы)**……………………..280

1. Турыстычныя магчымасці краю. Месцы адпачынку на Лёзненшчыне…..281
2. Экскурсія “Шагалаўскія мясціны ў Лёзне”……………………………...288
3. Турыстычны паход Лёзна – Віцебск
“Па баявому шляху двойчы Чырвонасцяжнай ордэна Суворава Лёзненска-Віцебскай 158-й стралковай дывізіі” ……… …………………………………295
4. Падарожжа па паўночна-ўсходняй частцы раёна
“Край герояў, творцаў і вучоных”…………………………………………...296
5. Падарожжа па паўднёва-заходняй частцы раёна
“Па слядах гістарычных падзей………………………………………………...306

**Дадатак**…………………………………………………………………………...311

1. Хроніка падзей. Асноўныя даты і падзеі гісторыі раёна…………………...312
2. Спіс населеных месцаў Магілёўскай губерні (1910 год)………………... 313
3. Спіс населеных пунктаў Лёзненскага раёна (2003 год)……………………..321
4. Рэкі Лёзненшчыны (Блакітная кніга Беларусі. (1994год)…………………...324
5. Карта. Помнікі гісторыі культуры Лёзненскага раёна (1992 год)…………325
6. Вёскі раёна, знішчаныя ў гады Вяліай Айчыннай вайны 1941-1944 гг.….326
7. Праваслаўныя храмы на Лёзненшчыне да 1917 года………………………329
8. Карта. Маёнткі Агінскіх на Беларусі……………………………………….330
9. “Нарысы пастанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі” (1895г.)..331
10. Старажытныя каштоўнасці раёна……………………………………...332
11. Схема. Шагалаўскія мясціны ў Лёзне……………………………………333
12. Схема маршруту па паўночна-усходняй Лёзненшчыне (2005 г.)………...334
13. Схема маршруту па паўднёва-заходняй Лёзненшчыне (2010 г.)………...335
14. Схема маршруту падарожжа па вёсцы Высачаны………………………....336
15. Складзі свой радавод…………………………………………………………337
16. Вахта Памяці “ 70 год Вялікай Перамогі” (2015год)……………………….338

**Спіс літаратуры, артыкулаў па гісторыі, культуры краю**…………339 - 343

# Раздзел І
# Лёзненшчына - мой родны край

*Дзе мой край?*
*Там, дзе вечную песню*
*пяе бор сасновы,*
*Ты ляжыш там,*
*Дзе ціхая рэчка*
*ласкава віецца.*
*Старажытная царкаў*
*З туману вякоў выплывае*
*нібы карабель.*
*Кут мой родны!*
*Спрадвеку што Лёзна завецца,*
*Дзе б ні быў я, заусёды*
*прыду да цябе.*








## §1. Лёзненскі раён на карце Рэспублікі Беларусь

### *1. Тэрыторыя і насельніцтва*

Лёзненскі раён, размяшчаецца ва ўсходняй частцы Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь, на захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны.

Гэта маленькі прыгранічны раён Віцебскай вобласці. Знаходзіцца ён у 40 км ад горада Віцебска і ў 10 км ад мяжы з Расійскай Федэрацыяй.



*Лёзненскі раён на карце Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь*

На нашай тэрыторыі знаходзіцца Віцебская вышыня – Гара Маяк (296 м) каля вёскі Гаршэва, Лучоская нізіна (50 – 100 м) над узроўнем мора. Працягласць тэрыторыі з поўначы на поўдзень – 42 км, з захаду на ўсход – 33 км. Клімат умерана-кантынентальны, сярэднегадавая тэмпература +5$^{\circ}$ С.

У нашым раёне зараз налічваецца 165 населеных пунктаў. Лёзна – цэнтр раёна. З **1938 года** лічыцца пасёлкам гарадскога тыпу. З **2006 года** мае сваю геральдыку герб і сцяг.





*Герб і сцяг Лёзна ( 2006 г.)*

Плошча раёна складае 1 41763 тыс. кв. км. Лёзненскі раён мяжуе з Віцебскім , Сенненскім, Дубровенскім, Аршанскім раёнамі Віцебскай вобласці і Руднянскім раёнам Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі.




*Карта. Лёзненскі раён*

Лесам занята 44 % тэрыторыі раёна, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі – 46 % (31,2 % – ворных зямель, 14,6 % – сенажаці і пашаў).

Наш раён спецыялізуецца на ільнаводстве і малочна - мясной жывёлагадоўлі, пашыраны пасевы збожжавых і бульбы. Захаваліся прадпрыемствы-філіялы харчовай прамысловасці і па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. У фарміраванні асноўных вытворчых паказчыкаў раёна ўдзельнічаюць 22 буйныя прадпрыемствы (філіалы). З іх 2 – прамысловыя, 11 – сельскагаспадарчыя, 2 – будаўнічай галіны, 4 – гандлю, па аднаму – бытавога абслугоўвання, транспарту і лясной гаспадаркі. Дамінуючай галіной у раёне з’яўляецца аграпрамысловы комплекс, які прадстаўляюць 11 сельскагаспадарчых арганізацый. Прамысловы комплекс раёна складаюць 2 прадпрыемствы – ААТ “Лёзненскі ільнозавод” і УП ЖКГ.

З **2008 года** ў раёне пачалі будавацца аграгарадкі. Зараз іх 13. Гэта – Адаменкі, Бабінавічы, Веляшковічы, Дабрамыслі, Зубкі, Кавалі, Крынкі, Міхалінава, Надзёжына, Новае Сяло, Пушкі, Стасева, Якубаўшчына.




Па дадзеных на 01. 01. 2017 года на тэрыторыі раёна пражывае **15 580** чалавек, у тым ліку – **6 740** у г. п. Лёзна, **9 249** – у сельскай мясцовасці.

Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка і аўтамабільная дарога Віцебск – Смаленск.

Аўтамабільнымі дарогамі Лёзна звязана таксама з Янавічамі, Арэхаўскам і аграгарадкамі раёна.

З **18 жніўня 1931 года** выдаецца газета "Сцяг Перамогі". У **2003 годзе** адчыніў свае дзверы Лёзненскі ваенна - гістарычны музей, заснаваны **19 мая 1992 года**. У раёне працуюць 3 школьныя музеі і 1 музейны пакой.

У склад бібліятэчнай сеткі ўваходзіць 15 бібліятэк. З іх 13 сельскіх, 2 у г. п Лёзна і Кавалёўская бібліятэка – музей.

*План-схема г. п. Лёзна ( 2009г.)*

Адміністратыўна - тэрытарыяльна раён падзелены на 6 сельскіх саветаў: Лёзненскі, Бабінавіцкі, Веляшковіцкі, Дабрамыслінскі, Крынкаўскі, Яськаўшчынскі.




*Дыяграма. Падзел раёна на сельсаветы (2015г.)*

На **01. 01. 2015 года** ў сістэме адукацыі раёна функцыянуюць установы адукацыі. З іх дзіцячых дашкольных устаноў – 12; адукацыйных комплексаў (дзіцячы сад-школа) – 7; "дзіцячы сад – пачатковая школа" – 2; базавых школ – 4; сярэдніх – 7. Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі "Радуга", "Лёзненскі СПЦ", "Лёзненскі цэнтр дзяцей і моладзі", ДЮСШ.

На тэрыторыі раёна існуе 8 праваслаўных цэркваў, 1 рымска-каталіцкі касцёл, 1 евангелісцка-бабцісцкая царква, "Хрысціяне веры евангельскай" – 2. У г. п. Лёзна два праваслаўныя храмы: Узнясення Гасподня і Узвышэння Святога Крыжа, 1 каталіцкі касцёл святога айца Піо і 2 евангелісцкія царквы.

## 2. *Блакітная карта раёна*

Лёзненшчына – гэта цудоўны блакітны край. Гідраграфія Лёзненскага раёна адносіцца да басейна Балтыйскага мора. Усяго на тэрыторыі раёна 5 азёр, 1 вадасховішча, 28 малых рэк і 16 ручаёў.



*возера Зяленскае (2016 г.)*

**Зяленскае** (124 га) – возера каля вёскі Бабінавічы ў басейне ракі Лучоса. Плошча воднага люстэрка складае 1,2 км$^2$, даўжыня 2,4 км, найбольшая шырыня 0,8 км. Максімальная глыбіня возера каля 4 м. Зяленскае возера – праточнае. Яго насяляюць шчупак, карась, плотка, чырвонапёрка, акунь, лінь і іншыя віды рыб.



*возера Шэлахава ( 2016 г.)*

**Шэлахава** возера – складае 101 га. Плошча 1 км$^2$ , найбольшая глыбіня 7,5 м, даўжыня 3 км, найбольшая шырыня 0,75 км. Знаходзіцца ў басейне ракі Сухадроўка ( 13 км на паўднёвы захад, каля вёскі Зубакі).




*Буёўскае возера на карце*

**Буёўскае** возера складае 77,4 га. Плошча 0,72 км$^2$, найбольшая глыбіня 13 м, даўжыня 2,65 км. Знаходзіцца яно ў басейне ракі Лучоса, у 2 км на паўднёвым захадзе ад г. п. Лёзна, каля вёскі Зубкі.



*возера Сітнянскае (2015 г.)*

**Сітнянскае** возера складае 50 га. Плошча 0, 47 км$^2$, даўжыня 1,88 км. Найбольшая шырыня 0,3 км. Знаходзіцца ў басейне ракі Вярхіта за 24 км на паўночным захадзе ад нашага г. п. Лёзна, каля вёскі Сітна.



*возера Грабеніцкае*

**Грабеніцкае** возера складае 28 га. Плошча люстэрка каля 0,28 км$^2$ (па іншых дадзеных 0,31 км$^2$), даўжыня 1,06 км, найбольшая шырыня 0,4 км. Максімальная глыбіня 8,9 метры. Знаходзіцца ў басейне ракі Машна, прытока ракі Чарніца, за 7 км на поўнач ад г. п. Лёзна, каля вёсак Грабенікі і Міхалінава.


*Дабрамыслінскае вадасховішча ( 2016 г.)*

**Дабрамыслінскае вадасховішча** складае 109 га. Стварэнне ГЭС на ім пачалося яшчэ ў **1925 годзе**, але працаваць яна пачала толькі ў сярэдзіне 50-х гадоў ХХ ст. Нейкі час ГЭС непрацавала.

Зноў была ўведзена ў строй у 2001 годзе. Зараз ГЭС выпрацоўвае 200 квт энергіі, што дазваляе забяспечваць святлом Дабрамыслі і вёскі, якія знаходзяцца побач.

**Рэкі і ручаі.** Агульная працягласць рэк складае 467,7 км. Плошча водаахоўных зон 38 423 га, з іх 33 108,1 – рэк, 5 314,9 – 23 вадаёмы, 4 379 га прыбярэжных палосаў. Усе рэкі раёна маюць працягласць да 30 км, поймы забалочаныя, рэчышчы звілістыя, нешырокія, берагі месцамі абрывістыя. Некаторыя з іх у жару мялеюць, перасыхаюць і пастаяннай плыні не маюць.


*рака Лучоса ( 2015г.)*


*рака Вярхіта ( 2016 г.)*

Самая вялікая рака раёна – **Лучоса** (у верхнім цячэнні – **Вярхіта**). Яе прытокі – **Чарніца з Машной, Сухадроўка, Узменка, Ардзяжанка** і іх прытокі. Большасць рэк ставяцца да вадазбору ракі Лучоса, якая працякае праз Зяленскае возера, якое бярэ пачатак у Асінторфскім балоце. Узімку ўсе рэкі пакрываюцца ільдом, з часам прамярзаюць да дна. Вялікага гаспадарчага значэння яны зараз не маюць, служаць вадазборнікамі атмасферных ападкаў. У Дабрамыслях і г. п. Лёзна на вуліцы Гагарына маецца крыніца ў гонар

іконы Божай Маці **“Жываносная крыніца”.** Жыхары пасёлка і навакольных вёсак прыходзяць сюды па ваду, якая лічыцца гаючай.





*“ Жываносная крыніца“ на вуліцы Гагарына ( 2015 г.)*

## *3. Флора і фаўна.*

Лёзненшчына – край дзіўнай прыгажосці. Прырода шчодра адарыла яе незвычайнымі лясамі, багатымі лугамі і ўзгоркамі.

***Флора*** (раслiннасць раёна) – гэта лясы, лугі, балоты.

Лясы адносяць да падзоны змешаных лясоў Еўрапейска-Сібірскай раўніны. Яны займаюць 37,2 % тэрыторыі – 52 830 га і знаходзяцца ў распараджэнні дзяржаўных лясных гаспадарак, якія ахоўваюць лясы, а на забалочаных участках праводзяць асушэнне дрэнажнымі каналамі.

Па Беларусі плошча лясоў складае 34,5 %, па вобласці 31,6 %, па раёне 44 %. Лясы і хмызнякі размешчаны па ўсім раёне, але асноўныя масівы сканцэнтраваны ў паўднёвай частцы.



*Хваёвы лес*



*Змешаны лес*

У паўночнай частцы пераважаюць яловыя лясы з прымешкай ліставых парод. На ўзвышшах назіраецца пераход да ялова-хваёвых і нават чыста хваёвых лясоў. У нізінах елка сустракаецца з шырокалiставымi пародамі або алешнікам. У падлеску пераважаюць алешына, асіна, рабіна, крушына і ляшчына. У ніжнім ярусе растуць папараць, маліна, брусніцы, суніцы, чарніцы, буякі (дурніцы), журавіны, добра развіты імховы пакроў.

Насельніцтва ў вялікай колькасці збірае гэтыя лясныя ягады.



*Ягады нашых лясоў*

У паўднёвай частцы пераважаюць хваёва-лістовыя лясы. На пясчаных глебах – сасновыя бары, ніжэй яны пераходзяць у хваёва-бярозавыя. Пад полагам хвоі растуць верас, папараць. Імховае покрыва развіта слаба.

Бярозавыя, асінавыя і шэраальховыя лясы ўзнікаюць на месцы іншых пасля высечкі і пажараў. Цяпер іх больш, чым карэнных. На залішне вільготных і тарфяных глебах расце чорная вольха.

Непасрэдных крыніц шкоднага ўздзеяння на лес у раёне няма, ускосныя – сцёкі ферм, угнаенняў, хімікатаў, нафтапрадуктаў. Разумная высечка лесу карысная, а вось бессістэмная – шкодная.

Балоты займаюць 2,6 % тэрыторыі. Яны складаюцца з нізінных і верхавых. Расліннасць нізінных балот багатая. Гэта травы, лясы, хмызнякі. Апошнія складаюцца з бярозы, вярбы, радзей чорнай алешыны і крушыны. Травы – гэта асака, балотнае разнатраўе: шабельнік, калежніца, вахта, чальчак. Сустракаюцца і імшаныя нізінныя балоты. Лясы на балотах – гэта ў асноўным нізкарослыя хвоі. У хмызняковым ярусе распаўсюджаны багун, буякі, імшарніца. Растуць журавіны, расіца, падвей аднакаласковы.

**Фаўна** (жывёльны свет). У раёне кантролем за вядзеннем лясной гаспадаркі займаецца Лёзненскі райсавет.

Плошча паляўнічых угоддзяў – 38,6 тыс. га, лясгас – 48,4 тыс. га, райгаз – 20,3 тыс. га:

У паляўнічых гаспадарках раёна праводзіцца ўлік колькасці дзікіх жывёл і баравой дзічыны.


*Жывёлы нашых лясоў*

Для спартыўнага палявання ў нас водзяцца лісіцы, зайцы, куніцы, яноты, норкі, вавёркі, курапаткі, рабчыкі, глушцы, цецерукі.

Пад час механізаванай уборкі страты дзікіх жывёл больш у 10 разоў, чым адстрэльваецца за сезон паляўнічымі. Пры касьбе траў, уборцы збожжавых гіне ад 70 да 100 % маладняку, асабліва часта знішчаюцца перапёлкі, курапаткі, цецерукі, зайцы - русакі.

Па ахове рыбных рэсурсаў наш раён адносіцца да **"Аршанскай межрайінспекцыі рыбааховы"**. На тэрыторыі раёна працуюць 9 егераў.

Да Лёзненскага лясгаса адносяцца 7 лясніцтваў: **Лёзненскае, Залесскае, Бабінавіцкае, Дабрамыслінскае, Крынкаўскае, Стасеўскае, Ясенеўскае.** На Лёзненшчыне знаходзіцца таксама некалькі заказнікаў: ландшафтны рэспубліканскага значэння "Бабінавіцкі" і мясцовага значэння – біялагічныя; Адаменскі Гай, Бор, Дабрамыслінскі, гідралагічныя; Радзіма, Гушчына, Сцепанаўскі Барок.

## *4. Чырвоная кніга Лёзненшчыны*

**Рэспубліканскі ландшафтны заказнік "Бабінавіцкі"** размешчаны ў паўднёвай частцы Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці на акваторыі азёр Зяленскага і Сітна.




*Схема ландшафтнага заказніка "Бабінавіцкі"*

Агульная плошча заказніка 10 557 га. Заказнік "Бабінавіцкі" быў створаны ў **1988 годзе**. У мэтах захавання ўнікальнага ландшафтнага комплексу з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, а таксама асабліва каштоўных і эталонных лясных насаджэнняў, якія з'яўляюцца генафондам лясоў Рэспублікі Белараусь.



*Ятрышнік мужчынскі*

Флора заказніка налічвае каля 500 відаў вышэйшых сасудзістых раслін: 460 відаў травяністых, 18 відаў кустоў, 17 відаў дрэў.

12 відаў рэдкіх і знікаючых раслін, прадстаўленых у заказніку, занесены ў Чырвоную кнігу РБ. Славутасцямі заказніка з'яўляюцца маляўнічыя лясныя ландшафты, азёры Сітна, Зяленскае, штучнае вадасховішча Валкоссе з міні-ГЭС, рэкі Лучоса, Чарніца, Вярхіта.



*Цыбуля мядзвежая (чарамша)*

На тэрыторыі раёна па апошніх дадзеных раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя з занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі прадстаўнікоў фаўны насяляюць: вялікі ўліт – 1 месцагнездаванне, вялікі бугай – 1 месцагнездаванне, чорны бусел – 4 месцагнездаванні, барсук – 17 асобін у 9 месцапражываннях, рысь – 6 асобін, 3 месцапражыванні, буры мядзведзь – 11 асобін, 4 месцапражывання. На Лёзненшчыне растуць 18 відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.



*вялікі ўліт*



*вялікі бугай*



*чорны бусел*



*барсук*



*рысь*



*мядзведзь*

| Флора | Фаўна |
|---|---|
| Змагар шэрсцістаўсты | Чорны бусел |
| Ятрышнік мужчынскі | Вялікі уліт |
| Цыбуля мядзведжая (чарамша) | Буры мядзведзь |
| Пальчатакарэннік балтыйскі | Вялікі бугай |
| Баранец звычайны | Барсук |
| Гарычка крыжападобная | Рысь |
| Званочак шыракалісты | Філін |
| Лінея паўночная | Балотная сава |
| Луннік ажываюшчы | Дамавы сыч |
| Асака карэнневішчная | Пустэльга |
| Схованка яйкападобная | Сплюшка |
| Шпажнік (гладыёлус) чарапітчаты | Ляцяга |




*Веснавыя кветкі*



*Ляцяга - звычайная (палятуха)*

Унікальнымі сімваламі Лёзненшчыны Чырвоная кніга Беларусі называе **ляцягу( палятуху)** і **бурага мядзведзя**. Ляцяга – гэта вавёрка, якая пражывала ў нашай мясцовасці ў XVIII – XX ст.ст. і пэўна ёсць зараз, бо ў нас растуць высокія хваёвыя дрэвы, з якіх раней рабілі мачты для караблёў. З 1993 г. яна занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. У нашых лясах водзіцца і буры мядзведзь, паляванне на якога ў нашай краіне забаронена яшчэ з 1930-х гадоў.

***Пытанні і заданні:***

*1. Знайдзіце на карце свету краіны, блізкія па памерах з Лёзненскім раёнам. З кім ён мяжуе?*
*2. На якой рацэ знаходзіцца Дабрамыслінскае вадасховішча?*
*3. Знайдзіце на карце рэкі і азёры нашага краю.*
*4. Якія жывёлы і расліны ўваходзяць у Чырвонаю кнігу Лёзненшчыны?*
*5. Дзе знаходзіцца рэспубліканскі ландшафтны заказнік?*

## § 2. Мястэчка Лёзна – цэнтр Лёзненскага раёна

### *1. Калі Лёзна стала мястэчкам*

Кожны з нас рана ці позна (няхай у думках), але вяртаецца да сваёй Радзімы – таго месца, дзе нарадзіўся, вырас. Таму трэба ведаць свае карані і сваіх продкаў. Чаму так названы населены пункт, дзе ты жывеш? Калі і як ён узнік? Чым ён вядомы, і якія выдатныя людзі жылі і жывуць тут?








*Уезд у гарадскі пасёлак Лёзна ( 2014год) ( 2016 год)*

Гаворачы пра Лёзна, трэба адзначыць, што пэўная дата яго ўзнікнення не вызначана.

Першая пісьмовая згадка пра Лёзна адносіцца да **3 красавіка 1593 года**, а як мястэчка яно ўпамінаецца пад **1654 годам.** ( *“Памяць Лёзненскі раён”).*

Хаця на карце **1569 года** яно ўжо было.




*Фрагмент карты. Беларусь у канцы XVI стагоддзя (1569г.)*
*Аўтар М. Ф. Спірыдонаў*

Значыць, яго ўзнікненне ўходзіць у глыбіню стагоддзяў, а мабыць, і тысячагоддзяў (калі за аснову ўзяць балцкае племя “лотва”, якое існавала на нашай тэрыторыі ў каменным стагоддзі).

Афіцыйнай датай заснавання Лёзна лічыцца **1650 год** – гэта сярэдзіна XVII ст. Час, калі нашымі мясцінамі пачынае валодаць знакаміты род Агінскіх.

І менавіта Агінскія з'яўляюцца заснавальнікамі нашага Лёзна як мястэчка. Бо вядома, што яны з 1625 года ва ўсіх сваіх уладаннях, дзе былі маёнткі, стваралі мястэчкі – маленькія гарады з царквой. Усё гэта мае месца быць і ў нас у Лёзне.

А яшчэ як мястэчка Лёзна ўпамінаецца ў зборніку дакументаў рускага цара Аляксея Міхайлавіча Раманава, які пад час вайны Расіі з Польшчай быў у нашых мясцінах. У **1656 годзе** ў мястэчку Лёзна нейкі час знаходзіўся царскі стан.



*Цар Масковіі А. М. Раманаў*

## 2. *Паходжанне назвы Лёзна, Ліозно*

Назва нашага пасёлка таксама канчаткова не вызначана. Існуе некалькі версій, легенд, паданняў наконт назвы **Лёзна, Ліозна**.

Па - першае, вядомы беларускі географ В. А. Жучкевіч, які апісваў беларускія назвы, у назве Лёзна бачыць фанетычную пераапрацоўку прыметніка “лозны”, утворанага ад назоўніка **лаза**. Аднак нідзе слова лаза не змяняецца ў…лёзу. Згодна гэтай думцы, Лёзна, як часам гавораць старажылы, гэта лозная мясцовасць, месца якое зарасло лазой. Тым не менш, верагодную наяўнасць лазы на гэтым месцы мы не адхіляем.

Па - другое, мясцовае паданне звязвае назву Ліозна з прозвішчам **братоў Ліознавых**, якія быццам бы пасяліліся ў свой час на месцы будучага мястэчка. У гэтай версіі, аднак, пераблытаны прычына і вынік. Прозвішча Ліознаў утварылася ад назвы Ліозна, а не наадварот.

Па - трэцяе, давайце разгледзім выраз “лёзны чалавек, або **“лёзныя людзі”**.

“Лёзны чалавек” – гэта падарожны чалавек, чужы. “Лёзныя людзі” – прышлыя, чужыя, не тутэйшыя людзі.

Лёзна будавалі для князя Асавіцкага мікулінскія мужыкі (прышлыя, чужыя людзі). Для адаменцаў (пасяленцаў, узнікшых раней тут) гэтыя людзі, якія сяліліся на левым беразе ракі Машна былі не тутэйшыя, “лёзныя”.

А вось яшчэ: старажытнаславянскае аснова **Лез, - леж** – мела значэнне нізкае, гразкае, багністае месца, якое заліваецца вадой. “Лезно – гэта нізіна, рачная ўпадзіна. Паколькі Адаменкі знаходзіліся на гары і ўзніклі даўней за **“Лезно”**, то пераход ад Лезно да Лёзна мог адбыцца пад уплывам мясцовага вымаўлення.

А вось калі і чаму з'явілася напісанне, а потым і вымаўленне Ліозна?

У прыкладзе з Лёзна - Ліозна вызначальнымі аказаліся традыцыі рускай арфаграфіі. Справа ў тым, што літара “ё “ не стала прывычнай, а каморнікі,

што працавалі ў канцы XVIII стагоддзя на беларускіх землях, ужывалі на месцы літары “ё “ – “ іо”. Мабыць, вось так і з’явілася напісанне – **Ліозно**.

У слоўніку беларускіх гаворак Паўночна-Заходняй Беларусі і яе пагранічча напісана, што “лёзныя” – гэта ласкавыя, прыветлівыя людзі, што ўсім нам, думаю, вельмі падабаецца.

І так, назва Лёзна ўзнікла з некалькіх версій, якія падмацоўвалі адна другую. Вось і зараз ідзе падмена першапачатковай назвы.




*Знак на шашы Віцебск – Смаленск ( 2014г.)*

Амаль 10 год таму, ў **2009 годзе** быў створаны шасцітомны нарматыўны даведнік **“Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь“**, якім хацелі назвы прывесці ў адпаведнасць з Дзяржстандартам. Ішла гаворка і пра наша Лёзна, прапаноўвалася па-беларуску пісаць Лёзна, а па-руску не Ліозно, а **Лёзно**.




## *3. Лёзна – яўрэйскае мястэчка*

Як сведчыць гісторыя, яўрэі ўпершыню з’явіліся ў нашым краі яшчэ ў XIV стагоддзі, калі краіны Заходняй Еўропы (Германія, Іспанія і іншыя.) пачалі масавыя ганенні на яўрэяў, яны знаходзілі прытулак у ВКЛ, дзе да людзей рознай веры адносіліся талерантна. Жылі яны кагаламі (замкнутымі абшчынамі). Яўрэйскімі мястэчкамі яны сталі пасля таго, як Расійская імператрыца Кацярына II увяла мяжу аселасці яўрэяў. З **1794 года** жыць ім дазвалялася толькі на ўскраінах Расійскай імперыі. Лёзненшчына якраз і была той ускраінай Расіі, таму яўрэяў тут жыло шмат. У нашай мясцовасці вядомымі яўрэйскімі мястэчкамі былі: Лёзна, Калышкі, Бабінавічы, Дабрамыслі.




*Мемарыяльная дошка на РЦК фота Міхеенкі В. А. ( 2005г.)*

Так на Лёзненшчыну са Слуцка трапіў **род Шагалаў**, з якога паходзіў сусветна - вядомы мастак Марк Шагал. Іх сядзіба была на вуліцы Бабінавіцкай, амаль

побач з царквой. Непадалёку знаходзіліся шагалаўскія лаўкі, дзе яны прадавалі мяса, рыбу, скуры жывёл і іншае. Мелі сваю цырульню, магазіны і займаліся рамяством.



*Лаўка. М. Шагал*



*Мяснік. М. Шагал*



*Парыкмахер. М. Шагал (1912г.)*

Але, у гады Вялікай Айчыннай вайны халакост знішчыў амаль усіх яўрэяў нашай мясцовасці. У Лёзне ўсіх яўрэяў зачынілі ў хляве і пратрымалі да раніцы. На досвітку іх павялі на расстрэл. **Адаменскі яр** на ўскрайку Лёзна каля рэчкі Машна, стаў страшным крывавым месцам экзекуцыі. Сюды зганялі яўрэяў з Лёзна, Дабрамысляў, Бабінавічаў. На гэтым месцы ў **1964 г**. ўстаноўлены помнік ахвярам фашызму. Тут расстрэльвалі не толькі яўрэяў, а таксама іншых жыхароў нашага раёна. Усяго **1 700 чалавек**, сярод іх **17 чалавек з прозвішчам Шагал.** .



*Помнік ахвярам фашызма. Фотаздымак 2014г.*





*Матэрыялы з музея. Ядва – шэм ў Іерусаліме. (1998г.)*

Са справаздачы Лёзненскага райвыканкама ад **5 сакавіка 1944 года**: “Гітлераўцы знішчылі ўсіх мірных грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці ў гарадскім пасёлку Лёзна, мястэчках Калышкі і Дабрамыслі.”

## *4. Лёзна – пасёлак гарадскога тыпу*

Мястэчка Лёзна з **1919 года** знаходзілася ў складзе РСФСР, з **1924 года** стала цэнтрам раёна ў БССР. З **27 верасня 1938 года** Лёзненскі раён увайшоў у межы толькі што ўтворанай Віцебскай вобласці.

З гэтага года Лёзна стала называцца пасёлкам гарадскога тыпу.

У 1939 годзе ў гарадскім пасёлку налічвалася – 4111жыхароў. Па этнічнаму складу тут пражывалі беларусы, рускія, яўрэі, палякі, латышы і іншыя народы.

Да вайны наш гарадскі пасёлак Лёзна меў зусім іншы выгляд.

На цэнтральнай вуліцы, якая называлася Вакзальнай, былі драўляныя тратуары, а ўздоўж іх – канавы, у якіх збіралася брудная вада. Такі ж тратуар быў пракладзены да будынку пошты. Яна размяшчалася на месцы былой гасцініцы. У гэтым жа завулку былі сталовая, маленькія магазінчыкі, у якіх купляліся і прадаваліся золата і срэбра, вырабы з каштоўных металаў.

Вуліцы Стара-Віцебская (зараз імя Чарняхоўскага) і Бабінавіцкая (імя Гагарына) былі цяжкапраходныя, асабліва вясной і восенню. Цэнтрам культурнага жыцця гарпасёлка была царква Узнясення Гасподня. Зараз на гэтым месцы пабудаваны кінатэатр “Світанак”.


*Царква Узнясенне Гасподня (пач. ХХ ст.)*



*Кінатэатр “Світанак” (2011г.)*

У будынку царквы размяшчаўся клуб, у якім дэманстраваліся кінафільмы, праходзілі канцэрты. Тут жа была бібліятэка, а пазней, у бакоўцы адкрылі кнігарню. Непадалёку ад магазіна канцылярскіх тавараў, бліжэй да стадыёна, размяшчаўся будынак пажарнай. Там быў створаны добры духавы аркестр, які падымаў настрой жыхарам у час свят і народных гулянняў.

На Вакзальнай вуліцы быў размешчаны рэстаран, у якім можна было заказаць страву з мядзведжага мяса, ракаў, новы універмаг, пабудаваны напярэдадні вайны, будынак раённага аддзела адукацыі, кнігарня.

Школ у мястэчку было чатыры: беларуская, руская, яўрэйская і латышская. Даваенная бальніца займала невялікі драўляны будынак і знаходзілася на месцы сённяшняй санстанцыі. За чыгункай да вайны была толькі Дабрамыслінская вуліца (дамоў 5 – 6) і пабудовы МТС.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца шэраг дакументаў з паметкай **“Лёзна”**. У **вёсцы Чарнаручча**, дзе адбылося некалькі пасяджэнняў СНК БССР і ЦК КП(б)Б, аб арганізацыі партызанскага руху ў Беларусі. На будынку праўлення калгаса **імя Леніна** ў памяць аб гэтых падзеях была ўстаноўлена мемарыяльная дошка.



*Будынак былой канторы калгаса Леніна (2000г.)*




*Дошка на будынку з надпісам .*

У Лёзне і іншых населеных пунктах ствараліся атрады народнага апалчэння і знішчальныя батальёны, пераважную частку іх складала моладзь.

У кастрычніку 1943 года над Лёзнам, першым вызваленым раённым цэнтрам Віцебшчыны, залунаў чырвоны сцяг, але фронт тут спыніўся яшчэ на 9 месяцаў. Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад **10 кастрычніка 1943года** пяці воінскім часцям і злучэнням, якія вызначыліся пры вызваленні Лёзна, было прысвоена ганаровае званне **"Лёзненскіх"**.

Пасля вайны, што датычыцца нашага пасёлка Лёзна, то ён быў поўнасцю зруйнаваны . У ім захавалася некалькі дамоў, пячныя трубы і белая прыгожая царква. Людзі жылі ў зямлянках. Таму ўяўляць, якім было Лёзна ў пачатку XX стагоддзя, мы можам амаль толькі па карцінах Шагала.

Але праз нейкі час раённы цэнтр быў адноўлены. Забудоўвалася Лёзна па дзвюх галоўных вуліцах – Леніна і Марыі Акцябрскай. Новыя вуліцы ў асноўным атрымлівалі назвы Герояў Савецкага Саюза і вядомых людзей краіны - Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У 50–70-х гадах былі пабудаваны РДК, Раённая бібліятэка, пошта, дзяржаўны банк, сярэдняя школа №1 і іншыя будынкі.

У 80–90-х гадах XX стагоддзя нанава адбудаваны гарпасёлак стаў прыгожым райцэнтрам. Некаторыя будынкі сацыяльна-бытавога і культурнага прызначэння былі пабудаваны з любоўю і густам.



*Універмаг (2009г.)*



*Паліклініка (2009г.)*



*Дом афганцаў (2011г)*



*Пошта (2011г.)*

## 5. Лёзна сёння

Гарадскі пасёлак Лёзна і зараз цэнтр Лёзненскага раёна. Адлегласць ад раённага цэнтра Лёзна да абласнога цэнтра горада Віцебска – 40 км, а да сталіцы горада Мінска каля 276 км. Праз Лёзна праходзіць чыгунка, якая звязвае наш гарадскі пасёлак з Масквой (438 км) і Санкт – Пецярбургам ( 547 км), а таксама аўтамабільная дарога Віцебск - Смаленск (83 км).



*Чыгуначны вакзал, аднаўлены ў 2005 годзе*



*Аўтастанцыя, аднаўленая ў 2011г.*

**24 верасня 2011 года** на цэнтральнай плошчы пасёлка адбылося абласное свята **"Дажынкі"**. На ім віталі перадавікоў жніва. Праводзіліся розныя выставы, гульні, конкурсы і вёўся разнастайны гандаль. Свята было цікавым, прыгожым і ўсім спадабалася.

Дзякуючы свята **"Дажынкі"** наш гарадскі пасёлак атрымаў новы воблік. У Лёзне былі абноўлены амаль ўсе адміністратэўныя, гандлёвыя і культурныя будынкі.


*"Дажынкі" ў Лёзне"( 2011г.)*


*будынак райвыканкама*


*будынак Лёзненскага Сельскага Савета*


*будынак Беларусбанка*


*будынак Аграпрамбанка*

***Пытанні і заданні:***

*1. Калі ўзнікла Лёзна?*
*2. Чаму Лёзна, Ліозно так названа?*
*3. Які знакаміты род яўрэяў пражываў у нашым мястэчку?*
*4. Што стала з пасёлкам Лёзна пад час вайны ?*
*5. Які статус мае Лёзна зараз?*

## §3. Населеныя пункты і іх тапаніміка

### *1. З гісторыі населеных пунктаў Лёзненшчыны*

Лёзненшчына, знаходзячыся на перакрыжаванні дарог і гандлёвых шляхоў, заўсёды прываблівала да сябе людзей. Некалі яна была даволі густа населенай.

Знаходзячыся ў межах Магілёўскай губерні **з 1871 па 1881 гады,** у нашым краі назіраўся нават значны прырост насельніцтва.

У Аршанскі ўезд Магілёўскай губерні тады уваходзілі наступныя воласці нашага краю – Высачанская, Дабрамыслінская, Лёзненская. Веляшковіцкая воласць была тады ў межах Віцебскай губерні Віцебскага ўезда. Са спісу населеных месцаў Магілёўскай губерні, зробленага ў **1910 годзе,** можна дакладна даведацца пра многія населеныя пункты Лёзненшчыны, каму яны належалі, колькі было зямлі ў паноў ( ў дзесяцінах), колькі жыхароў там пражывала (мужчын, жанчын), які быў прыход, адлегласць ад іх і да губернскага цэнтра, назва бліжэйшага паштовага або тэлеграфнага аддзялення сувязі.

У **1919 годзе** Высачанская, Лёзненская, Дабрамыслінская воласці ўвайшлі ў склад Віцебскага павета Віцебскай губерні.
На Лёненшчыне ў гэты час існавалі 4 воласці – Высачанская, Лёзненская, Дабрамыслінская і Веляшковіцкая.

У **1920 годзе** праводзіўся Усерасійскі перапіс насельніцтва, па якому бачым, якая колькасць насельніцтва пражывала ў такіх мястэчках, як Лёзна – 2479, Бабінавічы – 1179, Калышкі – 1594, Дабрамыслі – 588.

На Лёзненшчыне яшчэ ў напачатку XX стагоддзя існавала больш за чатыраста мястэчкаў вёсак і хутароў.

У 4-ох км ад вёскі Выдрэя існаваў **хутар Каладовічы**, на беразе возера Шэлахава знаходзіўся **хутар Падазер'е** з 5 двароў, дзе жыло 20 чалавек. **Хутар Старына** (5 двароў, 25 чалавек) створаны быў памешчыкам Р. І. Анжыянам для сумеснай апрацоўкі зямлі.

**Карнілаў хутар** стаяў на скрыжыванні дарог каля чыгуначнай станцыі Вялікая Выдрэя. Там пражывалі 2 сям'і Карнілавых, якія былі вучонымі ў галіне агранаміі. У 6-ці км ад гэтай станцыі, у вёсцы Баброўка, было 17 двароў, у якіх пражывала 60 мужчын і 60 жанчын. Належалі яны сельскай абшчыне. Усе хутары пад час калектывізацыі былі ліквідаваны.

За гады калектывізацыі з карты раёна знікла больш за 100 паселішчаў. Ёсць даведкі аб колькасці насельніцтва нашага раёна з дзяржаўнага Віцебскага архіва **1946 года.**

У той час у Лёзненскім раёне пражывала – 32 135 чалавек. Насельніцтва гарадскога пасёлка Лёзна складала – 3 017, сельскай мясцовасці – 29 118.

У гады вайны было спалена 196 вёсак нашага раёна. Больш за 100 з іх былі спалены ў 1943 годзе, калі вайна на нашай тэрыторыі ўжо заканчывалася.

Помнік спаленым вёскам з яе жыхарамі ўстаноўлены ў вёсцы Асташэва, якую называюць сястрой Хатыні.



*Помнік спаленым вёскам ( 2014г.)*



*Помнік вёскі Красыншчына ( 2001г.)*

У 50 – 60 гады XX стагоддзя было ўзбуйненне вёсак, потым, пачынаючы з 70 –х гадоў, пачалі адміраць неперспектыўныя вёскі. Большасць з іх ужо знікла і не існуюць у нашым раёне.

Помнік неперспектыўным вёскам у Красыншчыне ўстанавіў яе былы жыхар **Аляксей Пятровіч Мастакоў** (зараз жыве ў Віцебску).

За апошнія 80 гадоў перастала існаваць 239 населеных пунктаў раёна.

Рашэннем Лёзненскага райсавета дэпутатаў ад 21. 03. 2008 года скасавана яшчэ 6 вёсак: Горы, Міхайлова, Талпа Веляшковіцкага с/с, Жалудова, Ціханава Дабрамыслінскага с/с і Старына Крынкаўскага с/с.

На **2015 год** у Лёзненскім раёне значыцца – 170 вёсак. Кожны населены пункт тут мае надзвычай багатую спадчыну, але статус горада нейкі час мелі толькі **Бабінавічы.**

З часу заснавання Бабінавічы вядомы ганчарным промыслам, які дасягнуў росквіту ў XIX – 1-й чвэрці XX стст. З мясцовай чырвонай гліны тут выраблялі чырвонагліняную непаліваную, чорназадымленую і гартаваную кераміку (гарлачы, гаршкі, збанкі, міскі), якую з пачатку XX стагоддзя пачалі аздабляць размалёўкай. Была створана прамыслова–кааператыўная арцель па вырабу посуду **“Чырвоны паліўшчык”.**



*Бабінавіцкая кераміка*



*Бабінавіцкая цацка-свістулька*

Помняць яшчэ ў Бабінавічах адмысловых ганчароў братоў Апанаса Мікалаевіча і Міхаіла Мікалаевіча Траяноўскіх, іх пляменніка Мікалая Ягоравіча Арэхава. Работы майстроў канца XX стагоддзя выстаўляліся на прадстаўнічых выставах і зараз экспануюцца розных ў музеях (Орша “Млын”).



*Цацкі-свістулькі Траяноўскіх*



*Траяноўскі М.. М. каля сваёй хаты*

Пасля рэвалюцыі **1917 года** Бабінавічы страцілі статус горада і сталі вёскай, з **1919 года** ў складзе Віцебскай губерні РСФСР. Пасля 1-га ўзбуйнення БССР **(сакавік 1924 года)** Бабінавічы ў складзе БССР, цэнтр сельсавета ў Высачанскім раёне Віцебскай акругі (да ліпеня 1930 года).

**З ліпеня 1931 года Бабінавічы** сталі цэнрам сельсавета ў Лёзненскім раёне. А з 2008 года – аграгарадок..

Раней Бабінавічы былі **яўрэйскім мястэчкам**. Перад вайной **габрэі (яўрэі)** складалі палову насельніцтва мястэчка. Тут жыло 50 габрэйскіх сем’яў.

22 ліпеня 1941 года немцы занялі Бабінавічы, адразу ж расклеілі лістоўкі “За ўкрывальніцтва габрэяў – расстрэл“. Восенню 1941года гітлераўцы адабралі маладых, здаровых габрэяў - мужчын і забілі іх каля могілак.

Пасля паліцаі прымусілі некалькіх сялян закапаць целы, і іх таксама забілі як сведак злачынства. Астатніх габрэяў немцы сагналі ў **гета,** якое складалася з некалькіх дамоў.



*Яўрэйскія могілкі (2010 г.)*

Іх выкарыстоўвалі на работах і беспакарана здзекваліся над імі.

У брацкай магіле на ўскраіне Бабінавіч пахаваныя мужчыны - габрэі, і на таблічцы помніка напісана: ”Ахвярам фашызму 1941года бацьку і брату Певзднеру і іншым. Памяць пра Вас у нашых сэрцах”.

У Бабінавічах і Лёзне заставаліся яўрэі, якія хаваліся і пазбеглі расстрэлу.



*Помнік яўрэям (2016г.)*

Хавалі іх аднавяскоўцы, якіх зараз называюць **“праведнікі народаў міра“**, бо яны, рызыкуючы сваім жыццём, ратавалі гэтых людзей. Пісьменнік Барыс

Чарнякоў – чалавек з драматычным лёсам. Усіх яго родных на вачах хлопчука расстралялі фашысты і іх памагатыя з суседняга мястэчка Лёзна. Ён застаўся жыць дзякуючы дапамозе рускай жанчыны Феадосіі Дзехцяровай. Барыс Чарнякоў бачыў шмат жахаў у гады вайны. Яго дзіцячыя ўспаміны ўвайшлі ў знакамітую “Чорную кнігу” Васіля Гросмана і Іллі Эрэнбурга.
Ён пісаў: “Я бачыў трупы дваццаці пяці габрэяў з мястэчка Бабінавічы, якіх немцы раскідалі на шляху ад Бабінавіч да Лёзна”.

**Аркадзь Шульман у 2004 годзе** стварыў кнігу **“Праведники народов мира Беларуси“**, у якой ёсць сведкі пра Феадосію Дзехцярову і пра іншых праведнікаў нашага краю. Сярод іх Праскоўя Каралёва, Людміла і Ксенія Мураўёвы.

Вызвалены Бабінавічы былі **25. 06. 1944 г**. часцямі 11-й гвардзейскай арміі 3-га Беларускага фронту ў час Віцебска – Аршанскай аперацыі.

Спаленая цалкам фашыстамі вёска пасля вайны была адноўлена і **з верасня 1946 года да снежня 1956 года** знаходзілася ў складзе Арэхаўскага раёна.

Зараз Бабінавічы – вёска, цэнтр Бабінавіцкага сельсавета. Знаходзіцца вёска ў 30 км ад раённага цэнтра Лёзна.




*Вокладка кнігі Аркадзя Шульмана ( 2004 г.)*

На **01.01 2016 г**. насельніцтва вёскі складала 486 жыхароў. Па этнаскладу тут пражываюць: беларусы, рускія, украінцы, цыгане і ніводнага яўрэя.

На тэрыторыі сельсавета дзейнічае цэх дрэваапрацоўкі, Бабінавіцкае лясніцтва, КУСгП імя Заслонава. Да паслуг сяльчан – шэсць магазінаў, адзін з якіх прыватны кафетэрый. Аддаленыя вёскі абслугоўваюцца аўтамагазінам. Прыём заявак на бытавыя паслугі аказвае мясцовы комплексны прыёмны пункт. Пры жаданні можна тут скарыстаць і паслугі цырульніка, які прыязджае сюды па серадах.

Выхаваннем і навучаннем дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту займаюцца педкалектывы Асіпенскай пачатковай школы-сад і ДУА “Бабінавіцкая дзяржаўная агульнаадукацыйная дзіцячы сад-сярэдняя школа”.

Медыцынскім абслугоўваннем займаюцца работнікі Касцяёўскага ФАПа і Бабінавіцкай урачэбнай амбулаторыі. Ёсць у вёсцы і аптэка. Культурнае абслугоўванне мясцовага насельніцтва ажыццяўляюць Бабінавіцкі СДК, бібліятэка і пункт-філіял кнігавыдачы ў вёсцы Осьпенкі. Сяльчане могуць скарыстаць паслугі аддзялення № 228! 147 АСБ “Беларусьбанк” і двух паштовых аддзяленняў сувязі.



*У школьным музеі вёскі Бабінавічы ( 2016г.)*

## *2. Найбольш вядомыя вёскі раёна*

### Веляшковічы

У **X стагоддзі** тэрыторыя сучасных Веляшковіч уваходзіла ў склад Полацкага княства. У **XII стагоддзі** з Полацкага княства пасля смерці Усяслава Чарадзея вылучылася ўдзельнае княства, якое належала князям Васількавічам. У Віцебскае княства ўвайшлі Веляшковіцкія мясціны. Віцебскае княства залежала спачатку ад Полацка, затым ад Смаленска. У выніку неабходнасці абароны ад знешняй пагрозы – крыжакоў і Залатой Арды ўтварылася новая дзяржава – ВКЛ. З **1320 года** Віцебскае княства разам з Веляшковічамі ўвайшло ў склад ВКЛ, а віцебскім князем у той час быў Альгерд. У **канцы XIV стагоддзя** пасля скасавання Віцебскага княства быў утвораны Віцебскі павет. Тэрыторыя Віцебскага павета складалася з дзвюх асноўных частак: старажытных баярскіх вотчын і княжацкіх двароў, якія размяшчаліся на захад, усход і поўдзень ад Віцебска на адлегласці каля 30 км, мясцовыя баяры па чарзе кіравалі дзяржаўнымі землямі. У **XVI стагоддзі** Віцебскі павет увайшоў у Віцебскае ваяводства. Веляшковічы былі ў той час як дзяржаўнае ўладанне, праз якое праходзіў шлях з Віцебска ў Расійскую дзяржаву. У **XVI –XVIII стагоддзях** найбуйнейшымі землеуладальнікамі Віцебскага павета былі Сапегі, Салегушкі, Агінскія. Вядома, што паўночна – усходнія землі Лёзненшчыны, у тым ліку Веляшковічы, належалі прадстаўнікам роду Агінскіх.

Буйны землеўладальнік Віцебшчыны **Марцыян Міхал Агінскі** намагаўся ператварыць некаторыя свае маёнткі ў невялікія гарады.

Так маёнтак Веляшковічы на Лёзненшчыне ён надумаў зрабіць горадам пад назвай **“Руская Варшава”** і ў 1718 – 1724 гадах выдаў спецыяльны прывілей “ўсім мяшчанам і рознага звання людзям”. Паводле гэтага дакумента кожны, хто жадаў бы пасяліцца ў новым горадзе, на 12 год вызваляўся ад усялякіх падаткаў і набываў права бязмытнага гандлю любым таварам.




*Фрагмент карты. Віцебскі павет Віцебскай губерні. (1820 г.)*

Назва **“Веляшковічы”** сустракаецца ў зборніку дакументаў з кніг Віленскага архіва (Вільня,т.І/.,1929г.) ад 1716 года ў сувязі з продажам гэтага маёнтка. Назва вёскі, магчыма, пайшла ад імя ўладальніка або заснавальніка вёскі – **Веляшковіча**. Ёсць і іншыя версіі назвы.

Пасля І-га падзелу Рэчы Паспалітай у **1772 годзе** Віцебскі павет быў у складзе Расійскай імперыі ў Пскоўскай губерні, у **1776 годзе** ў Полацкай, а з **1796 года** ў **Беларускай губерні.** Праз Веляшковічы праходзіў Янавіцкі паштовы тракт, які звязваў Віцебск са Смаленскам. Рэшткі маста Янавіцкага ( або Кацярыненскага тракта) на захадзе ад вёскі нагадваюць нам аб гэтым.



*Рэшткі Янавіцкага маста XVIII ст. (2016 г.)*

Крынкі

**Крынкі** – радавое гняздо **Гуркаў-Рамейкаў**. Лёсы адзінаццаці пакаленняў прадстаўнікоў старажытнага беларускага шляхецкага роду звязаны з крынкаўскай зямлёй.

У XIX стагоддзі ў фамільнай капліцы крынкаўскага фальварка знайшлі спачын тры генералы. Хутчэй за ўсё, менавіта ў Крынках нарадзіўся і самы знакаміты палкаводзец з роду Гуркаў-Рамейкаў, апошні фельдмаршал Расійскай імперыі Іосіф Уладзіміравіч Гурка.

Два сыны Іосіфа Гуркі таксама сталі генераламі. Старэйшы Васіль у 1916–1917 гадах у час Першай сусветнай вайны выконваў абавязкі начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміі. Лёс не быў міласцівы да гэтай галіны роду Гуркаў - Рамейкаў. Усе сыны фельдмаршала апынуліся ў эміграцыі.



*Герб роду Гуркаў-Рамейкаў*

У Віцебскай зямлі Гуркі-Рамейкі згадваюцца яшчэ з XVI стагоддзя. Гэты дваранскі род пачынаецца з **Гурыя** ці **Гуркі Алехнавіча Рамейкі**, які ў 1539 годзе быў ваяводам Смаленска. Гуркі-Рамейкі служылі польскім каралям і вялікім князям літоўскім, атрымліваючы за верную службу вёскі з прыгоннымі сялянамі. Вядома, што баярын Андрэй Гурка падчас няўдалай вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй у 1654–1667 гадах трапіў у палон і памёр у Маскве.

Праўда, яго малодшы сын Іосіф застаўся ў сваім маёнтку на Лёзненшчыне, працягваючы ваенную службу на карысць каралю.

Пасля далучэння Віцебшчыны да Расіі ў 1772 годзе Іосіф Гурка-Рамейка прысягнуў на вернасць Кацярыне II. З яго нашчадкаў найбольш вядомы сын Уладзімір (1795–1852 гг.), які даслужыўся да генеральскага звання.

Менавіта ён заснаваў паблізу свайго радавога памесця ў Высачанах папяровую прыгонную мануфактуру, на якой у 1850 годзе працавала 260 сялян; папера ішла на продаж, а даходу прыносіла гаспадару звыш 25 тысяч рублёў. Прадаваў памешчык лён, збожжа і лес, якія ішлі праз Рыгу на экспарт. **Уладзімір Іосіфавіч Гурка - Рамейка** быў баявым афіцэрам у Айчынную вайну 1812 года, служыў у гвардзейскім Сямёнаўскім палку і ўдзельнічаў у замежным паходзе рускай арміі пасля паражэння Напалеона ў Расіі, вызваляючы народы і краіны Еўропы ад французскай няволі. Яго палітычныя сімпатыі былі ў той час на баку перадавых дваран - дзекабрыстаў.





*Бацькі генерал-фельдмаршала І. У. Гуркі*
*У. І. Гурка* *Т. А. Гурка (Корф)*

Ёсць звесткі аб тым, што ў снежні 1825 года ён павінен быў арыштаваць маскоўскага генерал - губернатара і іншых праціўнікаў паўстання. Але гэты план не быў здзейснены, і ўсё ж Уладзімір Іосіфавіч апынуўся пад следствам па справе дваран - паўстанцаў. Нейкім чынам яму ўдалося пазбегнуць пакарання і застацца на службе.

Ва ўзросце 33 гадоў ён атрымаў чын генерал-маёра, стаў камандзірам пяхотнай дывізіі. Толькі імператар Мікалай I не вельмі давяраў тым генералам і афіцэрам, хто прама ці ўскосна быў звязаны з падзеямі снежня 1825 года, калі карцечнымі выстраламі з гармат у Санкт - Пецярбурзе былі “рассеяны” рады мяцежных салдат і афіцэраў. Вось чаму генерал Гурка - Рамейка трапіў на Каўказ, дзе ішлі баявыя дзеянні з горцамі.

Незадоўга да сваёй смерці У. І. Гурка-Рамейка быў начальнікам усіх рэзервовых запасных сіл рускай арміі.

Ён быў прыхільнікам генерала Аракчэева, які ўводзіў у Расіі **ваенныя пасяленні** (“аракчэеўшчына” ). Памешчык Уладзімір Іосіфавіч Гурка стварыў адно з такіх ваенных пасяленняў паблізу Крынак у вёсцы **Ордзеж.**



*Ваеннае пасяленне*

Сялян падымалі раніцай пад гукі ваеннага барабана і прымушалі жыць і працаваць па строгаму армейскаму распарадку, калі нават гаспадыні - сялянкі прымушаліся ў адзін і той жа час паліць у печы і варыць адну і тую ж страву. Мужчыны вымушаны былі чаргаваць заняткі ваеннай справай са звычайнымі сялянскімі работамі. Палова дня адно, палова – другое. Адсюль і назва вёскі **Паловікі** ў нашым краі.

## Высачаны

Генерал **Іосіф Уладзіміравіч Гурка** пабудаваў свой маёнтак на беразе ракі Сухадроўка за 6 км на поўдзень ад чыгункі Віцебск – Смаленск. Непадалёку ўзнікла вёсачка, дзе жыла панская чэлядзь. Сядзіба была названа Высокае, потым з'явілася іншая назва – **Высачаны.** Такая назва ў дакументах упершыню сустракаецца ў 1850 годзе. Яна, мабыць, ад 5 вялікіх чанаў, якія былі ўстаноўлены пад гарой Высокай на **папяровай фабрыцы**. На гэтай фабрыцы быў яшчэ і кавальска-ліцейны цэх.



*Пячатка папяровай фабрыкі*

Фабрыка размяшчалася ў драўляным будынку, тут працавалі мясцовыя прыгонныя сяляне, а таксама прыгонныя з Разанскай губерні, якіх атрымала жонка памешчыка ў пасаг.

Уладальнікам яе быў **Аляксандр Лявонцьевіч Гурка – Рамейка.** Пазней генерал-фельдмаршал Гурка прадаў фабрыку купцу Шпырко, а маёнтак Высокае памешчыку Веберу. Купец Шпырко праз некаторы час фабрыку зачыніў. Драўляны яе будынак прастаяў яшчэ да 1900 года, калі яго купіў аўстрыец Этрых і пабудаваў тут новую **ільнопрадзільную фабрыку**.



*Будынак ільнопрадзільнай фабрыкі ( пач. XXст.)*

У Высачанах у **1867 годзе** было адкрыта Высачанскае народнае вучылішча. У канцы XIX стагоддзя вёскі Крынкі і Высокае ўваходзілі ў Высачанскую воласць Аршанскага павета. Усяго ў 1886 годзе ў Высачанскай воласці было 107 населеных пунктаў, 858 сялянскіх двароў з насельніцтвам 8061 чалавек.



*Геадэзічны знак на гары (2010г.)*

На поўнач ад вёскі Высачаны знаходзіцца ўзвышанае месца, якое мясцовыя жыхары здаўна называюць **“Швейцарыяй”**.

Гэта горка ў Высачанах цягнецца ў даўжыню 1 км, вышыня яе мяняецца. Самае высокае месца тут пэўна будзе метраў – 50.

Называць гэтае ўзвышша Швейцарыяй сталі прыкладна ў канцы **XIX стагоддзя**, калі немец Вебер купіў папяровую фабрыку ў Гуркаў.

Кажуць, што Вебер, калі прыехаў у Высачаны і ўбачыў гару, на якой раслі прыгожыя стройныя сосны, вельмі здзівіўся. Гэтае прыгожае месца нагадвала яму горныя ландшафты Швейцарыі. Ён і назваў гэтае месца Швейцарыяй.

А месца гэтае ў той час сапраўды было вельмі прыгожым. Яно было зонай адпачынку мясцовых жыхароў. Зараз сосны не захаваліся, іх знішчылі ў гады вайны. А назва гэта захавалася і зараз. Высачаны знаходзяцца на ўзвышшы з вялікім мноствам горачак, дзе жыў Гурка. Мясцовыя жыхары і зараз гэтыя горкі называюць **“Гурачкамі“**.



*Месца былога маёнтка Гуркаў (1998г.)*

На погляд краязнаўцаў, на месцы сядзібы Гуркаў неабходна было б устанавіць **памятны знак** знакамітаму генералу-фельдмаршалу, нашаму земляку Іосіфу Уладзіміравічу Гурку. Бо яго імя вядома не толькі ва ўсёй Расіі, але і ва ўсёй Еўропе.

## Пагосцішча

Назва Пагосцішча ў **X–XVIII стагоддзях** мела рознае значэнне. Першапачаткова пагостам называлі сельскія абшчыны, дзе вялася (гасьба) гандаль.

Паступова пагостамі сталі называць адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі, якія сталі цэнтрамі і складаліся з некалькіх паселішчаў гэтай акругі. Начале пагоста ставілі спецыяльных службовых асоб, якія адказвалі за рэгулярны збор даніны. У XI – XIV стст. пагосты складаліся з дзясяткаў нават

сотняў вёсак. У XV – XVI стст. – гэта былі невялікія паселішчы з царквой і могілкамі. Верагодна, у гэты час узнікае і лёзненскае Пагосцішча. Гэту думку пацвярджае і пабудаваная тут у **1527 годзе** хрысціянская праваслаўная царква Святога Міколы. Адна з самых ранніх на Лёзненшчыне, яна выстаяла шматлікія войны, што пранесліся па гэтым краі. Але праз 400 гадоў, у 1923 годзе, царква Святога Міколы па загаду бальшавікоў была разбурана і разрабавана.

У XVII – пачатку XVIII стагоддзя Пагосцішча належала шляхціцу Антону Рымшы, а потым была ім прададзена ў 1720 годзе другому шляхціцу – Івану Пагоскаму.

Сёння ў Беларусі вёсак з назвай Пагост або Пагосцішча 10, у тым ліку і Пагосцішча ў Лёзненскім раёне.

Зараз вёска Пагосцішча, як і дзесяткі іншых вёсак Лёзненшчыны, перажывае свой заняпад. Моладзь ад'язджае ў горад, у населеным пункце застаюцца адны старыя.

Назва вёскі часта сустракаецца ў гістарычных дакументах у сувязі з разнастайнымі падзеямі. Вясной 1863 года тут адбылася бітва атрада паўстанцаў пад кіраўніцтвам Ігната Будзіловіча з царскімі войскамі.



*Помнік паўстанцам 1863 года ( 2014г)*



*Помнік партызанам брыгады "Аляксея"*

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Пагосцішча дзейнічала камсамольская падпольная група, а ў 1943 – 1944 гадах на тэрыторыі гэтай мясцовасці праходзіла лінія фронту.

На ўскраіне вёскі знаходзяцца могілкі, як успамін аб вайне. На іх пахавана 1447 салдат. Вёска Пагосцішча – радзіма беларускага паэта **Уладзіміра Сяргеевіча Лісіцына.**



Ой, Пагосцішча, Пагосцішча!
На пагосце ўзрасло...
Ці яшчэ за мною гоніцца
Жураўліннае вясло?

У. С. Лісіцын

Калышкі

Знайшоўшы добрае месца, паставіўшы сабе дом, надзел абгаражваўся, не суцэльным плотам, а драўлянымі калкамі. Калі прыходзілі новыя людзі і шукалі месца, дзе б асесці, часта чулі параду: " Ідзіце туды, дзе колышкі стаяць".



*Першамайская дэманстрацыя ў Калышках.(1918г.)*

Адсюль і назва мястэчка – **Калышкі**. У XIX стагоддзі Калышкі сталі буйным габрэйскім мястэчкам. Тут у 1897 годзе пражывала 1 568 чалавек, з якіх 1 127 былі яўрэі. Два разы на год 2 лютага і 26 верасня ў Калышках праходзілі ярмаркі. Тут рабілі пляцёную мэблю, бочкі, лыжкі… Працавалі бандарамі, гарбарамі, сярмяжнікамі, шаўцамі. У 1919 годзе ў час грамадзянскай вайны ў Калышках выпускаліся нават уласныя грошы – **"калышанскія боны" або "незлінкі"** (Часопіс "Мішпаха" В. Бернштам). Гэта былі першыя грошы з назвай на беларускай мове. Боны былі выпушчаны мясцовай гандлёвай абшчынай і мелі зварот як у сваім мястэчку, так і ў суседніх вёсках, прытым не толькі на Віцебшчыне, але і на Смаленшчыне.

У самім Віцебску калышанскія боны таксама прымаліся пры разліках, але толькі тымі, хто асабіста ведаў старшыню гандлёвай абшчыны Хайма Незліна, дабразычлівага і паважанага чалавека. Боны былі ў абарачэнні некалькі месяцаў. Існавалі купюры вартасцю ў 1 і 10 рублёў. Друкаваліся на звычайнай паперы. Галоўнай абаронай ад фальшываманетчыкаў былі пячатка і асабісты подпіс старшыні. Пры з'яўленні дзяржаўных грошай калышанскія боны былі выкуплены ў насельніцтва і спалены. У Калышках былі зарэгістраваны некалькі габрэйскіх рэлігійных абшчын. Старая сінагога.

Але 22 чэрвеня 1941года перакрэсліла жыцці ўсяго яўрэйскага кагалу ў мястэчку. Акупанты ўжо 10 ліпеня захапілі Калышкі і ўстанавілі тут свае парадкі. Літаральна на другі дзень акупацыі, усе габрэйскія дамы былі пазначаны крыжамі, а пражываючыя ў іх яўрэі абавязаны былі нашыць на сваёй вопратцы жоўтыя шматкі тканіны з чорнай шасціканечнай зоркай. Тэрыторыя перасоўвання для іх была абмежавана. За парушэнне загаду – расстрэл. Гэта было гета (месца пражывання яўрэяў).

Гета таксама было і ў Лёзне на вуліцах Камсамольскай, Калгаснай і Валадарскага ( гета адкрытага тыпу).

Падчас вайны пастаянна нямецкая воінская часць не стаяла ў Калышках, але эпізадычна немцы наведваліся ў мястэчка.

**17 сакавіка 1942 года** раніцай у Калышкі наляцеў нямецкі карны атрад. Яны акружылі мястэчка шчыльным колам, былі на лыжах, у белых маскіровачных халатах. Ніхто не мог вырвацца. Немцы і паліцаі заходзілі ў хаты, выганялі ўсіх на вуліцу і строілі іх у шарэнгі. Потым пачалі паліць дамы. Усё наўкол запалыхала. Затым карнікі гэтую калону пагналі ў бок Лёзна.



*Помнік яўрэям у Калышках устаноўлены ў 2003г.*

## Завольша

Завольша – адметны населены пункт Лёзненшчыны, які мае багатую гісторыю. Гэта вёска ў Лёзненскім, на мяжы з Расіяй, і Дабрамыслінскім сельсаветах (гэта вароты Рэспублікі Беларусь).






*Мытня на мяжы Расіі і Беларусі ў Завольшы ( 2012г. )*

У аснове гэтай назвы – гідронімы, ракі Заальшанка, Ольша. Тут знаходзіцца будынак былой паштовай станцыі, узведзены яшчэ ў XIX стагоддзі. У пачатку XX стагоддзя прыхільнікам мясцовых краявідаў быў мастак Марк Шагал, бо брат Якаў Бэлы Розенфельд у Завольшы меў дачу і маладыя часта адпачывалі тут сям'ёй.



*Акно ў Завольшы. М. Шагал (1915г.)*



*Адпачываючы паэт. М. Шагал*



*Будынак былой паштовай станцыі*



*Рэшткі панскага дома ў Завольшы ( 2015 г )*

Ужо ў савецкі час у пасёлку дзейнічаў дом адпачынку. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Завольшы знаходзіўся аэрадром авіяпалка “Нармандыя-Неман”, які падчас аперацыі “Баграціён” удзельнічаў у вызваленні Беларусі.

## Уна

Вёска Уна знаходзіцца ў Лёзненскім сельсавеце, на шашы Віцебск – Смаленск, у 6 км ад райцэнтра.

У пачатку XX стагоддзя – сядзіба Уна – латышскае паселішча. Этамалогія гэтай назвы дакладна невядома. Паходжанне яго лічыцца фіна-угорскім і балцкім.




*Калектыў латышскага драмгуртка. Вёска Уна, 1929 год.*

У XIX стагоддзі праз Уна праходзіў “Кацярыненскі тракт” і была паштовая станцыя, будынак якой захаваўся да нашых дзён.



*Будынак былой паштовай станцыі ў в.Уна*



*Месца былой запалкавай фабрыкі(2012г.)*

Першыя запалкі на Беларусі выраблялі на Віцебшчыне. І дзеб вы думалі? У мястэчку Уна Аршанскага павета (зараз Лёзненскі раён). Тут у **1863 годзе** была заснавана запалкавая фабрыка. Належала яна замежнаму купцу Вальтсану, а дырэктарам і галоўным майстрам яе былі шведы.

Развіццю Унаўскай фабрыкі, спрыяла тое, што знаходзілася яна на лініі Арлоўска - Віцебскай чыгункі: гэта давала магчымасць лёгка збываць тавар.

А разыходзіўся ён па ўсёй Расіі.

## Дабрамыслі

Зараз Дабрамыслі – цэнтр аднаіменнага сельсавета, аграгарадок. У мінулым мястэчка, цэнтр Дабрамыслінскай воласці, у якой у 1910 годзе налічвалася 263 населеныя пункты. Як валасны цэнтр упамінаецца ў 1749 годзе. Пра час заснавання мястэчка Дабрамыслі не захавалася дакладных гістарычных звестак.

Паводле падання, некалі на яго месцы стаялі карчма і заезджы дом. Шмат розных людзей ехала праз гэта месца, і яго ўладальнік вырашыў павялічыць колькасць пабудоў. Калі ён паведаміў пра гэта сваім знаёмым, яны сказалі, што гэта "добрая мысль". Пасля было пабудавана некалькі дамоў, а паселішча названа **Дабрамыслі**. У 1830-я гады яно стала мястэчкам.

Паводле ўстаўной граматы, складзенай у 1863 годзе пры выкупе сялянамі мястэчка Дабрамыслі, адзначана, што Дабрамыслі мелі яшчэ назву Лагуны.

Зараз Дабрамыслі аграгарадок. У ім знаходзіцца добраўпарадкаваная сярэдняя школа, дзіцячы садок, Дом культуры, Сельсавет, МПМК-28, Дом рамёстваў, участковая бальніца, царква Божай маці, шмат гандлёвых кропак і помнікі Вялікай Айчыннай вайны.

У цэнтры вёскі, каля Дома культуры ўвагу прыкоўвае вялікі валун з выявай Божай Маці з немаўляткам, якую зрабіў жыхар вёскі Дабрамыслі **Агееў Аляксей Міхайлавіч**.



*Сельскі Дом культуры*



*Сярэдняя школа*



*Валун з выявай Божай Маці (2016г.)*

Знаходзіцца ён на беразе прыгожага Дабрамыслінскага вадасховішча з ГЭС, дзе размешчаецца цудоўная зона адпачынку.







*Зона адпачынку на ўзбярэжжы Дабрамыслінскага вадасховішча (2016г.)*

## *3. “Продкамі названыя” – вёскі Лёзненшчыны*

**Тапонімы** – гэта помнікі вуснай народнай творчасці. Вывучэнне тапанімікі дазваляе даведацца пра жыццё ў мінулым; пра тое, якія народы тут жылі, на якіх мовах і дыялектах размаўлялі, з кім размаўлялі і чым займаліся, дзе і як размяшчаліся ў той час лясы, рэкі, балоты, ворныя землі і многае іншае.

**Тапанімія** – навука, якая вывучае сукупнасць назваў геаграфічных аб’ектаў (тапонімаў). З імі мы сустракаемся ў жыцці на кожным кроку: пішам іх на канвертах, чуем па радыё, тэлебачанні, чытаем у кнігах і газетах, называем у гутарках са знаёмымі.

Цяжка ўявіць сабе, што здарылася б, калі зніклі геаграфічныя назвы. Без іх не можа працаваць пошта і тэлеграф, нельга абысціся суднавадзіцелям і пілотам, чыгуначнікам і шафёрам.

Агульная колькасць назваў вельмі вялікая: назвы маюць моры і акіяны, рэкі і азёры, гарады і вёскі, вуліцы і завулкі. Народ дае кожнаму гораду або вёсцы такое імя, якое вылучае яго сярод іншых населеных пунктаў. Яны падобны да імёнаў людзей, але больш разнастайныя. Пры ўважлівым разглядзе іх можна заўважыць, што адны назвы звязаны з прыроднымі ўмовамі, другія - з заняткамі жыхароў, трэція – характарызуюць само паселішча.

Многія назвы паходзяць ад прозвішчаў і імёнаў людзей, некаторыя дадзены ў гонар выдатных людзей ці гістарычных падзей.

У аснове нашай вечнай любві да Радзімы, незалежна ад таго, пішам яе з вялікай ці з малой літары, ляжаць многія фактары. І сярод іх, несуменна, найважнейшае месца займае наша прыхільнасць да засвоеных ад самага дзяцінства слоў, якімі называюцца нашы вёскі, гарады, вуліцы і плошчы, паркі і скверы, размешчаныя паблізу месца жыхарства рэкі і азёры.

Аўтарам вялікай працы па тапаніміцы Лёзненшчыны стала загадчыца дзіцячай раённай бібліятэкі **Пячонава Вольга Усеваладаўна**.

Яна злучыла энцыклапедычныя веды з тапанімікай нашага края і атрымаўся цікавы зборнік **“Предками названо”**.

Аналізуючы тапонімы населеных пунктаў нашага краю, трэба адзначыць, што многія з іх ўтвораны ад мужчынскіх імён: Адаменкі, Стасева, Арцёмава, Станіслававова, Якубаўшчына, Яськаўшчына; ад месца размяшчэння: Буі, Ордзеж, Замошша; ад віда працоўнай дзейнасці: Кавалі, Бандоры; ад назваў расліны або жывёл: Буракі, Жалудова; паселішч як аб’ектаў: Слабада, Пагосцішча; цікавыя: Сабачонкі, Хатулі. У кожнай назвы – свая гісторыя…



*Пячонава Вольга Усеваладаўна*




*Вокладкі кніг  Пячонавай В. У. ( 2003г.)*

**АДАМЕНКІ** – вёска ў Лёзненскім сельсавеце. У аснове назвы – імя Адам, а яго спадчыннікі, асяроддзе Адама. Краязнавец Уладзімір Карпавіч Бандарэнка выказаў версію,  што тут быў маёнтак Хлюсціных. І вёска названа ў гонар Адама Міцкевіча, з якім спадарыня Вера Хлюсціна з дачкой Анастасіяй пазнаёміліся і  пасябравалі падчас падарожжа па Еўропе.

Мясцовыя  жыхары лічаць,  што гэты Адам,  першапасяленец або гаспадар, быў палякам, таму што паўстала селішча ў часы польскага праўлення. Цалкам верагодна, тым больш,  што побач знаходзіцца вёска.

**ГРАБЕНІКІ** – вёска ў Веляшковіцкім сельскім савеце. У старых дакументах сустракаецца напісанне Грабеншчыкі. Версій  шмат.

1. Grebe – балцкае – западзіна, балоцістая нізіна каля возера. Вёска ляжыць на беразе Грабеніцкага возера.
2. Грэбень – дахрысціянскае імя. (Бірыла М. В.)
3. Грабеннік, грэбнік – лугавая расліна з мятлікаў.
4. Тут здаўна вырошчвалі лён, а грабянямі яго чухалі.
5. Грэбень – ўзнёслая узгорыстая паласа сярод забалочанай мясцовасці (Жучкевіч В. А)

***Пытанні і заданні:***

1. *Гісторыя населеных пунктаў Лёзненшчыны.*
2. *Які населены пункт раней меў статус горада?*
3. *Дзе было радавое гняздо Гуркаў - Рамейкаў у нашым краі?*
4. *Якую вёску называлі Другой Варшавай?*
5. *Правядзі падарожжа па вёсцы Высачаны.*
6. *Чаму вёска Пагосцішча мае такую назву?*
7. *Якую іншую назву мелі Дабрамыслі?*
8. *Як называецца праца па тапаніміцы нашага  раёна і хто яе аўтар?*


Раздзел II
Старонкі гісторыі:
зямля нашых продкаў
ад часоў старажытных
і да нашых дзён

## §4. Гісторыя Лёзненшчыны на стужцы часу

### 1. *Стужка часу гісторыі*

**Гісторыя** – гэта навука аб мінулым, сучасным і будучым. Каб ведаць гісторыю, трэба самому цікавіцца ёю: наведваць музеі, чытаць гістарычныя кніжкі, удзельнічаць у экскурсіях і падарожжах па гістарычных мясцінах, знаёміцца з гісторыяй сваёй сям'і, вёскі і горада, сваёй Радзімы. Гісторыя ствараецца з падзей, якія адбываюцца ў нейкім месцы, у нейкі час і адказвае на пытанні: **Што? Дзе? Калі? Зачым?**




*Гісторыя на стужцы часу*

**Стужка часу** – гэта паласа або лінія, на якой паказваюцца галоўныя падзеі мінуўшчыны. У кожнага чалавека ў свядомасці на працягу жыцця ствараецца своеасаблівая стужка часу, дзякуючы якой ён можа ўспомніць нейкія акалічнасці свайго лёсу, лёсу іншых людзей, краёў, краін.

Каб арыентавацца ў гістарычных падзеях, трэба ведаць хаця б асноўныя даты з жыцця Еўропы, краіны, сваёй мясцовасці. Для гэтага існуе такое паняцце, як стужка часу. Зразумела, што ўсе даты запомніць немагчыма, але для тых, хто вывучае гісторыю, ведаць важнейшыя з іх вельмі важна. І тут на дапамогу прыходзіць стужка часу. Яе можа скласці кожны для сябе як памятку, як шпаргалку.

Як гэта зрабіць? Уся гісторыя хрысціянскага свету, як вядома, падзяляецца на два вялікія прамежкі часу: да нашай эры і нашу эру. Мяжу паміж імі вызначаюць па даце нараджэння Ісуса Хрыста. А нарадзіўся ён 2018 год таму назад. Значыць, мы жывём у пачатку трэцяга тысячагоддзя або ў XXI стагоддзі нашай эры (н.э.). Стужку часу ў прамежку да нашай эры можна раскручваць да пачатку ўтварэння Зямлі (~ 4,6млрд.г. да н.э.), або ўтварэння Сонца (~ 5 млрд. г. да н.э.), або ўтварэння Сусвету (~ 14 млрд.г. да н. э.).

Але навуку гісторыю цікавіць жыццё людзей, і таму стужка часу будзе намнога карацейшая, бо ў Беларусі першыя вядомыя стаянкі старажытных жыхароў з'явіліся каля 24 тыс. г. да н. э. Для Лёзненшчыны стужку часу трэба яшчэ скараціць, бо наша тэрыторыя доўгі час была занятая ледавіком, які пакінуў наш край прыблізна 10 тыс. г. да н.э.

## 2. *Стужка часу Лёзненскага раёна*




Якія падзеі ў нашай мясцовасці могуць быць нанесеныя на стужку часу ў адрэзку да нашай эры?

Ды нямногія. Калі каля Зяленскага возера з'явіліся стаянкі неалітычнай эпохі Бабінавічы -1, Бабінавічы -2? Калі існавалі гарадзішчы, якой культуры?

З прычыны адсутнасці пісьмовых крыніц не шмат мы ведаем дат і ў 1 тысячагоддзі нашай эры. Калі на Лёзненшчыне рассяляліся балты, крывічы, славяне, фарміраваліся вялікія курганныя могільнікі?

А вось з X стагоддзя стужка часу пачынае насычацца падзеямі, бо да сённяшняга часу дайшлі пісьмовыя крыніцы пра даўнейшыя часы. І тут ужо варта зрабіць адбор самых важных дат. Для Лёзненшчыны, як і для любой іншай тэрыторыі, трэба ў першую чаргу вызначыцца з дзяржавамі, у склад якіх яна ўваходзіла: з X ст. – Полацкае ці Смаленскае княства, з XIII ст. – Вялікае Княства Літоўскае, з 1569 года – Рэч Паспалітая, з 1772 года – Расійская імперыя, з 1917 года – Савецкая Расія, з 1 студзеня 1919 года – БССР ( СССР), аднак у перыяд з 16 студзеня 1919 года да 3 сакавіка 1924 года Лёзненшчына( як і ўся ўсходняя Беларусь) знаходзілася ў складзе РСФСР, з 1991 года – Рэспубліка Беларусь (СНД), 2 красавіка 1997 года – саюз Беларусі і Расіі. Вызначыўшы такім чынам прыналежнасць да дзяржаў, потым на стужку часу варта нанесці войны і паўстанні, якія пакінулі сляды ў гісторыі краю.

Гэта: 1654 год – вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, 1812год – вайна паміж Францыяй і Расіяй, паўстанне супраць расійскай акупацыі – 1830 – 1831гг. і 1863г., рэвалюцыйныя падзеі ў нашым краі з 1905 па 1917 гады, Вялікая Айчынная вайна – 1941 – 1943 гг.

Акрамя гэтага, на стужку часу могуць быць нанесены іншыя катэгорыі гістарычных падзей, напрыклад, даты заснавання населеных пунктаў раёна, даты будаўніцтва цэркваў і касцёлаў, даты жыцця вядомых людзей і іншае. Стужкі часу можна стварыць для кожнага населенага пункта раёна.

***Пытанні і заданні:***

*1. Якое значэнне мае стужка часу пры вывучэнні гісторыі?*
*2. Што можна адлюстраваць на стужцы часу?*
*3. Скарыстаўшы матэрыял параграфа і дадаткаў, намалюй у сшытку стужку часу Лёзненскага раёна.*
*4. Намалюй стужку часу жыцця сваіх бацькоў.*

## §5. Першабыныя людзі на тэрыторыі нашага краю

### 1. *Паселішчы ранняга неаліту. Бабінавіцкая кераміка*

Тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна была заселена чалавекам у эпоху мезаліту ў **IX–V тысячагоддзі да н.э**, а пранікненне першых людзей пэўна было каля **X тыс. гадоў да н.э**. На Лёзеншчыне помнікі сярэднекаменнага стагоддзя пакуль не выяўлены, але яны вядомы ў суседнім Аршанскім раёне. Даследчык мезаліту У. П. Ксяндзоў лічыць, што гэтыя помнікі належалі насельніцтву грэнскай культуры, арэал якой уключаў і сучасную тэрыторыю Лёзненскага раёна.

Старажытная гісторыя ўмоўна падзяляецца на вялікія прамежкі часу, якія называюць эпохамі або вякамі.

Першабытнае грамадства вывучаецца па **сістэме трох вякоў**:
**I – ранні каменны век** – палеаліт (на Лёзеншчыне не зафіксаваны),
**сярэдні каменны** – **мезаліт** (IX –III тыс. г да н.э.),
новы каменны – **неаліт** (III тыс. – сярэдзіна II тыс.)
**II** – **бронзавы век** (сяр. II тыс. – VII –IV стст. да н. э.)
**III – жалезны век** – (з VII –IV стст. да н.э.)

Па сваім унутраным развіцці эпохі былі неаднароднымі: яны падзяляюцца на меншыя прамежкі часу, якія называюць культурамі; выдзяляюць звычайна паводле характару штрыховак на кераміцы, тэхніцы вырабу прылад працы, упрыгажэнням і г. д.

Больш 15 тысяч гадоў таму тэрыторыю Лёзеншчыны займаў вялікі ледавік, і таму прыродныя ўмовы былі вельмі суровыя. Пасля адыходу апошняга ледавіка адбылося пацяпленне. Былая ледзяная пустыня пакрылася рэкамі і азёрамі, лесам, была населена дзікімі звярамі.

Прыблізна ў **IV тысячагоддзі да н. э.** на поўначы Беларусі пачалася эпоха неаліту (новы каменны век). Яе характэрныя рысы: паяўленне глінянага ляпнога посуду, шліхтаваных каменных прылад, удасканаленне апрацоўкі крэменю, на познім этапе – авалоданне навыкамі земляробства і жывёлагадоўлі. У цёплым вільготным клімаце ранняга неаліту былі распаўсюджаны змешаныя шыракалістыя лясы.

Рэкі і азёры былі царствам водаплаўнай птушкі і мелі шмат рыбы. У азёрах рос **вадзяны арэх** і іншыя цеплалюбівыя расліны.



*Вадзяны арэх*

Узровень азёр павысіўся, і паселішчы размяшчаліся на іх высокіх каранёвых берагах на вышыні 10 і больш метраў над вадой.

У гушчарах вадзіліся ваўкі, дзікі, ласі, лісы, высакародныя алені, зубры, мядзведзі, рысі, барсукі, бабры і іншыя жывёлы, якія ў большасці жывуць на нашай тэрыторыі і зараз.

На тэрыторыі Лёзненскага раёна выяўлены два паселішчы ранняга неаліту каля сучаснай вёскі Бабінавічы: **Бабінавічы -1, Бабінавічы -2**, на якіх знойдзены фрагменты ляпной керамікі і крамянёвыя прылады працы.




*Карта. Рассяленне плямён эпохі неаліту. Стаягка Бабінавічы. IVтыс. г да н. э.*

Падобныя рэчы таксама выяўлены на паселішчы каля вёскі **Украішча** Лёзненскага раёна. Паселішчы размяшчаліся па берагах рэк і азёр. Насельніцтва займалася паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам.



*Сучасны выгляд месца, дзе была стаянка Бабінавічы – 1 (1997г.)*



*Жыццё людзей у час неаліту*

Большасць **крамянёвых прылад працы** зроблена на пласцінах і пласцiністых адшчэпах: канцавыя скрабкі, вуглавыя разцы, трапецыі і сячэнні пласцін, сегменты, груба аббітыя сякеры.



*Грэнская археалагічная культура.*



*Прылады працы са стаянкі Бабінавічы - 1*

Наканечнікі стрэл падзяляюцца на 4 тыпы: тронкавыя Бабінавіцкага тыпу, лістападобныя з бакавымі выемкамі, рамбічныя.

Кераміка па складу гліны, арнаментацыі і стратыграфічных умоў залягання падзяляецца на 3 храналагічныя групы.

Найбольш **ранняя кераміка** з дамешкам пяску ці кварцу ў гліне мае падгаразынтальныя расчосы з унутранага боку. Таўшчыня сценак 0,7-1 см. Венчыкі звычайна злёгку адагнутыя звонку, але трапляюцца і прамыя. 55-61 % фрагментаў керамікі не арнаментаваны, 25-37 % з грабеньчатым арнаментам, 7-13 % спалучэнне адбіткаў грабеньчатага штампа з ямкамі і наколкамі. Шмат абломкаў з **накольчатымі і грабеньчатымі ўзорамі,** зрэдку трапляецца арнамент у выглядзе пракрэсленых ліній. Больш за ўсё кераміка гэтага тыпу падобная да **керамікі верхняволжскай культуры** (V–IV тыс. да н. э.) і менш да керамікі днепра-данецкай культуры і ранняга этапу нарвенскай культуры.



*Кераміка са стаянкі Бабінавічы*



*Кераміка Верхняволжскай культуры*

Другую групу складае кераміка з арганічным дамешкам у гліне і расчосамі з унутранага боку. Пасудзіны мелі патоўшчаныя закругленыя донцы. Значная частка фрагментаў без арнаментаў, сярод арнаментаваных пераважалі адбіткі грабеньчатага штампа, спалучэнні грэбеня з ямкамі і наколамі, наколы, ямкі. У арнаменце гаршкоў з'явіліся насечкі, што зблiжае іх з керамікай **нарвенскай культуры** (Бабінавічы. Стаянка - 2). Да -яй 3 групы адносіцца гладкасценная кераміка з арганічным дамешкам у гліне, менш шчыльная, чым у папярэдняй групе. Таўшчыня сценак пасудзін 0,4 – 0,9 см. Венчыкі найчасцей прамыя ці злёгку адагнутыя, часам на зрэзы іх нанесены арнамент, па-ранейшаму пераважалі грабеньчатыя (каля трэці фрагментаў), а таксама спалучэнні грэбеня з іншымі элементамі, паяўляюцца "вусеневыя" адбіткі і сляды тонкай, слаба перавітай вяровачкі, паяўляюцца насечкі. У гэтай групе яшчэ больш узмацняюцца рысы, характэрныя для **нарвенскай культуры**. Па аналогіі з верхняволжскай культурай помнікі тыпу Бабінавічы датуюцца сярэдзінай V- IV – канцом III тыс. да н.э



*Нарвенская археалагічная культура.*

## 2. *Помнікі старажытнай гісторыі*

Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі пачаўся на мяжы III і II тыс. да н.э. і доўжыўся прыкладна да пачатку I тыс. да н.э. У гэты час вырабы з медзі і бронзы з поўдня трапляюць на тэрыторыю Беларусі. Тут не было радовішчаў медзі і волава, сплаў якіх утварае бронзу.

Яе прывозілі з поўдня (малая Азія). Бронзавы век у беларускім Падзвінні пачаўся ў **2-ой чвэрці II тыс. да н.э.**

На пачатак эпохі бронзы прыпадае позні этап **паўночнабеларускай культуры**.

Ёсць падставы меркаваць, што з Лёзненскага раёна паходзіць **бронзавая сякера-кельт**, адна з нямногіх ранніх металічных прылад на поўначы Беларусі, якая цяпер захоўваецца ў археалагічным музеі Магілёўскага Дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова.



*Сякеры-кельты і плоскі тапор з бронзы II тыс. да н.э.*

Паўночна-беларуская культура спыніла існаванне ў 2 палавіне II тыс. да н.э. Помнікі канца II – пачатку I тыс. да н.э. на Віцебшчыне пакуль практычна не вывучаліся. Прыблізна з **VIII-VII стагоддзяў н. э.** у Сярэднім і Верхнім Падзвінні, некаторых раёнах Верхняга Падняпроўя сфарміравалася **днепра-**

**дзвінская культура**, якая існавала да IV-V ст. н.э. Да перыяду позняга неаліту належаць каменныя шліхтаваныя сякеры. Адна такая **клінападобная сякера** выяўлена на полі за 2 км ад вёскі Пушкі Лёзненскага раёна, другая каменная свідраваная сякера лодкападобнай формы – каля вёскі Бабінавічы.



*Каменныя сякеры VIII - IVст. н.э.*




*Узоры рэчаў днепра-дзвінскай культуры*

Ранняе жытло насельніцтва днепра-дзвінскай культуры – паглыбленыя ў зямлю буданы з канічным дахам. У час бронзавага веку на тэрыторыю Беларусі паступова пачалі пранікаць **індаеўрапейцы** – шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў, якія жылі першапачаткова ў Малой Азіі па суседству з народамі Старажытнага Усходу.

У час рассялення на тэрыторыі Еўропы ў выніку змешвання індаеўрапейцаў з мясцовым насельніцтвам узніклі племянныя аб'яднанні германцаў, славян і балтаў**. Балцкія плямёны і фіна-угры,** якія з'яўляюцца продкамі сучасных літоўцаў і латышоў, пачалі паступова асвойваць тэрыторыю Беларусі. **Нарвенская культура** (назва па рацэ Нарва) была распаўсюджана ў паўночнай частцы тэрыторыі Беларусі. Ад басейна Віліі да міжрэчча Дзвіны і Дняпра на поўнач ад Оршы, а таксама ў нашым краі.

Над крывінскімі стаянкамі ўтварыўся пласт торфу, магутнасцю да 1,5 метра. Многа цікавых вырабаў з косці, рога і дрэва далі тарфяніковыя паселішчы Асавец, Крывіна, а вось **Бабінавічы** і Зацэнне займаюць прамежкавае становішча ў адносінах да верхнеднепроўскай культуры.

**Жалезны век** на тэрыторыі Беларусі быў пазней, чым у Еўропе, пачаўся прыкладна ў VII ст. да н.э. Людзі навучыліся здабываць жалезную руду. Яе называлі балотнай, таму што знаходзілі па бурым колеры на балоце або пад дзірваном на лузе.

З **IV ст. да н.э**. з'яўляюцца і распаўсюджваюцца жалезныя вырабы. Асноўнымі заняткамі насельніцтва былі жывёлагадоўля і паляванне, узрастала роля падсечнага земляробства (сеялі ячмень, проса, бабовыя, пшаніцу). Дапаможнымі заняткамі заставаліся паляванне і рыбалоўства, збіральніцтва. Развіваліся хатнія рамёствы: апрацоўка каменю, косці, рога, дрэва, шыццё, ткацтва, выраб глінянага посуду. Насельніцтва жыло патрыярхальнымі родамі, якія распадаліся на асобныя сем'і. На думку некаторых даследчыкаў, у гэты час

узнікла патрыярхальнае рабства, крыніцай якога былі міжплемянныя войны. З’явіліся багатыя і бедныя. Паміж імі ўзнікалі сутычкі. Для абароны людзі пачалі будаваць умацаваныя паселішчы – **гарадзішчы.**



*Заняткі славян*



*Паўзямлянка (жытло славян)*

**Днепра-дзвінская культура** знаходзілася ў межах арэалу балцкай гідраніміі, таму лічыцца, што носьбіты гэтай культуры па этнічнай прыналежнасці былі балтамі.

На тэрыторыі нашага раёна гарадзішчы вядомы каля вёсак **Буракі, Выхадцы,** ёсць звесткі пра гарадзішчы каля вёскі **Чарнышы,** паміж вёскамі **Гарадзец** і **Калінавічы.**



*Балцкае паселішча ( гарадзішча)*

Археалагічныя раскопкі ні на адным з гэтых помнікаў не праводзіліся, таму немагчыма дакладна вызначыць, якое насельніцтва жыло на гэтых гарадзішчах – днепра-дзвінскай культуры ці больш позняга часу.

Варта прызнаць, што банцараўская культура была першай ступенню **сінтэзу балтаў і славян**. Менавіта ў выніку славянізацыі балтаў, згодна з пашыранай цяпер тэорыяй археолага В. В. Сядова, і ўзнікла **беларуская народнасць**.

У гэтым працэсе славянская мова і культура перамаглі, але і балты пасля сябе захавалі шмат рыс у мове, звычаях, вераваннях, народным мастацтве, побыце, а таксама і ў фізічным вобліку.



*Старажытныя славяне. Вясельны абрад*

У нашым краі засталося шмат тапонімаў, гідронімаў **балцкага паходжання**: Уна, Ордзеж, Мятлі, Ольша. Але, знаходзячыся на мяжы са Смаленшчынай, мы больш станавіліся славянамі і мелі агульныя з імі рысы. Пры раскопках некаторых гарадзішчаў-сховішчаў у нас і на Смаленшчыне выяўлены аднолькавыя рэшткі свяцілішчаў.



*Свяцілішча ўсходніх славян*

Гэта былі круглыя утрамбаваныя пляцоўкі, вакол якіх па краях стаяць драўляныя слупы з выявамі бажаства. У цэнтры пляцоўкі знаходзіўся больш высокі і масіўны ідал. У нашым раёне каля вёскі Крынкі быў выяўлены каменны ідал – увасабленне старажытнага бажаства. Магчыма, там таксама было свяцілішча. Магчыма і тое, што гэта **каменная баба** азіяцкага паходжання і прывезена да нас з Азіі. (Зараз знаходзіцца ў Віцебскім археалагічным музеі.)



*Каменная баба з вёскі Крынкі. Фотаздымак 2015г.*

Жытло на паселішчах банцараўскай культуры было невялікае, наземнае, слупавой, радзей зрубнай канструкцыі. Вакол іх былі агнішчы, складзеныя з камянёў. Могільнікі размяшчаліся часцей на ўзвышаных месцах, непадалёку ад паселішчаў або на іх ускраінах. **Пахавальны абрад – трупаспаленне**.

Попел нябожчыка ссыпалі проста ў ямку або ў пасудзіну, якую накрывалі іншай перавёрнутай пасудзінай. Рэчы ў пахаваннях трапляюцца рэдка. Пасля крэмацыі рэшткі ссыпаліся ў невялікія ўрны і накрываліся вялікім гаршком (клёшам). Ад гэтага могільнікі атрымалі ў навуцы назву “надклёшавых”. Даследчыкі мяркуюць, што гэта былі самыя раннія славяне, у якіх існаваў патрыярхальна-родавы лад.

У **2-й палавіне І-га тыс. н.э** у беларускае Падзвінне праніклі і рассяліліся **крывічы** – прадстаўнікі самай вялікай групы ўсходніх славян, якія займалі тэрыторыі верхняга цячэння Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, паўднёвую частку басейна Чудскага возера, ад Пскова на поўначы да Мінска і Заслаўя на поўдні.



*Старажытнае паселішча славян*

На думку адных даследчыкаў назва “крывічы” азначае “блізкія па крыві”, на думку іншых, паходзіць ад імя родапачынальніка Крыва або язычніцкага першасвяшчэнніка Крыва-Крывейтэ. Маскоўскі лінгвіст Г. А. Хабургаеў лічыць, што спачатку існавала балцкае племя *krieva*, якое потым аслявянілася і стала называцца крывічамі.



*Крывічанка.*

Працэс фарміравання крывічаў пачаўся ў **сярэдзіне І-га тыс. н.э**. і скончыўся прыкладна ў ІХ стагоддзі ў выніку асіміляцыі славянскімі плямёнамі мясцовых балцкіх і заходніх фінскіх плямён. Найбольш раннімі пахавальнымі помнікамі крывічоў былі так званыя доўгія **курганы** (12-15, 4050, 100 м у даўжыню, 5-10 шырыню, 1-2 м у вышыню).



*Курган каля вёскі Бабінавічы (2016 г.)*

Выцягнутая форма кургана атрымлівалася за кошт шматлікіх пахаванняў, часам у адным кургане іх налічвалася да 22. Размяшчаліся доўгія курганы ў адных групах і разам з круглымі насыпамі, бясспрэчна славянскімі, але іх аб'ядноўвае аднолькавы пахавальны абрад, кераміка і іншыя рэчы, выяўленыя ў выніку раскопак. Некалькі прадаўгаватых курганоў выяўлена на тэрыторыі Лёзненскага раёна. У курганнай групе ва ўрочышчы **Шапкіна** непадалёку ад вёскі Бабінавічы прадаўгаваты курган памерамі 15-8-2 м размешчаны побач з круглымі. Ёсць звесткі аб прадаўгаватым кургане сярод круглых насыпаў каля дарогі з вёскі **Осіпава** ў Бабінавічы. Доўгія курганы былі распаўсюджаны ў VI -VIII стст., круглыя – у IX - XIII стст.

У Лёзненскім раёне групы курганных могільнікаў выяўлены каля вёсак Бабінавічы, Барсеева, Высачаны, Дабрамыслі, Вялікія Калінавічы, Касцяёва, Сітна. Захаваліся і адзінкавыя курганныя насыпы каля вёсак Бабінавічы, Барсеева, Высачаны, Дабрамыслі, Кучыншчына, Малыя Калінавічы.



*Курган-могільнік каля в. Высачаны (1990г.)*



*Курганы-могільнікі (фотазд. 2015г.)*

Курганы на поўначы Беларусі, у месцах рассялення крывічаў, маюць мясцовую назву **"валатоўкі"**, якая звязана са старажытнымі легендамі пра асілкаў-волатаў, пахаваных там. Курган каля вёскі Кучыншчына Крынкаўскага сельсавета мае назву "Напалеонаўская валатоўка". У народзе курганы часта называюць французскімі (напалеонаўскімі) або шведскімі магіламі. Аднак вынікі археалагічных раскопак гэта не пацвярджаюць, проста гістарычныя падзеі, звязаныя з паходамі Карла ХІІ і Напалеона, спрыялі выцясненню старажытных звестак. З Х стагоддзя ў крывічоў на змену абраду трупаспалення прыйшоў **абрад трупапалажэння**, але яшчэ доўга захоўваўся звычай ушанавання агню, напрыклад, рытуальнага ачышчэння агнём месца будучага кургана. Памеры круглых курганоў, выяўленых на Лёзненшчыне,

розныя. Каля **вёскі Высачаны** размешчаны 2 курганы дыяметрам 16 і 24 м, вышынёй 3-3,5 м. Раскопкі кургаоў у нашым раёне не праводзіліся да 1990 года, толькі пры зачыстцы сценкі аднаго з кургаоў каля **вёскі Дабрамыслі** М. А. Ткачоў выявіў сляды агнішча і кальцыніраваныя косці.




*Схема кургаоў-могільнікаў. Дабрамыслі*

Пры археалагічных раскопках крывіцкіх кургаоў у іншых раёнах Віцебшчыны выяўлены шматлікія рэчы, што клаліся побач з нябожчыкам: упрыгожанні (скроневыя кольцы, бранзалеты, падвескі, пярсцёнкі, пацеркі) побытовыя рэчы (нажы, прасліцы), зброя. Насыпанне кургаоў і звычай класці ў магілу рэчы былі звязаны з язычніцкімі пахавальнымі абрадамі, дахрысціянскімі ўяўленнямі пра замагільнае жыццё.

З прыняццем хрысціянства ў канцы X стагоддзя язычніцкія абрады выцясняліся, але курганы насыпалі яшчэ да XIII стагоддзя.

## *3. Археалагічныя даследванні нашага краю*

**Археалогія** – навука, якая вывучае гісторыю па рэчавых крыніцах. На тэрыторыі Лёзненшчыны знаходзіцца вялікая колькасць археалагічных помнікаў. На сённяшні дзень іх дакладна вызначана – 25. Гэта стаянкі, могільнікі, курганы эпохі неаліту і бронзавага веку, а таксама гарадзішчы ранняга феадалізму, што размешчаны каля вёсак Бабінавічы, Пушкі, Выхадцы, Чарнышы, Гарадзец, Касцяёва, Калінавічы. Тут беларускімі археолагамі, даследчыкамі Лёзненшчыны Э. М. Зайкоўскім і І. М. Ціханенкавым знойдзены фрагменты ляпной керамікі, крамянёвыя прылады працы: скрабкі, разцы, праколкі, сякеры, нажы, наканечнікі стрэлаў. На археалагічныя помнікі Лёзненшчыны вучоныя звярнулі ўвагу яшчэ ў мінулым стагоддзі. А ў 1920 годзе некаторыя помнікі былі абследаваны археолагам Я. Сяргеенкам. Шмат абследаванняў праводзілася ў пасляваенныя гады: у канцы 50-х г. – маскоўскім археолагам Л. В. Аляксеевым, у пачатку 70-х г. – М. Ткачовым, а ў 1981г. – В. С. Вяргей. Археалагічныя раскопкі праводзіліся пакуль што толькі ў Бабінавічах і то не былі закончаны. У 1968 годзе доследы тут вёў І. М. Ціханенкаў, а праз 10 гадоў – Э. М. Зайкоўскі. Курганы не даследаваліся.

І наогул, мала даследавалі край. На жаль, бо ў **1998 годзе** падчас уборкі ўраджаю бульбы на саўгасным палетку **паміж вёскамі Адаменкі і Альхавік**

(зараз месца фермы) пэўна была знойдзена яшчэ адна неалітычная стаянка старажытных людзей. Гэта пацвердзіў настаўнік гісторыі УА СШ №2 Міхаіл Міхайлавіч Космыкаў, вучні якога на гэтым месцы знайшлі кавалкі крэмню і наканечнік стралы, вырабленыя прыкладна ў сярэдзіне II - га тыс. да н. э. На кавалках крэмню былі сколы, якія шліфаваліся старажытным чалавекам, а потым пераўтвараліся ў нажы, сякеры, наканечнікі стрэлаў і г. д. Такім чынам, мы бачым, што Лёзненшчына багата старажытнымі матэрыяламі розных эпох і яе трэба даследаваць. Зараз усе старажытныя помнікі знаходзяцца пад аховай дзяржавы, і на іх устаноўлены ахоўныя знакі ў выглядзе чыгунных дошак.

Археалагічныя раскопкі могуць праводзіць толькі вучоныя, якія маюць вялікі вопыт работы і атрымліваюць на гэта спецыяльны дакумент, так званы “Адкрыты ліст”, які выдаецца аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук. Добра, што калісьці на месцы першабытных стаянак Бабінавічы-1, Бабінавічы - 2 былі ўстаноўлены такія ахоўныя дошкі.




*Ахоўныя дзяржаўныя знакі*



*Ахоўны знак на вайсковых могілках*

Самавольныя раскопкі караюцца законам. Пашкоджанне археалагічнага помніка раўнацэнна знішчэнню важнага гістарычнага дакумента, які яшчэ не вывучаны. Усе археалагічныя помнікі ўнесены ў выданне “Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць”(1985г.) і спіс гісторыка-культурныых каштоўнасцяў. Несумненна, што яшчэ шмат помнікаў хавае лёзненская зямля. Іншы раз адкрываюцца яны выпадкова ў час земляробчых работ, а бывае нават у рэках і азёрах, дзе калісьці былі затоплены ці апынуліся выпадкова. Такім чынам, наш край даследаваны мала. Археолагам трэба працягваць раскопкі, прычым у розных месцах нашага краю.

**Трэба таксама аднавіць ахоўныя знакі і ўстанавіць новы**я.

***Пытанні і заданні:***

1. *Калі з’явіліся першыя людзі на Беларусі, Лёзненшчыне ?*
2. *Знайдзі на карце стаянкі першых людзей у нашым раёне.*
3. *Да якой культуры адносіліся неалітычныя стаянкі?*
4. *Што ты ведаеш пра Бабінавіцкую кераміку?*
5. *Знайдзіце на карце нашага раёна, дзе былі гарадзішчы, курганы, валатоўкі.*
6. *Хто такія індаеўрапейцы, балты, славяне, крывічы?*
7. *Якія старажытныя археалагічныя рэчы знайшлі археолагі ў нашым раёне? Дзе зараз яны знаходзяцца?*

## §6. У складзе старажытных дзяржаў

### *1. На мяжы двух княстваў*

Крывічы - палачане стварылі **Полацкае княства**, якое было самым магутным і значымым княствам на тэрыторыі Беларусі ў X – XIII стст.




*Карта. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі (IX- Хстст.)*

Мы жывём непадалёку ад Заходняй Дзвіны і непадалёку ад Смаленска, дык да якога княства мы адносіліся б: **да Полацкага ці да Смаленскага?**

Смаленскія крывічы вельмі блізкія да полацкіх па мове і культуры, таму ў этнаграфічных адносінах звычайна разглядаюцца як полацка-смаленская група плямён. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ўсходніх славян прывяло да ўтварэння класавага грамадства. Прынята лічыць, што з сярэдзіны IX стагоддзя на тэрыторыі іх пражывання пачынаецца эпоха феадалізму.

Яшчэ да **860-х гадоў** адносяцца першыя ўпамінанні ў летапісах пра гарады Полацк і Смаленск. Пад 863 ці 864 годам паведамляецца, што кіеўскія князі Аскольд і Дзір ваявалі з палачанамі.

А Смаленск у 882 годзе быў узяты войскам Алега і на крывічоў была накладзена даніна. Больш доўга супраціўляўся Полацк, у якім быў свой незалежны князь Рагвалод. У 980 годзе будучы кіеўскі князь Уладзімір "Чырвонае Сонейка", або **Уладзімір-Хрысціцель,** захапіў Полацк, забіў полацкага князя Рагвалода і яго двух сыноў, а яго дачку Рагнеду сілком узяў у жонкі.

Так на 35 год усе землі крывічоў, у тым ліку тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна, апынулася пад уладай Кіева. Пасля смерці Уладзіміра ў 1015 годзе Полацкае княства зноў стала незалежным. У 1021 годзе пад уладу Полацка перайшлі Віцебск і Усвяты.

## 2. *Гандлёвы водны шлях “з варагаў у грэкі”*

У старажытныя часы праз тэрыторыю Беларусі праходзіў вялікі гандлёвы шлях **“з варагаў у грэкі”**. Рэкі Заходняя Дзвіна, Днепр і Нёман злучалі паміж сабой Балтыйскае мора з Чорным. Гэты вялікі гадлёвы шлях праходзіў і праз нашу Лёзненшчыну.




*Карта. Шлях “з варагаў у грэкі” (VIII - XIIстст.)*

На гэтым шляху з Балтыйскага (Варажскага) мора ў Чорнае (Рускае) было адгалінаванне па рацэ Лучоса, прытоку Заходняй Дзвіны, адкуль было недалёка да Дняпра. Аднак на гэтым шляху была адна перашкода. Не існавала прамога воднага праходу ад Заходняй Дзвіны да Дняпра. Таму лодкі і караблі гандляры працягвалі па зямлі волакам.



*Перасоўванне карабля волакам*

Паміж гэтымі рэкамі ў раёне сучасных Оршы і Віцебска былі наладжаны сухапутныя шляхі зносін – **волакі**, на якіх судны перацягвалі ад ракі да ракі па зямлі, падкладваючы пад іх бярвенне.

На гэтым шляху былі 3 вялікія горады: Ноўгарад, Полацк і Кіеў.

Іх князі жадалі валодаць **шляхам “з варагаў у грэкі”** асабіста, таму вялі за яго барацьбу.

Гэты гандлёвы шлях праходзіў і праз Полаччыну, і праз Смаленшчыну і для іх меў вельмі вялікае эканамічнае і палітычнае значэнне.

Выгаднае геаграфічнае становішча спрыяла хуткаму росту Полацка і ператварэнню яго ў буйны цэнтр гандлю і рамёстваў. Полацкі цэнтр ахопліваў значную тэрыторыю, раскінутую ў вадазборы верхняй, сярэдняй і заходняй Дзвіны і часткова вадазборы Дняпра. На гэтай тэрыторыі выраслі буйныя гарадскія асяроддзі: Полацк, **Віцебск (974г.), Менск (1067г**), Лукомль, Заслаўе, Друцк. Тэрыторыя Смаленскага цэнтра была раскінута па вярхоўях Волгі, Заходняй Дзвіны і Дняпра. Смаленск (**862 год**) узнік раней Віцебска і, апрача яго, там узніклі гарады: Дарагабуж, Мажайск, Вязьма.



*Князь Брачыслаў*

У **XI стагоддзі** пры сыне Ізяслава (унук Рагвалода), полацкім князю Брачыславе адбылося ўзмацненне Полацкага княства.

Ён разам з войскам захапіў волакі, што злучалі раку Заходнюю Дзвіну з Дняпром па шляху "з варагаў у грэкі", якія належалі Ноўгараду. Яны дазвалялі з дапамогай бярвенняў правесці (правалачы) судны і такім чынам прайсці ад Балтыйскага да Чорнага мора. Аднак войска было разбіта яго дзядзькам - кіеўскім князем Яраславам Мудрым, таму што ён сам жадаў кантраляваць гэты шлях і збіраць даніну з купцоў. Таму перамога Брачыслава над Ноўгарадам Яраславу Мудраму не падабалася..

Хочацца адзначыць, што значная частка гэтых шляхоў праходзіла па тэрыторыі сучасных Дубровенскага, Аршанскага, Лёзненскага раёнаў Віцебшчыны, тэрыторыя якіх уваходзіла ў склад Смаленскай воласці Кіеўскай Русі. Падобны комплекс **VIII - XI стст**. зафіксаваны і на Арэхаўскім волаку з Дняпра ў Заходнюю Дзвіну праз раку Лучосу.

Шлях з " варагаў у грэкі" быў вядомы нашым продкам яшчэ шмат вякоў таму назад. Цяжкі і суровы быў гэты шлях. Многія кіламетры даводзілася цягнуць судны поцягам. А ці нельга зрабіць так, каб з Дняпра, які ўпадае ў Чорнае мора, можна было адразу трапіць у Заходнюю Дзвіну, воды якой уліваюцца ў Балтыку? Інакш кажучы, ці нельга пракласці канал паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром? Аб гэтым многія дзесяцігоддзі думалі людзі. Але нізкая ступень развіцця тэхнікі ў далёкія гады не дазволіла сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем.

Толькі ў канцы XVIII стагоддзя, пасля далучэння Беларусі да Расіі, былі зроблены першыя крокі ў гэтым напрамку. Праект заключаўся ў будаўніцтве канала паміж Віцебскам і Оршай.

Для гэтага меркавалася злучыць два вялікія прытокі Заходняй Дзвіны і Дняпра: Лучосу і Аршыцу. Канал павінен быў пачынацца з Арэхаўскага возера і заканчвацца за тры- чатыры кіламетры ад Бабінавіцкага возера. Даўжыня ўсёй сістэмы – больш за 100 кіламетраў.

Аднак праект злучэння Дняпра з Дзвіной, які ў свой час мог адыграць немалую эканамічную ролю, застаўся нерэалізаваным.

## *3. Добрынскі манетна - рэчавы скарб*



Пра тое, што нашы далёкія продкі мелі гандлёвыя сувязі з такімі багатымі, магутнымі і аддаленымі дзяржавамі, як Арабскі халіфат, нам сведчыць **Добрынскі манетна-рэчавы скарб**, адзін з буйнейшых у Беларусі.

Добрынскі манетна - рэчавы скарб быў знойдзены вучнямі нашага раёна ў **1962 годзе** каля вёскі **Добрына** Крынкаўскага сельсавета, недалёка ад Высачан. Таму атрымаў такую назву – **Добрынскі.** Схаваны ён быў у **1-й палове 840-х гадоў**, а вось кім – не зразумела.

*Добрынскі скарб. Мал. І. Собалевай (2010г.)*

Добрынскі скарб складаецца з сярэбранай шыйнай грыўны і 527 арабскіх дырхемаў. Гэта вялізнае багацце на той час. Такой каштоўнасцю мог валодаць вельмі багаты купец або блізкая асоба да віцебскага князя, накшталт дружынніка. Як гэты скарб апынуўся ў нас на Лёзненшчыне, сёння мы можам толькі здагадвацца. Зараз Добрынскі манетна-рэчавы скарб зберагаецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і яго можа пабачыць любы з наведвальнікаў



*Шыйная грыўна ( IX ст.)*



*Арабскія дырхемы ( IX ст.)*

У Полацку **ў XIII стагоддзі** са згоды веча стаў княжыць **Усяслаў Чарадзей**, князь Віцебскі. Пры ім адбылася бітва з кіеўскімі князямі на Нямізе ў **1067 годзе**. Адчуваючы няўпэўненасць свайго палажэння, ён уступае ў саюз са смаленскім князем Давыдам, які ўладкоўваецца ў Віцебску. Прыйшлося яму перажыць і турму, і княжанне ў Кіеве, але праз сем месяцаў вярнуўся ў Полацк.

У пісьмовых крыніцах **XII стагоддзя** ёсць звесткі, паводле якіх землі, што ўваходзяць у сучасны Лёзненскі раён, знаходзіліся на мяжы Полацкага княства са Смаленскім.

Ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі гэтыя княствы паступова падзяліліся на больш дробныя. У прыватнасці, **з Полацкага княства выдзелілася Віцебскае, у яго ўваходзіла і Лёзненшчына.**

## 4. Лёзненшчына у межах Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага

У сярэднія вякі тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна ўваходзіла ў **Віцебскае княства** і займала яго паўночна-ўсходнюю частку.




*Фрагмент карты. Вялікае княства Літоўскае пры Гедыміне (1314 г.)*

Полацкае і Віцебскае княствы ўвайшлі ў склад ВКЛ на дабравольна – дагаворнай аснове, аб чым сведчаць прывілеі вялікіх князёў, якія зацвярджалі аўтаномны статус гэтых земель у сладзе ВКЛ. У **1320 годзе** гэтыя землі пасля смерці віцебскага князя Яраслава перайшлі да літоўскага князя Альгерда Гедымінавіча, сына вялікага князя літоўскага Гедыміна, які ажаніўся з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай, дачкой апошняга з незалежных віцебскіх князёў. У **1345 годзе Альгерд** стаў вялікім князем ВКЛ, а Віцебскае княства захавалася ў дзяржаве як уласная спадчына вялікага князя.



*Альгерд – Вялікі князь ВКЛ*



*Помнік Альгерду ў Віцебску (2015г.)*

Трэба адзначыць, што падрабязных звестак пра гісторыю нашага краю ў перыяд існавання ВКЛ не зберaглося. Толькі ў пачатку **XVI стагоддзя,** пасля далучэння Смаленскага княства да Рускай дзяржавы, калі віцебскія землі сталі пагранічнымі, у дакументах з'яўляюцца назвы валасцей Лёзненшчыны.

Доўгі час у нашым рэгіёне маёнткі не раздаваліся літоўскім феадалам, і таму феадальныя адносіны развіваліся тут марудней, чым у іншых землях ВКЛ. Насельніцтва было прыпісана да валасцей, з якіх збіралася даніна і адвозілася да вялікакняжацкага намесніка ў віцебскі замак. Валасцямі па чарзе кіравалі віцебскія баяры, толькі ў пагранічныя дасылаліся намеснікі з двара вялікага князя. Феадалы паступова забралі ў свае рукі частку сёл і валасцей, але яны пераважна жылі ў Віцебску, а са сваіх сялян збіралі даніну.

Да XV стагоддзя адпрацоўка паншчыны была выключэннем. Поўнач нашай тэрыторыі займала воласць Бруса.

Дзе знаходзіўся яе цэнтр, дакладна таксама невядома, таму што да нашых дзён вёска з такой назвай не захавалася.



*Мікулінская царква. Фотаздымак 2012 г.*

Усход – Мікулінская воласць (цэнтр вёска Мікуліна, цяпер у Смаленскай вобласці). Упамінаецца ў дакументах **сяло Выдрэя**, якое належала да гаспадарскай (дзяржаўнай воласці) з цэнтрам у Любашкаве (цяпер у Віцебскім раёне). Апрача дзяржаўных уладанняў, была тут і баярская маёмасць. На захадзе Лёзненскага раёна на стыку Стасеўскага і Крынкаўскага сельсаветаў ляжаць землі, якія ў пачатку XVI стагоддзя належалі віцебскім баярам, братам Аліферу, Пятру і Юрыю. Збярогся дакумент **1527 года** падзелу гэтых зямель паміж іх сынамі – Рыгорам, Цімафеем і Федкам Аліфёравічамі, Мацкам і Ігнатам Пятровічамі, Сенькам і Барысам Юр'евічамі. Братам Пятровічам і Юр'евічам адышоў маёнтак Хоцемля, а Аліфёравічам Лашнеўская зямля і Забалацце, дзе пазней узнік маёнтак Пагосцішча.

Далейшы лёс Пятровічаў і Юр'евічаў дакладна не прасочваецца (пазней Хоцемляй валодалі баяры Гуркі - Рамейкі), а нашчадкі Аліферавічаў, шляхцічы Пагосцкія, валодалі сваім маёнткам яшчэ і ў XVII стагоддзі.

***Пытанні і заданні:***

*1. У склад якога старажытнага княства ўваходзіла Лёзненшчына?*
*2. Дзе праходзіў шлях "з варагаў у грэкі"? Знайдзі яго на карце.*
*3. Падумай, якім чынам Добрынскі скарб мог трапіць да нас?*
*4. Які князь ВКЛ валодаў Лёзненшчынай?*
*5. Дзе знаходзілася воласць Бруса?*
*6. Каму належалі нашы землі ў пачатку XVI стагоддзя?*

## §7. Знакаміты род Агінскіх – уладальнік нашых земель у Рэчы Паспалітай

### *1. Лёзненшчына пад час існавання Рэчы Паспалітай*

Рэч Паспалітая, што ў перакладзе з польскай мовы азначае “рэспубліка”, утварылася ў **1569 годзе** ў выніку заключэння Люблінскай уніі. Гэта дзяржава ўяўляла сабой саюз ВКЛ і Польскага каралеўства.



*Жыгімонт Аўгуст II*

На Люблінскім сойме польскай шляхце ўдалося дабіцца ад караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста значных тэрытарыяльных уступак, што значна ўскладніла становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Шэраг найбагацейшых зямель ВКЛ быў уключаны ў склад Польшчы, у выніку чаго тэрыторыя ВКЛ значна зменшылася. ВКЛ вымушана было прыняць многія з польскіх умоў аб’яднання дзвюх дзяржаў, але яно змагло захаваць сваю самастойнасць. У складзе гэтай шляхецкай шматнацыянальнай дзяржавы ВКЛ існавала да канца XVIII стагоддзя.

Пагранічныя землі Лёзненшчыны ў ВКЛ належалі віцебскім баярам. Яны часта пераходзілі ад адных уладароў да другіх рознымі шляхамі: перадачай у спадчыну сынам; у якасці пасагу пры замужжы; продажам з адных рук у другія. На працягу трох стагоддзяў мястэчкам Лёзна валодалі князі Агінскія.

Самым першым уладальнікам Лёзна з’яўляецца той самы князь Багдан, які ўзяў шляхецкае прозвішча – Агінскі (ад маёнтка Агінты).

У 1555 годзе Мікулінская пагранічная воласць, у якую ўваходзіла наша Лёзна, была падаравана каралём Жыгімонтам пану Рыгору Валовічу, старасту Мерацкаму, а з 1573 года – ваяводу Смаленскаму. Дачка яго Раіна (Рэгіна) Валовіч выйшла замуж за Багдана Мацвеевіча Агінскага і ўнесла Мікуліна ў род князёў Агінскіх як пасаг.



*Уладзіслаў Валовіч*



*Герб роду Валовічаў*

Яго сын, Самуэл Багданавіч Агінскі, пры падзеле бацькоўскіх маёнткаў у **1625 годзе** атрымаў Мікуліна і Лёзна. Пасля смерці Самуэла Багданавіча ў 1657 годзе адбыўся падзел уладанняў паміж яго сынамі. Старэйшы Шыман-Караль Агінскі атрымаў Лёзна, малодшы Ян – Мікуліна. Шыман-Караль, ваявода Мсціслаўскі, валодаў Лёзнам да 1699 года.

Пасля яго смерці мястэчка было падзелена паміж яго сынамі: Багуславам (каля 1665-1730 гг.), Марцыянам-Міхайлам (1672-1750 гг.) і Аляксандрам (каля 1675-1709 гг.). Мы бачым, што ў той далёкі час Лёзна і яго ваколіцы належалі магнацкаму **роду Агінскіх**, якія ва Усходняй Беларусі валодалі шматлікімі маёнткамі.



*Карта . Межы Рэчы Паспалітай (1648 г.)*

Бабінавічы ўпамінаюцца як каралеўскае ўладанне, якое ў XVII – XVIII стагоддзях перадавалася польскімі каралямі сваім падданым.

Больш падрабязных звестак пра Лёзненшчыну ў архівах пад час існавання Рэчы Паспалітай няма.

У XVII стагоддзі – пачатку XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая (у тым ліку і Беларусь) апынулася ў глыбокім эканамічным і палітычным заняпадзе.

У канцы XVIII стагоддзя ў выніку трох Падзелаў Рэчы Паспалітай **(I – 1772 год; II – 1793 год; III – 1795 год)** паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй усе беларускія землі поўнасцю ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

## 2. *Агінскія – старадаўні магнацкі род*

Прадстаўнікі роду Агінскіх на працягу некалькіх стагоддзяў адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі.

Імёны дзяржаўных дзеячаў, ваяроў, мецэнатаў, музыкантаў, што паходзілі з гэтага роду, складаюць гонар і славу Беларусі. Знакаміты род Агінскіх меў свой уласны герб **“Агінец”** або “Брама”, валодаў маёнткамі на вялікай частцы тэрыторыі Віленшчыны, Віцебшчыны і Лёзненшчыны.





*Гербы роду Агінскіх*

Сваё паходжанне Агінскія вялі ад Рурыкавічаў – уладальнікаў Казельскага княства Чарнігаўскай зямлі. Па другой версіі заснавальнікам роду быў князь Іван Глушонак, унук якога Багдан, у сярэдзіне XVI стагоддзя першым стаў ужываць больш гучнае прозвішча – Агінскі, ад назвы маёнтка Агінты, які стаў радавым гняздом Агінскіх.

Сыны Багдана Мацвей і Фёдар упершыню згадваюцца ў дакументах 1547 года як князі Агінскія з дадаткам да прозвішча з “Казельска”. У XVIII стагоддзі род Агінскіх падзяліўся на дзве галіны: старэйшую, якая ўжывала графскі тытул, малодшую – браслаўскую, якая страціла княжацкі тытул і належала да шляхты, пазней – да дваранства. Княжацкі тытул старэйшай лініі пацверджаны ў Польшчы ў 1821годзе, у Расіі – у 1868 годзе. У XIX стагоддзі князі Агінскія мелі маёнткі ў Віленскай губерні, дваране Агінскія – у Віцебскай. Спачатку Агінскія былі праваслаўнага веравызнання, а ў XVII стагоддзі прынялі каталіцтва. Сапраўдным патрыётам сваёй краіны з’яўляўся **Міхаіл Казімір Агінскі** (1730 -1800гг.) Быў гетманам, галоўнакамандуючым войскам Вялікага княства Літоўскага. Вядомы як камандзір, паэт, мецэнат. Жыў у Пецярбургу, ад імператрыцы Кацярыны II атрымаў ордэн Андрэя Першазваннага, якім узнагароджваліся асобы царскай сям’і, карыстаўся вялікай павагай у Санкт-Пецярбургу пры Двары. Лічыўся адным з кандыдатаў на польскі трон. За ўдзел у барацьбе супраць царскіх войскаў вымушаны быў выехаць за мяжу, бо яго маёнткі былі канфіскаваны прыхільнікамі расійскіх уладаў.



*Міхаіл Казімір Агінскі*

Потым вярнуўся ў Слонім, дзе ўзвёў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў оперны тэатр і капелу, атрымаўшы амністыю і маёнткі. Пасля 3-га падзелу ў 1795 годзе прынёс прысягу на вернасць Кацярыне II і апошнія гады жыцця правёў у Варшаве, дзе і памёр.

Больш непрымірымым змагаром за свабоду Айчыны быў яго сваяк **Міхаіл Клеафас Агінскі** (1765 - 1883гг.). Ён вядомы як мечнік Літоўскі (камандуючы кавалерыяй), дыпламат, пасол на сойме, інакш кажучы, дэпутат парламента, у 1793 - 1794 гадах. Заўсёды змагаўся самааддана за свабоду роднага краю. За ўдзел у паўстанні 1794 года на чале з Тадэвушам Касцюшкам на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Беларусі вымушаны быў выехаць за мяжу. Якраз тады, пакідаючы Радзіму, Агінскі напісаў паланез, дзе мінорнасць шчымлівай тугой ахоплівае сэрца слухача. Міхаіл Клеафас жыў у Вене, Венецыі, Парыжы.



*Міхаіл Клеафас Агінскі*

У 1802 годзе па амністыі вярнуўся на Бацькаўшчыну і знаходзіўся ў маёнтку Залессе. *У* 1810 г. ён атрымаў званне сенатара, чын тайнага саветніка, ордэны Святога Уладзіміра і Аляксандра Неўскага. Яму належыць **"план Агінскага"**, або праект указа аб адраджэнні ВКЛ у складзе Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губерняў, Беластоцкай вобласці і Тарнопыльскай акругі на правах аўтаноміі з насельніцтвам у восем мільёнаў чалавек.



*Знак памяці роду Агінскіх у Залессі. Смаргонскі раён*

Сталіцай аўтаноміі вызначалася Вільня. Не атрымаўшы адказу на яго план, Агінскі зноў звяртаецца да імператара Аляксандра I у той час, калі Польшча была акупіравана войскамі Напалеона Банапарта, які абяцаў палякам незалежнасць. Прапанаваў нават абвясціць сябе польскім каралём і вялікім князем, каб утварыць дзяржаву, дзе патрыятычная ідэя змагла б стварыць перашкоду захопніцкім напалеонаўскім планам.

Але яго праект адраджэння Рэчы Паспалітай быў пакладзены пад сукно. Пераканаўшыся, што цар ніколі не падтрымае ідэю ўзнаўлення княства, ён у 1823 годзе выехаў з сям'ёй у Італію. Жыў у Фларэнцыі, дзе і памёр.

## *3. Маёнткі Агінскіх на Лёзненшчыне*

Буйным землеўладальнікам, магнатам на Віцебшчыне быў **Марцыян Міхал** (1672-1750гг.) **з роду Агінскіх.** Яму належалі такія маёнткі, як Мікуліна, Веляшковічы, Лёзна, Калышкі, Усвяцкае і Бабінавіцкае стараствы.

У 1709 годзе польскі кароль даверыў яму пасаду кашталяна(камендант горада) у Віцебску. Затым князь Марцыян быў прызначаны Віцебскім ваяводам – галоўным ваенным і грамадзянскім адміністратарам горада і наваколля. Маёнткі Марцыяна Агінскага прыносілі яму вялікія прыбыткі. У ваколіцах Бабінавіч рос добры карабельны лес, які па рэках Лучоса і Дзвіна сплаўлялі ў Рыгу. Князь Марцыян штогод прадаваў вялікую колькасць "ляснога тавару", у сувязі з чым падтрымліваў цесныя кантакты з расійскімі купцамі. Ён намагаўся ператварыць некаторыя свае маёнткі ў невялікія гарады.

Так маёнтак Веляшковічы, які быў размешчаны паблізу мяжы з Расіяй, ён надумаў зрабіць горадам пад назваю **"Руская Варшава"** і ў 1718-1724 гг. выдаў спецыяльны прывілей "усім мяшчанам і рознага звання людзям". Паводле гэтага дакумента кожны, хто жадаў бы пасяліцца ў новым горадзе, на 12 год вызваляўся ад усялякіх падаткаў і набываў права бязмытнага гандлю любым таварам. Аналагічны прывілей тычыўся і "новазаснаванага горада Калышкі".

Такім чынам, нашы **Веляшковічы і Калышкі** ў канцы Паўночнай вайны, якую вёў Пётр І з 1700 па 1725гады лічыліся гарадамі. Працягваючы даўнюю традыцыю роду, Марцыян Агінскі ў 1720 годзе заснаваў у сваім маёнтку Мікуліна касцёл у імя св. Антонія і пры ім бернардзінскі манастыр.

Вялікую па тых часах суму ў 2000 талераў ён ахвяраваў Віцебскаму кляштару, абавязаўшы насельнікаў Веляшковічаў унесці гэтыя грошы. Бабінавічы лічыліся мястэчкам, якое належала дзяржаўнаму скарбу, а ўладальнікамі, "дзяржаўцамі", доўгі час былі прадстаўнікі роду Агінскіх.

Сярод іх **Тадэвуш Францішак Агінскі (1712-1783гг.) быў уладаром Малых Веляшковіч**.

Пры ім пачалася пабудова праваслаўнай царквы ў Лёзне, якая была закончана і асвечана ў гонар Святога Узнясення Хрыстова ў **1786 годзе** ужо пры яго сыне **Міхаіле Казіміры Агінскім** (1730 - 1800 гг.). Ён будаваў і іншыя праваслаўныя цэрквы на Лёзненшчыне.

Не маючы дзяцей, Міхаіл Казімір усю сваю маёмасць, у тым ліку і мястэчка Лёзна, перадаў у спадчыну свайму пляменніку, вядомаму кампазітару і грамадскаму дзеячу – **Міхаілу Клеафасу Агінскаму**.

Другі яго дзядзька падараваў яму маёнтак у Залессі, дзе ён і жыў. У Лёзне ён не быў, адсюль акановы дасылалі яму рэнту.



*Тадэвуш Францішак Агінскі*

Росквіт роду Агінскіх прыпадае на XVIII стагоддзе. У XIX – на пачатку XX стст. ён пачаў паступова згасаць. З далучэннем Віцебска да Расійскай імперыі ў 1772 годзе хутка прыпыніліся і сувязі, што звязвалі род Агінскіх з горадам. Нeяк непрыкметна знік з твару Віцебска і некалі славуты дом Агінскіх.



У вёсцы Адаменкі Грыбаў Віктар Пятровіч аднавіў былы панскі дом і ўстанавіў каля яго вялікі камень-валун у гонар памяці **роду Агінскіх.**

*Знак памяці роду Агінскіх у в. Адаменкі. Лёзненскі раён ( 2016г.)*

Такім чынам, Рэч Паспалітая існавала з **1569 - 1795 гады**. А краіна наша называлася ВКЛ. Як бы там ні было, а паланез Агінскага ведаюць ва ўсім свеце, і мы, лёзненцы, можам ганарыцца тым, што яго аўтар мае прамое дачыненне да нашай мясцовасці.



Нездарма ў гонар знакамітага роду Агінскіх кожны год на выпускным балі ў СШ №1 г.п. Лёзна пры ўручэнні атэстатаў аб заканчэнні школы гучыць вядомы **"Паланез Агінскага", або "Развітанне з Радзімай"**. Мы спадзяёмся, што пасля навучання ў вышэйшых установах нашы вучні вернуцца на сваю малую Радзіму.

*Уручэнне залатога медаля Шафранскай Алене.(2017г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Як называлася наша дзяржава пад час існавання Рэчы Паспалітай?*
2. *Хто такія Агінскія, што ты пра іх ведаеш?*
3. *Знайдзі на карце маёнткі Агінскіх на Лёзненшчыне.*
4. *Дзе ўстаноўлены камяні " памяці роду Агінскіх"?*

## § 8. У складзе Расійскай імперыі

### 1. *Нашы землі ў межах Магілёўскай і Віцебскай губерняў*

У другой палове XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая губляла сваю былую веліч і прыходзіла ў заняпад. Гэтым скарысталіся яе суседзі: Расія, Аўстрыя і Прусія. Яны правялі тры падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку чаго краіна перастала існаваць.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай уся Усходняя Беларусь адышла да Расіі і стала называцца **Паўночна - Заходні край**. Тут уводзілася новае адміністрацыйнае дзяленне: замест ваяводстваў і паветаў утвараліся генерал-губернатарствы. Усё насельніцтва прыводзілася да прысягі на вернасць расійскай імператрыцы Кацярыны II. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у **1772 годзе** Лёзна ўвайшло ў склад Расійскай імперыі як цэнтр воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні.

**Магілёўская губерня** Расійскай Імперыі існавала з 1772 па 1919 год.



*Герб Магілёўскай губерні*




*Фрагмент карты. Магілёўская губерня. 1792 г.*

Адміністрацыйным цэнтрам з'яўляўся горад Магілёў. Губерня ўключала Аршанскую, Магілёўскую, Мсціслаўскую і Рагачоўскую правінцыі.

У **1777 годзе** губерня была падзелена на 12 паветаў. Сярод іх ***Аршанскі, Бабінавіцкі, Сенненскі.*** Усё насельніцтва прыводзілася да прысягі на вернасць расійскай імператрыцы. Тыя, хто не жадаў гэтага рабіць, вымушаны былі выехаць за мяжу. Абсалютная большасць магнатаў і шляхты прынялі прысягу і тым самым захавалі свае маёнткі і атрымалі правы, роўныя з рускім дваранствам.

Разам з тым частка шляхты трапіла пад так званы **"разбор шляхты"** – выключэнне з дваранскага саслоўя пры непрадстаўленні дакументаў на дваранскае званне. Магнаты і шляхта страцілі свае ранейшыя правы і былі незадаволены, таму яны падтрымлівалі шляхецкія паўстанні за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. У **1778 годзе** губерня была перайменавана ў **Магілёўскае намесніцтва**, якое ў 1796 годзе было скасавана, а паветы ўвайшлі ў склад Беларускай губерні з цэнтрам у Віцебску.

**Беларуская губерня** была ўтворана **12 снежня 1796 года** па ўказу Паўла І у выніку аб' яднання зямель Полацкага і Магілёўскага наместніцтваў. Цэнтрам быў назначаны Віцебск. Пры стварэнні Беларускай губерні Бабінавіцкі, Быхаўскі, Дрысенскі, Клімавіцкі, Копыскі, Лепельскі, Суражскі ўезды былога Полацкага і Магілёўскага наместніцтваў былі скасаваны, а іх тэрыторіі перададзены суседнім уездам.



*Цар Расіі Павел І*

Затым Магілёўская губерня быа адноўлена ў **1802 годзе** у складзе ранейшых 12 паветаў, падзеленых на 39 станаў і 147 валасцей. Межавала яна на захадзе з Мінскай губерняй, на усходзе – са Смаленскай, на поўдні – з Чарнігаўскай, на поўначы – з Віцебскай губерняй. У **1840 годзе** Бабінавіцкі павет быў скасаваны і далучаны да Аршанскага. У 1861годзе Копыскі павет быў скасаваны, а яго тэрыторыя падзелена паміж паветамі Сенненскім, Аршанскім і наваствораным Горацкім, да якога таксама была далучана частка Аршанскага павета. У 1865 годдзе царскім указам 37,7 тыс. дробнай беларускай шляхты Магілёўскай губерні, т.зв. адзінадворцаў былі далучаны да сялянскага саслоўя. Былая шляхта дзялілася на 2 групы: усходнюю, у якую ў асноўным уваходзіла праваслаўная шляхта (19,5 тыс. праваслаўных і 6 тыс. католікаў, якія сяліліся над Сожжу), і заходнюю, каталіцкую (10,5 тыс. католікаў і 1,7 тыс. праваслаўных, якія сяліліся над ракой Друць). Паводле перапісу 1897 года насельніцтва Магілёўскай губерні складала 1 686 700 тысяч чалавек. Паводле саслоўнага падзелу: дваран 27,7 тысяч, духавенства 6,4 тысяч, купцоў 3,5 тысяч, мяшчан 291,8 тысяч, сялян 1351,5 тысячы.



*Карта. Беларуская губерня (1797г.)*

Паводле веравызнання: праваслаўных – 1 402,2 тысяч, старавераў - 23,3 тысяч, католікаў - 50,1 тысяч, пратэстантаў - 6,9 тысяч, іудзеяў - 203,9 тысяч, мусульман – 184 чалавек. Пісьменнага насельніцтва ў Магілёўскай губерні 16,9%, у гарадах 45%. У 1884 годдзе 2 гімназіі, 2 прагімназіі, земляробчае і рамеснае вучылішчы ў Горках, чыгуначнае ў Гомелі.

Магілёўская губерня ўваходзіла ў Магілёўскую праваслаўную і Магілёўскую каталіцкую епархіі. У канцы XIX стагоддзя налічвалася 804 праваслаўныя царквы, 6 мужчынскіх і 5 жаночых манастыроў, 30 касцёлаў, 2 лютэранскія кірхі, 29 адзінаверскіх цэркваў і стараверскіх малітоўных дамоў, 340 сінагог і яўрэйскіх малітоўных дамоў. Па тэрыторыі Магілёўскай губерні ў

канцы XIX стагоддзя праходзілі чыгункі: Маскоўска – Брэсцкая, Лібава – Роменская, Арлоўска – Віцебская, Гомельска – Бранская, пераважалі вінакурныя заводы, сяляне займаліся саматужнымі промысламі.

**Віцебская губерня** – губерня Расійскай імперыі. Створана ў **1802 годзе**, адпавядае паўночна-ўсходняй частцы сучаснай Віцебскай вобласці Беларусі, а таксама ўсходняй часткі Латвіі (у тым ліку гарады Дзвінск, Рэжыца і Люцын) і некаторым раёнам Расіі (Невель і Себеж – Пскоўская вобласць, Веліж – Смаленская вобласць).





*Герб Віцебскай губерні* *Карта. Віцебская губерня (1802 – 1924гг.)*

З верасня **1917 года** Магілёўская губерня ў складзе Заходняй вобласці, уваходзіла ў склад БНР, абвешчанай у сакавіку 1918 года, са студзеня 1919 – у БССР, з лютага - ў РСФСР. **11. 7. 1919 года** Магілёўская губерня скасавана, 9 яе паветаў увайшлі ў Гомельскую губерню, Мсціслаўскі павет перададзены Смаленскай, а Сенненскі – Віцебскай губерні.

## *2. Памешчыкі – ўладары маёнткаў на Лёзненшчыне*

Уладальнікам вёскі **Чарнаручча** быў **Эльснер Эдуард Восіпавіч**, **барон**, калежскі саветнік, лютэранін. У яго карыстанні знаходзілася 826 дзесяцін, ворыва – 60, сенажацяў – 56. Ён сам кіраваў гаспадаркай, карчма і млын давалі 300 рублёў чыстага прыбытку. Столькі ж прыносіў вінны завод.

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР захоўваецца інвентар **1849 года** з вёскі **Зачэрня памешчыка Вацлава Косава**, які дае ўяўленне пра сялянскія павіннасці, стан памешчыцкай і сялянскай гаспадарак XIX стагоддзя.





*Беларуская хата і сялянская сядзіба (вазоўня) у XIX стагоддзі*

Рабочы ўзрост у інвентары вызначаны для мужчын ад 17 да 55 гадоў, для жанчын – ад 15 да 50 гадоў, павіннасці – 3 дні на тыдзень з кожнага прыгоннага. У маёнтку сялян мужчынскага полу – 287, жаночага – 290, у тым ліку працаздольных мужчын – 195, жанчын – 144, дваровых мужчын – 13, жанчын – 7. У маёнтку сялянскіх дамоў – 83, двароў з хлевам – 59, пунь – 83, склепаў – 59, рабочых коней – 176, кароў – 269, авечак – 272, свіней – 128, на 1 двор – 12 дзесяцін ворыва. Размеркаванне зямель у памешчыка (у дзесяцінах): пад памесцем – 25, пад ворывам – 282, пад сенажацямі – 20, пад лесам – 80, пад пашай – 20, няўдобіцы – 84.





*Месца былога маёнтка Вацлава Косава ў Зачэрні (2012г.)*

Вызначаны мужчынскія ўрочныя работы (узворванне, сеянне, касьба, нарыхтоўка дроў у лесе, перавозка хлеба, капанне каналаў), жаночыя (жніво, ачыстка і апрацоўка лёну і пянькі, прадзенне), а таксама агульныя (прасушка сена, уборка бульбы, рассціланне лёну і яго падыманне). Апрача прыгонных павіннасцей, памешчык меў права прыцягваць сялян і да начной варты, кожны сялянскі двор быў абавязаны штогод плаціць подаць – 2 скрынкі прадуктаў і 1 скрынку садавіны і грыбоў.

У **1870 годзе** ад Агінскіх Лёзна перайшло да **Храпавіцкіх,** потым да гвардзейскага палкоўніка **Аляксандра Ігнатавіча Шыбекі**. Яму належалі Лёзна, Адаменкі. Зямлі тут было 7003 дзесяціны, аднаго лесу – 5341, ворыва – 120, сенажацей каля Буёўскага возера – 70 дзесяцін. Мястэчка Рудня, вёскі Красны Двор і Калонія таксама належалі яму. Братам Шыбекам належаў яшчэ сумесны маёнтак у Міхалінаве. Сялянам дазвалялася карыстацца пашамі, вадаёмамі для лоўлі рыбы, для іх былі вызначаны месцы сенажацяў, на будаўніцтва давалі гаспадарскі лес, дровы былі таксама з лесу гаспадара. За карыстанне зямлёй жыхары Лёзна памешчыку Шыбеку плацілі па 1,5 капейкі ў год за адну квадратную сажань (4м$^2$). Маёнтак Шыбекі знаходзіўся ў вёсцы Адаменкі. Чыгуначная станцыя Лёзна раней называлася – **Шыбекіна**.

Апошнім памешчыкам ў маёнтку **Адаменкі** быў **Мікалай Дзмітрыевіч Хлюсцін**, які выйграў гэты маёнтак у карты ў мінулага гаспадара. Яго лясы, сасновы бор даходзілі аж да самога мястэчка Дабрамыслі; вялізныя лугі таксама займалі вялікую тэрыторыю вакол возера Буі; ворныя землі размяшчаліся ў асноўным вакол маёнтка і пашыраліся да вёсак Альхавік і Антонькава.

У памешчыка Хлюсціна мелася больш сотні рабочых коней і 30 бегавых і выязных. Аб’язджалі бегавых коней у манежы пры маёнтку. Акрамя гэтага, было каля 150 галоў крупнага рагатага ската чорна-белай галандскай пароды і

значная атара авечак танкаруннай пароды. Хлюсцін М. Д. займаў актыўную грамадскую пазіцыю, з'яўляўся старшынёй праўлення Лёзненскага вольна - пажарнага таварыства, якое ў тыя часы налічвала 10 сябраў.



*Былы панскі маёнтак у Адаменках ( 2000г.)*



*Панскія пабудовы ў Адаменках (2016г.)*

Пры маёнтку быў разбіты велізарны фруктовы сад, малліннік, а таксама аранжарэя, дзе раслі пальмы, цытрусавыя, прыгожыя кветкі, якія ў Беларусі не растуць. Меў сваю сыраварню, псарню і 200 калод пчол. На яго працавала 50 сямей парабкаў. Жылі яны ў драўляных казармах. Плату атрымлівалі грашыма: 3 рублі ў месяц, а таксама 3 пуды ржаной мукі, 1 пуд іржаных і пярловых круп. Парабкі жылі вельмі бедна, асабліва многасямейныя.

Апошнім гаспадаром маёнтка Малькава быў **Уладзімір Карлавіч Блюм**. Да таго, як перасяліцца ў Малькава, ён жыў пераважна ў Вележы. Пасля 1917 года ў яго маёнтку размясціліся школа і сельскагаспадарчая арцель. Прыкладна ў 1925 годзе былога памешчыка і зусім выселілі з Малькава.

У пачатку 1920-х гадоў у Станіславове пражываў памешчык **Карл Дзянісавіч Віткоўскі**, які нарадзіўся ў гэтым жа маёнтку ў 1861 годзе. На той час ён знаходзіўся "у крытычным становішчы без усялякіх сродкаў да існавання", таму пажадаў выехаць у Польшчу.

Але свой замежны пашпарт Віткоўскі Карл Дзянісавіч не дачакаўся, мабыць па той прычыне, што яго выселілі ў Сібір ці Казахстан.

## *Сенатар, расійскі паэт Г. Р. Дзяржавін у нашых мясцінах*



*Сенатар, паэт Г. Р. Дзяржавін*

У пачатку лета **1800 года** вядомы рускі паэт **Гаўрыла Раманавіч Дзяржавін** па загаду цара Паўла I наведаў Лёзненшчыну. Мэтай яго афіцыйнай паездкі было высвятленне становішча сялян у беларускім краі, які параўнальна нядаўна быў далучаны – пасля падзелаў Рэчы Паспалітай – да Расіі. За некалькі месяцаў Дзяржавін дэталёва абследаваў становішча беднага люду у многіх вёсках, мястэчках і гарадах Магілёўшчыны і Віцебшчыны, у тым ліку на Лёзненшчыне. Глыбока ўразілі паэта голад, цяжкія, амаль жабрацкія ўмовы жыцця сялян вёсак, якія належалі памешчыкам **Гурку і Заранеку.**

У Лёзне ён аддаў распараджэнне раздаць памешчыцкі хлеб сялянам. Гурку і Заранеку было аб'яўлена, што калі яны не будуць дбаць пра сялян, то маёнткі іх будуць рэквізаваны. Там жа ў Лёзне Дзяржавін выявіў яшчэ адзін абуральны факт. Багатыя яўрэі незаконна трымалі вінакурны завод і спойвалі народ, забіраючы апошнія грошы. Пра гэтыя непарадкі ў Лёзне і меры па іх выкараненні было паведамлена самому Паўлу I. Генерал-пракурор дакладваў цару, што Дзяржавін Г. Р. апячатаў вінакурню, частку памешчыцкага хлеба загадаў даставіць у Суражскі магістрат, а рэшткі – раздаць жыхарам навакольных вёсак.

## *3. Прамысловасць і гандаль Лёзненшчыны ў XIX стагоддзі*

Прамысловасць у гэты час на Лёзненшчыне ў асноўным была прадстаўлена прадпрыемствамі па перапрацоўцы мясцовай сыравіны: папяровымі, запалкавымі, вінакурнымі, піваварнымі, гарбарнымі, ільнопрадзільнымі, мукамольнымі, дрэваапрацоўчымі.

У **1863 - 85 гадах у маёнтку Уна** дзейнічала першая на Беларусі запалкавая фабрыка. Належала яна Рыжскаму акцыянернаму таварыству. Вырабляла шведскія запалкі з асіны. У 1896 годзе мела паравы рухавік магутнасцю 20 конскіх сіл. Асноўны капітал складаў 80 тысяч рублёў, абсталяванне каштавала 20 тысяч рублёў. У 1885г. тут працавалі 74 чалавекі, у тым ліку 14 мужчын, 9 жанчын, 10 хлопчыкаў, 41 дзяўчынка.



*Месца былой запалкавай фабрыкі ў в. Уна*

У 1879 годзе выраблена 3 мільёны карабкоў запалак. Рабочы дзень складаў 10 гадзін, сярэдняя заработная плата – 30 - 60 капеек за дзень (120 рублёў за год).
У 1881 годзе выраблена больш за 5 мільёнаў карабкоў запалак.

Гадавыя выдаткі складалі 21 тысячу рублёў, чысты прыбытак 12 тысяч рублёў, прадукцыя фабрыкі збывалася па ўсёй Расіі.



*Карабкі шведскіх запалак*

У 1873 - 84 гадах у сядзібе Уна дзейнічала піваварнае прадпрыемства, на якім працавалі 23 рабочыя, якія ў 1879 годзе выпусцілі 40 тысяч вёдзер піва на суму 32 тысячы рублёў. У Лёзне былі 2 піваварныя заводы, у фальварку Крынкі было прадпрыемства па перапрацоўцы цукровых буракоў.

У **1860 годзе** заснавана сукнавальня ў вёсцы Чарніцы, у **1877 годзе** – дзягцярны завод у вёсцы Горбава (працавала 7 рабочых, даход 4 тысячы

рублёў). Побач з Дабрамыслямі, ў мястэчку Перамонт, у 1885 годзе працавалі вінакурны, лесапільны заводы, вадзяны млын. У Лёзне і Бабінавічах былі гарбарныя прадпрыемствы.

З **1831 года** ў Лёзне праводзіліся кірмашы, на якіх гандлявалі цукрам, кавай, чаем, футрам, фарфоравым і іншым посудам, тытунём, скурамі, іншымі гаспадарчымі таварамі, коньмі. Лёзненскія кірмашы не былі буйнымі, грашовы абарот быў не больш за 1 500 рублёў.

Гандаль у Лёзне пашырыўся пасля таго, як недалёка прайшла лінія **Рыга-Арлоўскай** чыгункі, рух па якой быў адкрыты ў **1866 - 1867 гадах**.




*Карта-схема. Першыя чыгункі Расійскай імперыі(1867г.)*

З увядзеннем чыгункі на ўскраіне Лёзна з'явілася станцыя **"Шыбекіна"** (назва ад прозвішча памешчыка Шыбекі, які даў нейкую колькасць грошай на пабудову чыгункі), да якой з Аршанскага і Горацкага паветаў, а таксама вёсак і мястэчак Смаленскай губерні везлі жыта, ячмень, авёс, лён, каноплі для адпраўкі ў Рыгу і Літву.

На станцыю везлі драўніну і вырабы з яе, у тым ліку шпалы. Адсюль іх адпраўлялі ў Віцебск, потым па Заходняй Дзвіне сплаўлялі ў Рыгу. Дровы з мясцовых лясоў па чыгунцы вывозілі ў Маскву.

Былі кірмашы яшчэ ў Бабінавічах і Замшыне, куды мясцовыя майстры прывозілі свае вырабы на продаж. З Міхайлова – лапці, кошыкі, стулы, этажэркі з лазы, з Пнёва і Гаршэва – прыгожыя сталы і шафы з дрэва. Прадаваліся на кірмашы і музычныя інструменты: скрыпкі, гармонікі, цымбалы і нават трубы і ражкі.
.



*Экспазіцыя музея.*
*Кірмаш у Лёзне. (2003г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *У межах якіх расійскіх губерній знаходзіліся нашы землі?*
2. *Якім было жыццё памешчыкаў і сялян у гэты час?*
3. *Хто такі Г. Р. Дзяржавін, і што ён рабіў у нашым краі ?*
4. *Дзе дзейнічала першая на Беларусі запалкавая фабрыка?*
5. *Чым гандлявалі на кірмашы ў Лёзне, Бабінавічах і Замшыне?*

## §9. Горад Бабінавічы – былы горад Магілёўскай губерні

### *1. З гісторыі паходжання назвы Бабінавічы*

**Бабінавічы** – сёння вёска, аграгарадок, цэнтр аднаіменнага сельсавета Лёзненскага раёна, у мінулым быў горадам, меў свой герб.






*Уезд у аграгарадок Бабінавічы (2016 г.)* *Герб вёскі Бабінавічы*

Аб паходжанні назвы Бабінавічы існуе некалькі версій:

1. Мяркуючы па назве, верагодна, што яна ад старажытнага сяла Бабіна Аршанскага старастваВКЛ, выхадцы з якога быццам заснавалі гэту вёску.
2. Бобыня (Бабыня) – дыялектныя – "надзьмуты". Назвы на - ічы часцей за ўсё ўтвораны ад дахрысціянскіх імёнаў - мянушак. Бабыня цалкам магло быць імем заснавальніка паселішча.
3. Баба – "паганскі" ідал. Тут раней было паганскае капішча, што пацвердзілі археалагічныя раскопкі.
4. Баба – дыялектнае – старое вусце ракі. У "Вопыце апісання Магілёўскай губерні 1864 года" запісана: "Мястэчка Бабінавічы ляжыць пры Зялёным возеры на скасаванні з Санкт – Пецярбургскім трактам, акружанае іглічным лесам і Вярэйскім балотам". У Зяленскае возера і цяпер упадае тры ракі, а ў старажытнасці маглі быць і старыя вусці.
5. Бабінеце – назва вакол царквы.
6. Бабінавічы дагэтуль славяцца сваім ганчарствам, таму ёсць і "ганчарныя" версіі:

а) Баба – вялікі ком гліны, падрыхтаваны як сыравіна для ганчарных вырабаў;
б) бабачнін – гліняны посуд для вялікоднага куліча.

Існуе яшчэ і легенда паходжання назвы Бабінавічы: "Даўным-даўно праз гэта мястэчка праходзіў паштовы тракт. Праязджала тут **Кацярына II**. Сустракаць яе з хлебам-соллю выйшлі адны жанчыны, бабы. І назвала імператрыца гэтае месца Бабіным горадам. Так узнікла назва – Бабінавічы."



*Царыца Расіі Кацярына II*

У Бабінавічах і каля вёскі знаходзіцца група археалагічных помнікаў розных часоў: 2-ве неалітычныя стаянкі (на беразе Бабінавіцкага возера

і на беразе ракі Вярхіта), гарадзішча, 6 магільнікаў эпохі Кіеўскай Русі і адзіночны курган, а таксама земляное ўладкаванне (абарончыя земляныя валы пэўна XVIII стагоддзя) **“Салдацкая Слабада”**, якія зараз у народзе называюць “кацярыненскі вал”. У ваколіцах вёскі каля 30 курганоў першабытнага грамадства.




*Схема абарончага вала “Салдацкая Слабада”*



*“Кацярынінскі вал”. Фотаздымак 2007г.*

## 2. *Бабінавічы – цэнтр аднаіменнага павета. Герб горада*

Бабінавічы ўпамінаюцца як каралеўскае ўладанне, якое ў XVII - XVIII стагоддзях перадавалася польскімі каралямі сваім падданым. Паводле I падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе далучаны да Расіі.

У **1777 - 1796 гадах Бабінавічы** – цэнтр Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні.

У **1778 годзе** быў зацверджаны праект планіроўкі горада, у якім прадугледжвалася перанесці Бабінавічы на другі бераг ракі Вярхіта і забудаваць у выглядзе прамавугольніка з плошчай у цэнтры. Але ён не быў ажыццёўлены. У канцы XVIII стагоддзя распрацаваны праект забудовы Бабінавіч на старым месцы, паводле якога планіроўка праводзілася ў прамавугольную сістэму і горад абкружаўся валамі і рвамі. Гэты праект ажыццёўлены часткова.



*Герб горада Бабінавічы*

У **1781 годзе** быў зацверджаны герб горада, на якім у верхняй частцы шчыта частка герба Магілёўскага: у залатым полі палова Расійскага герба, які выходзіць да паловы чорны двухгаловы імператарскі арол, увенчаны трыма каронамі. У ніжняй – **у блакітным полі 2 мачты з флюгерамі**, бо ў ваколіцах гэтага горада лясы дужа багаты мачтавымі дрэвамі.

Пасля скасавання Бабінавіцкага павета яго тэрыторыя і заштатны горад Бабінавічы былі далучаны да Аршанскага павета Магілёўскай губерні.



*Фрагмент карты. Аршанскі і Бабінавіцкі паветы  Магілёўскай губерні (1820 г.)*

У 1796 – 1802 гадах і пасля 1840 года Бабінавічы – заштатны горад у Магілёўскай губерні на тэрыторыі Дабрамыслінскай воласці Аршанскага павета. Цераз раён Бабінавічаў і ракі Лучосы ў IX – XI стст. праходзіў вядомы гандлёвы шлях у Еўропе “з варагаў у грэкі “, з Чорнага ў Балтыйскае мора.



*возера  Зяленскае (2016г.)*

У **1777 годзе** царыцы Кацярыне II быў прадстаўлены праект стварэння 11–верставога канала, які  павінен быў злучыць Арэхаўскае і Бабінавіцкае **(Зяленскае)** азёры, для таго, каб даць магчымасць вальготна праходзіць судам з Дняпра ў Заходнюю  Дзвіну.  Але праект не быў здзейснены, таму, што ў XIX стагоддзі  пачалося будаўніцтва чыгункі.

З даўніх часоў у  Бабінавічах прыватныя лесапрамыслоўцы складвалі лес, які сплаўляўся па рэках  **Лучоса** і Заходняя Дзвіна ў Рыгу.

Усе пабудовы ў горадзе былі драўляныя, насельніцтва займалася дробным гандлем, земляробствам, рамёствамі. З 1804 года праз горад праходзіў паштовы тракт з Санкт-Пецярбурга да Екацярынаслаўля з 19 паштовымі станцыямі.

Гэты паштовы гасцінец праходзіў ад паштовай станцыі Палавінкі Віцебскай губерні да станцыі ў мястэчку Добранка Чарнігаўскай губерні – усяго  335  вёрст.



*рака  Лучоса ў  Бабінавічах*

 

*“ Кацярынінскі тракт”  і  былы мост тракта . Фотаздымкі  2016 г.*

У 1806 – 1812 гадах у Бабінавічах працавала двухкласнае павятовае вучылішча, у 1808 годзе ў ім вучылася 45 дзяцей.

У дакуменце “Са справаздачы бабінавіцкага гараднічага магілёўскаму губернатару аб становішчы горада Бабінавічы ў 1841 годзе адзначана, што “знаходзіцца горад  каля возера і трох дробных ручаёў, мастоў драўляных тут – 3,  вуліц незабрукаваных – 8,  садоў асабістых – 4,  агародаў – 142,  могілак – 2 і 2 царквы,   мураваная капліца,  7 крам,  176 дамоў,  **3 сінагогі**.

 

*Месца  былой сінагогі   і    месца былога гета ў Бабінавічах. Фотаздымкі  2013г.*

Сацыяльны склад насельніцтва вельмі розны: дваран – 66, духавенства – 11, ганаровых грамадзян – 4, купцоў – 11, мяшчан-хрысціян – 627, разначынцаў – 114, адстаўных салдат з сем’ямі – 666, дваровых людзей – 42.

У **1841г.** ў Бабінавічах – **1179 жыхароў.** Фабрык, заводаў, школ і бальніц не было. Насельніцтва горада абслугоўвалі  4 партных,  2 сапожнікі, 2 кавалі і 1 гадзіннікавы майстар. У 1880 годзе  ў Бабінавічах  было 464 мужчыны і 486 жанчын,  155 дамоў, праваслаўная царква, рымска-каталіцкі касцёл, 2 яўрэйскія малітоўныя школы, 16 крам. На рубяжы XIX –XX стст. у горадзе Бабінавічы пераважалі сяляне і мяшчане – дробныя рамеснікі і гандляры,  духавенства.

У горадзе Бабінавічы існавалі толькі 2 прамысловыя прадпрыемствы, якія давалі прадукцыі  на суму 1,5 тыс. рублёў. Працавала там усяго 5 рабочых, тады як рамесных устаноў было 56,  а рамеснікаў – 100. У **1902 годзе**  ў  г. Бабінавічы з **1421** жыхара праваслаўных было 926,  католікаў - 5,  іудзеяў – 440.

***Пытанні і заданні:***

1. *Чаму Бабінавічы так названы?*
2. *У  якую губерню і павет уваходзіў горад Бабінавічы?*
3. *Растлумачце герб горада Бабінавічы.*

## §10. Вайна 1812 года ў нашых мясцінах

### 1. *Айчынная вайна 1812 года*

Ужо знаходзячыся ў межах Расійскай імперыі, насельніцтву Лёзненшчыны прыйшлося перажыць жудасную вайну з імператарам Францыі Напалеонам. Войскі якога двойчы ( пад час наступлення на Маскву і адступлення з яе) пракаціліся па нашай зямлі.



*Імператар Францыі Напалеон Банапарт*

**Напалеон абяцаў узнавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 года** ўзамен на падтрымку сваіх ваенных планаў. Перад беларусамі ўстала пытанне: **на чый бок стаць у гэтай вайне?** Далей цярпець прыгнёт расійскіх памешчыкаў? Або прыняць уладу французскага імператара, які абяцаў ім новае жыццё.

**Айчынная вайна** – гэта вайна, на якую падымаецца ўвесь народ "ад мала да вяліка".

Паспрабуем адказаць на пытанне: ці была вайна 1812 года для беларусаў, а таксама нас лёзненцаў – Айчыннай?

Прыхільнікі ідэі аднаўлення ВКЛ ва ўмовах вайны падтрымалі французскі бок. Яны віталі прыход Напалеона і паступалі на службу ў яго армію. Так, напрыклад, князь Дамінік Радзівіл выставіў за свае грошы полк уланаў. Шляхта, якая калісь прысягала на вернападданасць Расійскай імперыі, зараз ператварылася ў правадніка экзекуцый, грабяжоў, выбівання нядоімак, катавання сялян.

Адносіны простага насельніцтва да вайны адлюстроўвае наступны гістарычны анекдот. Расказваюць, што, калі Напалеон ішоў на Маскву, недзе па дарозе ён сустрэў беларускую бабу і, спыніўшы яе, пацікавіўся, што лепш: каб француз пабіў расійца ці каб расіец пабіў француза?

Баба адказала Банапарту прыкладна так: "Ды я б хацела, каб француз, заняўшы Маскву, пагнаў, пагнаў, ды і сам не вярнуўся!".

Што азначае: беларускі народ не жадае ні расійскага, ні французскага прыгнёту, а жадае вольнага жыцця на сваёй зямлі.

У пачатку вайны сялянства Беларусі з прыходам Напалеона звязвала надзею на вызваленне з-пад прыгону, аднак Напалеон не пайшоў на вызваленне беларускіх сялян. А бясконцыя рэквізіцыі (прымусовае адбіранне маёмасці і жывёлы на карысць арміі) і рабаўніцтва выклікалі масавае супраціўленне сялянства, а таксама гарадскіх жыхароў.

У такіх умовах у Беларусі разгарнуўся партызанскі рух. Асаблівую актыўнасць у барацьбе з французскімі войскамі праявілі жыхары вёскі Жарцы, што пад Полацкам. Некаторыя з іх былі ўзнагароджаны крыжамі і медалямі за гераічную барацьбу з французскімі войскамі. Такім чынам, мы бачым, што для большасці беларускага народа гэта вайна была Айчыннай.

А якой яна была для лёзненцаў?



Кіраўніцтва рускай арміяй у гэты час ажыццяўляў фельдмаршал **Міхаіл Іларыёнавіч Кутузаў**, лёс якога быў звязаны з беларускай зямлёй.

Двойчы ( у 1799 - 1800 гадах і 1809 -1811 гадах) ён быў Віленскім ваенным губернатарам. Пад яго камандаваннем пачалося выгнанне французскіх захопнікаў.

У **кастрычніку 1812 года** расійская армія прымусіла Напалеона пакінуць Маскву і адступаць па старой смаленскай дарозе.

*Кутузаў Міхаіл Іларыёнавіч*

У час адступлення французскай арміі **восенню 1812 года** баявыя дзеянні другі раз пракаціліся па беларускай зямлі ( таксама і па Лёзненшчыне).

Адначасова перайшлі ў наступленне расійскія войскі на поўначы і поўдні Беларусі. Тут адбыўся канчатковы разгром французскай арміі.




*Фрагмент карты. Адступленне арміі Напалеона з Масквы 1812г.*

Рашаючая бітва ў Беларусі адбылася пад Барысавам (каля вёскі Студзёнкі) **14-16 лістапада 1812 года**. Тут пры пераправе праз раку Бярэзіну на другі бераг трапіла ўсяго 1/10 частка “вялікай арміі” Напалеона.

Яе адступленне ператварылася ў бязладныя ўцёкі. У Смаргоні, пераапрануўшыся ў мундзір літоўскага ўлана (лёгкі коннік або вершнік), знешне падобны на французскую ваенную форму, сам Напалеон тайна пакінуў армію і ад’ехаў у Парыж. Згодна з вобразным выказваннем “Ад вялікага да смешнага – адзін крок”, якое прыпісваецца Напалеону, паход у Расію з мэтай сусветнага ўладарання абярнуўся для яго цяжкім паражэннем. Нават зараз, праз 200 год французы памятаюць пра пераправу праз Бярэзіну і ўжываюць такі выраз: **“Будзе табе Бярэзіна!”**, што значыць – правал, разгром.

## *2. Напалеон і французскія войскі на Лёзненшчыне*

Да нашых дзён захавалася данясенне Бабінавіцкага павятовага прадвадзіцеля дваранства Магілёўскаму губернатару, датаванае **5 кастрычніка 1836 года**. У ім ідзе гаворка аб баявых дзеяннях на тэрыторыі нашай мясцовасці ў перыяд Айчыннай вайны 1812 года.

Дакумент сведчыць аб тых бедах і спусташэннях, якія прынесла вайна з французамі нашым продкам. Згодна з тагачасным адмістрацыйным падзелам, мястэчка Лёзна, як і суседняе мястэчка Рудня, уваходзіла ў састаў Бабінавіцкага павету Магілёўскай губерні. Дарэчы, у названым павеце была яшчэ і вёска Рудня, якая належала памешчыку Струтынскаму.

Праз гэту вёску Напалеон рухаўся з **Бабінавічаў** далей на ўсход. І наогул, амаль уся армія Напалеона, як сведчыць данясенне, ад Віцебска і Магілёва, рухаючыся на Маскву, перайшла ўлетку 1812 года праз **Бабінавіцкі павет**.

У гэты час адбыліся невялікія бітвы. Так, непадалёку ад мястэчка Рудня, а таксама ля вёскі Малева Інкаўскага прыказу, казакі атамана Платава напалі на кватэры генерала Себесціяні. Захопнікі адбіралі маёмасць у памешчыкаў і сялян. Не толькі кароў і коней, але нават "нерагаты скот" станавіўся здабычай ворага, не гаворачы ўжо пра тканае палатно, збожжа і сена, розныя харчовыя прыпасы.



*"На біваку ў Лёзне 4 жніўня 1812 г.". Мал. Фабер-дюФор*

Кароль Неапалітанскі **Мю-рат** два тыдні прастаяў у маёнтку **Матушова** нашага краю, які належаў расійскаму падпалкоўніку Бржазоўскаму, маршал **Ней** столькі ж часу прабыў са сваім войскам у мястэчку Лёзна, гасцяваў у памешчыцы **Храпавіцкай**, якая жыла ў вёсцы Адаменкі.



*Кароль неапалттанскі Мю-рат*



*Французскі маршал Мішэль Ней*

**21 ліпеня 1812 года** ў Лёзне быў разгорнуты шпіталь, дзе лячылі французскіх салдат (300–500 хворых) ад дыярэі, якая набыла ўжо характар эпідэміі. Медыкі казалі, што гэта выклікана тым, што салдаты пілі стаячую ваду з азёраў і балот.

У рэзерўным палку 25-й пяхотнай дывізіі "Вялікай арміі" Напалеона служыў генерал-маёр, **мастак-любіцель Хрысціян Вільгельм Фабер-дю Фор**, які стварыў серыю малюнкаў **"На біваку ў Лёзне 4 жніўня 1812 года"**. Тут яскрава бачна, як французскія ваякі запасаліся харчамі: адзін цягне на вяроўцы коз, другі разам са зброяй трымае на спіне забітую гусь.

Лёзна, Адаменкі і ўсё наваколле нашага краю падвергліся разарэнню і разграбленню французскай арміі.



*"На біваку ў Лёзне 4 жніўня 1812 г.". Мал. Фабер-дюФор*




*“На біваку ў Лёзне 4 жніўня 1812 г.” Малюнкі Фабер-дюФор*

Сам імператар **Напалеон** быў у нашых мясцінах. Ён праехаў з Віцебска праз **Крынкі**, маёнтак генерала Гуркі-Рамейкі у павятовы горад **Бабінавічы**.

Вораг утварыў у павятовым горадзе сваю адміністрацыю: падпрэфектуру і павятовую камісію. Дзейнасць гэтых структур абмяжоўвалася забеспячэннем французскага войска. Вядома, што імператар Напалеон праз Бабінавічы ехаў са сваёй світай у трох аднолькавых карэтах, каб ніхто не ведаў, у якой знаходзіцца ён сам. Прыпыняўся картэж на адпачынак каля дома мешчаніна яўрэя **Залмана** ў саміх Бабінавічах, а потым накіраваўся ў Расасну каля Дняпра пад Дуброўна, куды і прыехаў першага жніўня ўвечары. Там яго світа і ён сам начавалі ў паходных палатках.

Нягледзячы на самыя суровыя карныя меры, на крывавыя расправы ваенных экспедыцый, якія насылаліся акупацыйнымі ўладамі ў вёскі, насельніцтва хавала ў лясах хлеб, жывёлу, тканае палатно і іншае, чым бы мог пажывіцца вораг. Сяляне праводзілі ўборку і абмалот зерня на полі па начах, хлеб адвозілі ў лес і ссыпалі ў ямы, выкладзеныя бяростай, ямы добра замаскіроўвалі. У лясах да позняй восені знаходзілася і сялянская жывёла, якую пасвілі па чарзе.

Звычайна, ад’язджаючыя на рэквізіцыю, ўзброеныя французскія атрады вярталіся з пустымі рукамі або зусім не вярталіся.

Так адбылося паміж **Шахамі і Выдрэяй**, дзе здаровы мужык **Карп** парэзаў французскіх салдат, якія прыйшлі грабіць мясцовае насельніцтва.

Каб скрыць сляды забойства, мужыкі закапалі марадзёраў пад сасной. Сяляне змагаліся і не аддавалі ворагу сваю маёмасць. Напалеонаўскі інтэндант горада Віцебска маркіз дэ Пастарэ прызнаваўся у сваіх запісках, што яму з вялікімі цяжкасцямі ўдавалася забяспечыць харчаваннем 12–тысячны гарнізон горада.

Жыхар Бабінавічаў, пачтмайстар **Фёдар Шостак,** спачатку пад стрэламі непрыяцеля вывез з горада казну, а пасля ў ліку валанцёраў (добраахвотнікаў), ён дапамог палкоўніку лейб-уланскага палка Медзенцаву захапіць у Бабінавічах 48 палонных.



*Сяляне супраць французскіх салдат (1812г.)*

Пасля напалеонаўскага нашэсця пачаўся паморак жывёлы, з’явіліся розныя эпідэмічныя хваробы, ад якіх амаль чацвёртая частка сялян, памешчыкаў і людзей іншых саслоўяў памерла. Калі ў 1812 годзе ў павеце налічвалася 28 906 чалавек, дык у 1826 годзе пражывала тут толькі 23 118 душ.

Такім чынам, гістарычныя факты сведчаць аб тым, што Лёзненшчына ў Айчынную вайну 1812 года была не толькі арэнай ваенных дзеянняў, але і зямлёй нашых продкаў, якія ўнеслі свой значны асабісты ўклад у разгром ненавісных захопнікаў. І яшчэ хочацца адзначыць наступнае: фельдмаршал Міхаіл Іларыёнавіч Кутузаў у вёсцы **Ордзеж** нашага раёна ўручаў узнагароды тым, хто вызначыўся ў барацьбе з французскай арміяй, абараняў сваю Айчыну.




*Узнагароды Айчыннай вайны 1812 года*

***Пытанні і заданні:***

1. *Назавіце прычыны вайны 1812 года ?*
2. *Чаму гэту вайну называюць Айчыннай ?*
3. *Дзе стаяў французскі корпус маршала Мішэля Нея?*
4. *Хто з’яўляецца аўтарам малюнкаў 4 жніўня 1812 года?*
5. *Ці быў сам імператар Напалеон Банапарт у нашых мясцінах ?*

## §11. Сляды паўстанцаў - касінераў у нашым краі

### *1. Лёзненскія сцежкі паэта - дэмакрата Аляксандра Феліксавіча Рыпінскага*

Нарадзіўся **Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі 16 сакавіка 1811 года** ў вёсцы Кукавячына Віцебскага раёна ў шляхецкай сям'і. Дзяцінства прайшло ў дзедавым маёнтку Стайкі каля Віцебска. Скончыў Віцебскую гімназію.



*А. Ф. Рыпінскі*

Вучыўся ў школе прапаршчыкаў у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс, Латвія). Там пазнаёміўся і пасябраваў з В. Кюхельбекерам, паэтам-дзекабрыстам сябрам А. С. Пушкіна, які адбываў пакаранне ў крэпасці за ўдзел у паўстанні на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу (**1825 года**) і зрабіў вялікі ўплыў на маладога падхарунжага.



*Аляксандр Рыпінскі з таварышамі*
*па Дынабургскай школе падхарунжых*

Нацыянальна-вызваленчае паўстанне **1830–1831 гадоў** у Польшчы, на Беларусі і ў Літве, якое было пад лозунгам **"За нашу і вашу свабоду",** прыняў прыхільна. Добраахвотна ўступіў у атрад інсургентаў генерала Антона Гелгуда, які вёў баі з царскімі войскамі на Віцебшчыне. Рыпінскі камандаваў ротай пяхоты, потым падраздзяленнем артылерыстаў. Шляхецкае паўстанне мела на мэце адраджэнне Рэчы Паспалітай, але расійскія войскі разграмілі яго **19 чэрвеня 1831года** пад Вільняй. Пасля паражэння паўстання ён разам з арміяй Гелгуда перайшоў прускую мяжу, а потым перабраўся ў Францыю і доўгія 28 гадоў вымушаны быў правесці ў эміграцыі.

У Францыі ён зблізіўся з філаматам **Адамам Міцкевічам,** "геніем памежных культур" (беларускай і польскай). Міцкевіч падтрымліваў шляхецкае паўстанне і нават **Эмілію Плятэр** (ураджэнку Віцебшчыны, якая пераапранулася ў адзенне юнака, сабрала і ўзначаліла атрад паўстанцаў шляхты) параўнаў яе з гераіняй французскага народа Жаннай д'Арк.



*Эмілія Плятэр*



*Эмілія Плятэр на чале войска (1831г.)*

Дарэчы, Э. Ф. Плятэр была з роду **Плятара Адама Аўгусцінавіча**, які быў самым раннім вестуном беларускай гістарычнай навукі. А. Ф. Рыпінскі чытаў у Парыжы даклады і лекцыі пра беларускія народныя песні, якія пазней дапоўніў гісторыка-літаратурнымі і этнаграфічнымі звесткамі, апісаннямі і характарыстыкамі абрадаў, выслоўяў, музычнай культуры беларусаў Віцебшчыны і выдаў асобнай кнігай, якая атрымала назву **“Беларусь” (1840год).** Ён ведаў і любіў рускую літаратуру. Яшчэ ў юнацтве пераклаў на польскую мову **“Русалку”** А. С. Пушкіна.

Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі – беларускі фальклрыст, этнограф, паэт, графік, кнігавыдавец і першы беларускі фатограф. Ён яшчэ ў **1846 годзе** зрабіў фатаграфічны здымак. І ці не першы змясціў яго ў кнізе. **Генадзь Каханоўскі**, даследчык фальклрысцкай дзейнасці А. Ф. Рыпінскага, піша: “Здаецца і фотаапарат сам сабе змайстраваў, бо ў той час іх яшчэ не выраблялі на продаж”.

Пераехаўшы ў Лондан, Аляксандр Феліксавіч заснаваў там вольную друкарню, дзе выдаў зборнікі сваіх вершаў з уласнымі ілюстрацыямі. **“Прарок” (1851г.),“ Паэзія” (1853г.), “Сяржант – філосаф” (1854г.)** і беларускую рамантычную баладу **“Нячысцік” (1853г.),** у аснову якой пакладзены фальклорныя матывы.







*Нячысцікі*

Вядома, што ў **1855-57 гадах** у сувязі з уступленнем на трон Аляксандра ІІ царскім урадам быў абвешчаны шэраг амністый, у тым ліку дзекабрыстам, петрашэўцам, удзельнікам польскага вызваленчага руху. Ураджэнец Віцебскай губерні, Аляксандр Рыпінскі таксама падаў прашэнне расійскаму імператару аб дазволе яму вярнуцца на Радзіму. Дазвол на вяртанне і стражэйшы сакрэтны надзор быў дадзены ў маі 1856 года, а вярнуўся Рыпінскі на Радзіму толькі ў

**1859 годзе,** калі прыехаў да свайго роднага брата ў Віцебскі павет, сядзібу Кукавячына, дзе за ім быў устаноўлены паліцэйскі надзор.

Пазбаўлены ўсіх чыноў і званняў, як палітычны эмігрант Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі чатыры гады пражыў у доме свайго брата, адстаўнога штабс - капітана, героя Крымскай вайны Віктара Феліксавіча Рыпінскага.

## *2. Страганы – памятная мясціна нашай мясцовасці*

Жменьку пяску ад цябе малую
Толькі з сабою вазьму я,
І цэлы свой край, Айчыну святую
Да сэрца з ёй прытулю я.
Аляксандр Рыпінскі

Дзесьці каля **1864 года** А. Ф. Рыпінскі пасяляецца на сталае жыхарства ў маёнтку **Страганы** тагачаснай Веляшковіцкай воласці, якім валодала сваячка апальнага паэта Ксаверыя Аляксандраўна Рыпінская.
У Страганах ён пражыў усё астатняе жыццё.
Тут ён актыўна займаецца даследаваннем практычна нераспрацаваных на той момант пытанняў гісторыі беларускай літаратуры, стварае біяграфіі пісьменнікаў – ураджэнцаў Беларусі, складае **першую беларускую літаратурную хрэстаматыю,** куды ўвайшлі імёны 55 пісьменнікаў.


Część II
Utwory literackie

1) Zabytek z 1812 roku. Kolędka Antoniego Hrozyki (urywek) — 67 стар.
2) Hulanka mużyckaja, tegoż Hrozyki (стар. 68—74)
3) Kazanie, tegoż 1845 roku (75—87)
4) Rabunki mużyków, Jana Barszczewskiego (з прадмовай, стар. 89—96).
5) Eneida (na iznanku); to jest przenicowana parodija (стар. 97—156), у тым ліку:
а) прадмова, 99—130
б) Wielkorosyjskie N. Osipowa, стар. 131—140
в) Małorosyjskie, I. Kotlarewskiego, стар. 141—148
г) Toż samo po Białorusku, 149—156
6) Chłopskie powinszowanie Imienin (157—164)
7) Bohdar Sawasciej. Krytyka na powstanie polskie z 1831 roku (165—180); у тым ліку:
а) прадмова (165—172)
б) Satyryczne opisanie powstania 1831 roku (173—180)
8) Dzied i Baba. Powiastka (з кароткай прадмовай) (181—190)
9) Taras. Opowiastka Konstantego Wereniczyna (191—219)
а) прадмова (стар. 192)
б) Uletsiły na Parnas, szto widziew tam Taras? (193—219)
10) Dwa djasły, tegoż autora (з кароткай прадмовай, стар. 221—242)
11) Ilnat Sliška, Fantazija, T. Miłuszewicza (з прадмовай, стар. 243—260)
12) Niaczyścik. Ballada (261—276)
Далей (гэт раздзел пад назвай «Rok 1861» (стар. 277—337), дзе змешчаны прадмова (279—286) і творы:
13) Вершы «Hołoś! Wiasna nam prypała» (стар. 287—292)
14) Arwiecieś. Akarija a karczmie pad Fałkowiczami (293—337)
Па-за межамі раздзелу «Rok 1861» астатнія змешчаны творы:
15) Żydowskij Parabak Siamion i szto jamu sluczylasia u karczmie.

*Змест другой часткі беларускай рукапіснай хрэстаматыі Рыпінскага, створанай у Страганах*

На жаль, сёння мы дакладна не ведаем пра лёс страганоўскіх рукапісаў Рыпінскага (магчыма, яны яшчэ выплывуць аднекуль). Пакуль жа навука мае ў распараджэнні толькі апісанне некалькіх рукапісных зборнікаў Рыпінскага, у якіх змешчана вялікая частка беларускіх фальклорных і літаратурна-мастацкіх твораў з прадмовамі ўкладальніка.

Поўнасцю асабісты яго архіў не захаваўся, а толькі некалькі сшыткаў, якія ў **1930-я гады** захоўваліся ў прафесара БДУ М. Піятуховіча і былі апублікаваны ў **1990 г**. Захаваўся яго ранні тэкст паэмы **“Тарас на Парнасе”** з указаннем аўтарства **Канстанціна Вераніцына**. Самы ранні верш Рыпінскага запісаны на тытульным аркушы рукапіснага зборніка школьнага сябра **Гайкі з Пнёва**. У нашых Страганах ён працаваў над гісторыяй беларускай літаратуры.

Даў класіфікацыю беларускіх народных песень. Збіраў беларускі фальклор, запісваў паданні і легенды пра мясцовыя курганы, гарадзішчы і іншыя помнікі старажытнасці. Яго гасцямі былі родны брат Арцёма Вярыгі-

Дарэўскага – Сымон, які таксама пісаў працы па гісторыі Беларусі. Школьны таварыш Зянон Харышча прачытаў яму па памяці **"Энеіду навыварат"**.

Ад шляхціца Юрэвіча Рыпінскі запісаў звесткі пра **Ігната Манькоўскага**, якому некаторыя даследчыкі прыпісваюць аўтарства гэтай паэмы. У Страганы ішлі пісьмы ад польскага пісьменніка і публіцыста **Адама Плуга**, беларускага археолага, этнографа і краязнаўцы **Яўстафія Тышкевіча.** З тых жа Страганоў А. Рыпінскі пісаў А. Плугу: " Скляпаў ужо збольшага біяграфіі Баршчэўскага, Князьніна, Лускіны Юзафа, Рысінскага Францішака, Шыдлоўскага Ігната і **Заблоцкага Тадэвуша,** а колькі ж гэта яшчэ (не дачакаліся) ні слова".



*Тадэвуш Лада-Заблоцкі*

Імя **Тадэвуша Гілярыевіча Лады – Заблоцкага** ў свой час было даволі папулярным. Пры вывучэнні ў архіве матэрыялаў жыцця А. Рыпінскага стаў вядомы факт куплі Ксаверыяй Аляксандраўнай Рыпінскай фальварка Страганы ва ўдавы апальнага паэта Ганны Іванаўны Заблоцкай. Гыта падказвае нам, што паэт хутчэй за ўсё там бываў, а значыць, мае пэўнае дачыненне і да духоўнай культуры Лёзненшчыны. Не выключана, што ў Страганы ішлі ад яго пісьмы з каўказскай ссылкі. На жаль, рукапіс **"Гісторыі беларускай літаратуры"** Аляксандра Рыпінскага згублены, бо з яго ўсё пачыналася. Усё жыццё ён актыўна займаўся літаратурнай працай. Наведаў бліжэйшыя мястэчкі нашага краю: Лёзна, вёскі Кавалі, Глоданкі, Веляшковічы, Пнёва, а таксама Віцебск і Янавічы. Дакладна невядомы год смерці і месца пахавання А. Рыпінскага. Хутчэй за ўсё, гэта адбылося не раней за 1886 год і **не пазней за 1890 год**.



*Былая панская сажалка ў Страганах (2004г.)*

Пасля смерці Рыпінскага бібліятэка і асабісты архіў яго былі расцягнуты па хатах. На месцы, дзе стаяў дом, засталіся толькі сляды падмурка, старыя паркавыя дрэвы і былая панская сажалка (дно якой як быццам выкладзена кафляй). На мясцовых могілках магіла А. Ф. Рыпінскага не знойдзена. У Страганах, на месцы былой сядзібы, у якой жыў А. Ф. Рыпінскі, у **2009 годзе**. быў устаноўлены памятны камень.



*Памятны камень Рыпінскаму ў Страганах. (2009 г.)*

Хацелася б, каб заўсёды над мясцінамі, дзе некалі жыў А. Ф. Рыпінскі, гучаў спрадвечны спеў, лілася музыка баянаў. Каб чыстыя, як крыніцы, вочы "слёзных" людзей, добрых і шчырых спрадвеку, свяціліся моцнымі промнямі незвычайнага блакіту, верай у сябе, сваю будучыню.

## 3. *Паўстанне 1863 года на Беларусі*



Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Еўропе на рубяжы 50 – 60-х гадоў не мінуў Польшчы, а таксама закрануў і тэрыторыю Беларусі. Выспяванне паўстання было звязана з абставінамі развіцця Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя. Сялянства ў сваёй большасці было не задаволена ўмовамі адмены прыгоннага права. Маніфест і “Палажэнні” якога былі падпісаны **19 лютага 1861года царом “Вызваліцелем” – Аляксандрам II**. *Сялянская рэформа 1861 года*



Масавы ўдзел у паўстанні ўзяла на сябе шляхта, якая дамагалася аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Найбольш рашуча настроеная частка шляхты ажыццяўленне сваіх мэт звязвала з падрыхтоўкай і правядзеннем узброенага паўстання супраць царскіх улад пры падтрымцы сялян, іх называлі **інсургентамі.** Прыхільнікаў такой тактыкі дзеянняў называлі **“чырвонымі”**.

*Паўстанцы-касінеры (інсургенты)(1863г.)*

Прыхільнікаў тактыкі дзеянняў дасягнуцьназванай мэты мірным шляхам без удзелу сялянства называлі **“белымі”**. Кіраўніком “чырвонай” плыні шляхецкіх рэвалюцыянераў у Беларусі стаў **Канстанцін (Кастусь) Вікенцій Каліноўскі (1838–1864гг.)**. Ён наш нацыянальны герой, правадыр паўстання **1863–1864 гадоў**. Нарадзіўся ў невялікім мястэчку Мастаўляны, што на Гродзеншчыне, у сям’і беззямельнага шляхціца. Вялікую ролю ў арганізацыі паўстання адыграла выданне з лета 1862 года К. Каліноўскім разам са сваімі паплечнікамі першай рэвалюцыйна–дэмакратычнай нелегальнай газеты ў Беларусі **“Мужыцкая праўда”**. Друкавалася яна лацінкай, выходзіла на беларускай мове ў форме адозваў, прысвечаных набалелым для сялян пытанням. Адозвы гэтыя падаваліся ад імя “Яські-гаспадара з – пад Вільні”. Гэта была вялікая падзея ў гісторыі не толькі беларускага вызваленчага руху, але і нацыянальнай культуры, мовы. “Мужыцкая праўда” прапагандавала ідэю, што ніхто не дасць вольнасці мужыкам і што мужыкі самі павінны заваяваць яе і пабудаваць новы грамадскі парадак – такі, які яны захочуць самі.

Да канца **1862года** убачылі свет і былі шырока распаўсюджаны 6 нумароў газеты. У 4-м нумары Каліноўскі сфармуляваў адзін з важнейшых прынцыпаў дэмакратыі адносна дзяржаўнага будаўніцтва: **“Не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа”**. Газета заклікала сялян да барацьбы за нацыянальную і сацыяльную волю, да вяртання бацькоўскае веры – вуніі, да вызвалення ад Маскоўшчыны з яе ненажэрным чынавенствам і абрыдлым рэкруцтвам. Сёмы апошні нумар выйшаў у пачатку **1863 года** ужо ў час паўстання.

### 4. *Разгром паўстання касінераў (інсургентаў) у Пагосцішчы*

З канца лютага 1863 года верх у ЦНК узялі “белыя” – прадстаўнікі буйных землеўласнікаў і буржуазіі. Яны ігнаравалі сацыяльна-эканамічныя задачы паўстання, катэгарычна адмаўлялі права беларусаў, украінцаў і літоўцаў на нацыянальна - палітычнае самавызнанне і дамагаліся толькі аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах **1772года**.

Першыя паўстанцкія атрады на тэрыторыі Беларусі з’явіліся толькі ў **сакавіку – красавіку 1863 года**, фарміраваліся яны з дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, сялян. Многія кіраўнікі імкнуліся прыцягнуць да паўстання як можна больш сялян, спрабавалі нават рэалізаваць аграрную праграму, аднак яны былі разбіты царскімі карнікамі на самым пачатку фарміравання. Адносны поспех спадарожнічаў першаму выступленню атрада **Людвіка Звяждоўскага**, прызначанага кіраўніком паўстанцкіх сіл у Магілёўскай губерні. З дапамогай студэнтаў Горы - Горацкага земляробчага інстытута яму ў ноч з **23 на 24 красавіка 1863 года** ўдалося захапіць павятовы горад **Горкі**.



*Горы - Горацкі земляробчы інстытут*



*Людвік Звяждоўскі*

Аднак мясцовыя сяляне не падтрымалі паўстанцаў, і атрад Звяждоўскага быў разбіты. У многіх месцах Магілёўскай і Віцебскай губерняў сяляне дапамагалі карнікам нават лавіць паўстанцаў і грамілі маёнткі польскіх памешчыкаў. Кастусь Каліноўскі меў намер распаўсюдзіць паўстанне на прыбалтыйскія губерні. Для гэтага прадугледжвалася стварэнне новых атрадаў. На падмогу Людвіку Звяждоўскаму з Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры **Ігнат Будзіловіч**, К. Жаброўскі і іншыя з мэтай распаўсюджвання паўстання на Смаленск і Маскву.

Паўстанцкі атрад **Ігната Мартынавіча Будзіловіча** быў створаны ў **красавіку 1863 года** і павінен быў аб’яднацца з атрадам яго сябра Людовіка Звяждоўскага, але гэтага не адбылося. Тады Ігнат Будзіловіч вырашыў пайсці на Бабінавічы і Лёзна**.**

**22 красавіка 1863 года** Ігнат Будзіловіч са сваім атрадам прыбыў у фальварак да памешчыка Антона Гурка (**в. Добрына**), дзе яго ўжо чакалі каля 30 паўстанцаў. Ведаючы пра тое, што ў яго бок накіравана царскае войска, ён прымае тактыку партызанскай барацьбы. Атрад ішоў лесам, балотамі. Адпачыўшы ў карчме (назва якой невядома), ранкам, калі сонца яшчэ не ўстала, раззброіўшы гараднічага, палкоўніка Лісоўскага, яны ўвайшлі ў **Бабінавічы**. Атрад налічваў ужо каля 50 чалавек. Мясцовыя жыхары паведамляюць, што карнікі ўжо недалёка. Тады паўстанцы зварочваюць і ідуць у бок **вёскі**

**Ордзеж**. затым праз фальварак **А. Піора** (вёскі **Перамонт**). Сямейства Піоро актыўна іх падтрымала. Ранкам **25 красавіка** Ігнату Будзіловічу паведамілі, што ў Лёзне стаіць шмат царскіх салдат, і ён вырашае туды не ісці, а робіць яшчэ адзін пераход. Начуе ў фальварку Яцкава (**Ацкавая**), а ранкам **26 красавіка** ў колькасці 60 паўстанцаў пачае рухацца ў бок **вёскі Пагосцішча**. Тут яны планавалі сабраць звесткі пра іншыя паўстанцкія атрады.

Спыніліся яны на сядзібе гасподскага дома, але ў хуткім часе на іх напалі царскія войскі ў колькасці 90 чалавек.

Пачаўся бой, карнікі выціснулі паўстанцаў на маленькую пляцоўку паміж домам і балоцістай ракой і пайшлі ў штыкавую атаку. Вынікі былі такія: з **60** паўстанцаў забіта – **6**, а мабыць, і больш, таму што танулі ў рацэ, хаця некаторыя пераправіліся), **3** паранены і **21** узяты ў палон. Следства па справе І. М. Будзіловіча цягнулася 4 месяцы.



*Бой касінераў ( інсургентаў ). 1863г.*

**28 жніўня 1863 года** ў аршанскай гарадской турме (былы Іезуіцкі калегіум) Ігнат Будзіловіч быў расстраляны. Магчыма, там ён і пахаваны.

Жыцця агеньчык свеціць цьмяны,  
Атрад разбіты войскам ушчэнт.  
У соннай Воршы расстраляны  
Гнат Будзіловіч, інсургент.

У Беларусі ўзброеная барацьба спынілася **восенню 1863 года**, а **летам 1864 г.** была ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. Паўстанне было падаўлена. У студзені **1864 года Кастусь Каліноўскі** быў арыштаваны і **22 сакавіка 1864 года павешаны ў Вільні.**



*Барэльеф К. Каліноўскага ў Мінску*



*Помнік касінерам у Пагосцішчы (2007г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Хто такі Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі?*
2. *Дзе ішла праца Рыпінскага над першай беларускай хрэстаматыяй ?*
3. *Што ты можаш паведаміць пра свята "Баль у маёнтку Рыпінскага"?*
4. *Хто такі К. Каліноўскі? Да чаго заклікала "Мужыцкая праўда"?*
5. *Дзе ў нашай мясцовасці загінуў атрад паўстанцаў на чале з І. Будзіловічам?*
6. *Што ты ведаеш пра лёс інсургента Ігната Будзіловіча?*

## §12. Царква і адукацыя да рэвалюцыі 1917 года

### *1. Рэлігія і царква на Лёзненшчыне да Савецкай улады*

Яшчэ з першабытнага грамадства ў нашых продкаў (усходніх славян) на лёзненскай зямлі таксама было **язычніцтва (мнагабожжа**). Аб гэтым сведчаць рэчы з крывіцкіх курганоў, што клаліся побач з нябожчыкам, а таксама насыпанне курганоў, звязаных з язычніцкімі пахавальнымі абрадамі, дахрысціянскімі ўяўленнямі пра замагільнае жыццё.



*Язычніцтва ўсходніх славян*

Хрысціянства з'явілася ў нас з прыняццем яго ў Полацку. Паводле легенд, з прыняццем хрысціянства язычніцкія абрады знішчаліся, а на месцах свяцілішчаў будаваліся цэрквы або касцёлы, якія потым праваліліся пад зямлю. Адно такое месца на Лёзненшчыне – круты ўзгорак з роўнай пляцоўкай наверсе **каля вёскі Гарадок** непадалёку ад **Веляшковічаў.**

Яшчэ ў XIX стагоддзі фалькларысты запісалі тут легенду. Паводле яе, на гэтай пляцоўцы ў далёкія часы стаяла царква, якая за грахі людзей ці па іншых прычынах увайшла ў зямлю з усімі, хто маліўся там у той час. Самай першай праваслаўнай хрысціянскай царквой на Лёзненшчыне была царква **Святога Міколы**, якая згадваецца ў дакуменце з **1527 года**. Яна знаходзілася на землях, якія належалі віцебскім баярам братам Аліфёравічам. Між іншым, Рыгор Багамолец набыў для гэтай царквы славутую **Астрожскую біблію**, выдадзеную першадрукаром Іванам Фёдаравым.



*Астрожская біблія*

Гэта было прыгожае выданне з цудоўным паліграфічным выкананнем. Да нашага часу такіх Астрожскіх біблій захавалася крыху больш за 200 экземпляраў. Вядома, што адзін экземпляр ёсць у Смаленскім краязнаўчым музеі. Царква гэта была драўляная, перабудоўвалася пасля 1812 года, знаходзілася ў вёсцы Пагосцішча.

Яшчэ ў **1388 годзе** лёзненскія землі фармальна былі ўключаны ў склад навоўтворанай Віленскай каталіцкай епархіі, а пры вылучэнні ў пачатку XVI стагоддзя ў яе межах адміністрацыйных акруг аднесены да Віцебскага дэканату. Аднак толькі **XVII стагоддзі** дае сведчанне сталай прысутнасці

каталіцкага касцёла на Лёзненшчыне. У 1717 годзе адной з рэзідэнцый Ордэна стала Орша, адкуль у 1782 годзе трынітарыі прыбылі ў Бабінавічы.

Неўзабаве ў горадзе распачалася пабудова **касцёла Найсвяцейшай Троіцы (1783г.)**, які ў **1798 годзе** стаў парафіяльным. Пачала дзейнічаць парафія (каталіцкі прыход) святога Міхаіла Арханёла. У **1710 годзе** была заснавана парафія святога Антонія Падуанскага пры бернардзінскім манастыры ў мястэчку Мікулін (6 км ад Лёзна). Завольша, Станіславоў, Чарнаручча, Лёзна, Уна і Веляшковічы адносіліся да парафіі – Мікулін .

Захаваліся апісанні капліц, якія ў той час адносіліся да парафіі Бабінавічы. У маёнтку **Выдрэя** на каталіцкіх могілках – драўляная, у раманскім стылі, пабудаваная каля **1758 года** на сродкі памешчыка Піоро. У маёнтку **Кратоўша** ( на тэрыторыі сучаснага аграгарадка Крынкі) – каменная, у рымскім стылі, мела алтар з абразом Маці Божай Кальварыйскай. У маёнтку **Вішняк** – драўляная, мела алтар Маці Божай. У маёнтку **Завольша** – мураваная, мела алтар святога Уладзіслава.

Разам з заснаваннем мястэчка Лёзна ў пачатку **XVII стагоддзя** на левым беразе ракі Машна была пабудавана царква **Міраносіцы Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны** Багданам Агінскім. У **1859 годзе** яе перабудавалі і сталі ў ёй хрысціць маленькіх дзяцей, таму што яна была цёплая, драўляная.



Побач з драўлянай царквой Марыі Магдаліны знакамітым родам Агінскіх у **1786 годзе** была пабудавана яшчэ адна праваслаўная, але ўжо мураваная царква **Узнясення Гасподня**.

У страхавой ацэнцы 1910 года, якую мясцовыя краязнаўцы знайшлі ў архівах Пецярбурга, апісваецца "…царква каменная, крыжападобная, з купаламі, каменнай званіцай, 6 званоў вагай 53 пуды, вельмі трывалая, прыгожая, з арнаментамі, узорыстай кладкай сцен, вуглоў, карнізаў, з фрэскамі выяваў святых".

*Царква Узнясення Гасподня. Мал. Собалевай І. І. (2010г.)*

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў нашай мясцовасці налічвалася **16 праваслаўных храмаў**, **дзве ўніяцкія царквы – Прасвятой Багародзіцы** ў вёсцы Стасева (настаяцель І. Кладніцкі) і **Міхайлаўская** ў мястэчку Калышкі (настаяцель К. Шавельскі); **каталіцкі касцёл** у вёсцы Бабінавічы, некалькі лютэранскіх кірхаў (у "Памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1902 год упамінаецца **лютэранская абшчына** ў Лёзне) і даволі вялікая колькасць **сінагог.** Толькі ў мястэчку Калышкі, дзе большасць насельніцтва складалі яўрэі, дзейнічалі 3 сінагогі.



*Сінагога*

## 2. *Адукацыя на Лёзеншчыне да рэвалюцыі*

Яшчэ ў **1797 годзе** ў Бабінавічах была заснавана парафіяльная школа. У 1809 годзе ў ей навучалася 25 дзяцей шляхецкага саслоўя. Пры храмах у той час былі **царкоўна - прыходскія школы**, дзе галоўным прадметам быў **Закон Божжы**. На Лёзеншчыне ў канцы XIX стагоддзя было 15 царкоўна-прыхадскіх школ. Пад **1892 годам** царкоўна-прыходская школа значылася ў **вёсцы Адаменкі**, а пад **1894 годам** Нова - Бельская царкоўна-прыходская школа.



*Нова - Бельская царкоўна-прыхадская школа. (1894г.)*

У 13 вёсках былі яшчэ **школы граматы.** Навучалася ўсяго – 1000 чалавек. Самае першае народнае вучылішча на Лёзеншчыне адкрылася ў Веляшковічах у **1864 годзе,** затым у **Лёзне (1865г.)**, Высокім (1867г.), Дабрамыслях (1875г.).

У **1865 годзе** ў мястэчку Лёзна Аршанскага павета Магілёўскай воласці на Мікулінскай вуліцы (зараз Камсамольскай) было адкрыта аднакласнае народнае вучылішча. Размяшчалася яно ў народным доме. Выкладчыкамі ў ім былі настаўнік і свяшчэннік Свята-Вазнясенскай царквы. У Лёзенскім народным вучылішчы, вучылася 42 хлопчыкі і 5 дзяўчынак, адным з першых настаўнікаў быў **П. П. Кліндухоў.** У **1895 годзе** народнае вучылішча ў Лёзне было ператворана ў двухкласнае вучылішча, у якім навучалася ўжо 100 чалавек. З **1897 года** ў Бабінавічах пачала дзейнічаць **Духоўная семінарыя**.

**У 1908 годзе ў мястэчку Лёзна** на вуліцы Бабінавіцкай (зараз Гагарына) быў пабудаваны каменны будынак, куды перавялі народнае вучылішча. У ім было 6 класаў – 150 навучэнцаў. Па заканчэнні вучылішча можна было паступаць у настаўніцкую семінарыю, што і зрабілі першыя настаўнікі савецкай школы: Ратомскі Рыгор Іосіфавіч, Чарткова Ганна Тарасаўна, Котава Вера Фёдараўна.



*Школа ў Лёзне на вул. Бабінавіцкай (1908г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Назаві вераванні старажытных людзей?*
2. *Што такое праваслаўе і каталіцызм? Калі яны ўзніклі на Лёзеншчыне ?*
3. *Дзе ўзнікла самая першая праваслаўная царква і каталіцкі касцёл?*
4. *Якія культавыя храмы былі ў нашым краі да рэвалюцыі 1917 года?*
5. *Дзе былі школы і чаму там вучылі?*

## §13. *Лёзеншчына ў* **пачатку** *XX стагоддзя.*

### 1. *Аграрны край Расійскай імперыі*

На рубяжы **XIX – XX стагоддзяў** Лёзеншчына была аграрным краем Паўночна-Заходняй Расіі са шматлікімі гандлёвымі мястэчкамі.

Статус горада меў толькі населены пункт **Бабінавічы**, які знаходзіўся тады ў Магілёўскай губерні. Перамены, якія азначылі ўступленне Расіі ў перыяд імперыялізму, не маглі не адбіцца на сацыяльна-эканамічным развіцці лёзненскай зямлі. Узнікаюць новыя прамысловыя прадпрыемствы, у эканоміку пранікае замежны капітал. Пераважнае развіццё атрымалі вытворчасці, якія спецыялізаваліся на перапрацоўцы мясцовай сыравіны: ільнопрадзільная, гарбарная, дрэваапрацоўчая, цагельная, папяровая, запалкавая.

У гэты перыяд на Лёзеншчыне дзейнічаў цагельны завод **"Чарніца"**, да 1915 года ўладальнікам яго быў памешчык **Дунін**.

У маёнтку Высокае з **1902 года** пачала працаваць (замест папяровай) ільнопрадзільная фабрыка, а ў **1913 годзе** фабрыка атрымала назву **"Высачанская мануфактура"**.



*Будынак ільнопрадзільнай фабрыкі ў Высачанах (1902г.)*

Перад першай сусветнай вайной купец **Барышкін** адкупіў у памешчыка Камароўскага каля 5 тысяч дзесяцін лесу і пабудаваў у мястэчку Дабрамысль лесапільны завод, дзе пілавалі дошкі, рэйкі і адпраўлялі па чыгунцы ў Рыгу. Для гэтага была пабудавана вузкакалейка ад станцыі Выдрэя амаль да вёскі Бандоры. Умовы жыцця і працы пралетарыяту Лёзеншчыны, як і ўсёй Расіі, былі вельмі цяжкія. Так, на Высачанскай фабрыцы рабочы дзень працягваўся **12-13 гадзін.** Столькі ж працавалі і падлеткі, але атрымлівалі яны ў 3-4 разы менш, чым мужчыны. Паводле сведчання былога рабочага фабрыкі Паўла Максімавіча Сімакова: "Паўсюдна шэрым туманам стаяў пыл, які пранікаў у лёгкія. Больш 6-7 гадоў ніхто не вытрымліваў. Кожны, хто адпрацаваў гэты тэрмін, хварэў на туберкулёз". У **1904 годзе** ў горадзе Бабінавічы заработная плата абслугі была для мужчын 6-10 рублёў у месяц, для жанчын – 3–6 рублёў. Мужчына-чорнарабочы атрымліваў 40-70 капеек у дзень, жанчына – 25-45 капеек. Стан медыцынскай дапамогі насельніцтву быў нездавальняючы. Пераважала прыватная практыка. У сельскай гаспадарцы асноўны зямельны

фонд належаў памешчыкам. Уладальнік маёнтка Высокае **І. Вебер** меў 78 дзесяцін ворнай зямлі, а ўладальнік маёнтка Крынкі і Кратоўшча **А. фон Цекель** распараджаўся 338 дзесяцінамі зямлі і амаль столькі ж меў лесу.

Пан жыў у прыгожым дварцы з батанічным садам. Пры ім была збудавана цагляная пабудова ў выглядзе вежы. Тут быў манеж для вывучкі племянных коней, у якой зараз дзейнічае млын. Працягваўся працэс размежавання сялянства. Выдзяляліся заможныя сяляне, якія выраблялі прадукцыю для рынку. Моцныя гаспадары ўкаранялі перадавую тэхніку на сваіх землях, павышалі культуру земляробства.



*Былы конны манеж у Крынках (2003г.)*



*Сплаў лесу па рацэ*

У гэтым ім дапамагаў **Веляшковіцка-Кавалёўскі** земляробскі гурток у Лёзне, які ўпамінаецца ў **"Памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1909 год"**.

Збяднелыя сяляне наймаліся ў батракі або падаваліся на адыходныя промыслы, працавалі на сплаве лесу па рэках Лучоса, Дзвіна, абслугоўвалі Рыга-Арлоўскую чыгунку.

У адным з самых буйных мястэчак, Лёзне, прамысловы аб'ектаў не было, не лічачы двух млыноў, вадзянога і паравога, і ваўначоскі, уладальнікам якой быў **Руман.** Яна знаходзілася на Мікулінскай (цяпер Камсамольскай) вуліцы. На вуліцы Вакзальнай уласнік **Балад** трымаў чайную. Уладальнікам зямлі, дзе знаходзілася мястэчка, быў памешчык **Шыбека**, які жыў у сваім маёнтку ў Адаменках.



*План-схема вуліц Лёзна.(1900 г.)*

У **1901годзе** моцны пажар знішчыў вялікую частку драўлянай забудовы Лёзна. Нейкі Ілья Свердлаў запаліў па самавольству два грамадскія свірны, у якія збіралася збожжа для дапамогі сялянам. Мястэчка загарэлася пасля абеду, а да вечара **Стара-віцебская** вуліца выгарэла поўнасцю, Бабінавіцкая – да могілак, Вакзальная – да трэцяга Вакзальнага завулка.



*Лёзна ў пачатку XX стагоддзя*

## 2. *Рэвалюцыйныя падзеі ў нашым краі з 1905 па 1917 гады*

У **пачатку XX стагоддзя** ў Расіі склалася рэвалюцыйная сітуацыя. Эканамічны крызіс 1900 -1903 гадоў, руска-японская вайна 1904-1905 гг. рэзка абвастрылі ўсе класавыя супярэчнасці.

Пагаршэнне становішча прыгнечаных класаў і ў **Паўночна-Заходнім краі** спрыяла ўзмацненню іх рэвалюцыйнай актыўнасці.



*Філіпоўскі Зіновій Паўлавіч*

На Віцебшчыне ў некаторых гарадах і мястэчках былі створаны арганізацыі – Расійская Сацыял - Дэмакратычная Рабочая Партыя (**РСДРП**). На Лёзненшчыне сацыял-дэмакратычныя групы ўзніклі ў мястэчках **Крынкі і Калышкі**. Адным з актыўных удзельнікаў групы ў Калышках быў **Зіновій Паўлавіч Філіпоўскі.**

Асноўная маса рабочых на Лёзненшчыне была сканцэнтравана на Высачанскай ільнопрадзільнай фабрыцы. **22 ліпеня 1905года** на гэтай фабрыцы адбылася буйная **забастоўка** (адказ ад працы і прадстаўленне патрабаванняў да гаспадара).



*Забастоўка на фабрыцы*

Аб яе ходзе паведамляюць шматлікія данясенні ў дэпартамент паліцыі. Баставала каля 200 чалавек, у тым ліку каля 150 жанчын. Рабочыя патрабавалі павышэння заработнай платы, скарачэння рабочага часу, ветлівых адносін да людзей, вывешвання на відным месцы распарадку рабочага дня, адкрыцця прыёмнага пакоя і рускай лазні.

**Этрых**, які знаходзіўся за мяжой , вымушаны быў пайсці на ўступкі. Ён накіраваў упраўляючаму ліст з дазволам прыбавіць рабочым 10 % да жалавання і абяцаннем разгледзець усе іх скаргі пасля свайго вяртання. Але рабочыя вырашылі працягваць забастоўку, пакуль усе іх патрабаванні не будуць задаволены. Праца была аднаўлена толькі **19 жніўня**, калі быў устаноўлены 10-гадзінны рабочы дзень замест 11-гадзіннага. Сведчаннем узрослай палітычнай актыўнасці рабочых гэтай фабрыкі, іх салідарнасці з пралетарыятам усёй краіны сталі забастоўкі на прадпрыемстве ў час Кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачкі і Снежаньскага ўзброенага паўстання **1905 года**. Пад уплывам рабочага руху і бальшавіцкай агітацыі пачалі ўключацца ў рэвалюцыйную барацьбу і сяляне. Паводле ўспамінаў старажылаў, у Дабрамыслінскай воласці рэвалюцыйны рух сялян узначальвалі члены сацыял-дэмакратычнай партыі, аб'яднаныя ў гурток, якім кіраваў фельчар **Зубрыцкі**. У састаў гуртка ўваходзілі **Ігнат, Міхаіл, Іван Машковічы, Арцём Багроў, Апанас Рыжыкаў** і іншыя. Яны распаўсюджвалі сярод сялян лістоўкі, якія заклікалі да барацьбы.

Палітычную літаратуру набывалі ў Пецярбургу. У гады рэакцыі, якая настала пасля паражэння рэвалюцыі 1905-1907 гг., забастовачны рух пайшоў на спад. Многія члены сацыял-дэмакратычных груп былі арыштаваны або сасланы ў Сібір. Спыніла сваю дзейнасць група з Калышак, адзін з яе членаў З. П. Філіпоўскі быў асуджаны на катаржныя работы. У **студзені 1908 года** адбылася стачка падзённых рабочых - чыгуначнікаў станцыі **Крынкі** Рыга-Арлоўскай чыгункі. Начальніку былі пасланы дзве тэлеграмы з патрабаваннем павялічыць дзённы заробак з 45 да 50 капеек. Патрабаванне рабочых задаволена не было.

Першая Сусветная вайна значна пагоршыла становішча працоўных. Спынілі сваю дзейнасць многія прадпрыемствы: у Лёзне – 2 булачныя, у Бабінавічах – вадзяны млын і гарбарны завод. Скараціліся пасевы пшаніцы, бульбы, паменшылася колькасць працаздольнага насельніцтва.
У час вайны ў Лёзне адбылася першая **маёўка**. У яе падрыхтоўцы прымалі ўдзел **А. Котаў, Г. Ратомскі, В. Кляцкіна, Хайнсон, Файкман** і іншыя.

Ноччу, напярэдадні 1–га Мая, М. Котаў і С. Салаўёў расклеілі на вуліцах Лёзна лістоўкі, якія былі прывезены з Віцебска. Наступнае святкаванне 1- га Мая набыло больш шырокі размах. Маёўкі адбыліся ў некалькіх месцах: у лесе каля **вёскі Пунішча, у хмызняку недалёка ад вёскі Пронскае, у Дабрамыслінскім бары**.

Усе яны праходзілі пад бальшавіцкім лозунгам “Далоў імперыялістычную захопніцкую вайну!”



*Маёўка ў лесе*

Пасля лютаўскай буржуазна - дэмакратычнай рэвалюцыі **1917 года** па гарадах і мястэчках Беларусі пракацілася хваля дэманстрацый. Былі вызвалены палітзняволеныя, узята пад кантроль дзейнасць дзяржаўных устаноў. Пачалі адраджацца разгромленыя ў гады рэакцыі арганізацыі РСДРП. Так, у верасні 1917 года у Калышках пры актыўным удзеле **З. П. Філіпоўскага** была адноўлена група РСДРП(б). Яна праводзіла розныя спрэчкі, мітынгі, сходы, якія заўсёды заканчваліся спяваннем “**Інтэрнацыянала”**. Вельмі вострым заставалася сялянскае (аграрнае) пытанне. У мястэчку **Калышкі** было вельмі цяжкае становішча з харчаваннем. Хлеба не было зусім. Ад недаядання распаўсюджваліся масавыя страўнікавыя захворванні.

**Лютаўская рэвалюцыя**, у выніку якой пала самадзяржаўе, зрабіла Расію адной з самых дэмакратычных сярод дзяржаў удзельніц вайны.

**2 сакавіка 1917 года** цар **Мікалай II** адрокся ад прастола, улада перайшла да Часовага ўраду (улады капіталістаў).



*Адрачэнне ад прастолу*

.

Аднак прайшло лета 1917 года, а злабадзённыя пытанні аб міры, зямлі на Устаноўчым сходзе Часовым урадам не былі вырашаны. Новы рэвалюцыйны крызіс быў непазбежны. **25 кастрычніка 1917 года** рабочыя і па-бальшавіцку настроеныя салдаты пад кіраўніцтвам **ЦК РСДРП(б)** скінулі Часовы ўрад у Петраградзе. У гэтых падзеях прымаў удзел і наш зямляк **Г. В. Чайкоў**, які на эсмінцы "Самсон" з групай матросаў "Рэспубліка" прыбыў у Петраград. Георгій адбіваў у юнкераў Балтыйскі вакзал, масты і іншыя важныя аб'екты паўстання. Потым ён удзельнічаў у разгроме контррэвалюцыйных войскаў Керанскага – Краснова.

А **26 кастрычніка II Усерасійскі з'езд Саветаў** абвясціў савецкую ўладу ў цэнтры і на месцах, прыняў дэкрэты аб міры і зямлі і ўтварыў Часовы рабоча - сялянскі ўрад – **Савет Народных Камісараў** на чале з **Уладзімірам Ільічом Леніным**. Актыўны ўдзел у II Усерасійскім з'ездзе Саветаў прымаў і наш земляк-рэвалюцыянер **Рыўкін Рыгор Абрамавіч** (01.01. 1877 – 1922 гг.).



*Ульянаў Уладзімір Ільіч (Ленін)*



*Рыўкін Рыгор Абрамавіч*

У канцы кастрычніка – пачатку лістапада 1917 года ўлада перайшла ў рукі Саветаў у Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве.

Праз 2 тыдні пасля паўстання ў Петраградзе надзвычайны сход сялянскіх таварыстваў Аршанскага павета прыняў рэзалюцыю аб прызнанні і падтрымцы СНК, выбраў часовае бюро па сялянскіх справах, у якое ўвайшоў і прадстаўнік ад Лёзненскай і Дабрамыслінскай валасцей – **Камісараў**. Бюро стала аддзелам **Аршанскага павятовага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК).**

***Пытанні і заданні:***

1. *Што сабой ўяўляла Лёзненшчына ў пачатку XX стагоддзя?*
2. *Як называлі Высачанскую ільнопрадзільную фабрыку?*
3. *Дзе захавалася цагельная панская вежа?*
4. *Хто быў уладальнікам зямлі мястэчка Лёзна?*
5. *Што ты ведаеш пра рэвалюцыйныя падзеі ў нашым краі?*
6. *Хто такі Зіновій Паўлавіч Філіпоўскі?*
7. *Хто яшчэ з нашых землякоў прымаў удзел у рэвалюцыйных падзеях ?*
8. *Хто такі Ленін?*
9. *Куды ўвайшла Лёзненшчына пры СССР?*

## § 14. Устанаўленне ўлады Саветаў на Лёзненшчыне

### *1. Устанаўленне ўлады Саветаў у нашым краі*

Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі **1917г**. давала магчымасці для стварэння паўсюдна органаў савецкай улады і кіравання. Адным з першых у **пачатку 1918 года** быў арганізаваны Бабінавіцкі местачковы Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Валасныя органы Савецкай улады стваралiся ў студзені, лютым і сакавіку 1918 года. У сакавіку 1918 года ў Веляшковіцкай воласці яшчэ існавала земская ўправа пад кіраўніцтвам дробнага памешчыка П. Панова.



27 сакавіка 1918 года быў скліканы **Веляшковіцкі валасны з'езд**, які прыняў рэзалюцыю па бягучаму моманту, скасаваў земскую ўправу і выбраў **валасны выканаўчы Савет** сялянскіх батрацкіх дэпутатаў у складзе 12 чалавек.

*Будынак валаснога Савета ў Веляшковічах (пач. XX ст.)*

У Савеце былі створаны 4 аддзелы: кіравання, зямельны, харчовы, будаўнічы. У Высачанскую воласць з радоў Чырвонай гвардыі камісарам зямельнага аддзела быў накіраваны **П. М. Наследнікаў. 30 мая 1918 года** Наследнікаву было даручана раздаць беднякам лес, які належаў памешчыку Бонке. На дапамогу камісару прыслалі 20 чырвонаармейцаў. У памешчыцкі лес ва ўрочышча Свяцільніца прабраліся і групы ўзброеных контррэвалюцыянераў. Каля памешчыцкага маёнтка Пётр Міхайлавіч убачыў вялікі натоўп. Папрасіўшы чырвонаармейцаў застацца ў садзе, сам пайшоў наперад пагутарыць з людзьмі. У гэты час на чырвонаармейцаў накінуліся з засады контррэвалюцыянеры. Завязаўся бой, некалькі чырвонаармейцаў былі забіты, камісара Наследнікава захапілі жывым. Хутка ацаніўшы абстаноўку, ён дастаў з кішэні Дэкрэт аб зямлі і крыкнуў у натоўп: "Браты мае, вы можаце мяне забіць, але **Дэкрэт аб зямлі**, падпісаны Леніным, будзе выкананы!".



*П. М. Наследнікаў.*





*Магіла і бюст П. М. Наследнікаву ў Пагосцішчы (2008г.)*

Камісар высока падняў дакумент над галавой і пачаў заклікаць сялян на барацьбу з контррэвалюцыяй. У гэты час варожая куля абарвала яго жыццё. Моўчкі сяляне паднялі цела камісара і прынеслі ў вёску, у дом яго маці. Мясцовы свяшчэннік не дазволіў пахаваць камуніста Пятра Наследнікава на могілках у вёсцы Пагосцішча, яго пахавалі за агароджай. Не баючыся расправы, Марыя Фёдараўна Лайко высекла на надмагільнай пліце словы:

"**30 мая 1918 года** па-зверску забіты камісар земаддзела Высачанскай валасці П. М. Наследнікаў". У **1922 годзе** на магіле пастаўлены абеліск.

**11. 06. 1918 года** мясцовымі Саветамі пачалі стварацца **камбеды**, якія закліканы былі згуртаваць вакол Савецкай улады бяднейшых сялян. Стварэнне камбедаў абвастрыла класавую барацьбу і ўзмацніла сацыяльнае расслаенне ў вёсцы. Атрымаўшы зямлю, сяляне не атрымалі права свабодна распараджацца прадуктамі сваёй працы.

## *2. Барацьба за Савецкую ўладу*

**Харчразвёрстка**, якая ўваходзіла ў сферу дзейнасці камбедаў, ставіла сялянства ў апазіцыю да ўлады. Часам заможныя сяляне процістаўлялі камітэтам беднаты свае арганізацыі, якія ўхіляліся ад уліку збожжа, жывёлы. Большасць насельніцтва вёскі **Уна** былі заможныя сяляне. Пры арганізацыі камітэта беднаты яны атрымалі перамогу, што выклікала незадаволенасць сялянскай беднаты.



*Камбеды*



*Харчразвёрстка*

Заможныя сяляне, абараняючы сваю маёмасць, выступалі супраць камітэтаў беднаты, харчразвёрсткі, усіх савецкіх органаў, асоб, якія праводзілі ў жыццё мерапрыемствы Савецкай улады, уздымалі мецяжы. Кулакі з мястэчка **Дабрамыслі**, не пажадаўшы падпарадкавацца загаду аб прадастаўленні коней для Савета і для зносін з чыгуначнай станцыяй, а таксама з-за рэквізіцыі хлеба для ўзвода Чырвонай Арміі, арыштавалі ваеннага валаснога камісара таварыша **Янчыка** і пратрымалі яго суткі ў зняволенні ў лазні пад вартай.

За хуткую ліквідацыю мецяжа ў Дабрамыслях у газеце нават была надрукавана падзяка Дабрамыслінскага валаснога Савета чырвонаармейцам 2-га Савецкага палка. Нягледзячы на супраціўленне з боку заможнага сялянства, у Дабрамаслінскай, Лёзненскай, Высачанскай валасцях было арганізавана 49 камбедаў, а ў **студзені - лютым 1918 года** у Магілёўскай і Віцебскай губернях адбылося зліццё камбедаў з Саветамі. Рабата

Веляшковіцкага **валаснога Савета** праходзіла ў складаных палітычных умовах. Былі факты адсутнасці даверу да выканаўчага камітэта з боку мясцовых грамадзян, раздзяленне вёскі на 2 варожыя лагеры, пагроз узброеных асоб у адрас Савета, адсутнасці ваеннай сілы ў распараджэнні Савета. Першым старшынёй валвыканкама быў выбраны **Макар Захаравіч Шчамялёў,** матрос Балтыйскага флоту, удзельнік штурму Зімняга палаца. Пасля пераходу яго на работу ў Віцебскую губернскую надзвычайную камісію старшынёй валвыканкама быў абраны **Іван Герасімавіч Шляхценка** з вёскі Марочы. І. Г. Шляхценка з 16 гадоў працаваў настаўнікам у Віцебскім павеце, а потым стаў старшынёй валвыканкама і рашуча праводзіў канфіскацыю памешчыцкай зямлі.

Як цяжка ні было, ён заўсёды ставіў інтарэсы сялян на першы план. Былыя памешчыкі пагражалі яму расправай. У ноч з **19 па 20 ліпеня 1919 года** група ўзброеных контррэвалюцыянераў пад выглядам атрада чырвонаармейцаў, якія прыбыў у воласць на барацьбу з бандытызмам і дэзерцірствам, прыйшлі на кватэру да Шляхценкі нібыта з просьбай аказаць дапамогу ў раскватараванні. Іван Герасімавіч пайшоў у будынак валвыканкама і там быў забіты.








*І. Г. Шляхценка* *Дошка на будынку школы ў Веляшковічах (2010г.)*

Пахаваны старшыня валвыканкама быў на воінскіх могілках у вёсцы Веляшковічы. У **1966 годзе** на магіле пастаўлены абеліск, а ў **1969 годзе** на будынку Веляшковіцкай сярэдняй школы ў гонар **Івана Герасімавіча Шляхценкі** ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Валвыканкам у Веляшковічах існаваў да верасня **1918 года**. Затым ён быў распушчаны і замест яго створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт, а справы Савета перададзены камітэту беднаты. Скасаваць савецкую ўладу на Аршаншчыне першымі спрабавалі польскія легіянеры з корпуса генерала **Доўбар - Мусніцкага**, якія ўзнялі мяцеж яшчэ ў **пачатку 1918 года**.

Яны размяшчаліся ў раёне населеных пунктаў Высачаны, Крынкі, Бабінавічы і Дабрамыслі. Аршанскі ваенна–рэвалюцыйны камітэт прыняў рашэнне арганізаваць атрад Чырвонай гвардыі для адпору мяцежнікам. На адным з хутароў у палон былі захоплены некалькі польскіх афіцэраў, якія паведамілі, што іх асноўныя сілы знаходзяцца ў **Бабінавічах і Дабрамыслях.** Было вырашана тут жа выступіць у паход, каб раптоўна напасці на мяцежнікаў.

Захопленыя знянацку, яны былі раззброены і ўзяты ў палон. Палонных накіравалі пад канвоем у Оршу.

Падчас германскай інтэрвенцыі зімой 1918 года **Лёзненшчына не была акупіравана** немцамі, а ў 12 паветах Заходняй воласці праводзілася нацыяналізацыя прамысловасці (тут было нацыяналізавана 31 прамысловае прадпрыемства, у тым ліку і **Высачанская ільнопрадзільная фабрыка**).

Для аховы парадку на неакупіраванай тэрыторыі жыхары Калышак і навакольных вёсак аб’ядналіся ў **чырвонагвардзейскі атрад**, які спачатку налічваў 30 чалавек, потым вырас да 50.




Мястэчка Калышкі знаходзілася на перакрыжаванні дарог, якія вялі да Віцебска, Магілёва і Смаленска, дзе ў той час арудавалі буйныя атрады белых банд (**братоў Жыгалавых, Кыш-барона** і інш.) Гэтыя банды нападалі на мястэчкі і вёскі, забівалі партыйных і савецкіх работнікаў, грабілі насельніцтва, учынялі яўрэйскія пагромы. Бандыты ў **лістападзе 1918 года** захапілі трох самых актыўных членаў атрада: Юдкіна Якава, Штылікава Андрэя і Пчолку Нічыпара. Адвезлі ў Панізоўе і расправіліся з імі. Абязвечаныя трупы былі кінуты ў раку Каспля. Праз 2 дні чырвонаармейцы знайшлі іх і пахавалі з ушанаваннямі ў брацкай магіле ў цэнтры Калышак.






*Помнік чырвонагвардзейцам ў Калышках Стэнд у школе. Калышанскія чырвонагвардзейцы*

У час Вялікай Айчыннай вайны фашысты зняважылі гэтую магілу, зраўнялі яе з зямлёй і знішчылі помнік. Пасля вайны помнік быў адноўлены зноў. Падчас польскай інтэрвенцыі летам 1919 года ў прыфрантавой паласе ствараліся **рэўкамы**. **3 студзеня 1920 года** быў арганізаваны Калышанскі рэўкам. Яго старшынёй быў выбраны Зіновій Паўлавіч Філіпоўскі.

## *3. Першыя калгасы і саўгасы*

Першая сусветная вайна, германская і польская інтэрвенцыя прывялі да таго, што гаспадарка Беларусі была цалкам разбурана. Заходняя Беларусь апынулася па ўмовах **Рыжскага міру 1921 года** ў складзе Польшчы, а Віцебская і Магілёўская губерні былі яшчэ ў 1919 годзе перададзены ў склад Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі **(РСФСР)**.

Увядзенне **НЭПа** (новай эканамічнай палітыкі) было перш за ўсё звязана з імкненнем аднавіць разбураную вайной эканоміку. У **1921г.** было прынята рашэнне аб замене харчразвёрсткі натуральным харчпадаткам**. Харчпадатак** быў меншы і аб'яўляўся сялянам загадзя, напярэдадні сяўбы. У выніку ў селяніна з'явіліся лішкі прадуктаў, якія заставаліся пасля выплаты харчпадатку.




*Плакат .Харчпадатак*

Ён мог прадаць іх на рынку і атрымаць за гэта грошы. Павысілася матэрыяльная зацікаўленасць сялянства ў выніках сваёй працы. Гэта дазволіла поўнасцю аднавіць да **1927 года** сельскую гаспадарку. Яе асаблівасцю ў Беларусі стала павелічэнне колькасці **хутароў,** якія ўтвараліся на былых памешчыцкіх землях. У гады НЭПа праводзіўся курс на кааперavанне дробнай вытворчасці.

Так, **1 снежня 1921года** пачаў фактычную работу Віцебскі тэкстыльны трэст, у які ўвайшлі Высачанская ільнопрадзільная фабрыка **"Высачаны"** і завод **"Касцяёва"** Высачанскай воласці. У вёсцы пашыраліся спажывецкія, крэдытныя і збытавыя кааператывы, ствараліся калектыўныя гаспадаркі, аднаўляліся саўгасы. Асобую ролю ў аднаўленчы перыяд адыгрывалі сельскагаспадарчыя **камуны**, створаныя яшчэ ў 1918-1919гг., працоўныя арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца акт ад 16 мая 1922 года, у якім адзначана, што ўжо ў **1918 годзе** ў Дабрамыслінскай воласці была створана камуна **"Вішняк"**. Складалася яна з 7 сем'яў; Канстанціна Кавалёва, Міхаіла Сарокіна, Мяфодзія Гапеева, Ільі Ільюшчанкі, Міхаіла Сцепаненкі, Акуліны Голубевай і Сцепаніды Яшчынкавай. У ліпені 1919 года ў камуну ўваходзіла ўжо 15 сем'яў.

У ёй было 18 кароў, 6 коней і 12 галоў іншай жывёлы. У **кастрычніку 1924 года** камуна "Вішняк" была перададзена ў склад працоўнай земляробчай арцелі імя Вінчэўскага. У **1919 годзе** былыя батракі і сяляне вёсак Малькава і Якубаўшчына Лёзненскай воласці пад кіраўніцтвам старшыні камітэта сялянскай беднаты Івана Якаўлевіча Версана стварылі камуну на базе маёнтка **Альхімкава.**

Першымі яе членамі сталі Пётр і Захар Кукушкіны, Стафан Паўленка, Пётр Бярозка. Паводле звестак, на **май 1919 года** ў Веляшковіцкай воласці былі камуны **"Прагрэс"**, "Кавалі", "Зібяргува", "Хучэўская", у Каралёўскай воласці – "Стасева", "Хацямлянская" і "Кавалі".



*Члены Камуны "Прагрэс"(1919г.)*

У **1922 годзе** камуны "Хучэўская"і "Зібяргува", як не прыняўшыя статута і размешчаныя на хутарах, пераведзены ў таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. У сакавіку **1925 года** ў вёсцы Забалацце Крынкаўскага сельсавета арганізавана камуна **"Інтэрнацыянал"**. Яна ўтварылася ў выніку добраахвотнага зліцця некалькіх хутарскіх гаспадарак. Старшынёй быў выбраны **Карп Іванавіч Пурвін**. Зямельная плошча складала 75,5 дзесяцін, у камуне налічвалася 39 чалавек, з іх 22 - працаздольныя.

Першыя саўгасы на Лёзненшчыне былі створаны ў **1918 – 1919 гадах**.
У **лістападзе 1918 года** быў арганізаваны саўгас **"Крынкі".** У 1920 годзе ў гаспадарцы было 325 дзесяцін зямлі. Абслугоўвалі гаспадарку 17 рабочых-паляводаў, 5 жывёлаводаў, 4 тэхнічныя работнікі.

У **1919 годзе** быў арганізаваны саўгас **"Адаменкі"**. У1920 годзе ў гаспадарцы было 452 дзесяціны зямлі, 35 коней, 63 каровы, 15 авечак, 19 свіней і інш., працавала 17 рабочых і служачых.

Паводле звестак, на **31 студзеня 1922 года** на Лёзненшчыне існавалі саўгасы "Міхайлова", "Зачэрня", "Емельянова", "Завольша", "Альхімкава", "Перамонт", "Станіслава – Чарнаруччa".

У **снежні 1920 года** мэтай аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі быў распрацаваны план дзяржаўнай электрафікацыі Расіі (**ГОЭЛРО**).

На тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны 1920-х гг. было пабудавана больш за 20 электрастанцый. Першай была **БелДРЭС** каля Оршы (за 40 км ад Лёзна, зараз там знаходзіцца населены пункт Арэхаўск). Электрастанцыя працуе і зараз, у якасці паліва яна, як і раней, выкарыстоўвае торф.



*БелДРЭС. Арэхаўск*



*Экскурсія на БелДРЭС( 2003г..)*

Гурток “Мая Лёзненшчына” неаднаразова наведваў гэты гістарычны аб’ект пад час сваіх шматдзённых летніх паходаў.

Энергія, што выраблялася на электрастанцыях, выкарыстоўвалася для аднаўлення працы прамысловых прадпрыемстваў. У **1924 годзе** прамысловасць рэспублікі, якая заставалася дробнай і перапрацоўчай, перавысіла даваенны ўзровень. У **1930 годзе** ў Лёзне была пабудавана свая ГЭС на рацэ Машна, якая працавала да **1962 года**.



*ГЭС у Лёзне*



*Былая ГЭС у Лёзне (2015г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Якія органы былі ўладай Саветаў на месцах?*
2. *За што загінуў камісар земаддзела П. М. Наследнікаў?*
   *Хто такі І. Г. Шляхценка?*
3. *Чаму ў Калышках устаноўлены помнік чырвонагвардзейцам?*
4. *Назавіце першыя саўгасы нашага раёна. Калі яны ўзніклі?*
5. *Дзе на Беларусі ўзнікла першая БелДРЭС?*
6. *Што ты ведаеш пра ГЭС у Лёзне?*

## §15. Утварэнне Лёзненскага раёна

### 1. *Утварэнне Лёзненскага і Высачанскага раёнаў*

У першыя паслякастрычніцкія гады тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна была падзелена паміж Веляшковіцкай, Высачанскай, Дабрамыслінскай, Калышкаўскай, Лёзненскай і Замшынскай валасцямі, якія належалі Магілёўскай, потым Гомельскай і Віцебскай губерням і ўваходзілі некаторы час у склад РСФСР.




*Карта. Адміністратыўна – тэрытарыяльны падзел БССР 1921 -1924 гг.*

**У жніўні 1919 года** адбыліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле: Лёзненская, Высачанская і Дабрамыслінская воласці ўвайшлі ў склад Віцебскага павета Віцебскай губерні. Была прынята пастанова скасаваць гарадскі Савет заштатнага горада Бабінавічы, а замест яго стварыць **пасялковы Савет**. Паводле звестак, на **20 жніўня 1919 года** ў Веляшковіцкай воласці было 13 631, у Лёзненскай – 9 394, у Дабрамыслінскай – 10 122, у Высачанскай – 11 886 жыхароў. У Лёзне насельніцтва было 2 055, Калышках – 1 433, Бабінавічах – 1 386, Дабрамыслях – 603 чалавекі.

Дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўладкаванне БССР у гады НЭПа было звязана з далейшым вырашэннем нацыянальнага пытання.

Пачаліся пошукі і выпрацоўка канкрэтных форм аб’яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву. Сталін І. В. выступіў з ідэяй **аўтанамізацыі,** паводле якой усе савецкія рэспублікі павінны былі аб’явіць сябе састаўнымі часткамі РСФСР і ўвайсці ў яе склад.
Але гэты план не быў падтрыманы кіраўнікамі кампартый рэспублік, у тым ліку і Беларусі. У. І. Ленін прапанаваў іншую форму адзінства – **федэрацыю**, у якой на раўнапраўнай аснове аб’ядноўваліся ўсе савецкія рэспублікі.




**30 снежня 1922 года** на І-ым Усесаюзным з’ездзе Саветаў у Маскве дэлегацыя БССР на чале з Аляксандрам Чарвяковым падпісала Дэкларацыю і Дагавор аб стварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік – **СССР.** Такім чынам, БССР на раўнаправўнай аснове аб’ядналася з іншымі рэспублікамі.

*Карта СССР і яе сімвалы (герб, сцяг)*



Ленін стаў правадыром краіны СССР. Паўсюль сталі ствараць помнікі заснавальніку СССР – **Леніну.**

На станцыі **Крынкі** нашага раёна таксама быў установлены бюст Леніна. Для фінансавання праекта на агульным сходзе вырашылі выкарыстаць 30 пудоў зерня з лішкаў, што паступілі з млына за 1923 год. Да гэтых часоў невядома , хто аўтар помніка, а вядома, што ён адзін з першых помнікаў Леніну ў БССР.

*Помнік Леніну ў Крынках (2014г.)*

**17 ліпеня 1924 года** другая сесія ЦВК БССР прыняла пастанову “Аб адміністрацыйна – гаспадарчым дзяленні БССР”, адпаведна якой былі ўтвораны **Лёзненскі** і **Высачанскі** раёны ў складзе Віцебскай акругі. Лёзненскі раён быў падзелены на 10 сельсаветаў: Барсееўскі, Веляшковіцкі, Дабрамыслінскі, Сутоцкі, Замшынскі, Калышанскі, Лёзненскі, Унаўскі, Чарніцкі. Емельяноўскі.

У тым жа 1924 годзе былі перайменаваны ў раёне сельсаветы: Барсееўскі – ў Горбаўскі і Емельяноўскі – ў Глоданскі.

У **1926 годзе** былі ўтвораны Унаўскі нацыянальны **латышскі** і Калышанскі нацыянальны **яўрэйскі сельсаветы**.



*Работнікі калышанскага яўрэйскага сельсавета.(Фота1930-х г.)*

Высачанскі раён быў утвораны ў складзе Віцебскай акругі і таксама быў падзелены на 10 сельсаветаў: Асінаўскі, Бабінавіцкі, Выдрэйскі, Высачанскі, Кабыльніцкі, Каралёўскі, Касцяёўскі, Крынкаўскі, Старабабыльскі, Стасеўскі. У Высачанскі раён уваходзіла 394 вёскі і мястэчка – Бабінавічы.

Цэнтрам было сяло Высачаны, якое знаходзілася ў 5 вёрстах ад станцыі Крынкі Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі. У раёне пражывала 34 695 чалавек. 75 % насельніцтва складалі беларусы, 5% - рускія, 10% - палякі, 9% - латышы, 1% - яўрэі. Хутарская форма землякарыстання складала – 76,8%, быў толькі адзін саўгас "Крынкі". (8 ліпеня 1931 года Высачанскі раён быў ліквідаваны і ўвайшоў у склад Лёзненскага).

У **1924 і 1926 гадах** адбылося ўзбуйненне тэрыторыі БССР за кошт перадачы ёй шэрагу раёнаў Віцебскай, Гомельскай, Смаленскай губерняў. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася больш чым у два разы, а колькасць насельніцтва – амаль у тры разы і дасягнула **4,2 млн. чалавек**. Колькасць насельніцтва Лёзненскага раёна на **15. 04. 1926 года** складала **40 112** чалавек.

## 2. *Эканамічнае развіццё раёна пад час індустрыялізацыі і калектывізацыі БССР*

Асаблівасцю **індустрыялізацыі ў БССР** з'яўлялася развіццё лёгкай (перапрацоўчай) прамысловасці. Прамысловасць раёна на той час вырабляла запалкі, цэглу, віно, муку, апрацоўвала лён, скуры і лес. Хаця войны, якія пракаціліся па краіне, не прынеслі Лёзненшчыне значных разбурэнняў, усё ж свой след яны тут пакінулі. Фабрыка запалак у вёсцы Уна не працавала, бо машыны і прамысловыя памяшканні былі зруйнаваны і засталіся толькі казармы для рабочых. На заводзе "Касцяёва" паравыя машыны патрабавалі рамонту, іншае абсталяванне было зношана на 50%. Вялікую ролю ў аднаўленні народнай гаспадаркі адыгралі **кааператывы**. Арцельныя кааператыўныя таварыствы будавалі самі або бралі ў арэнду непрацуючыя прадпрыемствы і давалі ім новае жыццё.

Так, на былой фабрыцы запалак у вёсцы **Уна** пачалі працаваць сыраварны завод і млын таварыства **"Вясковы гаспадар"**.

Цагельны завод у Лёзне быў аддадзены ў **1922 годзе** ў арэнду на 4 гады за аплату 7000 штук цэглы ў год. Млыны "Дабрамыслі", "Палёнаўка", "Скугрэва" і інш. таксама былі здадзены ў арэнду.



*Сыраварны завод*



*Работнікі калышанскай патрэбкааперацыі (1920г.)*

Былі арганізаваны і арцелі па вырабу цэглы: "Барсеева", "Чарніцы", "Шостага жніўня". У Крынкаўскім с/с была створана вінаробная арцель **"Зедзь"** і арцель па перапрацоўцы садавіны **"Зедзе"**. У Высачанскім раёне была створана арцель па вырабу алею і шавецкая арцель **"Свая праца"**, у Выдрэйскім с/с кааператыўнае аб'яднанне **"Усход"** і таварыства **"Працоўная**

**іголка”**, у  Бабінавічах – прамыслова–кааператыўная арцель па вырабу посуду **“Чырвоны паліўшчык”**. Арцель **“Экспарт”**, што вырабляла смалу і шкіпінар, змагла сама ў **1929 годзе**  пабудаваць шкіпінараачышчальнік. Калі ў 1924 годзе на ільнопрадзільнай фабрыцы імя  **К. Маркса** працавала 214 рабочых, то ўжо ў 1926 годзе – 554. Адноўлены завод **“Касцяёва”** меў 5 аддзяленняў і ў **1926 годзе** перапрацаваў воўны 350, роўніцы 440, пражы 140 пудоў. Сярод першых былі адноўлены паравы млын “Палёнаўка”,  кузня ў сельскай гаспадарцы “Крынкі” і “Адаменкі” і таксама пракатная станцыя сельгасмашын, сталярная майстэрня і фабрыка хлеба. У **1926 годзе**  быў адноўлены рух маторнай дрызіны ў напрамку Дабрамыслі – Выдрэя. Пачалося будаўніцтва электрастанцыі ў Лёзне. У **1928-1929  гадах**  у  БССР быў распрацаваны першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі **(пяцігодка)**.

У сельскай гаспадарцы ішла **калектывізацыя** – аб’яднанне дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі (калгасы),  якая  пачалася з **1928 года**. На той час  яшчэ добраахвотная,  але ўжо тады аднаасобная гаспадарка не заахвочвалася, а калгасам дзяржава дапамагала эканамічна: зніжала падатак, забяспечвала збожжам, насеннем, інвентаром, будаўнічым лесам і інш. Існуючыя калектыўныя гаспадаркі павінны былі стаць прыкладам новага жыцця для астатніх сялян. У справаздачы за 1925 год адзначалася, што  **племсаўгас  “Крынкі”**, безумоўна, з’яўляецца адной з перадавых дзяржаўных гаспадарак і пачынае пацвярджаць сваё існаванне як агракультурны цэнтр. Племсаўгас  гадаваў ужо 113  галоў буйной рагатай жывёлы, праводзіў культасветніцкія мерапрыемствы, курсы па жывёлагадоўлі, паляводству, садаводству, пчалярству, якія наведвалі 80 чалавек. У гаспадарках аднаасобнікаў ураджай быў амаль удвая меншы. Істотную ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі адыгрывалі **сельгасвыстаўкі**.







*Выстава коней у Адаменках.  Пралетарскі клуб імя  Валадарскага..  Вясковы клуб (30-х г.)*

Для атрымання вопыту іх правядзення з раёна ў Маскву  накіроўваліся самыя лепшыя  работнікі  племсаўгаса “Крынкі” і саўгаса “Адаменкі”. Кожнаму з іх былі дадзены камандзіровачныя – па 800 руб. У **1924 годзе** было праведзена 9 выставак, якія выклікалі значную цікавасць  насельніцтва. За прадстаўленыя  экспанаты экспертная камісія прысуджала натуральныя прэміі: канюшыну, сепаратар, рыдлёўкі і г. д. Падобныя мерапрыемствы садзейнічалі ўзнікненню новых арцеляў,  камун. Вось звесткі пра камуну **“Інтэрнацыянал”**. Яна ўтварылася пры добраахвотным аб’яднанні некалькіх хутарскіх гаспадарак **10 сакавіка 1925 года.**  Пачатак камуне даў хутар грамадзяніна **Заліта А. П.**,

які меў 65 дзесяцін зямлі. Камунары будавалі дамы ў цэнтры, пасадзілі сад у 100 дрэў, якія перавезлі з былых сваіх хутароў.

У гэтым жа годзе напярэдадні першамайскага свята камсамольцы вёскі Малькава стварылі арцель. У гонар свята ёй далі назву **“1-е Мая”**. На гэтым сходзе быў абраны старшынёй калгаса **Сяргей Церахаў**. Пры ажыццяўленні палітыкі калектывізацыі былі забыты словы Леніна, што спрабаваць уводзіць дэкрэтамі грамадскую апрацоўку зямлі было б вялікай недарэчнасцю, што гэта задача павінна вырашацца цярпліва, шэрагам паступовых пераходаў, абуджаючы свядомасць насельніцтва. Заможным сялянам не было ніякага сэнсу ісці ў камуны, дзе і надзеі не заўжды здзяйсняліся, і абагульненне было звышагульным, і размеркаванне недакладным.

Вось што зафіксавана ў дакументах **9-й Высачанскай раённай партканферэнцыі**, якая адбывалася ў **1928 годзе**: “Высачанскі раён мае свае асаблівасці, гэта выразна заможны раён.



*Хутар*

**“Сталыпіншчына”** дала сваю спадчыну раёну ў выглядзе хутароў, якія можна ўбачыць на кожным кроку.
Гэтая амаль што 100% хутарызацыя перашкаджае ўсім мясцовым уладам у іх рабоце і, зразумела, перашкаджае асноўнай рабоце адпаведных арганізацый па калектывізацыі раёна”.

## 3. Эканамічны і сацыяльны стан раёна напярэдадні вайны

Уяўленне аб эканамічным і сацыяльным стане раёна ў пачатку 30-х гадоў дае статыстычны даведнік **” Усе раёны БССР ”**.
На **1931 год** раён меў **38** прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю працуючых 1 255 чалавек. У **1932 годзе** ужо налічвалася **91** прадпрыемства: з іх 7 дзяржаўных, 83 кааператыўных і 1 грамадскае, на якіх працавалі 1 424 чалавекі. У раёне дзейнічалі 15 сельпо, якія мелі 59 гандлёвых пунктаў. **МТС** (машына–трактарная станцыя) абслугоўвала 84 калгасы, а перад вайной 3 МТС абслугоўвалі ўсе **189 калгасаў**. Працаваў ільнозавод у Лёзне.



*Першыя МТС*



*Калектыў ільнозавода ў Лёзне (1930г.)*

У сельскай гаспадарцы расла сацыяльная напружанасць, хаця ўрад прыняў меры: стала больш дакладным размеркаванне на працадні, перасталі абагульняць хатнія рэчы, птушку і г.д. Трэць ураджаю калгас атрымаў права прадаваць на кірмашах. Не вытрымаўшы страшэннага падатковага ўціску, многія з іх кідалі гаспадарку і ішлі ў горад, іншыя вымушаны былі ісці ў калгас. У **1933 годзе** ў Лёзненскім і Высачанскім раёне было **65 %** калгаснікаў , а праз два гады стала каля **97 %**. Значна змянілася і карта раёна.

**8 ліпеня 1931 года** да Лёзненскага раёна быў далучаны ліквідаваны ў той час Высачанскі раён. **15 ліпеня 1935 года** вёска Высачаны стала рабочым пасёлкам. У **1938 годзе** Лёзненскі раён увайшоў у межы толькі што ўтворанай **Віцебскай вобласці**, тады ж Кабыльнікаўскі (Кабыльніцкі) сельсавет быў перайменаваны ў Акцябрскі (Акцябарскі).




*Сучасная карта Віцебскай вобласці*

З'явіліся ў раёне і свае **перадавікі**. За поспехі ў галіне сельскай гаспадаркі і перавыкананне паказчыкаў Усесаюзнай гаспадарчай выстаўкі ў **1940 годзе** племсаўгас **"Крынкі"** адзін з першых у рэспубліцы быў узнагароджаны ордэнам **Працоўнага Чырвонага Сцяга**.

**Ордэна Леніна** былі ўдастоены дырэктар саўгаса **Зінкевіч**, даярка **Е. Башкірава і брыгадзір І. Радзькін.**



*Дэлегацыя на с/г выставе. Масква 1939 г.*




*Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга*




*Ордэн Леніна*

Калгас **“Інтэрнацыянал”** паказаў на УСГВ групу кароў, якія давалі па 3000 кг малака. Калгас быў адзначаны прэміяй – 10 тыс. рублёў і матацыклам.

Даяркі гэтага калгаса былі ўзнагароджаны граматамі. **Перцава П. М.** – узнагароджана **граматай ЦВК БССР.** Сярэдняя заработная плата ў раёне напярэдадні вайны складала **242 рублі** ў месяц. У 11 ашчадных касах 4 132 укладчыкі на сваіх рахунках мелі за 80 000 рублёў. Гандлёвая сетка налічвала 104 крамы, 17 гандлёвых пунктаў, 11 сталовых і рэстаранаў, 2 буфеты.

Калі раней на тэрыторыі раёна была толькі адна бальніца ў мястэчку Лёзна, то на **01. 01. 1940 года** жыхароў Лёзненшчыны абслугоўвала 10 бальніц і радзільных дамоў на 175 ложкаў, 8 амбулаторый, 12 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, у якіх працавалі 12 урачоў, 3 зубныя ўрачы, 22 фельчары, 27 фельчараў – акушэрак, 27 медсясцёр.

Сваё здароўе працоўныя маглі палепшыць у 2 санаторыях, якія знаходзіліся ў вёсках **Чарніцы і Завольша.**



*Туберкулёзны дзіцячы санаторый “Чарніца” (1945г.)*

Перад Айчыннай вайной **11 389 вучняў** наведвалі 214 пачатковых, 202 няпоўных, 98 сярэдніх школ і 3 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.
У раёне было **838** радыёкропак і **55** радыёпрыёмнікаў, **7** кінатэатраў, 5 з іх гукавыя. Добрая сувязь раёна была забяспечана па чыгунцы з Віцебскам і Смаленскам.

А вось як выглядаюць гэтыя дасягненні з іншага боку.

**Вага працадня** ў раёне складала: збожжа 1,35 кг, бульбы 3,9 кг, сена 2,42 кг, грашыма 0,54 руб. Збожжа і бульбу амаль што адразу купляла дзяржава па цане ад 8 да 10 рублёў за 100 кг збожжа і 3 руб. за 100 кг бульбы ў лік выканання планаў нарыхтовак. Увесь час расла **інфляцыя( абясцэневанне грошаў)**. Перад вайной за 50 кап. можна было даслаць пісьмо ў суседнюю вёску, веласіпед каштаваў больш чым 200 рублёў, мэбля – 500 рублёў за “гарнітур”, гадзіннік – 300 рублёў. За лічбамі ўсеагульнай пісьменнасці таксама не было відаць, што страшэнны ўдар нанесены беларускай культуры, школе; краязнаўства было аб’яўлена нацыяналістычным адхіленнем.

***Пытанні і заданні:***

1. *Якія валасці былі ў нашым краі ў пачатку XX стагоддзя?*
2. *Калі быў утвораны Лёзненскі раён?*
3. *Назавіце прадпрыемствы і калгасы 20-30- х. гадоў.*
4. *Калі была ўтворана Віцебская вобласць?*
5. *Якім было становішча насельніцтва напярэдадні вайны?*

## §16. Вернутыя імёны лёзненцаў

### 1. *Савецкая грамадска-палітычная сістэма*

**Грамадска-палітычная сістэма** таго часу характарызавалася ўсталяваннем поўнага кантролю дзяржавы над усімі сферамі жыцця грамадства, існаваннем усеагульнай дзяржаўнай марксісцка–ленінскай ідэалогіі, сталінскай тэорыі аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму. Ва ўмовах, калі Савецкі Саюз застаўся адзінай сацыялістычнай краінай у свеце, органы ўлады дзейнічалі толькі адміністрацыйна – каманднымі метадамі кіравання.


*Сталін І.В. (Джугашвілі)*

З **сяр. 30-х гадоў XX ст.** умацоўваўся рэжым асабістай улады, які звязаны з узнікненнем **культу асобы Сталіна**. У гэты час пачалося ўзвялічванне ролі аднаго чалавека, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей.

У гэтых умовах Саветы, грамадскія арганізацыі, нізавыя органы самой партыі страчвалі сваю ролю.

У той жа час павялічылася роля Народнага камісарыята ўнутраных спраў (**НКУС** ), які стаў выкарыстоўвацца для распраў з тымі, чыя пазіцыя процістаяла ці не супадала са сталінскай.

Індустрыялізацыя праводзілася па прапанове Сталіна вельмі хуткімі тэмпамі пад лозунгам **“Пяцігодку – у 4 гады”.** Гэта патрабавала значных сродкаў, якія вырашана было адшукаць за кошт эканоміі, зберажэння, выкарыстання працоўнага энтузіязму, а таксама правядзення суцэльнай калектывізацыі на вёсцы.

У **1937 годзе** прынята **Канстытуцыя БССР**. У ёй быў замацаваны шэраг дэмакратычных правоў і свабод, у т.л. права выбіраць і быць выбраным у дзяржаўныя органы ўлады. Але на самой справе ва ўмовах існавання аднапартыйнай палітычнай сістэмы быць выбраным у Вярхоўны і мясцовыя Саветы працоўных дэпутатаў маглі па падрыхтаваных спісках толькі члены Камуністычнай партыі або беспартыйныя, якія падтрымлівалі палітыку адзінай існуючай партыі.

Праводзілася **культурная рэвалюцыя,** у выніку якой была ліквідавана непісьменнасць, уведзена ўсеагульнае і абавязковае пачатковае, а затым і сямігадовае навучанне. У галіне літаратуры і мастацтва ўлады праводзілі метад **сацыялістычнага рэалізму**. Згодна з ім савецкі чалавек стаў паказвацца як творца і гаспадар новага жыцця.

Адным з лепшых літаратурных твораў 1930-х гадоў стала аповесць **Якуба Коласа “Дрыгва”**, прысвечаная дзейнасці народнага героя дзеда Талаша.

Але мала хто ведае, што ў **красавіку 1936 года** Якуб Колас прыязджаў да нас у Лёзна на чытацкую канферэнцыю па сваёй аповесці. У канферэнцыі прымалі ўдзел: **Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Міхась Зарэцкі** і іншыя літаратары.



*Якуб Колас*




*Кандрат Крапіва*



*Міхась Зарэцкі*

Райгазета **"Ленінскі сцяг"** і рэспубліканская **"Звязда"** паведамлялі, што ў Лёзненскім кінатэатры (будынак былой царквы) адкрылася канферэнцыя калгаснікаў-чытачоў па кнізе "Дрыгва" Якуба Коласа. На канферэнцыі прысутнічала каля 600 чалавек. З дакладам аб творчасці Коласа выступіў дырэктар мясцовай узорнай школы **Васіль Васільевіч Вугалеў**.

Затым у будынку былой царквы Узнясення господня, прыстасаванай пад клуб адбылася першая пастаноўка твора "Дрыгва".

Ролю дзеда Талаша выканаў сам Васіль Васільевіч Вугалеў, а астатнія ролі выконвалі яго вучні.



*Вугалеў Васіль Васільевіч*




*Вокладка кнігі Якуба Коласа*

У **1936 годзе** таксама былі напісаны аповесці для дзяцей – **"Міколка-паравоз" Міхася Лынькова** і "Палескія рабінзоны " Янкі Маўра.
З **1924 па 1929 гады** праводзілася палітыка беларусізацыі (развіццё культуры Беларусі, беларускай мовы і школы). Было створана выдавецтва "Савецкая Беларусь". Адкрыліся БДУ, Інбелкульт, (БДТ-1) у Мінску.

Урад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі прысвоіў Якубу Коласу і Янку Купалу ганаровыя званні **народных паэтаў Беларусі.**

Пачалі дзейнічаць Беларускія Дзяржаўныя тэатры **(БДТ-1) у Мінску** імя Янкі Купалы, **(БДТ-2)** імя Якуба Коласа ў Віцебску і **(БДТ-3)** вандроўчы тэатр пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка.

Але тых дзеячаў культуры, якія прынялі актыўны ўдзел у рэалізацыі палітыкі беларусізацыі, абвінавацілі ў “**нацыянал-дэмакратызме**”, пад якім падразумявалася нібыта варожая савецкай уладзе дэейнасць з мэтай аднаўлення капіталістычнага ладу ў Беларусі. **У 1930 годзе** шэраг дзеячаў культуры быў асуджаны за прыналежнасць да “Саюза вызвалення Беларусі” **(СВБ)** – арганізацыі, якой у сапраўднасці ніколі не існавала. Роля кіраўніка СВБ адводзілася Янку Купалу, які пасля чарговага допыту зрабіў спробу самагубства. Самагубствам жа скончыў сваё жыццё гісторык **У. Ігнатоўскі.**



*Ігнатоўскі У.*




*Вокладка кнігі У. Ігнатоўскага*



*Янка Купала*

Наогул у рэспубліцы, як і ў СССР у цэлым, быў пабудаваны **дзяржаўны сацыялізм** – лад, пры якім забяспечваўся стабільны жыццёвы ўзровень простых людзей за кошт выкарыстання іх працоўнага энтузіязму, а таксама жорсткай вытворчай дысцыпліны.

Рэпрэсіі спалучаліся з верай людзей у правільнасць выбранага курсу і беспамылковасць палітыкі Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

## 2. *Сталінскія рэпрэсіі ў БССР*

З пераходам да фарсіраванай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, усталяваўся і пачаў умацоўвацца **дыктатарскі рэжым**. Не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы, ідэалогіі, навуцы, нават у маралі стаўка была зроблена на дыктат.

На вялікіх будоўлях **“сталінскіх пяцігодак”** пачала выкарыстоўвацца праца спецперасяленцаў, таму што пры дапамозе звычайных эканамічных метадаў было немагчыма перамясціць велізарную колькасць людзей для забеспячэння фарсіраванага выканання звышзаданняў, каб “максімум у дзесяць гадоў… прабегчы тую адлегласць, на якую мы адсталі ад перадавых краін капіталізму”. Для гэтага спатрэбіліся тэзісы аб абвастрэнні класавай барацьбы і аб масавым арганізаваным супраціўленні будаўніцтву сацыялізму.

Фарсіраванне будаўніцтва сацыялізму пры апоры на пераважна адміністрацыйныя, надзвычайныя, камандныя метады кіравання гаспадаркай і грамадствам у цэлым, адказ ад выкарыстання эканамічных метадаў з'явіліся важнай умовай рэпрэсій.

**Рэпрэсіі** – гэта неабгрунтаванае прыцягненне да крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя (г. зн. "контррэвалюцыйныя" злачынствы), а таксама высылка – накіраванне на спецпасяленне за межы БССР судовымі або пазасудовымі органамі па палітычных, сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і іншых матывах.

З **1930 года** колькасць рабочай сілы для патрэб фарсіраванай, звышнапружанай індустрыялізацыі Дзяржплан СССР пачаў узгадняць з АДПУ і НКУС.

Галоўнае ўпраўленне лагераў **(ГУЛАГ)** забяспечвала значную долю грамадскай працы. Менавіта з гэтым звязаны разнарадкі па рэгіёнах на **"ворагаў народа"** і "шкоднікаў".



*Карта ГУЛАГа*

Эканамічнае, палітычнае, духоўнае і маральнае насілле з'явілася магутнейшым бізуном у падсцёбванні сялянскай краіны да вышынь індустрыяльнага развіцця. Вялікі маштаб рэпрэсій быў абумоўлены і тыранічнай прыродай палітычнага рэжыму, які ўсталяваўся ў краіне. Яго карані глыбока ўваходзяць у першыя паслякастрычніцкія гады.

Гэта амаль пагалоўнае знішчэнне дваранства, духавенства, афіцэраў старой арміі, іншых сацыяльна чужых саслоўяў і катэгорый.

На самой справе быў рэалізаваны бальшавіцкі лозунг **"Хто не з намі, той супраць нас".**



*У лагеры рэпрэсіраваных*

Пры такіх шляхах яе дасягнення спатрэбілася падсістэма  страху, і яна стваралася і развівалася на дзяржаўным узроўні. Пазасудовыя рэпрэсіі шырока пачалі ўжывацца ў пачатку 30-х гадоў. Былі прыняты больш жорсткія законы, якія абаранялі сацыялістычную ўласнасць і ўмацоўвалі працоўную дысцыпліну. З часоў грамадзянскай вайны існавалі папраўча - працоўныя лагеры **(ППЛ)**.

У лагеры трапіла і значная частка старой інтэлігенцыі. Было рэпрэсіравана шмат людзей, якія ўжо даўно адышлі ад якой-небудзь варожай дзейнасці супраць савецкай улады. **1 снежня 1934 года** была прынята пастанова Прэзідыума ЦБК СССР  “Аб парадку вядзення спраў па падрыхтоўцы ці здзяйсненню тэрарыстычных актаў”. Тэрміны вядзення следства па такіх справах абмяжоўваліся 10 днямі, абвінаваўчае заключэнне абвінавачванаму ўручалася за 1 суткі да суда. Справы разглядаліся без удзелу пракурора  і адваката. Касацыйнае абскарджанне і падача хадатайніцтваў аб памілаванні не дазваляліся, смяротныя прыгаворы выконваліся неадкладна. У **1935 годзе** была афіцыйна ўстаноўлена  карная адказнасць, аж да смяротнага пакарання, у адносінах нават да дзяцей, пачынаючы з 12 гадоў.

У **1939 годзе**, у час знаходжання на пасадзе кіраўніка НКУС  БССР Л. Цанавы, было арыштавана 27 тыс. чалавек. Амаль па 900 чалавек у дзень. Паводле падлікаў вучоных, у 30-40-х гг. было рэпрэсіравана каля 600 тыс. чалавек. Пікам рэпрэсій стаў **1937 год**.  Ахвярамі  рэпрэсій сталі многія жыхары Беларусі, а таксама і лёзненцы.



*Помнік рэпрэсіям. Курапаты*



*Ля  помніка  ахвярам рэпрэсій. Варонаўскае кальцо (2012г.)*

### 3. Рэпрэсіі ў нашым раёне. Вернутыя імёны



*Раскулачванне*

У нашым раёне рэпрэсіі адбываліся ў сувязі з правядзеннем палітыкі ліквідацыі кулакоў як класа. **З  1929 года** пачалося раскулачванне і высылка ў аддаленыя раёны заможных сялян,  якія выступалі супраць прымусовага стварэння калгасаў. Толькі за першае  паўгоддзе агульнай калектывізацыі на Лёзненшчыне былі раскулачаны і рэпрэсіраваны каля **200** сялянскіх сем’яў.

Як фабрыкавалася большасць спраў, зараз добра вядома з дакументаў таго часу і ўспамінаў сведкаў тых падзей.

Аб анатоміі адной "контррэвалюцыйнай змовы" або **Справе № 23398** хочацца паведаміць. Калгасу **"Калектыўная праца"**, створанаму ў вёсцы Гарэлашы ў ліпені **1931года**, суджана было праіснаваць нядоўга; 21 студзеня ён імгненна распаўся. Старшыні калгаса **Івану Кузняцову**, які вярнуўся з часовай адлучкі, толькі і заставалася, што схапіцца за галаву – у яго адсутнасць жанчыны самавольна разабралі сваіх кароў, коней, хамуты і дугі. Часу гэта аперацыя заняла небагата – тых кароў і коней было ўсяго 25 галоў.



*Разбор скаціны з калгаса*

Распытаўшы рэдкіх сведкаў, Кузняцоў кінуўся да тэлефона. Праўда, паведаміў пра непрыемную падзею не ў райком ці райвыканкам, а ў **АДПУ** БССР. Начальнік раённага аддзела паўнамоцнага прадстаўніцтва **Р. Барон** спахмурнеў – зноў дыверсія, зноў кулакі заварушыліся і пачалося следства. Барон стаў дапытваць сведкаў хто падбухторыў жанчын на гэта. Сам заводзіў матэрыялы спраў на многіх аднавяскоўцаў. Справа Уласа Смолікава, напрыклад, знайшла прадаўжэнне ў тым, што аднойчы ў яго збіраліся знаёмыя, пілі гарэлку, аб нечым дамаўляліся. У гэты ж дзень перад Баронам сядзеў і даваў паказанні жыхар вёскі Міхалінава **Аляксандр Грачышнікаў**, 47 гадоў: "Жыву аднаасобна, у калгас уступаць не хачу. Убачыў, што гаспадарцы прыходзіць канец, перастаў ёю цікавіцца. Пілі, але пра калгасы нічога благога не гаварылі". Так, Барон не марудзіў, арыштоўваў усіх, хто як быццам удзельнічаў у "контррэвалюцыйнай п'янцы" у Смолікава. Справа разрастаецца, у ёй з'яўляецца сур'ёзная фармуліроўка "антысавецкая група кулака Смолікава". **30 ліпеня 1932 года** тройка АДПУ БССР разгледзела **справу № 23398** і прыгаварыла У. Смолікава, А. Высоцкага і І. Высоцкага да зняволення ў канцлагеры тэрмінам на 5 гадоў. А Аляксандра Грачышнікава, А. Аляксеенку, П. Маржанкова, В. Суржакава – да зняволення ў лагер тэрмінам на 3 гады і гэтак далей.

Мінула амаль 60 гадоў. Кляймо кулакоў і контррэвалюцыянераў з гэтых людзей было знята **15 сакавіка 1988 года** Вярхоўным судом БССР па пратэсту Пракуратуры Рэспублікі. Вышэйшы судовы орган рэспублікі адзначыў, што следства супраць сялян праводзілася з абвінаваўчым ухілам, словы аб

невінаватасці пад увагу не браліся. Справа ў адносінах да ўсіх асуджаных спынена з-за адсутнасці саставу злачынства.

**Рэабілітацыя** (апраўданне добрага імя) гэта была пасмяротная. Нікога з асуджаных у жывых не засталося – хто сканаў у лагеры, хто, вярнуўшыся адтуль, дома. Не ведаю, які лёс напаткаў іх дзяцей, што з імі сталася, як прайшлі яны па жыцці з запісам ва ўсіх анкетах – “з кулакоў”.

Адказнасць за памылкі, недахопы, пралікі, перагібы перакладалася на выканаўцаў спушчаных зверху дырэктыў. Колькі было іх, “шкоднікаў”, “дыверсантаў”, так званых **“ворагаў народа”**, людзей, што без усякіх падстаў былі пазбаўлены волі, жыцця? Хто яны? Латышы ці палякі? У спісках рэпрэсіраваных толькі з польскім прозвішчам **Яленскі** аж 10 чалавек. Колькі такіх людзей было на Лёзненшчыне – зараз цяжка адказаць. Толькі з **Унаўскага латышскага нацыянальнага сельсавета** было раскулачана і саслана некалькі тысяч чалавек.

**Латышы** ў нашым краі з’явіліся ў 80-90 гадах XIX стагоддзя. Пасяліліся яны тут з дапамогай Сялянскага банка ў пошуку лепшага жыцця.

Беззямельныя сяляне латышы сярод лясоў і балот змаглі стварыць моцныя гаспадаркі, выплаціўшы сялянскаму банку патрэбную ссуду, лічылі сябе ўласнікамі сваёй зямлі. Але савецкая ўлада працягвала з іх браць падатак і ставілася да іх як да кулакоў. **Калоніі латышоў** былі ў вёсцы Уна, Выдрэя, Стасева, Міхалінава, Дабрамыслі, Горбава (тут пражывалі яшчэ і эстонцы). Былі створаны Унаўскі нацыянальны латышскі сельсавет (1924 -1934 гг.), латышская сяльгас камуна.



**Коллектив швейной фабрики в латышском поселении в Уно. Фотоснимок 1929 года.**

*Латышы вёскі Уна*

Латышоў у вёсцы Уна сапраўды жыло шмат. Нават быў арганізаваны латышскі нацыянальны сельскі Савет. Дарэчы, на Лёзненшчыне ў першыя дзесяцігоддзі Савецкай улады былі два нацыянальныя сельсаветы: латышскі ў Уна і яўрэйскі – у Калышках.

Да вайны ў нашым раёне дзейнічалі дзве школы – латышская і беларуская. Па аповедах сучаснікаў, латышская ШКМ (школа сялянскай моладзі) мела магчымасць запускаць у неба дырыжабль і мадэлі самалётаў.




Коллектив латышского драмкружка в Ужо. Фотоснимок 1929 года.

А ў беларускай школе гэтага не было, таму нашы падлеткі часта біліся з аднагодкамі латышамі, не любілі “багацеяў”.

Сёння тагачасныя падлеткі ўзгадваюць латышоў добрым словам. Яны ўмелі арганізаваць сваю працу так, што пасля абеду ў суботу ў іх пачыналіся выхадныя: тапілі лазню, пілі чай, з патэфона гучала музыка. Некаторыя гаспадары не трымалі курэй. Латышы лічылі, што лягчэй купіць яйкі, чым прыбіраць за курамі.А яшчэ латышскія і беларускія хаты адрозніваліся флюгерамі. На латышскіх стаяў жалезны ці драўляны певень, на беларускіх – зоркі.

Калі ў канцы 1930-х гадоў латышоў пачалі рэпрэсіраваць – “тады многіх пазабіралі” – адным з абвінавачванняў было тое, што ў адпаведны час яны паварочвалі пеўняў у зададзеным напрамку і такім чынам давалі некаму знак…

Пасля вайны большасць унаўскіх латышоў (тыя, што ўцалелі) мянялі нацыянальнасць. Пры выдачы новых метрык іх вызывалі ў кампетэнтныя органы і гаварылі, што досыць быць латышом, пара станавіцца беларусам.

У вёсцы Лашнёва, дзе жылі латышы нейкі час працавала школа – сямігодка, якая была адзінай у Беларусі латышскай школай з пашыранай праграмай навучання для латышскіх дзяцей. А колькі чалавечых лёсаў стаіць за так званым сцягваннем хутароў і ўзбуйненнем калектыўнай гаспадаркі.

Так у **1935 годзе** быў ліквідаваны **Калышанскі нацыянальны яўрэйскі сельсавет,** у які ўваходзіла 34 населеныя пункты. **Працэс рэабілітацыі** нявінных ахвяр сталіншчыны, які пачаўся пасля **1956 года**, працягваецца і зараз. З небыцця вяртаюцца імёны людзей, якія, бывала, да апошняга свайго часу не ведалі, што ж такога варожага зрабілі яны для сваёй улады і за што яна іх так карае. **А колькі іх засталося, невядомых, беззваротна прапаўшых у тым трагічным віры?**



*Яўрэйская сем’я ( Дзядуля Мендель, бабушка Іда з дзецьмі і ўнукамі. Лёзна. ліпень 1937г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Каму было прысвоена званне народных паэтаў БССР?*
2. *Дзе адбылася прэм’ера пьесы Якуба Коласа “Дрыгва”?*
3. *Што такое рэпрэсіі, Гулаг?*
4. *Справа № 23398 у вёсцы Міхалінава.*
5. *Дзе ў нашым краі былі калоніі латышоў і чаму яны зніклі?*
6. *Наколькі важна для чалавека рэабілітацыя?*

## §17. Акупацыя нашага раёна нацысцкай Германіяй

### *1. Абарончыя баі на тэрыторыі БССР*

Фашысцкая Германія, парушыўшы пакт аб ненападзенні, **22 чэрвеня 1941года** вераломна ўварвалася ў межы СССР, перш наперш у **БССР**.

На тэрыторыі Беларусі разгарнуліся абарончыя баі. У адпаведнасці з планам **"Барбароса"** (маланкавай вайны), галоўны ўдар на маскоўскім напрамку наносіла група армій **"Цэнтр"**. Яна мела на мэце знішчэнне ў прыгранічных баях войскаў Заходняй асобай акругі і наступленне сваіх механізаваных войск і авіяцыі ў напрамку **ад Балтыйскага да Чорнага мора.**





*Нападзенне Германіі на СССР (1941г.)*

У першапачатковы перыяд вайны савецкія войскі вымушаны былі адступаць. Прычыны адступлення заключаліся ў тым, што асабовы склад Чырвонай Арміі рыхтаваўся галоўным чынам да **наступальных дзеянняў**, бо існавала думка аб будучай вайне як наступальнай, скарацечнай і на чужой тэрыторыі. Не было цалкам праведзена пераўзбраенне войскаў, новая тэхніка была яшчэ не асвоена. Разам з тым узброеныя сілы, у тым ліку тая іх частка, што размяшчалася ў БССР, былі аслаблены **рэпрэсіямі**, якія пазбавілі Чырвоную Армію вопытных камандзіраў. Савецкія воіны аказвалі адчайнае супраціўленне ў абарончых баях, праяўлялі стойкасць і мужнасць. На смерць, да апошняга патрона, стаялі на сваіх рубяжах пагранічнікі. За тыдзень баёў байцы пагранічнай заставы лейтэнанта **А. Кіжаватава**, што знаходзіліся ў **Брэсцкай крэпасці,** знішчылі каля батальёна гітлераўцаў.

Штаб абароны крэпасці ўзначалілі капітан **І. Зубачоў** і палкавы камісар **Яфім Майсеевіч. Фамін, наш зямляк** (родам з Калышак). Кіраўніком абароны стаў **П. Гаўрылаў**.



*Абарона Брэсцкай крэпасці*



*Фамін Яфім Майсеевіч*

Абаронцы крэпасці пратрымаліся **каля месяца**, хоць па планах фашыстаў на захоп крэпасці адводзілася толькі некалькі гадзін. Апошнія дні абароны крэпасці авеяны легендамі. На яе сценах былі зроблены надпісы, якія ведае ўвесь свет: “Я паміраю, але не здаюся! Бывай, Радзіма”. Наш зямляк Яфім Майсеевіч Фамін быў расстраляны немцамі ля Холмскіх варот крэпасці.

У **1965 годзе** Брэсцкая крэпасць атрымала званне **“Крэпасць – герой**”.



*У музеі Брэсцкай крэпасці (2005г.)*



*Помнік “Брэсцкая крэпасць”(2015г.)*

Затым у ёй быў створаны музей, прысвечаны гэтым падзеям. Шмат людзей з розных краін свету кожны год наведваюць гэты помнік вайны. Наведваюць яго і лёзненцы, і вельмі ганарацца сваім земляком.

У **2010 годзе** быў зняты мастацкі фільм **“Брэсцкая крэпасць”**, сцэнарый якога пісаўся на аснове гістарычных фактаў , а героі фільма маюць рэальныя гістарычныя прататыпы.



*Павел Дзеравянка ў ролі Я.М.Фаміна*

Ужо ў першыя гадзіны вайны разгарнуліся паветраныя баі ў небе Беларусі. Каля Радашковіч здзейснілі гераічны подзвіг камандзір эскадрыллі капітан **М. Гастэла** і члены яго экіпажа.Са згоды экіпажа камандзір накіраваў палаючы самалёт на групу нямецкіх танкаў і аўтамашын.

Пры абароне Гомеля здзейсніў свой першы паветраны таран лётчык **Б. Коўзан** – адзіны ў свеце лётчык, які зрабіў чатыры паветраныя тараны і застаўся жывы. У абароне Мінска прымала ўдзел 100 – я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал – маёра **І. Русіянава**, байцы якой упершыню ў гады вайны выкарысталі так званую шкляную артылерыю – бутэлькі з гаручай сумессю для барацьбы з танкамі **(кактэйль Молатава**).

**6 ліпеня 1941года** ў ходзе **Лепельскага контрудару** войскаў Чырвонай Арміі адбылася адна з буйнейшых танкавых бітваў у пачатку вайны. У ёй прымала ўдзел каля 1600 танкаў з абодвух бакоў. Ворага ўдалося адкінуць на 40 км.



*"Кактэйль Молатава"*



*Танкавая бітва*

Надзвычай напружаны характар мелі баі ў раёне **Магілёва**. Абарона горада працягвалася **23 дні**. У ліку адважных абаронцаў вызначыўся стралковы полк пад камандаваннем палкоўніка **С. Куцепава**. Толькі за адзін дзень баёў байцы Куцепава знішчылі 39 фашысцкіх танкаў.

**14 ліпеня 1941 года** пад **Оршай** упершыню была выкарыстана рэактыўная артылерыя **(кацюшы)** – батарэя мінамётаў пад камандаваннем капітана **І. Флёрава**.



*Буйніцкае поле каля Магілёва (2015г.)*



*Помнік "Кацюша" у Оршы*

**Двухмесячныя абарончыя баі** савецкіх войскаў у Беларусі не дазволілі праціўніку рэалізаваць **план маланкавай вайны**, далі магчымасць сканцэнтраваць рэзервы і падрыхтавацца да абароны на маскоўскім напрамку.

## 2. *Акупацыя нашага раёна*

Аб тым, што **22 чэрвеня 1941года** пачалася вайна, жыхары Лёзна даведаліся з урадавага звароту да савецкага народа, які быў перададзены праз рупар гучнагаварыцеля на аптэцы нашага мястэчка.

Савецкая Беларусь з першых гадзін вайны апынулася ў агні пажарышчаў і жорсткіх баёў. СНК БССР і ЦК КП(б)Б, якія эвакуіраваліся з Мінска, з **3 да**

**10 ліпеня 1941 года** працавалі ў Лёзне. Тут было сфарміравана 29 груп, адпраўленых за лінію фронту для разгортвання партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі.

І вось, калі мясцовыя жыхары, што стаялі ў чарзе ля магазіна (ён быў на плошчы каля царквы), заўважылі самалёт з чорнымі крыжамі, які кулямётнай чаргою забіў загадчыка магазіна **Марка Ерамеевіча Шагала** і параніў хлопчыка, зразумелі, што вайна прыйшла і ў Лёзна. У абарончых баях з фашыстамі на поўдзень ад Лёзна вызначылася **153-я стралковая дывізія** (камандзір палкоўнік **М. А. Гаген**). З 17 ліпеня яна ва ўмовах поўнага акружэння некалькі дзён вяла ўпартыя баі з праціўнікам. У раёне в. Дабрамыслі дзёрзкім ударам прарвала акружэнне, фарсіравала р. Чарніца і, прайшоўшы з баямі па тылах праціўніка, злучылася з іншымі часцямі Чырвонай Арміі. Лёзна ж было акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі **17 ліпеня 1941года**.




*Акупацыя Лёзна (ліпень 1941г.)*




*Немцы на вакзале ў Лёзне (1942 г.)*

Устанаўленне акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Лёзненскага раёна было адзначана масавымі рэпрэсіямі і расправамі з камуністамі, дэпутатамі і работнікамі мясцовых Саветаў, ды і з мясцовым насельніцтвам.

У яўрэйскіх мястэчках: Лёзне, Калышкі, Дабрамыслі – гітлераўцы стварылі **гета** і знішчалі грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці.



*Яўрэйскае гета*



*Шыбеніца*

У Лёзне гітлераўцы пабудавалі **шыбеніцы** (зараз на гэтым месцы знаходзіцца **сямейнае кафэ**). Да месца пакарання зганялі насельніцтва, каб запалохаць і зрабіць паслухмяным. Ахвяры фашысцкага тэрору па некалькі тыдняў віселі на шыбеніцах, наганяючы страх на людзей.

Аб тым, як жылі дзеці нашага раёна ў гады акупацыі, сведчыць пісьмо 15 - гадовай дзяўчынкі **Каці Сусанінай** да яе бацькі, воіна Чырвонай Арміі.

Пісьмо дзяўчынкі было перададзена ў вайсковую часць, якая стаяла ў Лёзне, ужо падчас вызвалення. **27 мая 1944 года** перадсмяротнае пасланне піянеркі **Каці Сусанінай** было апублікавана ў газеце **"Камсамольская праўда"**( зараз размешчана і ў музеі Вялікай Айчыннай вайны РБ ў Мінску).

"…Тата, я рабыня нямецкага барона Шарпэна. Працую прачкай, мыю бялізну, падлогу. Працую многа, а ем два разы ў дзень у карыце з Розай і Кларай – так завуць свіней гаспадара. Лепш памерці на Радзіме, чым паехаць нявольніцай ў Нямеччыну! Адпомсці за мяне і маму. Бывай, іду паміраць".






*Пісьмо Каці Сусанінай. Экспазіцыя музея (1943г.)* *Дзеці ў гады вайны*

Хлопчыку **Гену Арцёменку** з **Крынак** таксама давялося на сваёй уласнай скуры адчуць, што такое "новы парадак". Яго сям'я жыла ў драўляным доміку каля пераезду. Нямецкія ж салдаты жылі на першым паверсе будынка вакзала. Бачыў ён, як яны везлі нарабаванае дабро на станцыю. Там рабочыя перагружалі яго з машын у таварныя вагоны і адпраўлялі ў далёкую **Нямеччыну**.

Дзень і ноч грукаталі цягнікі, імчалі на фронт і з фронту. На перадавую фашысцкія салдаты ехалі з песнямі. З вагонаў чуўся п'яны рогат ваякаў, гукі губных гармонікаў. Ужо зімой перамяніўся іх настрой, калі ехалі яны **з - пад Масквы**. Але вораг быў моцны, яшчэ гаспадарыў і ўладарыў у чужым доме.

***Пытанні і заданні:***

*1.Чаму пачалася Другая Сусветная і Вялікая Айчынная вайна?*
*2. Якую ролю ў вайне адыгралі абарончыя баі на Беларусі?*
*3. Што ты ведаеш пра нашага земляка Я. М. Фаміна?*
*4. Калі было акупіравана Лёзна?*
*5. Як жылі людзі ў гады нямецкай акупацыі?*
*6. Што такое гета і дзе яно было?*

## §18. Ішла вайна народная 1941-1943гг.

### 1. *Пачатак барацьбы з ворагам*

Жыхары Лёзненшчыны, як і ўся краіна, адразу ж падняліся на барацьбу з акупантамі, бо адносіны іх да беларусаў былі вызначаны ў плане **“Ост”**. Згодна з ім, прадугледжвалася **75%** рускіх, беларусаў, украінцаў фізічна знішчыць, а астатнія **25%** ператварыць у рабоў. Што датычыцца цыганаў і яўрэяў, якія таксама жылі ў Беларусі, дык іх чакала поўнае знішчэнне (**генацыд**). Або для яўрэйскага насельніцтва Еўропы выкарыстоўваецца паняцце **“Халакост”**. Тысячы лёзненцаў пайшлі на фронт, многія з тых, хто застаўся, удзельнічалі ў будаўніцтве абарончых збудаванняў.

У Лёзне і іншых населеных пунктах ствараліся атрады народнага апалчэння і знішчальныя батальёны, пераважную частку іх складала моладзь. Ужо **23 ліпеня 1941 года** над станцыяй **Крынкі** з’явіліся 2 варожыя самалёты, якія скінулі каля 40 бомб. Па варожых бамбардзіроўшчыках быў адкрыты кулямётна-ружэйны агонь атрадам **знішчальнага батальёна** Лёзненскага раёна разам з байцамі вайсковай часці. У выніку абстрэлу адзін варожы самалёт быў збіты, 4 чалавекі яго экіпажа разбіліся. Сумленныя жыхары раёна выконвалі свой чалавечы і грамадзянскі абавязак: у небяспечны для Радзімы час забяспечвалі бесперабойную дапамогу савецкай арміі.



*Нямецкія самалеты*

У абстаноўцы тэрору і смяротнай небяспекі нараджаўся і рос **патрыятызм** людзей, арганізоўваліся першыя партызанскія групы.

Ужо ў першае ваеннае лета акупанты сутыкнуліся з такой малавядомай для іх з’явай, як **партызанская барацьба.** Праўда, пераважна гэта былі яшчэ асобныя і неарганізаваныя выступленні нашых байцоў, якія, адстаўшы ад сваіх часцей, заставаліся ў лясах пасля няроўных абарончых баёў.

У **Лёзне** каля чыгуначнага пераезду фашысты разраўнялі пляцоўку. Хутка тут з’явіліся могілкі з бярозавымі крыжамі і нямецкімі каскамі (нямецкія могілкі знаходзіліся там, дзе ў пасляваенны час была **аўтастанцыя**). Для жыхароў гэта было сведчанне таго, што вайна з ворагам пачалася.



*Нямецкія магілкі*

У **вёсцы Крынкі** немцы разбурылі помнік Леніну, але вяскоўцы сабралі яго кавалкі і захоўвалі да вызвалення вёскі. Пасля вайны па іх просьбе помнік быў адноўлены народным мастаком БССР **А. Бембелем** і ўстаноўлены на ранейшым месцы.

Войскі Савецкай Арміі адступалі, ведучы цяжкія абарончыя баі, вымушаны былі адступаць пад націскам праціўніка, які перавышаў колькасна і быў больш вопытным. Колькасць жа савецкіх ваеннапалонных павялічвалася з кожным днём. Немцы трымалі іх за агаражай з калючай провалкі.

Са слоў былой настаўніцы **Стаянавай Марыі Данілаўны,** ў **ліпені 1941года** быў лагер ваеннапалонных і ў нашым пасёлку Лёзна. Ён некалькі дзён знаходзіўся каля маста з левага боку ракі Машна. У лагеры было шмат савецкіх воінаў.



*Я. І. Джугашвілі ў палоне (1941г.)*

Пад нашым пасёлкам Лёзна закончылася вайна і для **Якава Джугашвілі (сына Сталіна)**, які трапіў у палон (у Лёзне ці каля Крынак) і нейкі час знаходзіўся ў гэтым лагеры. Жыхары Лёзна ведалі, што там ёсць сын Сталіна, і бегалі на яго паглядзець.

Узяўшы ў палон сына Сталіна, немцы хацелі абмяняць яго на свайго фельдмаршала, вядомага **Паўлюса.** Але Сталін І. В. сказаў: “Я салдата на генерала не мяняю!”.

Якава Сталіна хацелі зрабіць здраднікам, але ён, не вытрымаўшы здзекаў, загінуў у канцлагеры **Закенхаўзен** (кінуўся на агароджу з провалкі, праз якую быў прапушчаны электраток).

У **Капцях,** суседняга з намі Віцебскага раёна, дзякуючы намаганням ветэрана Вялікай Айчыннай вайны падпалкоўніка ў адстаўцы **Віктара Дзям’янавіча Цярэшчанкі,** на Кургане Славы ўстаноўлены помнік двум сынам Сталіна:

Якаву, які **летам 1941 года** абараняў нашу Віцебшчыну ад ворага, і Васілію, які вызваляў наш край ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў **летам 1944 года.**



*Помнік Я. І. .Джугашвілі і В. І. Джугашвілі ў Капцях (2011г.)*

## *2. Партызанская вайна на акупіраванай тэрыторыі*

Пачатак барацьбы супраць акупантаў адбываўся ва ўмовах хуткага наступлення нямецка - фашысцкіх войскаў. Таму асноўная работа па арганізацыі падполля і партызанскага руху вялася ва ўмовах акупацыі.

На захопленай тэрыторыі ствралася сетка падпольных арганізацый і груп. Ініцыятыву ў стварэнні атрадаў і груп супраціўлення бралі на сябе радавыя камуністы і беспартыйныя патрыёты. Першы партызанскі атрад на Лёзненшчыне пад камандаваннем **В. К. Саладоўнікава** быў створаны з разрозненых груп байцоў, якія былі ў лясах каля вёсак **Хоцемля і Ордзеж.**



*“Суражскія вароты”*

Ужо летам і восенню **1941 года** ўтварылася больш за 15 невялікіх атрадаў і шмат самастойных груп. Вясной **1942 года** аднавіў сваю работу **Віцебскі падпольны абком партыі**, які знаходзіўся ў паласе 4-й ударнай арміі на вызваленай тэрыторыі Усвяцкага і Веліжскага раёнаў. Гэты разрыў (40 км) іграў выключную ролю ў сувязі з Вялікай зямлёй і па праву называўся **Віцебскімі, або Суражскімі, “варотамі”**. Абком разам з ваенным саветам 4-й ударнай Партызанскай арміі збіралі і аб’ядноўвалі партызан у групы, атрады і зноў вярталі на акупіраваную тэрыторыю.

**25 красавіка 1942 года** па ініцыятыве Віцебскага падпольнага абкома партыі была створана брыгада **“Аляксея”** (з красавіка **1944 года** брыгада **Аляксея Фёдаравіча Данукалава**), якая стала асноўным партызанскім фарміраваннем на тэрыторыі Лёзненшчыны ў гады вайны.

Разам з брыгадай **Стралкова В. В**. яны накіроўваліся ў Лёзненскі раён для арганізацыі зрыву перавозак па чыгунцы і шашэйных дарогах. У сярэдзіне ліпеня **1942 года** брыгада “Аляксея” налічвала ўжо **1085** партызан.



Полковник т.т. Михайлов и Разнотовский беседуют с представителями местной власти в г. Лиозно: секретарем РК ВКП(б) Щербаковым, редактором Лиозненской газеты Свиридовым и пред. РПК'А тов. Качук (октябрь 1943)

Атрады праводзілі дыверсіі на чыгунках у розных напрамках, вялі баі з ворагам, ратавалі моладзь ад вывазу ў Германію. **21 ліпеня 1942 года** Віцебскі падпольны абком арганізаваў Лёзненскі падпольны райком КП(б)Б. Сакратаром быў зацверджаны **Шчарбакоў Апанас Цімафеевіч.** Лёзненскі падпольны райком знаходзіўся ў партызанскай брыгадзе **“Аляксея”**.

Нашу Беларусь называюць **партызанскім краем**, бо ўжо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне нашай краіны ўзнік партызанскі атрад пад кіраўніцтвам **Васіля Каржа**. У Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці таксама былі створаны партызанскія атрады на чале з **Ц. Бумажковым і Ф. Паўлоўскім**.

Але больш за ўсё іх было ў нашай Віцебскай вобласці. Мы добра ведаем **бацьку Міная ( М. Шмырова)**, за галаву якога фашысты давалі 30 тыс. марак і карову. Памятаем і твор "Баладу аб чатырох заложніках" (яго дзецях), якіх расстралялі немцы. А яшчэ – **Пётр Міронавіч Машэраў** (будучы кіраўнік нашай дзяржавы БССР), якому за падпольную і партызанскую дзейнасць у 26 год было прысвоена званне **Героя Савецкага Саюза**.

Шырокую дыверсійную дзейнасць на буйным чыгуначным вузле **"Орша"** (60км ад Лёзна) разгарнуў былы начальнік паравознага дэпо гэтага вузла **Канстанцін Заслонаў,** які прыбыў з-за лініі фронту. Ён уладкаваўся да немцаў начальнікам паравозных брыгад з правам самастойнага набору рабочай сілы. Яго людзі пачалі рабіць міны, знешне падобныя да кавалкаў вугалю, якія праз вугальныя склады падкідваліся ў паравозныя топкі.



*Канстанцін Заслонаў*



*Бюст К. Заслонаву ў музеі (2016г.)*

Такім чынам заслонаўцы вывелі са строю больш за **200** паравозаў і ажыццявілі каля **100** крушэнняў цягнікоў. Разгортвалася так званая **рэйкавая вайна** па масавым разбурэнні чыгунак з мэтай дэзарганізацыі нямецкіх ваенных перавозак.





*"Рэйкавая вайна"*

Партызанская дзейнасць Канстанціна Заслонава была і на тэрыторыі нашага раёна. У школьным музеі вёскі Бабінавічы падрабязна аб гэтым распавядаецца, там устаноўлены бюст легендарнага героя. Нездарма птушкафабрыка ў Бабінавічах названа ў гонар яго – імя Заслонава.

## *3. Дзейнасць партызанскай брыгады “Аляксея” на Лёзеншчыне*

Яшчэ ў **кастрычніку 1941года** ў Слабодскім раёне Смаленскай вобласці быў створаны партызанскі атрад, камандзірам якога стаў **Аляксей Данукалаў**, камісарам – Грабоўскі А., начальнік штаба – А. Пятроў. Усяго атрад налічваў 28 чалавек. У пачатку **мая 1942 года** Аляксей са сваімі баявымі таварышамі прыбыў у Лёзненскі раён, дзе была створана баявая брыгада.



*А. Ф. Данукалаў*



*Запісная кніжка А. Ф. Данукалава*

Да аляксееўскай брыгады далучыўся таксама асобна дзеючы ў Хацемлянскім і Дыманоўскім барах атрад, дзе камандзірам атрада быў **Селіваненка М. Н.**, а камісарам **Блахін В. А.**

Першымі прыйшлі ў брыгаду “Аляксея” **Старавойтаў І. І., Піменаў І. П., Чарніцоў П. В., Карчагін С. С., Малахаўскі Н. Г., Герасімаўскі,** якія, ідучы самі, вялі з сабой дзесяткі таварышаў.



*Аляксееўцы. Мал. А. Ф. Полазава*

Кожны з прыйшоўшых у атрад праходзіў адпаведную праверку і атрымліваў індывідуальнае заданне: знішчыць мост, дастаць узбраенне і боепрыпасы, схадзіць у разведку ў варожы гарнізон і прынесці адтуль каштоўныя звесткі. Брыгада **Стралкова В. В**. складалася з пяці атрадаў агульнай колькасцю 240 партызан, большая частка з якіх былі жыхарамі Руднянскага, Веліжскага, Панізоўскага раёнаў Смаленскай вобласці.

Асноўным партызанскім злучэннем у Лёзненскім раёне стала брыгада **“Аляксея”**.

У час маршу з вёскі **Дзятлы** было праведзена некалькі баёў, у тым ліку ў лесе каля **вёскі Пушча. 24 мая 1942 года** брыгада шукала пераход праз чыгунку і двойчы была выяўлена. Раніцай партызаны брыгады зноў былі заўважаны зводным атрадам праціўніка (каля 150 салдат) з гарнізонаў на станцыях **Выдрэя і Шахі**.



*Помнік партызанам у Пагосцішчы ( 2014г.)*

Бой пачаўся на паўночным ускрайку лесу каля **вёскі Пушча** і паступова ўцягнуўся ў глыбіню лесу.

Партызаны скавалі праціўніка боем, а тым часам два атрады выйшлі і заблакіравалі чыгунку на ўсходнім ускрайку станцыі **Выдрэя**.

Да 16 гадзін абоз і асабовы склад брыгады з боем перайшлі дарогу. Прыбыўшае да немцаў падмацаванне пачало абстрэл партызан з гармат і кулямётаў, аднак аляксееўцы ўжо былі далёка, і агонь не прычыніў ім страт. У вёсцы Пагосцішча ў гонар гэтых падзей быў устаноўлены помнік.

**Летам і восенню 1942 года** партызаны разграмілі 7 варожых гарнізонаў, 14 валасных упраў з паліцэйскімі ўчасткамі, у тым ліку ў **Высачанах, Стасеве, Выдрэі, Каралёве, Бураках, Крынках.**

**21 кастрычніка 1942 года** непадалёку ад чыгуначнай станцыі Крынкі здзейсніў свой подзвіг падрыўнік з партызанскага атрада “Перамога” **Пётр Антонавіч Галецкі**. Ён з узрыўчаткай кінуўся пад варожы эшалон з гаручым, знішчыў яго і загінуў сам. На месцы гібелі героя, за 5 км на паўночны захад ад чыгуначнай станцыі Крынкі, ўстаноўлены абеліск.



*Галецкі Пётр Антонавіч*



*Помнік П. Галецкаму ў Крынках*

Спачатку штаб брыгады “Аляксея” і два яе атрады базіраваліся ў **вёсцы Дзятлы**, а пазней штаб знаходзіўся ў **вёсцы Таўпа і Кавалі** нашага раёна.




*Шыльда на доме ў вёсцы Талпа і Кавалі*

Баі з карнікамі не спыніліся і ў **студзені 1943 года.** Толькі брыгада “Аляксея” разгрупавалася на вялікай прасторы Лёзненскага, Суражскага, Панізоўскага раёнаў. У **лютым 1943 года** праціўнік сем дзён стрымліваў баямі партызан брыгады “Аляксея” у вёсках Суражскага раёна, жадаючы выцесніць яе з левага берага Заходняй Дзвіны ў блакіраваную зону. **10 сакавіка 1943года** партызаны вырваліся з блакады, страціўшы 60 чалавек.

Так, з **мая 1942 года** да **мая 1943 года** партызаны правялі 185 баёў, разграмілі 10 гарнізонаў, у тым ліку ў вёсках **Кавалі**, **Пагосцішча**, **Стасева**, **Фокіна** Лёзненскага раёна. Былі разбіты 14 валасных упраў, у час дыверсій на чыгунках аляксееўцы падарвалі 44 варожыя эшалоны, 6 мастоў, знішчылі таксама самалёт, 242 аўтамашыны, 11 танкаў і бронемашын. А ў **маі 1943 года** ўсе атрады пакінулі тэрыторыю Лёзненскага раёна і сабраліся на правым беразе ракі Заходняя Дзвіна. Атрады брыгады агульнай колькасцю 1095 партызан размясціліся ў вёсках Віцебскага раёна.

Наша Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны стала сапраўдным партызанскім краем. Тут дзейнічала шмат партызанскіх атрадаў, якія ўваходзілі ва Ушацкую партызанскую зону. Усе яны ўнеслі значны ўклад у разгром фашысцкага “новага парадку”, прарыў абароны праціўніка, знішчэнне ворага.

Удзельнікам партызанскага руху атрада імя Жданава быў і мой бацька Шыдлоўскі Іван Якаўлевіч, які ў 15 гадовым узросце ўстаў на абарону Радзімы. Пасля вайны былі наладжаны сустрэчы былых партызан. Месцам сустрэчы на Лёзненшчыне стала вёска Кавалі (каля музея Данукалава). На Віцебшчыне ва Ушачах быў устаноўлены помнік партызанам “Прарыў”. І былых партызан Віцебшчыны сталі запрашаць на сустрэчы да помніка **“Прарыў”**.



*Сустрэчы партызан у Кавалях (1981 г.)*



*Сустрэча са Старавойтавым І. І.*

## 4. *Барацьба падполля.*

Яшчэ ў **ліпені 1941года** была пакінута на падпольную работу сакратаром Лёзненскага падпольнага райкома камсамола **Домна Аляксандраўна Дубоўка** (падпольны псеўданім **“Тамара”)**, якая да вайны працавала сакратаром Чыжоўскага ЛКСМБ Беластоцкай вобласці. Разам з ёй засталося і 100 камсамольцаў. Падпольны райком камсамола пачаў працаваць у жніўні 1941года. Першая камсамольска - маладзёжная група з 14 чалавек была створана ў **жніўні 1941года** ў вёсцы **Веляшковічы**.



*Дубоўка Домна Аляксандраўна*



*“ Тамара” - Дубоўка Д. А.*

Узначалілі яе **Тамара Дубоўка** і настаўнік мясцовай школы Кузьма Грынкін. У хуткім часе такія групы арганізаваліся ў вёсках Замшына, Альхавік, Заверына. Да верасня 1942 года ў раёне было 17 падпольных камсамольскіх арганізацый. У ліпені 1942 года Віцебскі падпольны абком камсамола абнавіў склад Лёзненскага райкама. Асноўная база падпольнага райкама знаходзілася ў партызанскай брыгадзе “Аляксея” і ў Лёзненскай брыгадзе. З **восені 1942 года** пачалі праводзіцца брыгадныя, раённыя і міжраённыя камсамольскія канферэнцыі. Адной з першых у вобласці у нашым раёне была праведзена камсамольская канферэнцыя, удзельнікі якой прынялі зварот да ўсіх юнакоў і дзяўчат Беларусі (ён пасля быў выдадзены лістоўкай і распаўсюджаны на ўсёй акупіраванай тэрыторыі), **“ Усе на барацьбу з ворагам!”** .



*Тамара Дубоўка з лёзненцамі (1943 г.)*

На Лёзненшчыне асоба камсамольскага важака **Тамары Дубоўка**, пры непасрэдным удзеле якой былі створаны падпольныя камсамольскія арганізацыі, стала легендарнай: за галаву адважнага сакратара немцы давалі 5 тысяч нямецкіх марак. У **вёсцы Альхавік** была створана падпольная група, у якую ўвайшлі камуніст **А. Л. Чыжыкава,**камсамолка-настаўніца **Раманоўская** і іншыя.

Не жаночая гэта справа – плячо ў плячо ісці з салдатамі ў самае пекла вайны. Аднак смяротная небяспека зраўняла ў правах жанчын і мужчын. Сувязныя, разведчыцы, падрыўніцы, медыцынскія работнікі, пекары, шаўцы, кухары. Гэта на іх плечы, часам зусім юныя, лёг увесь цяжар нялёгкіх партызанскіх будняў ва ўмовах паходнага ляснога жыцця, частых абстрэлаў, карных аперацый. Дзеля вялікага дня вызвалення самаахвярна ішлі яны на верную смерць, стойка і мужна перажывалі страту баявых сяброў, родных.

Сярод іх **М. Ф. Логінава** з Веляшковіч, якой разам з Тамарай Дубоўка ўдалося звязацца з партызанамі. Разам з баявымі сябрамі прайшла яна тысячы кіламетраў, зведала ўсе цяжкасці партызанскага жыцця. **П. Д. Люценка**, вярнуўшыся да маці ў Кавалі, прымкнула да групы партызан І. І. Гур’ева.



*М. Ф. Логінава*



*П. Д. Люценка*

У **жніўні 1942 года** атрад І. І. Гур’ева трапіў у бабінавіцкае акружэнне. Многа загінула тады народных мсціўцаў. Пасля выхаду з блакады яго атрад быў расфарміраваны. У 8-м атрадзе імя М. Н. Селіваненкі была створана спецыяльная **жаночая рота** пад камандаваннем Фёдара Голуба, якая ўдзельнічала ў адкрытых баях і засадах. Баец **Ганна Аўсяннікава** загінула смерцю героя. Цяжка параненая, вяла бой да апошняга патрона. Ужо трацячы сілы, расстраляла ва ўпор трох карнікаў. Ворагу ўдалося захапіць яе цяжка параненую ў палон. На допыце, нягледзечы на зверскія катаванні і здзекі, не сказала ні слова, захавала вернасць прысязе і ленінскаму камсамолу. Хавалі Аню партызаны і ўсе жыхары вёскі **Хоцемля.** Пасля вызвалення Хоцемлі цела юнай гераіні перазахавалі ў горадзе **Рудня** на Смаленшчыне.



*Помнік урачам у Высачанах (1976г.)*

Да канца, цаной уласных жыццяў выканалі свой прафесійны абавязак медыкі Высачанскай сельскай бальніцы. У першыя дні гарачых баёў сюды сцякаліся параненыя байцы і камандзіры. Усім ім была аказана дапамога ў перапоўненай бальніцы. Уласным жыццём і жыццём сваіх дзяцей заплацілі многія работнікі яе за выкананы абавязак у цяжкую гадзіну.

Сярод іх – **Ганна Мікалаеўна Мамонава**, якая зрабіла аперацыю на яловым пні лётчыку з пашкоджанай сківіцай Багданаву Мікалаю Рыгоравічу.



*Аперацыя на яловым пні. Экспазіцыя ў раённым музеі*

Перад самай вайной Ганна Мікалаеўна Мамонава была накіравана ў Высачанскую бальніцу. Праз некалькі месяцаў яна нарадзіла трох дзяўчынак (Надзею, Веру і Любоў). Быў у Ганны Мамонавай яшчэ і пяцігадовы сынок.



Яна неаднаразова дапамагала параненым партызанам. Толькі здарылася з гэтай сям'ёй вялікая трагедыя. Гэтую мужную жанчыну **18 жніўня 1942 года** карны атрад фашыстаў па чыімсьці даносе схапіў разам з дзецьмі і па – зверску расстраляў. (Маст. фільм "Чорная бяроза"). Уратавалася толькі адна дзяўчынка Надзея, якая знаходзілася ў яе сястры ў суседняй вёсцы.

*Мамонава Ганна Мікалаеўна*

Пасля вайны яе дачка Надзея неаднаразова сустракалася з лётчыкам **Багданавым Мікалаем Рыгоравічам**, якому маці рабіла аперацыю на пні.

У Капцях ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Цярэшчанкам В. Д. ўстаноўлены помнік ўрачу **Мамонавай Ганне Мікалаеўне**.





*Лётчык М. Р. Багданаў з Н. Мамонавай*   *Магіла Мамонавай у в. Копці.(2011г.)*

## 5. *Юныя мсціўцы Лёзненшчыны*

З першых дзён Айчыннай вайны дзеці чым маглі дапамагалі дарослым, а некаторыя адразу сталі не па гадах дарослымі і ваявалі з ворагам. Былы вучань 5-га класа Крынкаўскай пачатковай школы, якая знаходзілася ў вёсцы Чарнышы, **Мікалай Гарэлашаў** збіраў зброю для народных мсціўцаў.



*Юны партызан*

Ён апранаўся ў вялікае для яго адзенне свайго бацькі, які быў у той час на фронце, непрыкметна прабіраўся да пакінутых без догляду нямецкіх павозак і выцягваў адтуль вінтоўкі і аўтаматы. Калі гітлераўцы даведаліся пра гэта, Мікалай перайшоў у лес да партызан. У атрадзе ўдзельнічаў у шматлікіх аперацыях. На жаль, юны мсцівец не дажыў да светлага дня перамогі. **У 1944 годзе** ён загінуў у баі з фашыстамі.

Адчувальную падмогу аказваў народным мсціўцам вучань Веляшковіцкай сярэдняй школы **Сяргей Расленка**, які яшчэ з лета пачаў збіраць розную зброю і хаваць у патайным месцы.



*У разведку.*
*Мал. І. І. Собалевай (2005г.)*



*Піянеры дапамагаюць маці*
*Сярожы Расленкі (60-я г.)*

Яму стала вядома, што многа вінтовак, аўтаматаў, боепрыпасаў было затоплена адступаючымі часцямі Савецкай Арміі ў сажалцы. Ноччу ён выцягваў іх і папаўняў свой запас, потым перадаваў усё партызанам. Збіраў каштоўную інфармацыю аб праціўніку, неаднаразова перасцерагаў лясных салдат аб небяспецы. Настала і другая ваенная восень. З ёй прыйшла і бяда.

**10 кастрычніка 1942 года** акупанты схапілі Сяргея і ўчынілі допыт. " Дзе партызаны?" – пыталіся ў яго. Але хлопчык не адказваў. Яго па – зверску збівалі, потым аблівалалі сцюдзёнай вадой. І ўсё пачыналася зноў. Фашысты нічога не дабіліся ад Сярожы і адвезлі яго ў Лёзна. Адтуль ён уцёк, але потым яго зноў схапілі і расстралялі ў **Адаменскім рове** ( верш Р. С. Агеевай). Імя Сяргея Расленкі занесена ў Кнігу герояў Веляшковіцкай школы, а побач са школай яму ўстаноўлены **помнік** (піянерскі гальштук).





*Помнік Сярожу Расленка каля школы ў Веляшковічах. Фотазд. Міхеенкі В. А.(2004г.)*

Калі карная экспедыцыя фашыстаў набліжалася да вёскі Міхайлова, **Кастусь Ягораў** быў у засадзе. Варожая калона падыходзіла ўсё бліжэй і бліжэй. Ужо можна было разглядзець твары гітлераўцаў. У гэты час прагучала каманда і грымнуў дружны залп. Адзін за адным немцы пачалі падаць на зямлю. Але сілы былі няроўныя. Усе партызаны загінулі ў тым баі. Кастусь застаўся адзін , але працягваў весці трапны агонь па ворагу. У час бою хлопчык быў цяжка паранены. Фашысты захапілі партызана ў палон і прывезлі яго ў Веляшковічы. На наступны дзень ледзь жывога юнака закатавалі на могілках **Саракавішча.** Падобны лёс напаткаў і **Валодзю Кастрыцкага**, байца коннай разведкі. Знешне ён выглядаў падлеткам гадоў 12 – 13. Гітлераўцы захапілі хлопца і жудасна яго катавалі. Ворагі нічога не дабіліся ад яго. Ён маўчаў і нікога не выдаў. Калі сябры ўбачылі яго цела, не стрымалі слёз. Рукі ў яго былі вывернуты. Яму выкалалі вочы , цела зрэзалі нажамі, скалолі штыкамі і прабілі некалькімі кулямі. Так заўчасна скончылася жыццё Валодзі Кастрыцкага. Памяць аб ім жыве ў сэрцах тых, хто ваяваў побач з ім.

У дазоры смерцю храбрых загінулі тры юныя партызаны: кулямётчыкі **Саша Савіцкі** ( з в. Красыні), **Валодзя Стралкоў** (з в. Зоры) і **Вася Суханаў** (з Касплянскага раёна). На досвітку калона немцаў непрыкметна пачала абыходзіць дазор праз роў. Паведаміць у атрад ужо было позна. Тады юнакі вырашалі даць бой. Яны адкрылі агонь па гітлераўцах з кулямёта і двух аўтаматаў. Бой быў няроўны. Скончыліся патроны. Змоўк кулямёт Сашы Савіцкага, потым аўтамат Валодзі Стралкова. Тады Вася Суханаў кінуў дзве гранаты ў немцаў, якія набліжаліся.

На жалобным мітынгу партызаны пакляліся адпомсціць за смерць сваіх таварышаў па зброі. У хуткім часе варожая калона была разбіта.

***Пытанні і заданні:***

1. *Хто такія партызаны і падпольшчыкі?*
2. *Партызанская брыгада “Аляксея” – чаму так была названа?*
3. *Наведайце музей А. Ф. Данукалава ў Кавалях.*
4. *Якія планы былі ў фашыстаў наконт Беларусі?*
5. *Як жанчыны змагаліся з ворагам?*
6. *Назаві юных мсціўцаў Лёзненшчыны?*

## §19. Вогненныя вёскі. Асташэва – сястра Хатыні

### 1. *Вогненныя вёскі Лёзненшчыны*

Да **сярэдзіны 1942 года** партызанскі рух прыняў такія маштабы, што ўзнікла неабходнасць стварэння адзінага каардынуючага цэнтра**. 30 мая 1942 года** былі створаны ЦШПР і БШПР (Цэнтральны і Беларускі штаб партызанскага руху). Ствараліся **партызанскія зоны,** іх у БССР было – больш за **20**, у тым ліку **Ушацкая** – у Віцебскай вобласці. Немцы вельмі баяліся партызан і не маглі з імі змагацца.Тады яны пачалі знішчаць **партызанскія вёскі** (вёскі, жыхары, якіх пайшлі ў партызаны або мелі сувязь з імі).

**196** вёсак і вёсачак на лёзненскай зямлі ў ваенны час сталі **вогненнымі**. Так іх пазначылі ў сэрцы тыя, хто гарэў разам з імі, каго забівалі. Забівалі ў родных сценах, на роднай зямлі, у роднай вёсцы. Вогненнымі яны сталі для загінуўшых у агні; для жывых, цудам уцалелых, яны таксама засталіся ў памяці вогненнымі. Ад болю няма спакою. Колькі б ні прайшло часу. Пачатак і росквіт іх жыцця быў перакрэслены жудаснай смерцю родных, уласнай смерцю, у лапах якой пабывалі яны самі.



*Вогненная вёска*

У вёскі **Зоры** Кавалёўскага сельсавета, размешчанай сярод лясоў, у найпрыгажэйшым месцы каля рэчкі, магла б быць цудоўная будучыня. Каб не вайна… Усе 64 дамы згарэлі. Палілі вёску **ў 1942 г.,** двойчы дапальвалі ў **1943г**. Былі расстраляны за сувязь з партызанамі 22 яе жыхары. Ніхто не вярнуўся з фронту. Так і не змагла пасля вайны падняцца, акрыяць спаленая вёска Зоры.

А шматпакутная вёска **Хоцемля**… Не было таго тыдня, каб не наведаліся сюды немцы. Вёску – партызанку палілі некалькі разоў. Першы раз, **3 кастрычніка 1942г**., яна перажыла карную аперацыю **"Хоцемля – Аргуны"** у спалучэнні яшчэ і з карнай экспедыцыяй **"Маланка"**. Мэтай іх было ачышчэнне ад партызан перадполле **Полацк – Смаленск.**

"У Хоцемлі – савецкая ўлада, а ў Чарнышах – немцы. А ад тых Чарнышоў да нас усяго тры кіламетры… "– успамінае **А. А. Галцеева.**

Аднойчы выгнала карову ў поле, бачу партызаны сядзяць, пераабуваюцца. А з шашы немцы шчыльным ланцугом ідуць, машыны на вёску едуць. Я ім крыкнула. Добра, што ад шашы не так блізка было, яны паспелі ў лес уцячы і астатніх папярэдзіць. Я хуценька ў хату, дзяцей сонных падхапіла і ў падполле палезла. Сядзелі доўга, нічога не ведалі, што ў вёсцы робіцца. Вылезла потым, да акенца прыкінулася, а ў вёсцы агонь, гарыць усё, людзі крычаць".



*Галцеева А. А.*

Карнікі падпалілі вёску, сагналі сюды жыхароў з вёскі **Чарнышы** і расстралялі больш за 150 чалавек. Перад вызваленнем Лёзна, у **кастрычніку 1943 года,** ў **Хоцемлі** былі спалены апошнія хаты.

Жыхары Стасеўскага сельсавета адны з апошніх вярталіся да доўгачаканага мірнага жыцця. Да **чэрвеня 1944 года** тут ішлі жорсткія кровапралітныя баі за канчатковае вызваленне Лёзненшчыны. Праз вёску **Кляўцы** доўгі час праходзіла лінія абароны праціўніка. У **1943 годзе** былі спалены поўнасцю або амаль поўнасцю партызанскія вёскі **Канашкава, Забалацце, Вялікае Сяло, Шумшчына, Асінаўшчына, Кляўцы, Смародзіна, Свірбы, Шэркіна, Шарыкі, Пыжы, Баяры, Навароцце, Бычкова** і іншыя.



*Партызаны*

У вёсцы **Бычкова** да вайны было 68 двароў, пражывала ў ёй 205 чалавек дарослага насельніцтва і дзяцей. У вайну лясная вёска стала партызанскай. З жыхарамі вёскі Бычкова карнікі расправіліся ў некалькі прыёмаў: спачатку знішчылі мужчын, пазней, восенню 1943г., старых жанчын і дзяцей, усяго 42 чалавекі. Успамінае **Д. Б. Мініна**: "Нашых мужыкоў, недалёка да Варон, завезлі ў лес пад Цішкавам. Прымусілі яму сабе выкапаць, а тады абы - як іх пастралялі і ўсіх у адну магілу: і забітых і параненых. Казалі, зямля некалькі дзён туды - сюды качалася.



.                                                  *Мініна Д. Б.*



*Расстрэл*



*На папялішчы вёскі*

А нашых жанчын з дзецьмі і прыезжых (усяго з тры сотні) загналі ў дзве пуні і падпалілі".

## 2. *Асташэва – сястра Хатыні*

Гітлераўцы за час акупацыі правялі ў Беларусі больш за **140** карных экспедыцый, у час якіх цэлыя раёны ператварыліся ў **зоны пустыні**. У Беларусі не было ніводнага раёна, дзе б фашысты не спалілі населеныя пункты, не грабілі, не забівалі мірных жыхароў. Але больш за ўсіх пацярпелі ў

Віцебскай вобласці раёны, дзе былі партызаны. Загінуў кожны другі ў **Асвейскім, Верхнядзвінскім, Суражскім, Лёзненскім раёнах.**

Ні на адной геаграфічнай карце мы сёння не знойдзем вёску з назвай – **Хатынь**. Яе знішчылі карнікі.




*Мемарыял Хатынь.*

**22 сакавіка 1943 года** па загадзе фашыстаў былі спалены жывымі ўсе жыхары вёскі Хатынь паблізу Лагойска. У агні загінулі **149** чалавек, у тым ліку **76** дзяцей. Назва **"Хатынь"** стала сімвалам трагедыі беларускага народа ў гады вайны. Усяго ў Беларусі было знішчана больш за **2 млн. 200 тыс.** чалавек. Разам з жыхарамі спалена **627** вёсак, з якіх **186** так і не былі адноўлены пасля вайны.

Толькі тут, на 54-м км шашы **Мінск – Віцебск,** мы можам пабачыць **"Могілкі вёсак"**, знішчаных фашыстамі разам з людзьмі, знішчаных і неаднаўленых зноў. У **1966 годзе** ўрадам БССР было прынята рашэнне аб стварэнні на месцы спаленай вёскі Хатынь **мемарыяльнага комплекса "Хатынь"**. Адкрыццё мемарыяла адбылося **5 ліпеня 1969 года**, у дні святкавання **25-годдзя** вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Зараз у рэспубліцы налічваецца сотні вёсак, якія перажылі трагедыю Хатыні і паўсталі з попелу.

Вёска **Асташэва** нашага раёна ў ліку **433** спаленых і адноўленых вёсак Беларусі занесена ў спіскі мемарыяльнага комплекса "Хатынь".

У вёсцы **Асташэва** (Яськаўшчынскі сельсавет) да вайны было 40 двароў, у якіх жыло 120 чалавек.

**30 верасня 1943 года** ўсяго за некалькі дзён да вызвалення Лёзна, карны атрад акружыў вёску. Усіх, хто не паспеў уцячы ў лес, а сярод іх былі дзеці да трох гадоў, карнікі загналі ў хлеў і дзве лазні і падпалілі. У полымі задыхаліся, гарэлі жывымі **120** дзяцей, жанчын, старых.



*Карная экспедыцыя*



*С. М. Голубеў з сынам*

…На месцы дзвюх лазняў і хлява, што стаялі каля рэчкі, ляжалі абгарэлыя людзі і шмат касцей. Маці сваю пазнаў па кавалку шыняля пад ёй. Яна ніцма ляжала каля печкі. Ніхто з агню не вырваўся. А назаўтра паехалі ў Запожанку, прывезлі адтуль дзве шафы і куфар. Сабралі ў іх усе костачкі, апусцілі ў яму. Засталіся, лічы, круглымі сіротамі, адны падлеткі і моладзь.

**Вёска сірот** – так называлі нас доўгі час у раёне. (з успамінаў **Сяргея Мацвеевіча Голубева**).



*Помнік на месцы спаленай вёскі Асташэва (2014г.)*



*Вёска Асташэва сярод адноўленых вёсак ў Хатыні (2001г.)*

## 3. Вязні фашызму нашага раёна

Галоўным сродкам ажыццяўлення сваіх мэт фашысты зрабілі палітыку генацыду.

У Беларусі было створана больш за **260 лагераў смерці.** Адзін з іх каля вёскі **Малы Трасцянец**. У сістэме лагераў фашысцкай Германіі ён займае сумнае чацвёртае месца пасля **Асвенціма**, **Майданака** і **Трэблінкі** па колькасці знішчаных чалавек.



*Канцлагер Малы Трасцянец*

Каля **1 400** лёзненцаў, моладзі, дзяцей, пажылых людзей, прайшлі праз усе жахі і выпрабаванні, якія выпалі на долю вязняў **Бухенвальда, Майданака**, **Асвенціма, Дахау**, іншых фашысцкіх канцлагераў. Нямногім суджана было перанесці вытанчаныя здзекі, голад, уратавацца ад вогненных печаў крэматорыяў. Жывымі засталіся цудам. Вярнуліся, адкуль не вяртаюцца.



*Ваеннапалонныя Бухенвальда.*



*У. І. Кукавенка*

Праз усё гэта прайшоў жыхар вёскі Веляшковічы **У. І. Кукавенка.**

“Мы былі ў **Бухенвальдзе**. Асабліва аслабленых пасля дарогі людзей адразу ж адпраўлялі ў душагубку. У астатніх забіралі адзенне. Пасля душа загадвалі скакаць у вялізныя чаны для дэзінфекцыі. Выдавалі паласатыя кашулі.



*Крэматорый*

На левым рукаве кашулі быў чырвоны трохвугольнік з літарай “Р”. Я насіў нумар загінуўшага чэха 24 721. Праз нейкі час нас перавезлі ў канцлагер **Дора,** аддзяленне Бухенвальда ў Францыі. На работу ганялі ў горы, дзе мы з апошніх сіл высякалі сховішчы для самалётаў”.

**Яўгенія Ягораўна Логінава** з вёскі Матушова трапіла ў **Майданак**.



*Асвенцім*



*Аўсшвіц*



*Майданак*

Яна ўспаміна̀ла: “У нашым бараку спачатку было вельмі цесна. Аднак кожную раніцу сталі вызваляцца ўсё новыя і новыя нары : знаёмыя і незнаёмыя мне дзеці пасля ночы былі мёртвыя. Нас, дзяцей ад 5 да 15 гадоў, якія засталіся ў жывых, павезлі ў канцлагер **Лісманштат**. Там у нас праз кожныя 10 дзён бралі кроў”.





*Дзеці – вязні канцлагераў*



*Нумар вязня*

**Алену Ананьеўну Дружыніну** з вёскі Парыхі таварняк прывёз у Асвенцім: “Прывезлі ў лагер. Адразу ж сталі наколваць нумары, нават грудным дзецям і зусім старым людзям. Мой нумар быў 66011. Калі закончылі наколваць апошнюю лічбу, далі глыток вады. Потым нас, дзяцей, разлучылі з маці. Дзяцей павезлі ў канцлагер **Путуліца**, дзе я апынулася ў туберкулёзным аддзяленні бальніцы. Потым былі **Франкфурт**, **Дахау**, а вызвалілі нас амерыканцы. Быў лагер смерці і ў нашым раёне. Знаходзіўся ён у лесе каля вёскі **Мар’янова.**



*А. А. Дружыніна*

Гэта быў лагер вязняў **“5-га палка”**.

Назва ад тэрыторыі ў Віцебску, якая належала 5-му чыгуначнаму палку. Там быў фашысцкі лагер смерці, функцыянаваў ён з **верасня 1941года**. Спачатку праз гэты **“Віцебскі Майданак”** прайшло **120 тыс**. ваеннапалонных з якіх **75 тыс**. былі расстраляны або памерлі ад голаду і ад хвароб.



*Лагер вязняў пад вёскай Мар’янова (1943г.)*

У **сакавіку–красавіку 1943 года** “5-ы полк” быў ператвораны ў лагер смерці для грамадзянскага насельніцтва. Туды сагналі **20 тыс.** жыхароў з Віцебска і вёсак. У канцы **мая 1944 года** фронт набліжаўся да Віцебска. Застаўшыхся ў жывых адправілі ў лагер пад адкрытым небам пад вёску Мар’янова. Сюды трапілі дзеці з дзіцячых дамоў Віцебска, хворыя на сыпны тыф.

Вязні спалі пад адкрытым небам, харчаваліся карой дрэў, пілі ваду з балот. **3 чэрвеня 1944 года** іх вызвалілі савецкія воіны.



*Дзень вызвалення ( 3 чэрвеня 1944 г.)*



*Помнік вязням у вёсцы Мар’янова (2014 г.)*

У вёсцы Мар’янова (Радзіме Андрэйчанка У. П.) ў **1998 годзе** ўстаноўлена каплічка і помнік вязням фашызму.

У **2014 годзе** выйшла кніга **“5-ы полк”**, аўтары яе **А. М. Падліпскі і В. А. Різо**.



*Каля помніка ў в. Мар’янова.*
*Фота. А. Хітрова (1998г).*




*Вокладка кнігі Падліпскага А. М. і В. А. Різо (2014г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Што значыць” вогненныя вёскі”?*
2. *Што ты ведаеш пра лёс вёскі Хатынь?*
3. *Чаму вёску Асташэва называюць сястрой Хатыні?*
4. *Назавіце лагеры смерці ў Еўропе.*
5. *Дзе на Лёзненшчыне быў лагер смерці? Што ты пра яго ведаеш?*

## §20. Вызваленне нашага краю ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў

### *1. Вызваленне Лёзна і часткі раёна. 9 месяцаў на лініі фронта*

Актывізацыі партызанскай барацьбы ў значнай ступені садзейнічалі перамога савецкіх войскаў пад **Масквой** і зімовае наступленне Чырвонай Арміі (**снежань 1941 – студзень 1942гг.**), якія пахавалі гітлераўскую стратэгію **“маланкавай вайны”** і садзейнічалі ўзмацненню агульнай барацьбы супраць фашызму. Вялікі ўплыў на яе ўзмацненне аказала перамога пад **Сталінградам (лістапад 1942г**.), якая паклала пачатак **карэннаму пералому** ў ходзе Вялікай Айчыннай і Другой Сусветнай войнаў. Потым і бітва на **Курскай дузе (ліпень 1943г.**), якая завяршыла карэнны пералом у вайне і замацавала за СССР стратэгічную ініцыятыву да канца вайны.


*Сталінградская бітва*


*Курская бітва*

Пасля Курскай бітвы ў **1943 годзе** Савецкая армія разгарнула стратэгічнае наступленне на фронце шырынёй 2 000 кіламетраў – ад Невеля да Чорнага мора. Першым вызваленым раённым цэнтрам у Беларусі быў **Камарын (23 верасня)**, а затым наша **Лёзна (10 кастрычніка),** якое перажыло акупацыю працягласцю ў **822 дні.**

**7 кастрычніка 1943 года** часці Савецкай арміі падышлі да Лёзна і паспрабавалі авалодаць ім адразу. Аднак гэтая спроба не ўдалася. Абароне абласнога цэнтра **Віцебска** (40 км ад Лёзна), як важнейшага вузла чыгуначных і шашэйных дарог, фашысцкае камандаванне восенню **1943года**, зімой і вясной **1944 года** надавала вялікае значэнне, называючы яго **"шчытом Прыбалтыкі"**. Таму фашысты збудавалі на нашай зямлі ўмацаванні, названыя **“Мядзвежы вал”**: скразныя траншэі, дзоты,


*Наступленне савецкіх войск*

кулямётныя пляцоўкі затуляліся агароджай з калючага дроту, завалы, мінныя палі. Кожны ўчастак гэтага вала прастрэльваўся артылерыйска–мінамётным і кулямётным агнём. У 6 гадзін раніцы **8 кастрычніка 1943 года** немцы пачалі наступленне на Лёзна. Нечаканае з'яўленне танкаў з боку балот ашаламіла гітлераўцаў. Пакідаючы тэхніку і зброю, яны беглі па вуліцах, трапляючы пад агонь нашых стралкоў. Камандзір мехгрупы **47-й механізаванай брыгады** Дромаў дастаў са свайго танка чырвоны сцяг, і перадаў яго лейтэнанту **Канышкаву Кірылу Фёдаравічу.**
.


*Канышкаў К. Ф.*

Сцяг быў узняты над царквой, як сімвал пачатку вызвалення Беларусі (гэта быў першы сцяг перамогі на Віцебшчыне).

Адначасова з поўдня і захаду павялі наступ у кірунку да цэнтра Лёзна часці **158- й, 134- й і 91-й стралковых дывізій**. Артагнём іх падтрымаў **472-гі гаўбічны артылерыйскі полк** резерву. Ударам з трох бакоў нашы войскі авалодалі горадам Лёзна.

З аператыўнай зводкі за **9 кастрычніка 1943 года :** "На Віцебскім напрамку нашы войскі прасунуліся ад 4 да 6 кіламетраў, занялі больш за 40 населеных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Віцебскай вобласці – горад **Лёзна"**.



*Вызваленне Лёзна (кастрычнік1943 г.)*

Добра ўмацаваная фашысцкая абарона была зламана, але цяжкія баі за вызваленне гарпасёлка працягваліся да **10 кастрычніка**. Гэтая дата святкуецца ў раёне як дзень вызвалення. Але вызвалена была толькі частка Лёзненшчыны, на астатняй тэрыторыі раёна фронт спыніўся яшчэ на 9 месяцаў.

Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад **10 кастрычніка 1943года** пяці воінскім часцям і злучэнням, якія вызначыліся пры вызваленні Лёзна, было прысвоена ганаровае званне **"Лёзненскіх"**. Гэта **158-я стралковая дывізія, 28-я гвардзейская танкавая дывізія, 4-я знішчальна-процітанкавая артылерыйская брыгада, 472-гі гаўбічны артылерыйскі полк, 114-ы матарызаваны інжынерны батальён (камандзір маёр А. І. Мірзоеў).** Дзевяць доўгіх месяцаў – з **кастрычніка 1943 года па ліпень 1944 года** – на Лёзненшчыне не сціхалі баі, тут праходзіла передавая лінія фронту.



*Помнік 158 стралковай дывізіі (2015г..)*

На Лёзненшчыне па ўсёй лініі фронту кожны дзень ішлі цяжкія, кровапралітныя баі. Нездарма, тут загінула каля **30 тысяч салдат і афіцэраў**, а ў вёсцы **Стасева** знаходзяцца адзіныя ў постсавецкім прасторы афіцэрскія могілкі.




*Воінскі мемарыял. Стасева (2013г.)*



*Афіцэрскія могілкі. Стасева (2013г.)*

**18 кастрычніка 1943 года** павёў батальён у наступленне на моцны рубеж абароны немцаў у раёне **вёскі Фокіна** гвардыі капітан **Пацёмкін Генадзь Фёдаравіч** і смерцю храбрых загінуў у гэтым баі. У партыйным білеце знайшлі лісток з яго вершам – клятвай.






*Пацёмкін Генадзь Фёдаравіч* *Партыйны білет Пацёмкіна Г. Ф.*

**14 лістапада 1943 года** каля **вёскі Шумшчына** здзейсніў свой подзвіг **Уладзімір Яфімавіч Смірноў**. Гвардыі старшы сяржант, падобна **Аляксандру Матросаву**, кінуўся на варожы кулямёт і цаной уласнага жыцця забяспечыў праход сваёй роты.



*Помнік У. Я. Смірнову. Вялікае Сяло. 2012г.*



*Помнік савецкім воінам загінуўшым у в. Кляўцы*




*Помнік воінам-вызваліцелям. Вялікае Сяло (2012 г.)*

**17 студзеня 1944 года** ў баі за **вёску Крынкі** была смяротна паранена гвардыі сяржант экіпажа танка “Боевая подруга” **М. В. Акцябрская**. Пахавана (крэміравана) яна ў Сцяне Славы ў садзе імя М. І. Кутузава горада Смаленска.







*Акцябрская М. В. Помнік М. В. Акцябрскай у Крынках. (2015г ) Экскурсія ў Смаленск (2002г.)*

 

**25 лютага 1944 года** на захад ад **мястэчка Дабрамыслі**, на безыменнай вышыні **38 мінамётчыкаў** пад камандаваннем старшага лейтэнанта **Леаніда Паўлавіча Ціхмянава** мужна змагаліся з намнога перавышаючымі сіламі праціўніка. Больш за 14 гадзін адбівала атакі фашыстаў акружаная з усіх бакоў мінамётная батарэя. **8 воінаў** загінулі,астатнія атрымалі раны і кантузіі.

*Ціхмянаў Л. П.* *Багамолаў С. А.*

За подзвіг на вышыні ўсе ўдзельнікі бою былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а **Леаніду Паўлавічу Ціхмянаву** і малодшаму лейтэнанту медыцынскай службы **Сяргею Аляксандравічу Багамолаву** было прысвоена званне **Героя Савецкага Саюза.**

А безыменная вышыня стала называцца **Ціхмянаўскай.**
Там **19 лістапада 1972 года** быў узведзены мемарыяльны комплекс.

 

*Ціхмянаўская вышыня ў вёсцы Асіпенкі (2013г.)*

## *2. Аперацыя "Баграціён" – вызваленне Беларусі. Памяць аб вайне*

У **1944 годзе** пачаўся завяршальны этап Вялікай Айчыннай і Другой Сусветнай войнаў – поўнае выгнанне акупантаў з савецкай зямлі і вызваленне народаў Еўропы ад фашысцкага рабства.

Значную ролю ў рашэнні гэтых задач адыграла Беларуская наступальная аперацыя пад кодавай назвай **"Баграціён"**. Для яе ажыццяўлення прыцягваліся 4 франты (3-ы Беларускіх і 1- Прыбалтыйскі). Дзеянні франтоў каардынавалі маршалы Савецкага Саюза **А. В. Васілеўскі і Г. К. Жукаў**. Задума савецкага камандавання заключалася ў наступным.

Франты, выкарыстоўваючы дапамогу партызан і мясцовых жыхароў, адначасова пераходзяць у наступленне на віцебскім, аршанскім і бабруйскім напрамках і магутнымі ўдарамі разбураюць абарону праціўніка, акружаюць і знішчаюць яго групоўкі ў раёнах Віцебска і Бабруйска, а затым наносяць удары па напрамках на Мінск з мэтай акружэння і знішчэння асноўных сіл арміі **"Цэнтр"** у так званых катлах.

**12 марта 1944 года** з дапамогай **99 ТГАБр** (гаўбічнай брыгады) былі вызвалены вёска **Крынкі, Ціхмянаўская вышыня.**

У канцы **сакавіка 1944 года** ішлі абарончыя баі каля станцый Выдрэя і Крынкі, вёскі Рэчкі, возера Шэлахава. У **маі 1944 года** сюды пераехаў штаб брыгады, КП перамясціўся на вышыню 181,3, адсюль пачалася беларуская аперацыя **"Баграціён".**




*Карта. Аперацыя "Баграціён"(1944г)*

Пачалася аперацыя "Баграціён" **23 чэрвеня 1944 года** нечакана для ворага. Немцы меркавалі, што ўдар савецкіх войск адбудзецца ва Украіне. Аднак аперацыя пачалася ў Беларусі праз цяжкапраходныя балоты і лясы, дзе гітлераўцы ўдару не чакалі.

У выніку наступальнай аперацыі **23 чэрвеня 1944 года** былі вызвалены **Высачаны, Буракі, Курцёнкі, Шніткі, Гарэлікі**. Адным словам, уся астатняя частка раёна. **99 гаўбічнай артылерыйскай брыгадзе** пад камандаваннем палкоўніка **Сямёна Іванавіча Далгова** за вызваленне **Віцебска** прысвоена ганаровае званне **"Віцебская"**, а Вярхоўны Галоўнакамандуючы аб'явіў падзяку ўсяму асабістаму складу дывізіі.



*Мемарыяльны комплекск воінам 99 гаўбічнай ТРАБр (1982г.)*




*Штаб брыгады КП*

Непадалёку ад **Крынак** у **1979 годзе** на месцы каманднага пункта быў адкрыты мемарыял **99-ай цяжкай гаўбічнай артылерыйскай брыгадзе.**

Ужо на трэці дзень аперацыі, **26 чэрвеня 1944 года,** быў вызвалены **Віцебск**, а затым і **Орша**. Пасля вызвалення Бабруйска разгарнуліся баі на мінскім напрамку. Раніцай **3 ліпеня 1944 года** пачаліся баі за вызваленне **Мінска**. На працягу дня захопнікі былі выбіты з нашай сталіцы.

Па заканчэнні вайны **12 гарадам** СССР было прысвоена ганаровае званне **"Горад – герой"**. Сярод іх – наша сталіца горад **Мінск** і **Брэсцкая крэпасць**.

У **1954 годзе** у цэнтры **Мінска** ўзведзены **Манумент Перамогі,** які сімвалізуе перамогу савецкага народа над фашысцкай Германіяй. У Беларусі створана шмат мемарыяльных комплексаў, якія ўвекавечваюць подзвігі савецкіх воінаў і партызан. Гэта **Курган Славы** на 21- м кіламетры шашы Мінск – Масква ў гонар подзвігу **воінаў 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў**, якія вызвалялі Беларусь.



*Курган Славы*

Манумент у гонар **Маці-патрыёткі** ў горадзе **Жодзіне,** прысвечаны беларускай жанчыне – **маці Н. Ф. Купрыянавай,** усе 5 сыноў якой аддалі жыццё за Радзіму.

Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ў Мінску быў створаны **Музей Вялікай Айчыннай вайны**. Наведайце яго! Прачытайце кнігу **"Ніколі не забудзем"**. Няма ў Беларусі такога кутка, які б не стаў месцам здзяйснення народнага подзвігу. І няма месца, дзе б ні шанавалі гэтыя помнікі. **Помніце аб гэтым і вы!**



*Манумент маці-патрыёткі ў Жодзіне*



*Музей Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску (2014 г.)*




*Кніга ўспамінаў" Ніколі не забудзем"*

***Пытанні і заданні:***

*1. Калі было вызвалена Лёзна і хто ўзняў сцяг перамогі над царквой?*
*2. Чаму аперацыя па вызваленню Беларусі называлася "Баграціён"?*
*3. Калі скончылася Вялікая Айчынная вайна і Другая Сусветная?*
*4. Калі мы адзначаем дзень Перамогі?*
*5. Чаму мы павінны памятаць гэту вайну?*

## §21. Пераход да мірнага жыцця. Аднаўленне народнай гаспадаркі раёна

### 1. *Страты Лёзненскага раёна*

У БССР загінуў **кожны трэці жыхар** на гэтай вайне, а ў нашым раёне нават **кожны другі.** Матэрыяльныя страты БССР склалі звыш паловы яе нацыянальнага багацця, **(75 млрд. рублёў)**. Ворагі разбурылі і спалілі **209** гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, **9 200** вёсак, знішчылі ці вывезлі ў Германію больш за **10 тысяч** прамысловых прадпрыемстваў. Знішчылі **7 тысяч школ**.
У **1945 годзе** ўзровень прамысловай вытворчасці ў рэспубліцы быў у 5 разоў ніжэйшы, чым у **1940 годзе.**

Нягледзячы на ўсе пасляваенныя цяжкасці, людзей не пакідала надзея на іх паспяховае пераадоленне. Калі такую вайну выстаялі, то і адновім краіну зноў!

У **кастрычніку 1943 года** яшчэ грымелі гарматныя залпы, курыліся папялішчы і паштальёны прыносілі пахавальныя паведамленні, а на шматпакутнай лёзненскай зямлі, вызваленай ад фашысцкай няволі, пачалося новае стваральнае жыццё.



*Лёзна ў кастрычніку 1943 года*



*Каля спаленай хаты. Лёзна. ( 1943г.)*

Жудасную спадчыну пакінулі пасля сябе гітлераўцы ў нашым раёне.
Яны зруйнавалі і разрабавалі ўсе калгасы і саўгасы, 4 ільнозаводы, маслазавод, тэкстыльную фабрыку імя Карла Маркса, 3 цагельныя заводы, 2 электрастанцыі, 3 МТС, чыгуначную станцыю, знішчылі тэлефонную і тэлеграфную сувязь. Фашысты вывезлі ў Германію ўсё абсталяванне заводаў, шмат трактараў і іншай сельгастэхнікі, а таксама ўсе каштоўнасці і маёмасць, якая належала арганізацыям і ўстановам.

Яны разрабавалі і знішчылі **5** сярэдніх, **23** няпоўныя сярэднія, **60** пачатковых школ, **46** бібліятэк, 19 хат – чытальняў, радыёвузел, 4 бальніцы, санаторый усесаюзнага значэння **“Чарніца”** (у гады вайны ваенны шпіталь), дом адпачынку **“Завольша”**. Было спалена **4700** дамоў калгаснікаў, **4649** гаспадарчых пабудоў калгасаў. Ад **45 населеных пунктаў** засталіся адны назвы. Так, на тэрыторыі Глоданскага сельсавета з 911 дамоў уцалела толькі 8. Агульныя матэрыяльныя страты, нанесеныя раёну, склалі ў грашовым падліку больш за **60 мільёнаў рублёў**.

Што датычыцца нашага пасёлка Лёзна, то ён быў зраўнаваны з зямлёй. У ім захавалася толькі некалькі дамоў, шмат пячных труб і белая прыгожая царква. Людзі жылі ў зямлянках, дапамагаліі адзін аднаму.





*Лёзна. Жыццё ў зямлянках 1943г. Лёзна. Кастрычнік1943 г. Лёзна. Вуліца Шасейная1943г.*

**4 лістапада 1943 года** быў зацверджаны склад Лёзненскага райкама КПБ, у які ўвайшлі **А. Ц. Шчарбакоў, М. К. Багданаў, У. А. Руноў.**

Асноўнымі задачамі былі асваенне вызваленай тэрыторыі раёна, аднаўленне мясцовай прамысловасці, адраджэнне МТС, улік і захаванне пагалоўя коней, будаўніцтва жылля, падрыхтоўка да веснавой сяўбы.

Да ўсіх пасляваенных нягод дадаліся інфекцыйныя захворванні, дзясяткі выпадкаў якіх былі зарэгістраваны ў першыя месяцы пасля вызвалення. Аднаўленне раёна ўскладнялася тым, што Лёзненшчына працягвала заставацца прыфрантавой тэрыторыяй, каля якой на працягу 9 месяцаў затрымаўся фронт.

З гэтага вынікае тое, што вайна працягвалася і ўсё мужчынскае насельніцтва раёна ваявала.

Усе нягоды аднаўленчага перыяду выпалі на долю жанчын і падлеткаў, да таго ж захоўвалася пэўная ступень небяспекі ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі, якія працягваліся.

Усім пасляваенным цяжкасцям, голаду і разбурэнням лёзненцы проціпаставілі мужнасць і згуртаванасць, гарачае жаданне хутчэй падняць з руін свой родны край.

## 2. *Аднаўленне народнай гаспадаркі Лёзненскага раёна*

Аднаўленне зруйнаванай вайной гаспадаркі БССР стала магчымым дзякуючы самаадданай працы ўсяго беларускага народа, які ўзяўся за аднаўленне сваіх гарадоў і вёсак, знішчаных вайной.

Так, напрыклад, унёс значны ўклад у паспяховае эканамічнае развіццё рэспублікі былы партызан (наш зямляк), сталявар Мінскага аўтазавода **Дзмітрый Іванавіч Барашкін**, які за свае працоўныя заслугі стаў **ганаровым грамадзянінам сталіцы БССР горада Мінска**.



*Д. І. Барашкін*



*Сталявар.*
*Мал. І. І.Сабалевай (2004г.)*



*МАЗ 1968 года*

Да **лютага 1944 года** было адноўлена **133** калгасы, 3 МТС, 73 паўразбураныя дамы, пабудаваны 74 новыя, адкрыта 11 магазінаў, 2 сталовыя, 12 нарыхтоўчых пунктаў, хлебапякарня, пабудаваны новы паравы млын у Лёзне, адноўлены райпрамкамбінат, кузня, швейная і абутковая арцелі і інш. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, была праведзена веснавая сяўба **1944 года**. Калгаснікі, пераважна гэта былі жанчыны і падлеткі, дапамагалі збіраць насенне, з-за адсутнасці коней у плугі і бароны запрагаліся самі, запрагалі ўласных кароў.



*Ворыва на каровах*



*Аднаўленчыя работы*

Патрэбны былі трактары, трактарысты. Пры Лёзненскім **МТС** былі адкрыты курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў. З **83** чалавек, якія там займаліся, **40** былі дзяўчаты. Пачала аднаўляцца школьная сетка. **1 сакавіка 1944 года** ў прыстасаваных сялянскіх хатах працавала **35** школ, у якіх вучылася каля 3 тысяч дзяцей.


Ленінскі сцяг

*Газета "Ленінскі сцяг"*

Большасць школ працавала ў 3 змены, з-за адсутнасці парт вучні часта займаліся стоячы. Аднавіўся выпуск раённай газеты **"Ленінскі сцяг"**, якая выдавалася з 1938 года.

У аднаўленні народнай гаспадаркі раёна актыўны ўдзел прымалі камсамольцы і моладзь раёна. Яны будавалі дамы, працавалі на расчыстцы дарог ад снежных заносаў, збіралі кнігі для школ, школьную маёмасць, даглядалі магілы чырвонаармейцаў.

Насельніцтва Лёзненшчыны чым магло дапамагала дзяржаве, каб хутчэй наблізіць жаданую перамогу. Але **ўраджай 1946 года** быў яшчэ ў 2,5 разы ніжэйшы за даваенны. Пасяўныя плошчы за гады вайны спустошыліся. Шмат палёў засталіся замініраванымі. Існавала картачная сістэма да **1947 года**.

Аднак сітуацыя паступова мянялася. **5 красавіка 1947 года** было канстатавана, што ў раёне адноўлены ўсе **179** калгасаў, якія існавалі да вайны, **3** МТС, **2** саўгасы. У выніку планы паставак дзяржаве збожжа, бульбы і прадуктаў жывёлагадоўлі былі выкананы.

У **1949 годзе** калгасы раёна за здадзеную ільнопрадукцыю атрымалі 2154т пшаніцы, 2600 тыс. рублёў. Добрых вынікаў дасягнулі калгасы **"Інтэрнацыянал", "Новае жыццё", "Камінтэрн"**.

За 4 пасляваенныя гады былі адноўлены разбураныя вайной прадпрыемствы, МТС, школы, бальніцы, установы культуры, пабудавана каля 9 тыс. жылых дамоў.

Да **1950 года** былі адноўлены і працавалі 6 арцеляў прамысловай і інваліднай кааперацыі, ільнозавод, торфазавод **"Высачанскі бор".**

У 4 калгасы была праведзена электрычнасць. Тым не менш аб'ёмы вытворчасці заставаліся невысокімі, і толькі ў **1954 годзе** ўзровень вытворчасці прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў раёне перавысіў даваенны.

У 50 – 70-х гадах у нашым пасёлку Лёзна на вуліцы Леніна былі пабудаваны: СШ №1 у 1952 годзе, раённая бібліятэка ў 1962 годзе, РДК у 1959 годзе, дзяржаўны банк у 1957 годзе і іншыя. Насельніцтва перасялялі з зямлянак у жылыя дамы. Самыя першыя 2 каменныя такія дамы ўзніклі каля РДК, дарэчы будаўнічыя матэрыялы былі прадстаўлены бясплатна. За чыгункай на такіх жа умовах таксама было пабудавана некалькі дамоў.



*Будынкі на вуліцы Леніна ў 50-70-х гадах*

Пачатак **50-х гадоў** акрэсліўся разгортваннем **навукова-тэхнічнай рэвалюцыі**, якая ахапіла развітыя краіны свету. Развіццё гаспадаркі БССР таксама характарызавалася спробамі яе пераходу да навукова-індустрыяльнага тыпу на аснове ўвядзення комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі.

У **1955 годзе ў гарадскім пасёлку Лёзна** ўступіў у строй **кансервава-агароднінасушыльны камбінат.**









*Кансервава-агароднінасушыльны завод (1985г.)* *Віды прадукцыі завода*




*Карта. Прадукцыя завода ішла ва ўсе куткі СССР*

У **чэрвені 1958 года** была створана **міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (МБА)**, у **1960 годзе – камбінат бытавога абслугоўвання (КБА).** Раён на працягу многіх гадоў быў удзельнікам **ВДНГ СССР**.





*Камбінат бытавога абслугоўвання* *Цэх массавага пашыву аддзення*

**Героямі Сацыялістычнай Працы** сталі:

**М. А. Эзерын, І. А. Глядчанка, М. Я. Ігнатава, М. І. Шалупкіна, І. С. Самуйлаў, Р. У. Кубліцкая.**



*М. А .Эзерын*



*І. С. Самуйлаў*



*М. Я. Ігнатава*

Калгас **“Чырвонаармеец”**, прадукцыя якога была прадстаўлена на ВДНГ СССР і адзначана Дыпломам І ступені і залатым медалём, быў у той час передавой гаспадаркай. А ў **1957 годзе** калгас **“Чырвонаармеец”** першы ў Віцебскай вобласці стаў **калгасам - мільянерам.** Старшынёй яго 13 гадоў быў **А. Я. Сахараў** – ветэран Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэна Чырвонага Сцяга і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У **1962 годзе** была спынена работа **ГЭС** у Лёзне, якая працавала тут з 30-х гадоў. Замест яе была пабудавана першая падстанцыя на 35/10 квт. і **Дабрамыслінская ГЭС.**

## *3. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё насельніцтва (1945–1965гг.)*

У пасляваенныя гады ў БССР, як і ў СССР, захавалася панаванне таталітарнага сталінскага рэжыму.

У БССР была забаронена шматпартыйнасць. Камуністычная партыя была арганізацыяй, якая ажыццяўляла функцыі заканадаўчай і выканаўчай улады. У **1947 годзе** адбыліся першыя ў пасляваенныя гады выбары ў Вярхоўны Савет БССР, а **ў 1948 годзе –** у мясцовыя Саветы Рэспублікі.



*Хрушчоў М. С.*



*XX з’езд КПСС*



*Мазураў К. Т.*

Пасля смерці І. В. Сталіна **(5 сакавіка 1953 года)** у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, як і ўсёй краіны, пачаўся адыход ад сталінскай рэпрэсіўнай сістэмы. Ён быў звязаны з прыходам да кіраўніцтва краінай **Мікіты Сяргеевіча Хрушчова** і яго курсам на дэсталінізацыю грамадства.

Палітычны курс М. С. Хрушчова атрымаў у гісторыі назву **” курсу ХХ з’езда”**, таму што менавіта на ім у **1956 годзе** кіраўнік КПСС упершыню ўзняў пытанне аб **кульце асобы Сталіна** і злоўжываннях у час яго праўлення.
У БССР пасаду першага сакратара ЦК КПБ займаў, пачынаючы **з 1956 года**, **Кірыл Трафімавіч Мазураў** – актыўны ўдзельнік партызанскай барацьбы ў гады вайны з фашызмам. Ён быў першым беларусам, які заняў гэту пасаду.

Тыя мерапрыемствы, якія праходзілі ў СССР і адпаведна ў БССР пасля смерці Сталіна, атрымалі ў літаратуры назву палітыкі **“адлігі”**.

У грамадскім жыцці моладзі вызначальную ролю адыгрываў **камсамол**, але ён таксама з’яўляўся рэзервам Камуністычнай партыі. Камсамольцы Беларусі ўнеслі свой уклад у развіццё эканомікі як сваёй рэспублікі, так і ўсёй Савецкай краіны. Вялікі ўклад унеслі камсамольцы і моладзь Лёзненскага раёна ў будаўніцтва жылля для тых, хто яшчэ жыў у зямлянках. Са 161 будаўнічых брыгад Лёзненшчыны – 35 былі маладзёжныя. Толькі ў **1947 годзе** брыгада **Івана Райценкі** з калгаса імя Варашылава пабудавала **9** зрубаў, а ў калгасе **“Бязбожнік”** Унаўскага сельсавета было пабудавана **52** дамы. Піянеры і школьнікі дапамагалі дарослым. Для ўгнаення палёў яны сабралі **426 ц** попелу.

З **1956 года** калгаснікам сталі назначаць **пенсіі** па старасці і інваліднасці, сяляне атрымалі **пашпарты** і сталі адчуваць сябе больш паўнапраўнымі грамадзянамі краіны. Амаль **за 10** гадоў, з 1956 па 1965 гады, у рэспубліцы звыш **3 млн. чалавек** атрымалі жыллё (у гарадах **“хрушчоўкі”**). Таму і моладзь як мага хутчэй імкнулася пакінуць вёску і пераехаць у горад.

Па перапісе **1959 года** пісьменнае насельніцтва ў рэспубліцы склала **99%** (у 1939 годзе было 80,8). Вялікім дасягненнем з’явілася тое, што ў БССР з **1959 года** была уведзена абавязковая **8-гадовая адукацыя** дзяцей. Уводзіліся **ПТУ** (прафесіянальна–тэхнічныя вучылішчы). Але хутка пачалася шырокая кампанія па пераводу беларускамоўных школ у рускамоўныя. Наогул, улада прывучыла савецкага чалавека да абмежаванняў сваіх патрэб.



*“Хрушчоўка”*

Таму абсалютная большасць насельніцтва таго часу абыходзілася без кватэрнага тэлефона, не мела радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў і на ўсе нягоды адказвала: **“Толькі б не было вайны”**.

***Пытанні і заданні:***

*1. Падлічы страты, нанесеныя вайной рэспубліцы і раёну.*
*2. Калі была адноўлена народная гаспадарка нашага раёна?*
*3. Як жылі лёзненцы падчас хрушчоўскай адлігі?*
*4. Хто такія камсамольцы піянеры і што яны рабілі?*
*5. З якога года пачалі выдаваць пашпарты і пенсіі жыхарам БССР?*

## §22. Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё раёна ў 60 – 90 гады XX стагоддзя

### 1. *Грамадска – палітычнае жыццё ў краіне*



*Брэжнеў Леанід Ільіч*

У **кастрычніку 1964 года Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў** быў зняты з пасады **Першага сакратара ЦК КПСС**. Кіраўніком партыі, а значыць і ўсёй дзяржавы, стаў **Леанід Ільіч Брэжнеў**, гады ўлады якога (**1964 – 1982 гг.**) атрымалі ў некаторых гісторыкаў вельмі яскравую назву – **застой**.

Асаблівасцю палітычнай сістэмы таго часу стала непасрэднае прамое партыйнае кіраўніцтва эканомікай (так, планы пяцігодак прымаліся на з'ездах КПБ, стваралася вялікая армія партыйна – дзяржаўных бюракратаў, якая кіравалася зверху, з Масквы).



*Машэраў Пётр Міронавіч*

Але сярод партыйных кіраўнікоў былі сапраўдныя дзеячы, якія не страцілі сувязь з народам. Такім з'яўляўся **Пётр Міронавіч Машэраў**, які з **1965 па 1980 гады** ўзначальваў рэспубліканскую партыйную арганізацыю. Усеўладдзе бюракратаў у краіне сведчыла аб тым, што рэспубліка, як і ўвесь СССР, спынілася ў сваім грамадска - палітычным развіцці. У гэты час была прыпынена рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій, узмацнілася роля **КДБ**. Адсутнасць свабоды слова выяўлялася ў кантролі партыі сродкаў інфармацыі.

Знешне складвалася ўражанне, што ўлада і народ знаходзяцца ў поўнай згодзе і што ніякіх пагроз рэжыму не існуе. На **XXIV з'ездзе КПСС у 1971 годзе** Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў заявіў, што ў краіне ўжо "ўзнікла новая гістарычная супольнасць людзей – **савецкі народ**".

Галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі з'явіўся пераход да **ўсеагульнай сярэдняй адукацыі**, які адбыўся ў рэспубліцы **ў другой палове 70-х гг**. Калі ў **1965 годзе** сярэднюю адукацыю ў БССР атрымалі **50 тыс**. чалавек, то ў **1985 годзе** – каля **170 тыс**.

Але школы і настаўнікі вымушаны былі цягнуць да атэстата аб сярэдняй адукацыі і тых, хто не імкнуўся да гэтага ці наогул быў няздольны засвоіць праграму сярэдняй школы. У **1985 годзе** у рэспубліцы дзейнічала **33 ВНУ**, у якіх навучалася **182 тысячы студэнтаў**. Выпуск кадраў спецыялістаў з 1960 па 1985 гады павялічыўся больш як у 3 разы. Але не заўсёды якасць спецыялістаў адпавядала міжнародным стандартам.

На прадпрыемствах Беларусі выраблялася прадукцыя, якая служыла выкарыстанню энергіі атама, асваенню космаса. Беларусы **Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак** сталі сусветнавядомымі **лётчыкамі-касманаўтамі** СССР.

Аднак застой у грамадстве аказваў адмоўны ўплыў на навуку, якая была праваднікам партыйнай ідэалогіі ў СССР.

Жудасныя факты недаверу да людзей, якія ў час вайны апынуліся пад немцамі, знайшлі зноў у палітыцы партыі сваё месца( рэпрэсіі).

У партыйных патрабаваннях да літаратуры на першае месца вылучалася **ідэйная** накіраванасць твораў і іх адпаведнасць установкам партыі па **камуністычным выхаванні чалавека.**



*Увод і вывад савецкіх войск. Афганістан*

Увод савецкіх **войск (1979–1989гг.) у Афганістан** тлумачыўся неабходнасцю дапамогі паўднёваму суседу СССР у яго барацьбе за самастойнае развіццё, хаця сапраўды гэта было падтрымкай палітычнага рэжыму, які сімпатызаваў КПСС.

У далейшым увод войскаў у Афганістан быў прызнаны палітычнай памылкай. Але **789 беларускіх хлопцаў** загінулі там, сярод іх **нашы землякі : А. В. Бельчыкаў, С. І. Старавераў, В. Л. Лахцеева** – ў цынкавых трунах спецыяльнымі самалётамі, што атрымалі назву **"чорны цюльпан",** былі дастаўлены на Радзіму. Усяго з СССР загінула ў Афганістане 15 тыс. чалавек.









*А. В. Бельчыкаў     С. І. Старавераў     В. Л. Лахтеева     Помнік афганцам ў Лёзне (2014г)*

## *2. Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё раёна падчас палітыкі застою і перабудовы (1965–1994гг.)*

**Эканамічная рэформа Касыгіна ( 1965 года**), якая прадугледжвала ўвядзенне элементаў рыначнай эканомікі, закончылася няўдачай, таму што па-ранейшаму праводзілася ў жыццё каманднымі метадамі. Пераход на **інтэнсіўны шлях** развіцця аказаўся задачай цяжкай і невырашальнай. Пасля рэформы павялічыўся аб'ём будаўніцтва, але доля ручной працы ў ім складала каля **57%**, а аб'екты здаваліся з недаробкамі. Развіваўся і транспарт, у прыватнасці з **1984 года** ў Мінску пачало дзейнічаць метро.

Камсамол БССР прыняў удзел у будаўніцтве Байкала-Амурскай чыгуначнай магістралі (**БАМ**), якую называлі **будоўляй стагоддзя**.

Развівалася **каляровае тэлебачэнне**. Пачалася вытворчасць персанальных **ЭВМ,** але людзі дзесяцігоддзямі чакалі ўстаноўкі кватэрных тэлефонаў.



*Каляровае тэлебачанне*



*Першыя камп'ютары*

У сельскай мясцовасці мала будавалася жылля, клубаў, не ўдзялялася належнай увагі будаўніцтву дарог, стварэнню ўмоў працы і быту механізатараў. Нядзіўна, што значная частка сельскага насельніцтва, асабліва моладзь, выязджала на жыхарства ў горад.

Старыя паміралі, і шмат вёсак знікалі з твару раёна як **неперспектыўныя**. У вёсцы **Красыншчына** Лёзненскага сельсавета яе былы жыхар **Аляксей Пятровіч Мастакоў** стварыў помнік былым жыхарам гэтай вёскі і напісаў кнігу. Сам жа А. П. Мастакоў кожны год прыязджае з Віцебска сюды і жыве ўсё лета. І хочацца сказаць: "Ёсць такая вёска – Красыншчына!".



*Помнік вёсцы Красыншчына (2001г.)*



*А. П. Мастакоў у вёсцы.*




*Вокладка кнігі А. П. Мастакова*

У пачатку 80-х гадоў харчовае забяспячэнне насельніцтва значна пагоршылася. Была нават распрацавана і прынята ў **1982 годзе “Харчовая праграма СССР”.** АПК павінен быў забяспечыць насельніцтва харчовымі прадуктамі, але ўся гэтая “мітусня” вакол **АПК** толькі стварала новыя месцы для бюракратыі, ад якой сельскай гаспадарцы было мала карысці. Аднак БССР у тыя гады назвалі ў народзе **адкормачным цэхам Савецкага Саюза**, таму што тут былі сканцэнтраваны адкорм буйна-рагатай жывёлы, свіней, малочная жывёлагадоўля.

З **1982 года** ў раёне пачалі надаваць сур’ёзную ўвагу будаўніцтву на сяле і ў райцэнтры. У **1978 годзе** СШ №1 пачала працаваць у новым будынку.

Некаторыя будынкі сацыяльна-бытавога і культурнага прызначэння дагледжаны з любоўю і густам. Гэта **Дамы жывёлавода** ў Кавалях, Крынках, калгасе “Звязда”, **Дом быту** ў калгасе “Савецкая Беларусь”, Дом сацыяльных паслуг у вёсцы Загарадна, **сталовая-кафэ** ў калгасе імя Леніна, дзіцячае кафэ ў Лёзне, **Дамы культуры** ў Крынках і Міхалінаве. Было пабудавана 5 клубаў. У райцэнтры працавала школа мастацтваў, **кінатэатр “Світанак**”.

Пры раённым Доме культуры працавалі 2 народныя калектывы – хор раённага Дома культуры і аркестр народных інструментаў.



*Дзядкова Тамара Дзмітраўна*



*Дом піянераў на вуліцы Шасейнай (2003г.)*

Фальклорны дзіцячы ансамбль **“Прасніца”** створаны ў **1972 годзе** пад кіраўніцтвам **Тамары Дзмітраўны Дзядковай Дома піянераў і школьнікаў** у 1981 і 1987 гадах стаў лаўрэатам 4-га Рэспубліканскага агляду дзіцячай мастацкай творчасці, рэспубліканскіх тэлевізійных конкурсаў юных выканаўцаў **“Чырвоныя гваздзікі”**, удзельнікам 2-га Усесаюзнага конкурса **“Свята”** (1988 года). Яны нават пабывалі ў **ГДР** ( зараз Германія).



*Дзіцячы ансамбль “Прасніца”*



*Рэспубліканскі конкурс «Чырвыныя гваздзікі”(1987г.)*

За гады **12-й пяцігодкі** ў раёне было пабудавана 5 агульнаадукацыйных школ, 3 дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Усяго працавала **32** агульнаадукацыйныя школы, **27** дзіцячых дашкольных устаноў, **міжшкольны вучэбна - вытворчы камбінат**.

Справай навучання і выхавання займаліся больш за **370** настаўнікаў, каля **140** выхаваццеля дзіцячых дашкольных устаноў. Цяжкасці ў эканоміцы, аднак, заключаліся ў тым, што распрацаваных шляхоў выхаду з эканамічнага крызісу сацыялістычнай эканомікі не было ні ў тэорыі, ні на практыцы. Аб пераходзе да рынку пакуль нічога не гаварылася. Шукалі нейкі трэці **шлях паміж каманднай сістэмай і рыначнай эканомікай.**

У такім напрамку і ішло абмеркаванне 12-га пяцігадовага плана развіцця БССР на **1986–1990гг. на XXX з'ездзе КПБ.** Створана была таксама рэспубліканская комплексная праграма **"Інтэнсіфікацыя"** (перавод на гаспадарчы разлік і самафінансаванне). Стан сельскай гаспадаркі пагоршыўся, для забеспячэння насельніцтва харчовымі прадуктамі была ўведзена сістэма талонаў. Эканамічнае становішча БССР рэзка пагоршылася ў сувязі з аварыяй на **Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі**, што адбылася **26 красавіка 1986 года.** Эканамічны ўрон, нанесены Беларусі аварыяй, ацэньваецца, па падліках вучоных, у **32 гадавыя рэспубліканскія бюджэты**, а вынікі для здароўя людзей наогул непрадказальныя. З забруджаных тэрыторый на новае месцажыхарства за **1986 – 1992 гг**. пераехала звыш **130 тыс** чалавек. Лёзненшчына таксама гасцінна прыняла перасяленцаў.

Спыніць крызісныя працэсы, якія нарасталі ў эканоміцы, вывесці краіну на шлях устойлівага развіцця нельга было метадамі, што склаліся за гады **сталінска-брэжнеўскага** кіраўніцтва. Ва ўмовах тагачаснай палітычнай сістэмы ідэя пераўтварэнняў магла ўвасобіцца ў жыццё толькі па ініцыятыве верхняга эшалона ўлады. У **1985 годзе** новым кіраўніком ЦК КПСС **Міхаілам Сяргеевічам Гарбачовым** быў аб'яўлены курс на паскарэнне сацыяльна–эканамічнага развіцця і дэмакратызацыю палітычнага жыцця, які атрымаў назву **перабудова**. БССР у той час набыла аблічча адной з самых **кансерватыўных рэспублік**, якая была прыхільна да ўсяго састарэлага, устойлівага, традыцыйнага, што выклікала супрацьдзеянне ў адносінах да ўсяго новага.



*Гарбачоў М. С.*



*Распад СССР*

***Пытанні і заданні:***

*1. Назаві кіраўнікоў СССР і БССР з 1965 па 1980 гады?*
*2. Якія змены адбыліся ў нашым раёне за гады іх кіравання?*
*3. Хто такія " афганцы"?*
*4. Дзе ў нашым раёне ёсць помнік зніклым вёскам?*
*5. Што ты ведаеш пра Чарнобыльскую катастрофу?*
*6. Хто такія перасяленцы і чаму яны пераехалі ў наш раён?*

## §23. Царква і школа падчас Савецкай улады

### *1. Адносіны Савецкай улады да царквы*

Бальшавікі і Савецкая ўлада, нібы знішчальны віхор, пранесліся па нашай пакутнай зямлі. Ужо за першая пяць гадоў свайго існавання рэжым нанёс жорсткі ўдар па рэлігіі. Можна казаць, што ў гэты час адбывалася перабудова ўсяго грамадства. Адначасова змяніліся адносіны дзяржавы ў дачыненні і да рэлігіі. Так, па стану на **25 жніўня 1923 года** ў раёне засталося ўсяго **10** рэлігійных абшчын: **4** праваслаўныя і **6** яўрэйскіх. Побач з гэтым ішло масавае закрыццё храмаў і знішчэнне культавых помнікаў. У **1928 годзе** была разбурана самая старажытная царква нашага раёна **Святога Міколы** ў **Пагосцішчы**. Зараз на гэтым месцы стаіць помнік "У гонар незалежнай Беларусі" і помнік партызанам "Брыгады Аляксея".

У **1926 годзе** быў арыштаваны і рэпрэсіраваны душпастар каталікаў ксёндз **Казімір Юршан**, які з 1912 года быў адміністратарам парафіі ў Бабінавічах. Гэта наогул моцна аслабіла каталіцкае жыццё на Лёзненшчыне. Будынак жа касцёла згарэў пад час Вялікай Айчыннай вайны.

**12 сакавіка 1930 года** ў **Веляшковічах**, дзе было дзве царквы, сярод якіх **Свята-Міхайлаўскі сабор**, царкоўна-прыходскае і дзяржаўнае вучылішча, адбыліся **масавыя хваляванні** супраць знішчэння і закрыцця храмаў. Натоўп у 500 чалавек не змог спыніць тагачасныя ўлады – абедзве царквы былі знішчаны. На месцы, дзе знаходзіўся культавы будынак, непадалёк ад школы, і да гэтага часу можна знайсці рэшткі разбураных размаляваных сцен.

Адзін з такіх фрагментаў сцяны знаходзіцца ў школьным этнаграфічным кутку. Яго экспанаты папоўніла яшчэ адна знаходка, якая звязана з гісторыяй царквы.

Гэта – **Евангелле**, з якім хадзіў на службу былы дзяк Веляшковіцкай царквы Зяленскі. Вядома таксама, што ў 50-я г. XIX стагоддзя дзякам гэтай царквы служыў бацька вядомага этнографа Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага.



*Евангелле*

Хрысціянскі храм існаваў і ў **Калышках** яшчэ з **1827 года**. Магчыма, гэта быў каталіцкі касцёл ці, яшчэ верагодней, уніацкая царква. Тое, што калышанская царква дзейнічала ў 1928 годзе, можна сцвярджаць з упэўненасцю, бо ў "Спісе цэркваў і малітоўных дамоў усіх рэлігій па Віцебскай акрузе", складзеным у тым жа годзе, пад № 226 запісана праваслаўная абшчына ў мястэчку Калышкі. Дзесьці ў прамежку часу з канца 1928 года да пачатку 1930-года мястэчковая царква была зачынена.

У **1934 годзе** выдаецца пастанова “**Аб нарыхтоўцы бронзы са званоў**”. Здымаюцца званы вагай 63 пуды (1008 кг) і з **Вазнясенскай царквы** ў Лёзне, а сама яна перабудоўваецца пад клуб. Тут дэманструюцца кінафільмы, выступаюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці, працуе бібліятэка.

Сцены царквы, размаляваныя фрэскамі, пабялілі. Але праз пэўны час пабелка абсыпалася і зноў на прысутных глядзелі лікі святых. У ёй вырашылі размясціць местачковы ачаг культуры. Знялі званіцу, прыбудавалі сцэну, кінабудку, абсталявалі кабінеты. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак царквы крыху пацярпеў, але захаваўся.



*Вазнясенская царква ў Лёзне (1952г.)*



*РДК і Вазнясенская царква ў пач. 60-х г.*

Але ў **1962 годзе** на Вялікдзень па храму быў нанесены апошні знішчальны ўдар. Сапёры некалькі разоў закладвалі дынаміт, і толькі на трэці раз выбух дасягнуў мэты. Храма не стала, цынкавыя грабы, што агаліліся з-пад муроў, і граніт расцягалі жыхары, а астатняе звезлі на сметнік. На месцы царквы пасадзілі парк. Пабудавалі танцпляцоўку, арэлі, каруселі. Зараз на гэтым месцы знаходзіцца крама “Еўраопт” і кінатэатр “Світанак”.

Такім чынам, па самых сціплых падліках, на Лёзненшчыне існавала каля **30** культавых помнікаў дойлідства **5** рэлігійных канфесій. На вялікі жаль, сёння ніхто з нас ужо не можа ацаніць іх культурнай і гістарычнай каштоўнасці.

## *2. Развіццё савецкай школы (гісторыя СШ №1)*

Пасля рэвалюцыі **1917 года** народнае вучылішча ў Лёзне стала школай 1-й і 2-й ступені, дзе вучылася 300 вучняў. Знаходзілася школа ў будынку чыгуначнай станцыі Шыбекіна, якая была перайменавана ў станцыю Лёзна. У **1924 годзе** школа стала сямігадовай, а ў **1933 годзе**, дзякуючы намаганням дырэктара школы Угалева Васіля Васілевіча, школа атрымала статус сярэдняй, узорнай. Першы выпуск дзесяцікласнікаў адбыўся ў 1936 годзе, сярод іх былі будучыя заслужаныя настаўнікі БССР Машэр Тамара Кліменцьеўна і Шэўчанка Надзея Андрэеўна (дачка Чартковай Ганны Тарасаўны).

Прамежак часу **з 1936 па 1941 гады** быў вельмі яркім і пладатворным. У школе дзейнічалі і чатырохгалосы хор, і тэатральная студыя, танцавальны калектыў, пажарная дружына, праводзіліся ваенізіраваныя шматдзённыя турыстычныя паходы.



*4-й кл. Беларускай узорнай ПСШ. (1936 год.)*

Малодшая група хора неаднаразова выступала на рэспубліканскім радыё.

20 настаўнікаў не толькі вучылі 600 чалавек, але і кожны кіраваў нейкім гуртком, раскрываючы здольнасці вучняў.

Таму 95 % навучэнцаў паступалі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны будынак школы быў спалены фашыстамі. З канца **кастрычніка 1943 года ў Лёзне** пачала працаваць пачатковая школа. Наменікам яе была назначана **Котава Вера Фёдараўна.** Знаходзілася школа ў адной з уцалелых хат па вуліцы Бабінавіцкай (зараз Гагарына). Сярэдняя школа знаходзілася на вуліцы Садовай (зараз будынак інтэрнату). І на вуліцы Камсамольскай (зараз ДРСУ -107).



*СШ №1 на вуліцы Леніна ( 1974 г.)*

У **1952 годзе** па тыпавым праекце на вуліцы Леніна была пабудавана СШ №1 (беларуская ўзорная школа). Гэта каменны, двухпавярховы будынак з абарудаванымі кабінетамі фізікі, хіміі, біялогіі, майстэрнямі, бібліятэкай і спартыўнай залай. Вучні старэйшых класаў вывучалі аўтасправу і трактар.

**З 1947 года і да 1971 года** ў школе змянілася шмат наменікаў: **Пашкевіч Іосіф Рыгоравіч, Гаркавы Пётр Пятровіч, Нікіцін Павел Нікіціч, Ерашоў Іван Андрэевіч, Пратасевіч Іван Фёдаравіч, Сырадоева Аляксандра Кірылаўна, Свірыдаў Мікалай Паўлавіч, Алейнікава Тамара Пятроўна**. Усе яны ўнеслі значны ўклад у развіццё школьнай адукацыі таго часу.



*Настаўнікі СШ №1 г.п. Лёзна (1982г.)*

З **1971 года і да 1984 года** кіраўніком яе быў **Трутнеў Канстанцін Іосіфавіч.** У кожным настаўніку і вучні ён бачыў асобу, да ўсіх адносіўся з цеплатой і клопатам. Пры ім школа працавала ў дзве змены, а пачатковыя класы нават у тры. Разгарнулася турысцка - краязнаўчая работа настаўнікаў і вучняў.

Пасля 9 класа арганізовываліся сумесныя экскурсіі ў Хатынь, Мінск, Брэст, сяло Міхайлаўскае, Горкі. Нават у 1968 годзе адбылася паездка настаўнікаў і вучняў ва Украіну ў горад Адэсу. Для вучняў 5 – 8 класаў былі распрацаваныя турыстычныя маршруты паходаў па родным краі: Чарніцы, Пронскае, Асташэва, Кавалі, Ціхмянаўская вышыня, Белдрэс, Орша. Неаднаразова паходы арганізоўваліся ў Мікуліна і горад Рудня, дзе жыў Герой Савецкага Саюза Міхаіл Аляксеевіч Ягораў, які ўзняў сцяг Перамогі над Рэйхстагам у Берліне. Настаўнікі і вучні ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па розных відах спорту. Здавалі нормы ГТА. Пры школе дзейнічалі два вялікія хоры: вучнёўскі і настаўніцкі.





*Хор настаўнікаў Сш №1 Настаўнікі сш №1 і №2 на лыжні.Сустрэча з М. Ягоравым 1965г.*

У **1978 годзе** СШ №1 пераехала на вуліцу Бязуглага ў новы трохпавярховы будынак, разлічаный на 1200 вучняў з вялікай спартыўнай і актавай залай.




*ДУА "СШ №1" ( 80-90-х гг.)* *Настаўнікі СШ №1 г.п. Лёзна (1986г.)*

У 60 – 70-я гады XX стагоддзя многія настаўнікі СШ №1 за сваю нялёгкую працу былі ўдастоены значка **"Выдатнік народнай асветы"**. Сярод іх удзельнік Вялікай Айчыннай вайны **Букін Леанід Антонавіч** і **Алейнікаў Яўген Сямёнавіч** – настаўнікі фізічнага выхавання школы. **Букін Леанід Антонавіч** нарадзіўся **11 чэрвеня 1926 года**. У 1941 годзе скончыў 7 класаў і быў вывезены немцамі ў Германію, а ў красавіку 1945 года вызвалены Савецкай Арміяй. Пасля вайны 3 гады служыў у Германіі, як быццам замацоўваючы Перамогу над фашысцкай Германіяй. Служба ў Арміі дала яму загартоўку і дапамагла ў выбары грамадзянскай прафесіі. Ён 20 год адпрацаваў у СШ № 2 і 10 год у СШ № 1.



*Букін Леанід Антонавіч (11 чэрвеня 2016 г.)*

У 1977 годзе быў удастоены звання "Выдатнік народнай асветы" за I –е месца ў БССР сярод сельскіх школ па фізічнай падрыхтоўцы. 11 чэрвеня 2016 года ветэран адзначыў свой 90 гадовы Юбілей.



*Алейнікаў Яўген Сямёнавіч*

**Алейнікаў Яўген Сямёнавіч** нарадзіўся **14 ліпеня 1933 года** і падчас вайны яму было ўсяго 8 год. Ён успамінае, як яго сям'і прыйшлося жыць пры немцах, як ён хадзіў ў нямецкую школу, дзе забаранялася пісаць слова "Мама", "Тата", у падручніках былі заклееены партрэты Леніна і Сталіна. Дзеці павінны былі зашываць нямецкія шанялі, прабітыя кулямі нашых салдат.

Як пасля вызвалення Лёзна зноў пачала працаваць пачатковая школа і з якой павагай ён адносіўся да сваёй першай настаўніцы **Лепінай Веры Іванаўны**.

Яўген Сямёнавіч з 1955 і па 1992 гады адпрацаваў настаўнікам фізічнага выхавання ў СШ №1 ( амаль 50 год), быў трэнерам дзіцяча - юнацкай спартыўнай школы, 20 год кіраваў раённым метадычным аб'яднаннем настаўнікаў фізічнага выхавання, амаль кожны год прадстаўляў каманды на раённыя і абласныя турыстычныя злёты. А колькі турысцка - краязнаўчых паходаў правёў гэты таленавіты настаўнік. Мне таксама давялося вучыцца ў Яўгена Сямёнавіча на ўроках фізкультуры, у спартыўных секцыях і шматдзённых турыстычных паходах. Разам з вучнямі мы здзейснілі паход 1-й катэгорыі складанасці да Суражскіх (Віцебскіх) варот. Трэба было пешшу прайсці 130 км за 6 дзён па месцах помнікаў Героям Савецкага Саюза, якія загінулі за вызваленне Лёзненшчыны. Званне "Выдатнік народнай асветы" прысвоена Алейнікаву Я. С. яшчэ ў 1965 годзе за арганізацыю і правядзенне раённай спартакіяды школьнікаў і паспяховае выступленне на абласных спаборніцтвах. Зараз на пенсіі, прадаўжае займацца спортам і краязнаўствам.







*Паход да" Суражскіх варот"(1988 г.) Абласная спартакіада школьнікаў. Віцебск (1973 г.)*

У **1983 годзе** ў школе адкрыўся музей Народнай Славы, які быў створаны **Ждановіч Людмілай Іванаўнай**. Зараз загадчыкам яго з'яўляецца кіраўнік пошукавага клуба "**Памяць" Ціхамірава Ніна Канстанцінаўна.**

З **1985** па **2010 гады** дырэктарам СШ №1 быў **Каўрыга Анатоль Пятровіч**, пры ім быў створаны метадычны кабінет, першыя ліцэйскія класы, арганізавана супрацоўніцтва з Віцебскім Дзяржаўным універсітэтам.

## *3. Рэлігія і царква  сёння*

У пачатку XXI стагоддзя  ў Рэспубліцы Беларусь змяніліся адносіны да царквы, рэлігіі. **Мітрапаліт Філарэт** за шматгадовы ўклад у духоўнае адраджэнне беларусаў, умацаванне брацкіх сувязяў паміж народамі і рознымі канфесіямі быў  нават  ўдастоены звання **Герой  Беларусі**. Паўсюдна пачалі адраджацца храмы, касцёлы.  На Лёзеншчыне таксама. У **2001 годзе** была адноўлена дзейнасць каталіцкай парафіі. У Лёзне на вуліцы Томскага ўзнік касцёл **Святога айца Піо**. Ужо на **1 снежня 2004 года** на тэрыторыі  раёна размяшчалася 10 рэлігійных абшчын, з іх 6 – праваслаўных, 2 – хрысціянскай веры і евангельскай, 1- Рымска-каталіцкая парафія, 1  -  хрысцыян баптыстаў. У **2017 г.** на плошчы  ўстаноўлены памятны знак знішчаным цэрквам раёна.



*Храм на вул. Леніна (2015г.)*

**Дзеючыя храмы на Лёзеншчыне:**

**Храм Узвышэння Святога Крыжа** (г. п. Лёзна) размешчаны ў былым  будынку дзяржбанка. Па благословенні архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзмітрыя і працамі вернікаў на чале благачыннага і настаяцеля іерэя Генадзя Жаркоўскага прыход быў зарэгістраваны ў **2001 годзе**. Вялася рэканструкцыя будынка. 3 мая 2003 года было адслужына першае Архірэйскае Набажэнства. Боскую Літургію ўзначаліў Архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый. З гэтага часу рэгулярна здзяйсняюцца Набажэнствы.  У сувязі з пераходам у іншую епархію настаяцеля іерэя Генадзя Жаркоўскага 23 ліпеня 2007 года  настаяцелем прызначаны іерэй Вячаслаў Пашкевіч. 29-га красавіка 2008 года дыяканам прызначаны Рыгор Окунеў. Пры храме працуе  Нядзельная школа, бібліятэка.



*Храм на вул. М. Акцябрскай. Лёзна.(2015г.)*

**Храм Узнясення Господня** (разбураны ў 1962 годзе на вуліцы Леніна) зараз знаходзіцца на вуліцы Марыі Акцябрскай, размешчаецца ў выкупленым доме яшчэ ў 1960 годзе айцом Валенцінам. З 1993 года настаяцелем царквы з’яўляецца іерэй Расціслаў Страха. На вуліцы Валадарскага знаходзіцца Евангельцкая царква **“Воскресение”.** На вуліцы Томскага пабудаваны каталіцкі касцёл.



*“Воскресение”. 20117г.*



*Касцёл на  вул. Томскага.*



*Памятны знак знішчаным цэрквам*



**Храм Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы** знаходзіцца ў вёсцы Дабрамыслі. Малітоўны дом. Прыход зарэгістраваны ў 2000 годзе. Да снежня 2005 года Набажэнствы адбываліся ў старым маленькім доміку. У 2005годзе з дапамогай вернікаў на чале з іерэем Вячаслава Пашкевіча быў выкуплены дом пад храм па вуліцы Дабрамыслінскай № 25. У чэрвені 2006 г. года храм быў перакрыты і на ім усталявалі

*Храм у Дабрамыслях(2015г.)* купал.



*Храм у Крынках (2015г.)*

**Храм Іверскай іконы Божай Маці** знаходзіцца ў Крынках. Прыход зарэгістраваны 6 лютага 1997 года пад кіраўніцтвам іерэя Віктара Ледаховіча. Малітоўны дом пераабсталяваны з будынка былой крамы. У бліжэйшы час плануецца ўстаноўка купала.



*Храм у Бабінавічах (2015г.)*

**Храм іконы божай маці “Жываносная крыніца” ў вёсцы Бабінавічы.** Прыход зарэгістраваны ў 1996 годзе ў былым будынку школьнага музея.

**Аднаўляюцца храмы**:

Храм Свяціцеля Ціхана Задонскага ў Вялікай Выдрэі, Храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Веляшковічах, Храм “Спарыцельніцы хлябоў” ў Пушках.



*На будоўлі храма “Спарыцельніца хлябоў” у в. Пушкі.(2012г.)*

Удзельнікі гуртка “Мая Лёзненшчына” нават прымалі ўдзел ў будаўніцтве Храма “Спарыцельніцы хлябоў”, знаходячыся ў патрыятычным лагеры ў Пушках у 2012 годзе.

***Пытанні і заданні:***

*1. Дзе і кім былі разбураны храмы на Лёзненшчыне?*
*2. Калі знішчылі Храм Узнясення Гасподня ў Лёзне?*
*3. Складзі гісторыю сваёй школы пад час БССР.*
*4. Назаві зараз дзеючыя храмы нашага раёна.*

## § 24. Лёзненшчына на рубяжы стагоддзяў (канец  XX – пачатак XXI стст.)

### *1.  Ад БССР да Рэспублікі Беларусь. Набыццё суверэнітэту.*

**Пачатак  90-х гадоў** у гісторыі СССР адзначыўся нарастаннем руху народаў за набыццё сапраўднага **дзяржаўнага суверэнітэту**. Першымі да практычнай рэалізацыі гэтых мэт прыступілі прыбалтыйскія рэспублікі. У **1990 годзе** Савет **Літвы**, а затым **Латвіі** і **Эстоніі** абвясцілі аб сваім суверэнітэце. **27 ліпеня 1990 года** Вярхоўны Савет **БССР** прыняў **Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі**, якая азначала, што Беларусь таксама выбрала ўласны шлях развіцця, хоць не выключала магчымасці аб’яднання з іншымі рэспублікамі ў новы Саюз.

**19 верасня 1991 года** Вярхоўны Савет прыняў **Закон  аб новай назве краіны**. Яна пачала называцца **“Рэспубліка Беларусь”**, а ў скарочаным варыянце – **“Беларусь”**.

У замацаванні суверэнітэту Рэспублікі Беларусь асобае месца належыць **Канстытуцы**і, якая была прынята Вярхоўным Саветам **15 сакавіка 1994 года**. Першая Канстытуцыя суверэннай Беларусі стала важным крокам на шляху стварэння **прававой дзяржавы**, у якой забеспячэнне правоў і свабод чалавека стала прыярытэтным. У выніку другога тура выбараў прэзідэнта РБ абсалютная большасць выбаршчыкаў (звыш 80%) аддалі свае галасы за **Аляксандра  Рыгоравіча  Лукашэнку**.



*Прэзідэнт  РБ  Лукашэнка А. Р.*



*Сімволіка Рэспублікі Беларусь*

**20 ліпеня 1994 года** на сесіі Вярхоўнага Савета адбылася цырымонія ўступлення Прэзідэнта на пасаду.

Дарэчы, будучы Прэзідэнт, праводзячы перадвыбарчую кампанію **16 чэрвеня 1994 года** быў  у нашымградскім  пасёлку Лёзна, дзе выступаў са сваёй праграмай  у  Раённым Доме Культуры. А ў вечары ў 23 гадзіны 10 хвілін на 24-м км шашы Віцебск  –  Лёзна  на аўтамышыну  ў якой ён ехаў адбыўся “замах”.  Невядома хто і зачым гэта зрабіў?

Лёзненцы  ўнеслі значны ўклад у абранне кандыдата  Аляксандра Рыгоравіча  Лукашэнкі  Прэзідэнтам краіны, аддаўшы яму свае галасы.

**14 мая 1995 года** на рэферэндуме большасць насельніцтва прагаласавала за новую сімволіку. **24 лістапада 1996 года** адбыўся рэферэндум, на якім была прынята Канстытуцыя РБ **1994 года** са змяненнямі і дапаўненнямі.

**15 сакавіка** ў РБ – **Дзень Канстытуцыі**. Кожны год у гэты дзень лепшым юнакам і дзяўчатам нашай краіны ўрачыста ўручаюць пашпарты.




*Канстытуцыя РБ*



*Атрыманне пашпарта грамадзяніна РБ ( 2012 г.)*

**Рэферэндум** (усенароднае галасаванне) таксама адобрыў пытанне аб перанясенні Дня незалежнасці РБ (Дзень Рэспублікі) з 27 ліпеня на **3 ліпеня** (дзень вызвалення Беларусі).






*Дзень Незалежнасці ў Мінску. (2005 г.)*

І вось ужо на працягу больш чым **20 гадоў** А. Р. Лукашэнка з'яўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт у нашай краіне выбіраецца на 5 год, а затым перавыбіраецца. Значыць у **2001, 2005, 2010, 2015 гадах** А. Р. Лукашэнка перавыбіраўся на гэту пасаду, прычым пры **80 %** падтрымцы насельніцтва РБ. Рэспубліка Беларусь – **прэзідэнцкая рэспубліка**.

## *2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Лёзненскага раёна з 1990 па 2015 гг.*

**Эканоміка** – гэта развіццё **прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, транспарту і сувязі**.

Зараз мы паглядзім, як усё гэта развівалася ў **канцы XX ст.** і ў **пачатку XXI ст.** (да 2015г.), як жыло насельніцтва Лёзненшчыны ў гэты час.

З прамысловых прадпрыемстваў у раёне ў канцы XX стагоддзя працавалі :

**1). Ільнозавод,**

**2). Малочны завод,**

**3). Кансервава-агароднінасушыльны завод,**

**4). Лясгас,**

**5). Доследна-прамысловае прадпрыемства “Завольша”,**

**6). Камбінат бытавога абслугоўвання (КБО),**

**7). Хлебная база,**

**8). РЭС (раённыя электрасеці).**

Будаўнічыя работы пераважна выконвала механізаваная перасоўная калона (**МПМК-54**). Дарожнае будаўніцтва ажыццяўляла **ДРБУ № 107**. Дзейнічачалі **ПМК №28- меліярацыі, Райсельгасхімія, Райаграпрамтэхніка.**



*Ільнозавод*



*МПМК- 54*



*РЭС*



*Прадукцыя завода*

Была пачата газіфікацыя раёна. У першыя гады 12 пяцігодкі раён выйшаў пераможцам у рэспубліканскім спаборніцтве па вытворчасці і продажы льну, правядзенні зімоўкі жывёлы, павышэнні якасці і культуры медыцынскага абслугоўвання, а ў абласным быў адзначаны за дасягнутыя поспехі ў эканамічнай дзейнасці, павелічэнні вытворчасці мяса і малака.

Прадукцыя **кансервава-агароднінасушыльнага завода ў 70-80-х гг.** ішла ва ўсе куткі СССР. Толькі за 4 гады 12- й пяцігодкі было пабудавана 1058 кватэр (у **1989 годзе** быў пабудаваны дом з 5 пад’ездамі на вуліцы Школьнай), 300 км дарог, у тым ліку каля 200 км з асфальтава-бетонным пакрыццём. Шмат увагі надавалася ўмацаванні матэрыяльна–тэхнічнай базы аховы здароўя, народнай адукацыі, культуры. У раёне фактычна вырашана праблема месцаў у дзіцячых дашкольных установах.

Для вырашэння многіх сацыяльных пытанняў выкарыстоўваліся фінансавыя рэсурсы калгасаў, саўгасаў і прадпрыемстваў. У раёне на той час было **16 калгасаў** і **6 саўгасаў**.



*Кантора племсаўгаса “Крынкі “*



*Кантора саўгаса “Адаменкі “*



*Гал. бух. саўгаса Адаменкі Шыдлоўскі Іван Якаўлевіч*

За гады **12–й пяцігодкі** ўмацоўвалася матэрыяльная база аховы здароўя. Былі ўведзены ў строй паліклініка ў Лёзне, амбулаторыя ў Бабінавічах і ўчастковая бальніца ў Дабрамыслях. Адкрыты прафілакторыі пры жывёлагадоўчых комплексах у калгасах імя Чапаева і імя Калініна. Пры раённай бальніцы пачало працаваць аддзяленне хуткай медыцынскай дапамогі. Сярод медыцынскага персаналу нямала кваліфікаваных спецыялістаў, гатовых у любую хвіліну прыйсці на дапамогу людзям. А траім з іх было прысвоена званне **“Заслужаны ўрач БССР”**. Гэта галоўны ўрач Высачанскай участковай бальніцы Герой Сацыялістычнай Працы **А. Г. Антонаў**, урач–хірург Лёзненскай раённай бальніцы **М. П. Курчаў**, былы акушэр-гінеколаг раённай бальніцы **Н. Л. Смірных**.


*Антонаў А. Г.*


*Смірных Н. Л.*


*Курчаў М. П.*

Трэба адзначыць і настаўнікаў, узнагарод для іх у той час не шкадавалі. **Адзінаццаці** самым адданым справе народнай асветы было прысвоена ганаровае званне **“Заслужаны настаўнік БССР”**, **4** настаўнікі: **І. М. Барадулькін, А. І. Краўчынская, С. Ф. Сірын, А. Т. Чарткова –** за шматгадовую плённую працу былі ўзнагароджаны **ордэнам Леніна.**


*Барадулькін І. М.*


*Агнішчанка Н. А.*


*Конах Г. І.*


*Цітова М. М.*

Актыўнае жыллёвае і культурна–бытавое будаўніцтва, прымяненне новых форм арганізацыі і аплаты працы дазволілі звесці да мінімуму выезд працаздольнага насельніцтва ў гарады.

З распадам СССР у краіне пачаўся **эканамічны крызіс.** Цяжкасць яго была ў тым, што адбыўся разрыў адзінай эканамічнай прасторы краін СНД (былых рэспублік). Ураду прыйшлося распрацаваць сваю **мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ**. Гэта была сацыяльна-арыентаваная **гандлёвая эканоміка.** Галоўныя яе накірункі прымаліся на кожныя 5 гадоў развіцця.

Праводзілася дзяржаўнае фінансаванне прадпрыемстваў і калгасаў, **прыватызацыя**. Быў распрацаваны курс эканамічнай інтэграцыі Беларусі.

Стратэгічным жа курсам стаў лозунг: **“За моцную і квітнеючую Беларусь”**. У **2008 годзе** пачаўся **сусветны эканамічны крызіс**. Была праведзена **дэвальвацыя** беларускага рубля (паніжэнне курса рубля ў адносінах да замежных валют). **2009 год** быў аб’яўлены **Годам роднай Зямлі**. Усебеларускі народны сход у **2010 годзе** галоўнай мэтай паставіў паляпшэнне дабрабыту і ўмоў жыцця насельніцтва. Гэты год быў аб’яўлены **Годам якасці**. **2015 год - Годам Моладзі, 2016 год - Год Культуры, 2017 – Год Навукі.**

У сацыяльна-эканамічным жыцці нашага раёна, як і па ўсёй краіне, адбыліся значныя перамены. Перастаў працаваць раней вядомы ў СССР кансервава-агароднінасушыльны завод, становіцца спачатку філіялам, а затым і проста цэхам малаказавод. Знікаюць калгасы і саўгасы . Іх сталі называць **КУСП (камунальнае унітарнае с/г прадпрыемства).**


*ААГ “ Малако”*


*РУП “ Хлебная база”*


*ДРСУ-107*

А з **2008 па 2011гг.** многія з іх сталі аграгарадкамі (13). Прадпрыемствы раёна: ААТ “Ільнозавод”, ААТ “Малако”, РУП “Лёзненская хлебная база”, ДРСУ-107, “Лёзненскі лясгас”, КУП Віцебск дарстрой, Белтэлеком, РЭС.



*Аграгарадок “Зубкі” (2009г.)*


*Аграгарадок у вёсцы Кавалі(2009г.)*

У **2003 годзе** ў Лёзне пачало працаваць малое прадпрыемства **УЧПТП “БІГІВ” (па вытворчаці драўлянай тары)** на чале з яго дырэктарам – **Ігарам Іванавічам Бураком.**


*Бурак Ігар Іванавіч*




*УЧПТП “БІГІВ” (2015г.)*

**У 2012 годзе** прыступіла да выпуску гэтай жа прадукцыі новае прадпрыемства**“ЭнергокамплектТара”**. Яе дырэктар **Бурак Максім Ігаравіч** прадоўжыў пачатую бацькам вытворчасць барабанаў. У **2017 годзе** ужо стала 170 суб’ектаў гаспадарання, з іх 126 малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

У **2009 годзе** на ўездзе ў Лёзна была пабудавана заправачная станцыя.

На базе прадпрыемства бытавога абслугоўвання **“Дабрабыт”** быў адкрыты цэх па вырабу абутку з удзелам **“Марка”.**

**Белтэлеком** пачаў праводзіць лічбавае тэлебачанне насельніцтву раёна.



*Цэх па вырабу абутку “Марка” у г .п. Лёзна (2013г.)*



*Работнік Белтэлекома праводзіць лічбавае тэлебачынне(2016г.)*

У **2011 годзе** абласное свята **“Дажынкі” (падвядзенне вынікаў ураджаю 2011 года)** праводзілася ў нашым раённым цэнтры Лёзна.

У рамках праграмы дапамогі сялу наша Лёзненшчына значна аднавіла свой воблік. Наш пасёлак Лёзна стаў падобны на прыгожы еўрапейскі гарадок.

Было адкрыта **9 новых аб’ектаў** гандлю і грамадскага харчавання гэта **“Торговый центр”, “Техно-мир”, “СтройДом”, “ Родны кут”, “Евроопт”, “Центр”, “Ганна”.**




*Гандлёвы цэнтр*



*“Родны кут”*



*Еўраопт*



*Рэстаран “Івушка”*

Праз наша Лёзна была праведзена рэканструкцыя аўтамабільнай шашы **“Віцебск – мяжа Расійскай Федэрацыі”**. На шашы Віцебск – Смаленск, якая праходзіць праз Лёзна, былі ўстаноўлены светлафоры.

Змены ў раёне адбываюцца не толькі ў райцэнтры, а і на сяле. Шмат новай сельскагаспадарчай тэхнікі з’явілася ў аграгарадках, значна палепшылася становішча жывёлы на фермах раёна.



*Ферма. Кляўцы*



*На палях раёна*

У Лёзне на вуліцы Леніна праведзена рэканструкцыя будынка былой СШ №1. Зараз тут будзе “**Культурна-аздараўленчы цэнтр”**. У ім размесціцца бібліятэка, ДЮСШ, Дом рамёстваў, а хуткім часе з’явіцца, пэўна, і басейн.



*Культурна-аздараўленчы цэнтр (2016г.)*



*Фізкультурна-аздараўленчы комплекс (2018г.)*

А колькі новых вуліц і шматпавярховых дамоў з’явілася ў нашым гарадскім пасёлку Лёзна ў мікрараёне Школьны за апошнія 5 год.



*Лёзна. Мікрараён “Школьны”*
*Фотаздымак з самалёта (2015г.)*

Усё гэта вельмі добра, але моладзь, якая жыве ў гэтых дамах, працуе або ў Маскве, Пецярбурзе, або ў Віцебску. У нас у Лёзне не хапае **працоўных месц**, а былыя вядомыя прадпрыемствы разбураюцца, пераходзяць у разрад філіялаў, нават цахоў прадпрыемстваў горада Віцебска.

Нашаму раёну, каб існаваць, як паветра, патрэбна **прамысловасць**!

## *3. Культурна-нацыянальнае жыццё Лёзненшчыны ў пачатку XXI ст.*

**Гісторыю** (навуку аб мінулым, сучасным і будучым) стварае народ, а народ – гэта людзі, якія сваёй самаадданай працай робяць нашу Радзіму лепшай і прыгажэйшай**. Культура** – гэта дасягненні людзей у матэрыяльным і духоўным жыцці.







*Вышэйшыя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь*

Прэзідэнтам краіны яшчэ ў **1995 годзе** за дасягненні грамадзян у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры і інш. былі зацверджаны дзяржаўныя ўзнагароды: **Герой Беларусі, Ордэн Айчыны і Ордэн Францыска Скарыны.** Першы Герой Беларусі – ваенны лётчык **У. М. Карват**, які цаной свайго жыцця выратаў іншых. Сусветнавядомая біятланістка, алімпійская чэмпіёнка **Дар'я Домрачава** за свае выдатныя дасягненні ў спорце таксама ўдастоена звання **Герой Беларусі**.

Адным з першых дзеячаў культуры званне Герой Беларусі ў **2006 годзе** атрымаў мастак **Міхаіл Андрэевіч Савіцкі.**



Падчас краязнаўчай паездкі ў Мінск ў **1999 годзе** мне пашчасціла пабываць у творчай майстэрні гэтага таленавітага мастака. Пабачыць яго цудоўныя карціны.

Галоўныя тэмы яго творчасці: Вялікая Айчынная вайна, Чарнобыль і Афганістан.

*Сустрэча з мастаком М. А.Савіцкім (1999г.)*

Бываючы ў сталіцы, краязнаўцы наведвалі таксама сваіх знакамітых землякоў: **Ганеставу Людмілу Раманаўну** і **Буглова Яўгена Данілавіча.**



*Сустрэча з Ганеставай Л. Р. 1996 год*



*Сустрэча з Бугловым Я. Д. 2006 год*

У нашай краіне значная ўвага надаецца развіццю культуры, адукацыі, традыцыям, спорту і духоўнаму адраджэнню беларускага народа. У нас існуе двухмоўе (дзяржаўныя руская і беларуская мовы). У **2005 годзе** ў Мінску пабудавана прыгожая **Нацыянальная бібліятэка**. У кожным абласным цэнтры ёсць **Лядовы палац**, ідзе адраджэнне цэркваў і касцёлаў. За 40 км ад Лёзна кожны год праходзіць фестываль эстраднай песні “**Славянскі базар у Віцебску”.**

Мы, лёзненцы, таксама ўносім дастойны ўклад у развіццё нашай Радзімы – **Рэспублікі Беларусь.** На Лёзненшчыне шмат калектываў, якія сваей самаадданай працай праслаўляюць наш раён у вобласці, рэспубліцы і нават за мяжой. Цэнтрамі развіцця культуры з’яўляюцца раённы Дом культуры , Школа мастацтваў, музеі, бібліятэкі, школы.



*Будынак школы мастацтваў. Лёзна*



*Настаўнікі школы мастацтваў (2014г.)*

Лёзненская школа мастацтваў у нашым раёне пачала сваю дзейнасць яшчэ ў пачатку **1960-х гадоў**. Сярод першых выкладчыкаў школы былі Ларыса Георгееўна Бараноўская, а таксама Ірына Міхайлаўна Глушакова, Адам Васільевіч Бульбічкін. У **1975 годзе** школа мастацтваў пераехала ў новы двухпавярховы будынак. Зараз у школе мастацтваў дзейнічае 9 аддзяленняў: баян, акардэон, цымбалы, фартэпіяна, балалайка, духавыя інструменты, харэаграфія.

Раённы дом культуры з’яўляецца цэнтрам культурнага жыцця лёзненцаў. Пад яго кіраўніцтвам падрымліваюцца нацыянальныя традыцыі края. Кожны год праводзяцца святы Масленіца, Купалле, Дажынкі, а таксама абавязкова святкуецца Дзень Перамогі і Дзень вызвалення Лёзна.



*Дзень вызвалення Лёзна (1982 год. )*



*Бессмяротны полк. 9 мая 2015 год*

Зараз кіраўніком РДК з'яўляецца Піваварчык Сяргей Сяргеевіч. Пры РДК працуе шмат цікавых калектываў: фальклорны ансамбль **"Медуніца"**, народны тэатр" **"…У пошуку"**, малады танцавальны калектыў для дзяцей **"Юла",** якім кіруе таленавітая **Цыганкова Яўгенія Аляксандраўна.**

У **2003 годзе** адкрыў свае дзверы Раённы ваенна-гістарычны музей. Загадчыкам музея з'яўляецца **Самушчанка Вольга Мікалаеўна.** Там працуе добразычлівы творчы калектыў, які захоўвае гісторыю нашай Лёзненшчыны. **7 лістапада 2017 года** каля музея адбылася падзея, якую лёзненцы чакалі шмат год. Было ўскрыта пісьмо Ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны да моладзі 2017 года. Пісьмо было замуравана ў сцяне музея з надпісам на дошцы. Моладзь 2017 года таксама зрабіла пасланне нашчадкам 2043 года.






*Супрацоўнікі музея (2016г.)* *Дошка на музеі* *Дошка на музеі (2017г. 7. 11.)*

У раёне таксама ёсць музеі пры школах. Вялікі дзякуй іх стваральнікам: у сш №1**. Ждановіч Людміле Іванаўне**, **Ціхаміравай Ніне Канстанцінаўне**, у Дабрамыслях- **М. М. Багамолаву,** у Крынках- **Алёшкінай Л. І.**, у Бабінавічах- **Цімчанка Г. А. і Багдановіч Д. М.**,у Кавалях – **Якавіцкай Я. А., Кісялёвай Л. В.** Трэба берагчы нашы музеі і бібліятэкі, бо гэта скарбонкі нашай памяці.





*У музеі Бабінавіцкай школы* *У музеі А. Ф. Данукалава. Кавалі*



*Музей Народнай Славы СШ №1 (2015г.)*

У **2015 годзе** па выніках работы музей Народнай Славы СШ №1 заняў першае месца ў вобласці і прадстаўляў Віцебскую вобласць на Рэспубліканскай выставе ў горадзе Мінску, прысвечанай 70-годзю вызвалення Беларусі.



У верасні **2013 года** падчас рэспубліканскага свята “Дажынкі” ў Жлобіне ўдзельнікамі конкурсу на **“Лепшае сельска-гаспадарчае падвор’е”** была мнагодзетная працавітая сям’я Кулаковых з вёскі Адаменкі.

Бацькі і дзеці спявалі прыпеўкі, песні, чыталі вершы, запрагалі каня, пілавалі дровы, гатавалі старажытную беларускую страву і ў выніку з’явіліся пераможцамі рэспубліканскага конкурсу **“Уладар сяла”**.

*Сем’я Кулаковых з вёскі Адаменкі.(2013г.)*

У раёне праводзіцца шмат розных конкурсаў сярод арганізацый, моладзі, сямей і дзяцей. Кожны год адзначаюцца ўсе нацыянальныя святы: “Масленніца”, “Купалле”, Нараджэнне Хрыстова, “Вялікдзень”, “Дзяды”, “Радуніца”. Праводзіцца абласное свята “Песні сунічных бароў”.

**Бахір Аляксей Алегавіч** з’яўляецца заснавальнікам інтэлектуальнай гульні **“Мазгалом”**, якая праходзіць у некалькі этапаў кожны год. У **2015 годзе** адбыўся конкурс **“Великолепная пятёрка” (**паміж арганізацыямі гарадскога пасёлка Лёзна), які таксама праходзіў у некалькі этапаў. Пераможцамі стала каманда **ДУА “Яслі–сад №3”**.



*Удзельнікі каманд “Мазгалом”.( 2015г.)*





*Пераможцы конкурсу “Великолепная пятёрка(”2015г.)*



Вялікая роля ў выхаванні маладога пакалення належыць ДУДА “Лёзненскі цэнтр дзяцей і моладзі”. У 2015 годзе былы Дом піянераў (Лёзненскі цэнтр дзяцей і моладзі) адзначыў свой **55 – гадовы юбілей**. На юбілеі прысутнічалі яго заснавальнікі: **Тамара Дзмітрыеўна Дзядкова, Надзея Уласаўна Кабак, Бондарава Лідзія Іванаўна.**

*Юбілей Цэнтра дзяцей і моладзі (2015 г.)*

Зараз там працуе шмат гурткоў. Калектыў малады і творчы. Дырэктар **ДУДА “Лёзненскі цэнтр дзяцей і моладзі”** – **Мінакіна Алена Уладзіміраўна**. Са святам “Песні сунічных бароў” у нашым раёне з’явіўся свой брэнд і прэмія **“Сунічка”.**



*Свята “Песні сунічных бароў”(2015г.)*




*Прэмія “Сунічка”*

У **пачатку XXI стагоддзя** загадчыкам СШ №1 да **2010 года** быў **Каўрыга Анатолій Пятровіч.** Пры ім быў адкрыты першы кампьютэрны клас. Школа неаднаразова становілася пераможцам у аглядах – конкурсах па падрыхтоўцы да новага навучальнага года. Першая школа амаль ва ўсім лічылася першай. Праз кожныя два гады, пачынаючы з **2007 года,** ў РБ праводзіцца конкурс **“Настаўнік года**”, дзе настаўнікі дэманструюць сваё педагагічнае майстэрства. Настаўнікі СШ №1 заўсёды на раённым узроўні былі ў ліку прызёраў гэтага конкурсу. Нашы вучні неаднаразова з’яўляліся пераможцамі раённых і абласных прадметных алімпіяд школьнікаў.

Рэспубліканскія пераможцы **Цыганкоў Аляксандр, Кірылаў Сяргей (2004г.), Семянкоў Андрэй (2008г.)** без уступных іспытаў сталі студэнтамі **БДУ.** Дырэктарам СШ№1 з **2010 года** з’яўляецца **Апет Ірына Іванаўна**. Колькасць сярэдніх, базавых і пачатковых школ у раёне кожны год змяншаецца.У **2014 годзе** Дабрамыслінская школа адзначыла **140 – гадовы юбілей**. СШ №1(**1865г.**) таксама адзначыла свой **150 – гадовы юбілей**. Вось колькі год сеюць разумнае, добрае, вечнае нашы настаўнікі.




*Юбілей Дабрамыслінскай школы.(2014г.)*




*Да юбілею сш №1 г.п. Лёзна. (2016г.)*

***Пытанні і заданні:***

*1. Калі прэзідэнт Лукашэнка А. Р. быў у нашых мясцінах?*
*2. Якія прадпрыемствы ёсць на Лёзненшчыне зараз?*
*3. Як развіваецца культурнае жыццё?*

# Раздзел III

## "Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына..."



## §25. Археалагічныя і архітэктурныя помнікі раёна.

### *1. Археалагічныя помнікі Лёзненшчыны.*

**Археалогія** – навука, якая вывучае гісторыю па рэчавых і пісьмовых крыніцам. На тэрыторыі нашага раёна ў **90-х гг.** XX ст. праводзіліся раскопкі археолагаў, але яны не былі закончаны. Таму наш край даследаваны мала, а людзі і зараз знаходзяць сляды мінулай гісторыі. Пра знаходкі эпохі неаліту вучнямі СШ № 2 з настаўнікам гісторыі Космыкавым М. М. **паміж вёскамі Адаменкі** і **Альхавік у 1997 годзе** вам ужо вядома.



*Скрабок, знойдзены Кузьмянковым Р. У. (павялічаны ў памерах. 21.01.1998г.)*

Вось і ў пасёлку Лёзна настаўнікам гісторыі Сш №1 **Уладзімірам Рыгоравічам Кузьмянковым** і яго вучнямі былі знойдзены прылады працы першабытнага чалавека (скрабкі) эпохі неаліту.



*Зуб маманта знойдзены ў (2007г.)*

**Кавалькоў Л. А.** таксама ў г.п. Лёзна ў **2007 годзе** знайшоў зуб маманта, які перадаў у раённы музей.
Яшчэ ў 90-х гадах XX стагоддзя на гарышчы панскага дома Хлюсціна ў Адаменках было знойдзена шмат касцей маманта, якія забралі ў рэспубліканскі музей.



*Грэбень XIX ст.. Знойдзены ў 2010г.*

У **2010 годзе** Шафранава Віка, удзельніца гуртка “Мая Лёзненшчына” на бабуліным агародзе ў Лёзне па вуліцы Дабрамыслінскай знайшла вось такі грэбень. Вызначыць, да якога часу ён адносіцца, нам пакуль не ўдалося. Знаходку мы перадалі ў раённы музей.

Пра Добрынскі старажытны скарб IX стагоддзя вы таксама ведаеце, а вось пра скарб з вёскі Зачэрня вам, пэўна, трэба паведаміць.

У **2002 годзе** ў **вёсцы Зачэрня** вясковым жыхаром быў знойдзены скарб – манеты. Хто іх былы ўладальнік – невядома. А манеты ўнікальныя. Скарб уключаў білонавыя паўгрошы гэтага часу і сярэбраныя трайныя грошы перыяду праўлення **Стэфана Баторыя** ў **1576 -1586 гг**. Усяго **320 манет**.

Але скарб быў выкрадзены з сейфа аддзела міліцыі. Справа па крадзяжы была закрыта безвынікова. Вы запытаеце, чаму жыхар занёс клад у міліцыю? Таму, што наш раённы музей тады яшчэ не працаваў. Ён адчыніўся толькі ў 2003 годзе. Добрасумленны чалавек здаў клад на захаванне да адкрыцця музея.



У **2008 годзе** падчас краязнаўчай экспедыцыі мы з гурткоўцамі на старажытных яўрэйскіх могілках у Лёзне знайшлі дзве мацейвы (яўрэйскія помнікі). На іх ёсць надпісы, але яны на іўрыце. Прачытаць іх мы не змаглі, але можна дапусціць, што яны належаць дзеду і бабцы Марка Шагала, якія і былі якраз пахаваныя на гэтых могілках(са слоў Марка Шагала).

*Экспедыцыя гурткоўцаў на яўрэйскія могілкі*





*Надгробныя камяні на старажытных яўрэйскіх могілках у Лёзне (2008г.)*



Ветэран Вялікай Айчыннай вайны **Плешчанкоў Аляксей Пятровіч**, якому мой клас амаль 10 год аказваў ветэранскую дапамогу, перад смерцю падараваў нам **сярэбраную лыжку,** з якой ён прайшоў усю вайну. На ёй ёсць надпіс: "Лёша, Оля 15.X. 43г."

*Срэбраная лыжка ветэрана Плешчанкова А. П. (1943г.)*

Неяк, яшчэ ў пачатку 90-х гадоў маці майго вучня Пракопкіна Славы перадала нам карты землекарыстання Межавай канцылярыі Расійскай імперыі, якія яна знайшла на гарышчы купленага старога дома **ў вёсцы Баравая**.





*Карта Межавай канцылярыі Расійскай імперыі 3 чэрвеня 1850 г.*
*План ляснога надзела памешчыцы Грудзінскай А. І. (1885г.)*

*Царкоўны звон 1727года, дастаны з калодзе жу.*

Настаўнікам гісторыі Калышанскай школы імя Яфіма Майсеевіча Фаміна Івановым К. І. на тэрыторыі былога мястэчка Калышкі ў канцы 90-х гадоў знойдзена чаша для амавення рук і падсвечнік (пэўна, рэчы яўрэяў).



*Падсвечнік*



*Каменны крыж (фотазд. 2014г.)*



*Алея "100-год міліцыі Беларусі" ( фотазд. 2016г..)*

У пачатку XXI стагоддзя ў вёсцы Калышкі з калодзежа дасталі царкоўны звон. У вёсцы Шніткі на вайсковых могілках быў знойдзены каменны крыж. Падобны крыж летам 2016 года знайшлі студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў вёсцы Міхалінава на грамадзянскіх могілках пры правядзенні раскопак. Да якога часу адносяцца гэтыя крыжы, трэба яшчэ высветліць. Акрамя крыжа, былі знойдзены 3 нацельныя крыжыкі, кальцо і манеты 1822 і 1884 гадоў. У 2016 г. каля вёскі Адаменкі ўзнікла бярозавая алея.

## *2. Архітэктурныя помнікі Лёзненшчыны.*

Архітэктурнымі помнікамі Лёзненшчыны з’яўляюцца царкоўныя **храмы** ў Лёзне, Калышках, Бабінавічах, Пагосціішчы, Веляшковічах. Яны не захаваліся да нашых дзён, бо былі знішчаны.

Да архітэктурных помнікаў таксама адносяцца **панскія фальваркі**. Гэта маёнткі ў Адаменках, Станіслававе, Перамонце, Чарніцах, якія зараз знікаюць. У кнізе **“Спісак населеных месц Магілёўскай губерні”** 1910 года выдання значыцца, што маёнтак у **Адаменках** знаходзіцца каля ракі Машна і шашы паблізу Рыга-Арлоўскай чыгункі, належыць **М. Д. Хлюсціну**, праваслаўнаму, складаецца з 9 168 дзесяцін зямлі, у ім адзін двор і пражываюць тут 50 асоб мужчынскага і 46 жаночага палоў. Яму належаў і маёнтак у вёсцы **Розумава** з 2 379 дзесяцін зямлі.







*Панскія пабудовы ў вёсцы Адаменкі (фотазд. 2016г.)*

*Былы панскі маёнтак у Адаменках (фотазд. 2011г.)*

У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца фонд 144 – фонд Лёзненскага валаснога Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчага камітэта. Справа № 33 называецца **“Спісы батракоў, вопісы маёмасці, сельскагаспадарчага інвентару, зямлі маёнтка Станіслававa Лёзненскай воласці за 1917-1918гг.”**. Уладальніцай маёнтка ў гэты час была **Кацярына Карніцкая**, якая ў 1917 годзе перадала яго Лёзненскаму павятова-валасному зямельнаму камітэту. Забудоў маёнтка да 1917 года было ў 8 разоў больш, чым засталося. Гэта значыць, што маёмасць Кацярыны Карніцкай адчувальна зменшылася ў параўнанні з 1884 і 1910 гг..



*Рэшткі капліцы ў Станіслававе (фотазд. 2014г.)*

Быў складзены **“Вопіс пабудоў”**:
Пад №1 значыцца жылы дом і капліца, пад №№ 2-5 пазначаны жылыя будынкі, пад №№ 6-16 былі запісаны гаспадарчыя пабудовы (лядоўня, свіран, хлявы, пуні, ток з сушылкамі і манежам для малацілак). Дом уладальнікаў быў драўляны з каменнай прыбудовай.
Пад каменным будынкам быў склеп. Будынак меў 2 паверхі. На першым жылі служкі, а на другім – паны.

Хочацца ўспомніць пра стайню цагляную на падмурку каменным, даўжынёю 12 сажняў, шырынёю 4 сажні 2 аршыны, вышынёю сценкі 5,5 аршына, дзвярэй 3, вакенцаў 13.



У **1997 годзе** гурткоўцы “Мая Лёзненшчына” на веласіпедах наведалі Станіславова. Спусціліся ў склеп капліцы, заглянулі і ў прыгожую нават знешне стайню. Яна вельмі моцна ўразіла іх.

Здавалася, што коні пасуцца дзесьці на лузе і хутка вернуцца дамоў у сваю стайню.

*Былая стайня ў Станіслававе (фотазд.2014г.)*


Dzieje rezydencji
na dawnych kresach
Rzeczypospolitej
Tom
1

Звесткі пра сядзібу баронаў Эльснераў краязнаўчая група настаўнікаў знайшла ў Нацыянальнай біблітэцы ў Мінску, прычым у аддзеле польскай кнігі. Звестак было зусім мала, але быў **фотаздымак сядзібы Эльснераў 1914 года** з апісаннем іх дома. Прыйшлося перакладаць з польскай мовы. Аўтар кнігі **Раман Афтаназі**. Назву кнігі мы пераклалі так: **“ Сядзібы на былых крэсах Рэчы Паспалітай”**.

*Вокладка кнігі Рамана Афтаназі*

Мы даведаліся, што будынак былой канторы калгаса імя Леніна раней быў сядзібай баронаў Эльснераў, пабудаваны ў **пачатку XIX стагоддзя**. Нашчадкі валодалі гэтым маёнткам да 1917 года.

Дом быў драўляны на каменным фундаменце, па цэнтры шматпавярховы, а з бакоў аднапавярховы. Яшчэ дом меў порцік з двух калон, выкладзеных з цэглы і падтрымліваючых балкон. Дах быў чатырохскатны з чардачнымі вокнамі.



Перад парадным уездам заўсёды быў прыгожы газон, а па абодва бакі дома раслі рэдкія садовыя дрэвы.

*Фотаздымак сядзібы Эльснераў (фотазд. 1914 г.)*

**У сярэдзіне ХХ стагоддзя** гэты будынак некалькі разоў перабудоўваўся, а затым нейкі час тут размяшчалася кантора калгаса імя Леніна.





*Будынак маёнтка да сяр. ХХ ст.* *Былая кантора калгаса імя Леніна(2000г.)*

На канторы была шыльдачка з надпісам **" Тут з 3 па 10 ліпеня 1941года знаходзіўся штаб ЦК КПБ(б)"**. Шыльдачка знікла ў **пачатку XXI стагоддзя,** а ад былога будынка зараз амаль нічога не засталося.

Наша Лёзна падчас вайны было поўнасцю разбурана, засталася толькі царква, пячныя коміны і некалькі дамоў. Даваеннае Лёзна мы можам убачыць амаль толькі на карцінах Марка Шагала. Забудова нашага гарадскога пасёлка пачалася з **канца 1943 года**, да гэтага часу людзі жылі ў зямлянках.

Зараз наша Лёзна – пасёлак гарадскога тыпу з двума галоўнымі вуліцамі. Гэта маленькі , чысты вельмі прыгожы гарадок. На цэнтральнай вуліцы Леніна знаходзяцца амаль усе адміністратыўныя, гандлёвыя і культурныя будынкі.

У пасёлку Лёзна налічваецца каля 80 вуліц і завулкаў.





*Плошча Леніна ў Лёзне (фотазд. 2015г.)*

***Пытанні і заданні:***

*1. Якія археалагічныя помнікі могуць быць у нашым краі?*
*2. Ці захаваліся ў нас старажытныя архітэктурныя помнікі? Дзе?*
*3. Даведайся, калі ўзніклі будынкі на цэнтральнай вуліцы Леніна.*
*4. Пералічы ўсе вуліцы г. п. Лёзна і нанясі іх на карту.*
*5. Зрабі карту-схему гарадскога пасёлка Лёзна.*

## § 26. Помнікі Вялікай Айчыннай вайны

### *1. Помнікі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі сельсаветаў раёна*

Доўгія 9 месяцаў крывапралітных баёў за Лёзненшчыну былі аплачаны цаной амаль 30 тысяч жыццяў воінаў Чырвонай Арміі і партызан. І сведчанне таму – 79 воінскіх пахаванняў, 600 помнікаў і абеліскаў, устаноўленых на месцы баявой славы і гібелі воінаў – вызваленцаў, мірных жыхароў.

Уся тэрыторыя раёна ўсеяна помнікамі Вялікай Айчыннай вайны. За вызваленне нашага края 16 чалавек атрымалі Званне Героя Савецкага Саюза. Пра жорсткасць баёў на нашай зямлі сведчаць адзіныя ў Беларусі афіцэрскія могілкі, якія знаходзяцца ў вёсцы Стасева.

### *Лёзненскі сельсавет:*



**Мемарыял воінскай Славы** знаходзіцца на шашы Віцебск – Смаленск у вёсцы Стасева, дзе пахаваны 127 савецкіх афіцэраў, якія загінулі ў баях за вызваленне нашага раёна ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза **Цімафей Мікалаевіч Арлоў**.

*Мемарыял воінскай Славы ў Стасеве(фотазд. 2013 г.)*

Кожны, хто трапіць у наш пасёлак, на скрыжаваннні шашы Віцебск – Смаленск і вуліцы Леніна ўбачаць 2 помнікі Вялікай Айчыннай вайны. Толькі ў гарадскім пасёлку Лёзна знаходзіцца 6 помнікаў.



На вуліцы Леніна на вайсковых могілках пахаваны **1360** савецкіх воінаў, якія загінулі 6 - 8 кастрычніка 1943 года ў баях за вызваленне Лёзна.

Сярод пахаваных і Герой Савецкага Саюза **Міхаіл Паўлавіч Судакоў.** У Маскве яго імем названа вуліца на будынку ліцейна - механічнага завода, дзе працаваў М. П. Судакоў. Скульптура - воіна пастаўлена ў 1958 годзе.

*Вайсковыя могілкі ў г.п. Лёзна. (фотазд. 2015г.)*



У гонар вызваліцеляў пасёлка ў 1983 годзе на шашы Віцебск – Лёзна быў устаноўлены помнік – танк Т-34 на прамавугольным бетонным пастаменце, які пераходзіць у зігзагападобную плоскасць з мемарыяльнай дошкай, выявамі гвардзейскага знака, ордэнаў Леніна, Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі, а таксама подпісам – прысвячэннем.

*Помнік танк Т – 34. г.п. Лёзна (фотазд. 2013 г.)*



Пры ўездзе ў гарадскі пасёлак на шашы Віцебск – Смаленск устаноўлены помнік вызваліцелям Лёзна **158-й стралковай дывізіі** пад кіраўніцтвам генерал - лейтананта **Івана Сямёнавіча Бязуглага.** Пасля вызвалення Лёзненшчыны яна атрымала назву **158-я Лёзненска – Віцебская стралковая дывізія.**

*Помнік 158-й стралковай дывізіі (фотазд. 2015г.)*



На ўсходняй ўскраіне пасёлка Лёзна на беразе ракі Машна пахаваны 392 савецкія воіны і партызаны, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941- 1943 гадах. Помнік (арх. А. Сцябліцкі, бетон) – архітэктурна-прасторавая кампазіцыя з прамавугольнай стэлай у цэнтры, на фасаднай плоскасці якой барэльефныя выявы ордэна Айчыннай вайны, твараў 4 воінаў і партызан. Абапал стэлы – 8 пліт з імёнамі загінуўшых.

*Помнік савецкім воінам і партызанам (фотазд. 2015г. )*



Магіла ахвяр фашызму знаходзіцца ў Адаменскім гаі на ўсходняй ўскраіне нашага пасёлка на беразе ракі Машна, дзе было расстраляна 1200 ( 1700) мірных жыхароў нашага раёна, у большай частцы яўрэяў. У 1964 годзе на магіле ўстаноўлены абеліск.

*Магіла ахвяр фашызму ў Лёзне (фотазд. 2016г.)*



Помнік у памяць 23 землякоў – работнікаў Лёзненскай МТС, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, знаходзіцца за чыгункай на вуліцы Чкалава пасёлка Лёзна. У 1967 годзе была ўстаноўлена стэла.

*Помнік на вул.Чкалава ў скверы (фотазд.2014г.)*





*Помнік на шашы Віцебск – Смаленск каля вёскі Смародзіна (фотазд.2013г.)*

*Псмнік на шашы Віцебск – Смаленск каля в. Вялікае Сяло (фотазд.2013г.)*

На шашы Віцебск – Смаленск на ўскраіне вёскі Смародзіна знаходзіцца брацкая магіла 14 савецкіх воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 года пры вызваленні вёскі ад немецка - фашысцкіх захопнікаў.

Сярод іх – Герой Савецкага Саюза **Рэшатаў Павел Дзмітрыевіч.**

Таксама каля шашы на паўднёва - заходняй ускраіне вёскі Вялікае Сяло пахаваны 509 савецкіх воінаў, якія загінулі тут у 1941 -1945 гадах. Сярод іх – Герой Савецкага Саюза **Смірноў Уладзімір Яфімавіч.**





*Могілкі савецкіх* воінаў *у в. Пронскае*

*Брацкія могілкі ў вёсцы Чарніцы*

На паўночна - заходняй ускраіне вёскі Пронскае пахавана 456 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 годзе. Сярод пахаваных воіны 5-га гвардзейскага стралковага корпуса 39 –й арміі Калінінскага фронту.

На тэрыторыі былой школы - інтэрната імя А. І. Кальцова знаходзяцца брацкія магілы савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі 24. 06. 1944 года пры вызваленні вёскі Чарніцы. Ёсць тут і магіла лётчыка Героя Савецкага Саюза **Кальцова Аляксея Іванавіча.**







*Помнік у в. Чарнаруча*

*Помнік у в. Буі*

*Помнік у в. Кляўцы*

Бабінавіцкі сельсавет:





*Мемарыяльны комплекс Ціхмянаўская вышыня. Арх. А.Тарасян, скульптар З. Тарасава*

Помнік на вышыні імя Леаніда Паўлавіча Ціхмянава каля вёскі Асіпенкі, дзе ў лютым 1944 года ў няроўным баі змагаліся 38 савецкіх воінаў. У жывых іх засталося зусім мала, але вышыню яны адстаялі. Яны былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а камандзір батарэі старшы лейтэнант **Леанід Паўлавіч Ціхмянаў** і камсорг дывізіёна малодшы лейтанант медыцынскай службы **Сяргей Аляксандравіч Багамолаў** атрымалі званне Героя Савецкага Саюза.




*Помнік у вёсцы Бабінавічы (фотазд. 20014г.)*

У цэнтры вёскі Бабінавічы, побач з былой сярэдняй школай, пахаваны 1 273 савецкія воіны і партызаны, якія загінулі ў баях з ворагам.

Сярод пахаваных – воіны 159-й стралковай і 11-й гвардзейскай стралковай дывізій, 5-й і 11-й гвардзейскай арміі, што загінулі ў чэрвені 1944 года. На могілках у 1966 годзе устаноўлена – скульптура воіна.



*Помнік каля вёскі Касцяёва (фотазд. 2014г.)*

Брацкая магіла 60 савецкіх воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 года. Сярод іх – воіны 11-й гвардзейскай стралковай дывізіі і 16-га гвардзейскага стралковага корпуса 11-й гвардзейскай арміі.

Крынкаўскі сельсавет:





*Помнік у цэнтры Крынак* *Помнік М. В. Акцябрскай у Крынках(2014г.)*

Вайсковыя могілкі на тэрыторыі былога племзавода “Крынкі”. Тут пахавана 4 790 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 - 1944 гадах. Сярод пахаваных – воіны 72-га стралковага корпуса 5-й арміі. У 1958 годзе на могілках устаноўлены помнік .

Перад будынкам сельсавета ў Крынках устаноўлены помнік Герою Савецкага Саюза **Марыі Васільеўне Акцябрскай.** У 1981 годзе паблізу месца апошняга бою М. В. Акцябрскай быў устаноўлены манумент ( архетэктар ) А. Сцябліцкі; бетон, вышынёй 6 метраў), які складаецца з 4 гранёных блокаў і завяршаецца стылізаванымі крыламі.






*Помнік у Высачанах (2014г.)* *Помнік насупраць станцыі Выдрэя*

Каля будынка былой канторы саўгаса Высачаны ў 4 брацкіх магілах пахаваны 274 воіны. У 1981 годзе на магіле устаноўлены помнік – 3 ссунутыя па вертыкалі бетонныя кубы з барэльефамі ў выглядзе зоркі на верхнім кубе і галавы воіна на левай грані сярэдняга куба.

Насупраць будынка чыгуначнай станцыі Выдрэя пахаваны 300 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 годзе на магіле ўстаноўлены абеліск. У вёсцы Чарнышы пахавана – 4 468 , Хоцемлі – 1 229, Малых Місніках – 470 савецкіх воінаў.







*Помнікі ў в. Малыя Міснікі* *в. Чарнышы* *в. Хоцемля*

## *Дабрамыслінскі сельсавет:*




*Ля помніка ў Дабрамыслях (1997г.)*



*Помнік у Дабрамыслях каля школы*

У цэнтры вёскі Дабрамыслі пахаваны 158 воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941 – 1944 гадах. У 1966 годзе на магіле ўстаноўлены помнік - скульптура воіна з забітым таварышам на руках і 2 пліты з імёнамі загінуўшых.

У вёсцы Дабрамыслі каля школы пахаваны 122 воіны і партызаны, якія таксама загінулі ў 1941 – 1944 гадах. На магіле ў 1966 годзе быў устаноўлены абеліск.



*Помнік у Перамонце (фотазд. 2013г.)*




*Помнік у Горбаве*

У цэнтры вёскі Перамонт каля дзіцячага садзіка пахаваны 87 воінаў і партызан. У 1966 годзе на магіле пастаўлены помнік - скульптура воіна.

Помнік партызанам - заслонаўцам, якія загінулі 13.08. 1942 года ў вёсцы Горбава пры разгроме буйнога гарнізона нямецка - фашысцкіх захопнікаў знаходзіцца ў вёсцы Выхадцы. У 1966 годзе была пастаўлена стэла.



*Помнік у вёсцы Стар (фотазд.2013г.)*



*Памятны знак каля вёскі Рублева(фотазд. 2015г.)*

У цэнтры вёскі Стар пахавана 785 воінаў, якія загінулі ў 1944 годзе ў баях. У 1971 годзе на магіле ўстаноўлены помнік - скульптура воіна.

## Веляшковіцкі сельсавет:



*Помнік у Веляшковічах(фотазд. 2014г.)*



*Помнік у Грабеніках*

У Веляшковічах каля школы і на паўднёвай ўскраіне вёскі знаходзяцца брацкія могілкі савецкіх воінаў, якія загінулі тут у 1941-1944 гадах.

За 300 м ад вёскі Грабенікі ў 12 магілах пахаваны 67 савецкіх воінаў 84 - га стралковага корпуса 39 -й Арміі, якія загінулі восенню 1943 года.
У 1974 годзе на могілках устаноўлены абеліск.



*Помнік у Глоданках (фотазд. 2014г.)*



*Помнік у вёсцы Замшына*

За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі Глоданкі на ўскрайку лесу пахаваны 134 воіны і партызаны, якія загінулі тут у 1941- 1944 гадах.

У 1981 годзе на могілках устаноўлены помнік - скульптура воіна.

На паўночнай ускраіне вёскі Замшына, каля клуба ў 13 магілах пахаваны 267 воінаў і партызан, якія загінулі тут у 1941 - 1944 гадах. У 1958 годзе на могілках устаноўлены абеліскі.



*Помнік у вёсцы Буракі*



*Помнік у в. Загарадна (фотазд. 2014г.)*

У вёсцы Буракі знаходзіцца брацкая магіла партызан, дзе пахавана 13 партызан брыгады А. Ф. Данукалава, якія загінулі ў 1943 годзе. У 1967 годзе на магіле ўстаноўлены абеліск.

Яськаўшчынскі сельсавет :



У цэнтры вёскі Асташэва пахаваны 137 жыхароў, закатаваных і спаленых нямецка - фашысцкімі акупантамі 30 верасня 1943 года. У 1983 годзе на магіле ўстаноўлены помнік (арх. Сцяблецкі, бетон; вышыня 12 м) – плоская вертыкальная стэла пад стылізаванай двухсхільнай страхой хаты. На франтальнай плоскасці стэлы скульптурная выява ахопленай полымем жанчыны з дзіцём. У завяршэнні – 4 вертыкальныя пілоны, паміж якімі ўмацаваны 3 званы.

*Помнік ахвяр фашызму. Асташэва (фотазд. 2013г.)*



На ўскраіне вёскі Надзёжына пахаваны 226 савецкіх воінаў, якія загінулі тут у 1941 - 1944 гадах. У 1970 годзе на могілках устаноўлены помнік у выглядзе скульптуры - воіна і 10 абеліскаў.

*Помнік у Надзёжыне*



На ўскраіне вёскі Куляціна пахаваны невядомы воін, які загінуў у Вялікую Айчынную вайну.
У 1965 годзе на магіле ўстаноўлены абеліск, а ў 2015 годзе помнік **невядомаму воіну** быў абноўлены.

*Помнік невядомаму воіну ў Куляціне (фотазд. 2014г.)*

## 1. *“Ніхто не забыты і нішто не забыта”. Перазахаванні*

Яшчэ ў пачатку XXI стагоддзя лічылася, што на Лёзненшчыне за гады Вялікай Айчыннай вайны загінула 27 тысяч савецкіх воінаў. На сённяшні дзень лічбы ўжо іншыя ( больш за 30 тысяч). Яны будуць змяняцца, бо ёсць людзі, якія вядуць пошукавую працу і займаюцца архіўнымі даследаваннямі. Зараз у нашым раёне лічыцца загінуўшых – **31тыс. 374 ч**, вядомых – **23тыс. 720ч**, невядомых – **7 тыс. 540ч**.

Вялікі дзякуй трэба сказаць нашым настаўнікам – Багдановіч Дзіне Анатольеўне, Гайдукевічу Канстанціну Пятровічу, якія толькі за 2016 год устанавілі больш за 500 новых невядомых прозвішчаў і адпрацавалі больш за

1000. Пошукавую працу ў раёне вядуць аматары пошуку Ільюшкін Андрэй, Гоманаў Андрэй і 52-гі пошукавы батальён з Полацка. Амаль кожны год у нашым раёне праходзяць перазахаванні савецкіх воінаў.





*Перазахаванні савецкіх воінаў у Лёзнескім раёне*





*Перазахаванне ў Лёзне* *у Чарніцах* *у Крынках*

Перазахаванні праводзіліся ў Крынках (2012г.), Бабінавічах (2015г.), Лёзне (2014г.), Чарніцах, у Вялікім Сяле. 6 мая 2016 года ў Бабінавічах адбылося яшчэ адно перазахаванне з Рублева - 2, а затым яшчэ і ў Крынках.

Трэба падзякаваць і мясцовай уладзе, якая да 70-годдзя Перамогі аднавіла амаль усе помнікі воінам Вялікай Айчыннай вайны на Лёзеншчыне.





*Помнік танкістам у вёсцы Шніткі* *Помнік Піценіну М. Т. (фотазд. 2013г.)*

***Пытанні і заданні:***

1. *Колькі савецкіх воінаў загінула на Лёзеншчыне?*
2. *Дзе знаходзяцца афіцэрскія могілкі?*
3. *Назавіце лічбу воінскіх пахаванняў на нашай зямлі.*
4. *Распавядзі пра помнік Ціхмянаўская вышыня.,*
5. *Чаму праводзяцца перазахаванні воінаў?*

## §27. Легенды і паданні Лёзненшчыны. Этнограф М. Я. Нікіфароўскі

### *1. Фальклор беларускага народа.*

**Фальклор** – народная творчасць, часцей за ўсё менавіта вусная; мастацкая калектыўная творчая дзейнасць народа, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэалы. Гэта паданні, песні, прыпеўкі, анекдоты, казкі, эпас, народная музыка (песні, інструментальныя найгрышы і п’есы), тэатр (драмы, сатырычныя п’есы, тэатр лялек), танец.

Багамі і дэманалагічнымі істотамі ў беларусаў некалі была напоўнена ўся навакольная прырода – ад зямных нетраў да недасягальнага Космасу.

Фантастычныя вобразы насялялі лясы, палі, рэкі, ім знаходзілася месца ў хатах, на гарышчах, у коміне, падпечны, у лазні, хляве і іншых гаспадарчых пабудовах. Сваіх міфічных антыгерояў народ ствараў паводле сваіх жа чалавечых заган і хібаў, не ашчаджаючы самых брудных фарбаў на іх пачварныя партрэты. Ну, а калі чаго ў гэтым жыцці ў знешнасці ці характары не хапала, у ход ішла нястрымная фантазія.

Сярод празаічных жанраў беларускага фальклору звычайна вылучаюць: 1). празаічныя няказачныя жанры (паданні, легенды, былічкі, бывальшчыны, вусныя апавяданні); 2). казачныя жанры (казкі пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя, аванцюрныя, кумулятыўныя, казкі-анекдоты); 3). небыліцы; 4). так званыя малыя формы фальклору: устойлівыя рытуальныя формулы, празаічныя загадкі, прыказкі, прымаўкі.

**Легенды** – фальклорныя творы, якія паведамляюць аб падзеях вельмі далёкай мінуўшчыны, часцей за ўсё эпохі першатварэння. Легенда адрозніваецца ад казкі тым, што ў сапраўднасць легендарнага апавядання вераць. Легенда – у адрозненне ад казкі – расказваецца не для забавы, а для паведамлення, як і што было раней, адкуль пачынаюцца вытокі той ці іншай з’явы, для тлумачэння існуючага парадку яго паходжаннем, а таксама для павучання і выхавання.

**Паданне** – гэта вуснае паведамленне аб рэальных (ці блізкіх да рэальных) з’явах альбо асобах мінулага. Паданні паведамляюць пра важныя гістарычныя падзеі, якія адбыліся ў той ці іншай мясцовасці, а таксама тлумачаць некаторыя мясцовыя прыродныя і культурныя адметнасці.

**Найбольш распаўсюджаныя віды паданняў:**

- аб гістарычных асобах і падзеях (гістарычнае)
- аб паходжанні назвы мясцовасці (тапанімічнае), аб паходжанні назвы рэчкі або возера (гідранімічнае)
- аб паходжанні назвы этнасу, племені, сацыяльнай групы (этнанімічнае),
- аб паходжанні прадметаў, устанаўленняў, вераванняў, парадкаў.

Паданні могуць быць легендарнымі (з элементамі фантастыкі, напрыклад, пра скарбы), міфалагічнымі (пра асілкаў, якія стварылі той ці іншы прыродны аб’ект).

## *2. Легенды і паданні Лёзеншчыны.*

Курганы на поўначы Беларусі, у месцах рассялення крывічоў, маюць мясцовую назву **"валатоўкі"**, якая звязана са старажытнымі легендамі пра **асілкаў-волатаў**, пахаваных там. Курган каля вёскі Кучыншчына Крынкаўскага сельсавета мае назву **"Напалеонаўская валатоўка"**. У народзе курганы часта называюць французскімі (напалеонаўскімі) або шведскімі магіламі. Аднак вынікі археалагічных раскопак гэта не пацвярджаюць, проста гістарычныя падзеі, звязаныя з паходамі Карла XII і імператара Напалеона, спрыялі выцясненню старажытных звестак.

Існавала легенда пра **Буракоўскае балота.**

Напэўна, многія жыхары раёна ведаюць балота, якое знаходзіцца каля **вёскі Буракі Кавалёўскага сельсавета**. З глыбіні вякоў да нашага часу дайшлі легенды пра гэтую мясціну. Даўным-даўно, як сведчыць першая легенда, што перадавалася з пакалення ў пакаленне, на месцы сучаснага балота было вялізнае возера, а на беразе яго стаяў прыгожы палац, у якім жыла княжаская сям'я. У князя і княгіні доўгі час не было дзяцей. І вось пасля некалькіх гадоў княгіня нарадзіла сына. Хлопчык стаў адзіным наследнікам усяго княжаскага роду. Быў ён усеагульным любімцам і ўцехай для шчаслівых бацькоў. Аднойчы здарылася вялікае няшчасце: маленькі княжаскі хлопчык утапіўся ў возеры. Гора бацькоў было бязмежным. У адчаі і роспачы княгіня закрычала: "Няхай будзе праклятым навекі гэтае возера!"

Шмат часу прайшло з тае пары. І паступова возера пачало мялець і зарастаць, а з цягам часу ператварылася ў сапраўднае балота.

Яшчэ адна легенда дайшла да нашых дзён пра тое, як гэтае балота выратавала жыхароў навакольных вёсак у вайну **1812 года**. Тады праз нашу мясцовасць праходзіў найкарацейшы шлях на Маскву, якую Напалеон хацеў захапіць. Два тыдні стаялі французскія войскі ў Лёзне. Увесь гэты час яны грабілі і забівалі мірнае насельніцтва. У жыхароў вёсак забіралі прадукты харчавання і фураж.

Каб выратавацца ад акупантаў, жыхары навакольных вёсак, што размяшчаліся каля балота, зрабілі мост і перагналі ўсю хатнюю жывёлу ў непраходнае месца. І самі там схаваліся, а мост разабралі. Французскія салдаты чулі, як мычаць каровы, брэшуць сабакі, але зайсці туды яны не змаглі.

Вось так нашы продкі і выратаваліся на балоце ад ворага. У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсках Кавалі і Таўпа знаходзіўся доўгі час штаб партызанскай брыгады Аляксея Фёдаравіча Данукалава. І менавіта цераз гэтае балота партызаны трымалі сувязь з **"Вялікай зямлёй"**, з савецкім тылам.

У нашы дні балота спраўна служыць людзям. Шмат гадоў вяліся тут торфараспрацоўкі. Улетку і ўвосень сюды прыязджаюць многія сяльчане і гараджане па грыбы і журавіны.

**Існуе шмат легенд пра Лёзна**. Вось адна з іх:

У аднаго купца былі сын Андрэй і прыгажуня дачка Марыся, якая вельмі падабалася мясцоваму папу. Неяк купец з сынам з'ехалі на гандаль, а поп у

гэты час заявіўся да дзяўчыны і паспрабаваў яе спакусіць. Тая заманіла яго ў лазню, а калі ён распранаўся, ашпарыла яго кіпенем. Раззлаваўся поп. Калі бацька вярнуўся, нагаварыў яму розных гадасцяў: “Вось злавіў я тваю дачку ў лазні, ды не адну. Яны мяне распранулі, кіпенем аблілі”. Разгневаўся купец і загадаў сыну забіць дачку-распусніцу. Але Андрэй пайшоў разам з Марысяй з бацькоўскага дому. Купілі яны за невялікія грошы , якія ў іх былі, “лознае месца”- участак зямлі, паросль лазой, потым раскарчавалі яго, зааралі, пабудавалі дом. І паўстала тут паселішча – **Лознае – Лозно – Лёзна**.

Пра час заснавання мястэчка **Дабрамыслі** не захавалася дакладных гістарычных звестак. Паданне гаворыць, што некалі на яго месцы стаялі карчма і заезджы дом. Шмат розных людзей ехала праз гэта месца, і яго ўладальнік вырашыў павялічыць колькасць пабудоў. Калі ён паведаміў пра гэта сваім знаёмым, яны сказалі, што гэта **“добрая мысль”**. Пасля было пабудавана некалькі дамоў, а паселішча назвалі **Дабрамыслі**.

Гідранамічныя паданні раскрываюць нам назвы нашых рэк, азёр.
Вось, напрыклад, чаму рэчка на памежжы Лёзненскага і Віцебскага раёнаў мае назву **Ласасінка.** Таму, што там раней вадзілася рыба **ласось**.

Ёсць паданне і пра **раку Машну.**
Плыла калісьці па ёй ладдзя, гружаная таварамі. Стаяў купец, любаваўся навакольнымі месцамі. Сагнуўся, каб зачэрпнуць далонямі чыстай рачной вады, ды і не заўважыў, што кашалёк з грашыма (машна), які вісеў на шыі, зваліўся ў ваду.
**Машна, машна**, - закрычаў ён. Сталі ныраць весляры ў ваду, ды месцы тут глыбокія. Так і не знайшлі яны **кашалёк з грашыма (машна).**

Культура беларусаў заснавана на былых традыцыях нашых продкаў. Святы, абрады і звычаі маюць месца і ў сучасным жыцці.

Гэта каляндарныя святы **Гуканне вясны, Вялікдзень, Радаўніца, Дзяды, Каляды, Купалле, Масленіца, Дажынкі, шчадраванне, валачобніцтва**. Сямейныя святы заручыны, вяселле, хрэсьбіны і іншыя. Абрады пахавання і памінання.

Абласное свята **“Дажынкі” ў верасні 2011 года** праводзілася ў нашым гарадскім пасёлку Лёзна.

А вось свята **“Масленіца”** амаль кожны год праводзіў на школьным двары **гурток “Мая Лёзненшчына”**. З гульнямі, песнямі, спальваннем чучала зімы і, вядома, блінамі – сімвалам сонейка.





*Свята “Масленіца” на двары СШ №1 г.п. Лёзна (2006г. 2010г. 2013г.)*

У **2012 годзе** краязнаўчы гурток прымаў удзел у раённым конкурсе праектаў мясцовай газеты "Сцяг перамогі" **"Для любімага горада".** Гурткоўцы прапанавалі, абапіраючыся на паданне пра раку Машну, стварыць **"Масток багацця"**, дзе маладыя падчас вяселля будуць чапляць замочкі.

## *3. М. Я. Нікіфароўскі ў сваіх працах пра нашы мясціны.*

**Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі** – вядомы беларускі этнограф і фалькларыст.

Нарадзіўся **5 мая 1845 года** ў вёсцы **Вымна Віцебскага раёна**. Але і вёска Веляшковічы Лёзненскага раёна займала важнае месца ў ягоным жыцці.

Сюды ў **1853 годзе** быў пераведзены на службу панамаром мясцовай праваслаўнай царквы яго бацька. Тут васьмігадовы Мікалай пачынае вучыцца ў школе мясцовага дзяка. Ён валодаў дзіўнай памяццю і вялікімі здольнасцямі. Па жаданні бацькоў юнак паступае ў Віцебскую духоўную семінарыю.



*Нікіфароўскі Мікалай Якаўлевіч*

Тады ён вельмі часта наведваў родныя Веляшковічы, аб чым пазней пісаў: "У гэтыя пабыўкі мне зноў удавалася бачыць вясковыя ігрышчы, хрэсьбіны, вяселлі, пахаванні, разнастайныя працы…" У далейшым ўражанні таго часу знойдуць адлюстраванне ў многіх яго публікацыях.

**15 кастрычніка 1893 года** Імператарскае грамадства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі прысвоіла Мікалаю Якаўлевічу Нікіфароўскаму сярэбраны медаль за багаты сабраны этнаграфічны матэрыял. Сялянскае жыццё, спосабы прыгатавання ежы, народнае адзенне, народная музыка і святы, прыкметы і павер'і, легенды і паданні, уяўленні народа аб нячыстай сіле – усё гэта і шмат іншага ахарактарызавана з такімі падрабязнасцямі, якія сведчаць аб выключнай назіральнасці аўтара і аб вялікай адданасці і любові яго да роднага народа.

Нікіфароўскі, верагодна, не аднойчы бываў у нашым мястэчку Лёзна. Яшчэ бліжэй да Лёзна, у Палёнаўцы і Пнёве, ім зроблены запісы асобных простанародных прыкмет і павер'яў, якія ўвайшлі ў аднайменную працу, надрукаваную ў **1897 годзе.**

Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі мог быць у Лёзне па гаспадарскіх справах бацькі, напрыклад, на кірмашы, у гасцях па запрашэнні каго-небудзь з веляшковіцкіх лёзненцаў альбо віцебскіх знаёмых – ураджэнцаў Лёзна, нарэшце, па прычыне ўласнай прыроднай дапытлівасці, схільнасці да этнаграфічныхназіранняў. Дакладна зафіксаваны факт знаходжання Нікіфароўскага ў Лёзне **летам 1889 года**.

Гэтая інфармацыя ўтрымліваецца ў зносцы на старонцы XX Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага **"Очерки простонароднаго житья-**

**бытья в Витебской Беларусии и описание предметов обиходности”, Витебск, 1895.** З гэтай працы тэкст зноскі № 224.

У гэтай працы і **“Простанародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи…”**

Мікалай Якаўлевіч змясціў шмат звестак з Веляшковіччыны з пазначэннем часу і месца іх запісу. Дзякуючы гэтай інфармацыі, мы сёння маем магчымасць падрабязна ўявіць сабе, як жылі, чым харчаваліся, як апраналіся нашы продкі, якіх прытрымліваліся традыцый. На жаль, мы пакуль не ведаем, дзе ў Веляшковічах жыла сям’я Нікіфароўскіх, і можам толькі здагадвацца, дзе пахаваны бацькі славутага даследчыка.


ОЧЕРКИ


ПРОСТОНАРОДНЫЯ
ПРИМѢТЫ и ПОВѢРЬЯ.

*Вокладкі кніг Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага (1895г, 1897г.)*

Заслугоўвае ўвагі паданне, запісанае Нікіфароўскім пра **Бабаўшчынскі пограб**, які знаходзіцца паблізу **фальварка Бабаўшчына, што ад сяла Веляшковічы ў трох вярстах, на захад ад Янавіцкага шляху.**

Народнае паданне расказвае аб гэтым пограбе наступнае.

У далёкія часы тут жыло шмат разбойнікаў, якія хавалі ў гэтым пограбе нарабаваныя багацці. Трымалі яны ў палоне знакамітую дзяўчыну, бацькі якой пры падтрымцы царскага войска прымалі ўсе намаганні, каб адшукаць дачку і пакараць разбойнікаў. Калі не стала магчымасці хавацца ад войска, разбойнікі зачынілі яе і “зачаравалі пограб”, а праз пэўны час патрапілі ў рукі правасуддзя і былі пакараны…

Бацькі адшукалі гэтае месца. Але кожны раз, як рабочыя паспявалі адрыць дзверы ў пограб , на іх нападаў цяжкі сон. Ніхто не паспяваў выйсці з месца, а падаў там і засыпаў навечна. Ведаючы пра няўдачы папярэднікаў, сучасныя шукальнікі прыгод не імкнуцца ўзнавіць небяспечныя спробы.

Больш 530 загадак сабраў Мікалай Якаўлевіч для свайго зборніка “Прастанародныя загадкі”, выдадзеныя ў 1898 годзе.

У прадмове аўтар разглядзеў формы і віды загадак. Яны сістэматызаваны па тэматычнаму прынцыпу і падзелены на 10 груп: “Прылады працы”, “Жывёлы”, “Расліны, стыхія”, “З’явы прыроды, поры года”, “Пабудовы і іх часткі” і іншыя.

Вядомая яго кніга **“Нячысцікі”**, **“Паўпрыказкі і паўпрымаўкі”, а таксама павер’і, суявер’і і народныя прыкметы.**




*Карта-схема месц, наведаных М. Я. Нікіфароўскім на Лёзненшчыне*

Памяць пра выдатнага нашага земляка шануецца тутэйшымі жыхарамі. У Веляшковіцкай школе **Ціхаміравай Ірынай Мікалаеўнай** аформлены альбом, прысвечаны Мікалаю Якаўлевічу Нікіфароўскаму, сабрана калекцыя этнаграфічных прадметаў, апісаных у яго творах. Пад яе кіраўніцтвам вучнямі старэйшых класаў на абласны краязнаўчы конкурс быў прадстаўлены абрад вяселля, апісаны гэтым вядомым беларускім фалькларыстам.

***Пытанні і заданні:***

1. *Што такое фальклор?*
2. *Чым паданне адрозніваецца ад легенды?*
3. *Якія паданні і легенды ты ведаеш пра сваю мясцовасць?*
4. *Хто такі М. Я. Нікіфароўскі, чым ён займаўся?*
5. *Паглядзі ў дадатку № 5 абрад Вяселле, запісаны М. Я. Нікіфароўскім.*

## §28. Нашы славутыя землякі

### Іосіф Уладзіміравіч Гурка – генерал- фельдмаршал Расійскай арміі



*Генерал-фельдмаршал І. У. Гурка*

Нарадзіўся ў **1828 годзе** ў нашых мясцінах, пэўна ў Крынках. Вучыўся Іосіф у Пажскім корпусе, які знаходзіўся пры двары імператараў, куды маглі паступіць толькі дзеці генералаў і іншых саноўнікаў. Пасля служыў у гусарскім палку. Калі пачалася Крымская вайна (1853–1856 гады), наш зямляк перавёўся ў армейскі пяхотны полк, змяніўшы чын ротмістра на маёра, каб толькі ўдзельнічаць у баях. Неўзабаве пасля вайны стаў камандзірам палка, затым брыгады, даслужыўся да пасады камандзіра другой гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі, трапіў у світу цара, стаўшы флігель-ад'ютантам.

Падчас руска-турэцкай вайны (1877–1878 гг.) генерал І. У. Гурка-Рамейка камандаваў перадавым атрадам, які ў ліпені 1877 года вызвалiў старажытную сталіцу Балгарыі горад **Тырнава** і значную частку краіны, якая задыхалася пад прыгнётам захопнікаў. У складзе яго атрада, дэманструючы высокія маральныя і баявыя якасці, ваявалі і балгарскія апалчэнцы. Вядома, што самыя крывапралітнныя баі ішлі пад сценамі добра ўмацаванай турэцкай крэпасці Плеўны. Рускія войскі двойчы штурмавалі крэпасць, але туркі ўсе атакі адбівалі. Здавалася, перамагчы Плеўну будзе немагчыма.

І вось на ваенным савеце, які вёў цар Аляксандр II, генерал І. У. Гурка-Рамейка ўнёс прапанову перарэзаць шлях з Сафіі на Плеўну, каб пазбавіць турэцкі гарнізон падмацаванняў. Генерал сам браў на сябе гэтую задачу. Неўзабаве войскі Гуркі - Рамейкі разам з балгарскімі апалчэнцамі пасля трохгадзіннага рукапашнага бою ўзялі штурмам умацаванне Горны Дубняк, тым самым авалодаўшы высотамі і перарэзаўшы галоўную дарогу. Апынуўшыся ў асадзе, **Плеўна** капітуліравала. У многіх баях удзельнічалі войскі нашага праслаўленага земляка.



*Вызваленне Сафіі. Мал..Дзмітрава М.*

Але самым цяжкім выпрабаваннем той вайны стаў пераход рускіх войск цераз Балканы ў снежні 1877 года. Нямецкі генерал Мольтке, які лічыўся ў Еўропе самым лепшым ваенным аўтарытэтам, прадказваў генералу Гурку няўдачу. Але 70-тысячны корпус пераадолеў у лютыя маразы стромкія скалы, а спусціўшыся з гор у даліну, пад радасныя воклічы жыхароў, вызвалiў **Сафію.**

Потым славутыя перамогі пад Ташкісенам, Філіпопалем, уступленне ў Адрыянопаль. Турцыя запрасіла міру. Вядома, што Сербія, Чарнагорыя, Балгарыя і Румынія атрымалі незалежнасць у ходзе гэтай апошняй руска-турэцкай вайны, і вялікая заслуга ў перамозе над ворагам належыць генералу І. У. Гурка-Рамейку. Нават існуе легенда, што з той пары кожны нашчадак з роду гэтага праслаўленага палкаводца, згодна з рашэннем балгарскага ўрада, аўтаматычна становіцца **ганаровым** грамадзянінам Балгарыі.

У ваенным майстэрстве І. У. Гурка поўнасцю прапаведаваў сувораўскія прынцыпы. Яго дэвіз: "Ісці наперад, нягледзячы на лікавы перавес ворага, імкліва зблізіцца з ім і перамагчы яго куляй і штыком". Суворава, як палкаводца, Гурка багатварыў. Гарэў жаданнем даказаць жыццяздольнасць і сілу сувораўскіх запаветаў. У свае 49 год І. У. Гурка быў стройны, як юнак, вынослівы, энергічны. Русавалосы, з шэрымі, глыбокімі, уважлівымі вачыма і густой раздвоенай барадой, якая не закрывала адзінай высокай узнагароды – срэбранага "Георгія". Пасля заканчэння вайны Гурка вёў спакойнае і размеранае жыццё, займаючы высокія адміністрацыйныя пасты, знаходзячыся ў вышэйшым эшалоне ўлады.

Салдат і патрыёт, ён быў на ўсіх пасадах прамым і чэсным. Аб гэтым сведчыць такі факт яго біяграфіі. Калі яму жандармскае трэцяе аддзяленне прапанавала сачыць за неблаганадзейнымі, ён у знак пратэсту падаў у адстаўку, але яна не была прынята.

З 1880–1882 гг. Гурка - генерал-губернатар Пецярбурга. У 1883–1894гг. быў генерал-губернатарам Прывісленскага краю і Варшавы. **Чын генерал-фельдмаршала** Гурка атрымаў у **1894 годзе**. З 1886 года з'яўляўся членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. З 1894 года ён у адстаўцы.

Недзе ў гэты час, у канцы XIX стагоддзя Гурка прадаў свой маёнтак і землі ў Высачанах памешчыку Веберу і перасяліўся ў Смаленскае памесце Рай. Памёр Іосіф Уладзіміравіч Гурка **28 студзеня 1901 года** ў вёсцы Сахарава пад Цверру, куды зноў пераехаў жыць. Пражыў 72 гады.

Балгары, нашы браты славяне, свята захоўваюць памяць аб нашым земляку. Яго іменем названа адна з вуліц і бульвар у сталіцы Балгарыі - горадзе Сафіі. Там жа ўстаноўлены барэльеф генерала Гуркі. Горад Гуркава і два пасялені ў Балгарыі таксама названы ў яго гонар.







*Барэльеф генерала ў Сафіі*

*Помнік І. У. Гурку ў Сафіі (фотаздымак 2013 г.)*

У Расіі ў **2011 годзе** адбылося перазахаванне генерал - фельдмаршала І.У.Гуркі ва ўсыпальніцы радавога маёнтка Сахарава Цвярской губерні.

У **2013 годзе** ў Сафіі ўстанавілі яшчэ адзін помнік І. У. Гурку. Ён прысвечаны **135 - годдзю вызвалення Балгарыі** ад турэцкага гнёту.

"Чалавек жыве да тых пор, пакуль яго памятаюць".

Дзеці генерал - фельдмаршала не прызналі рэвалюцыю і савецкую ўладу. Сын Уладзімір быў намеснікам міністра ўнутраных спраў, удзельнічаў у белым руху на поўдні Расіі, потым апынуўся ў эміграцыі. Васіль і Дзмітрый у першую сусветную вайну сталі генераламі. Першы ў сакавіку – маі 1917 года камандаваў войскамі Заходняга фронту. За манархічныя выступленні быў звольнены Часовым урадам з гэтай пасады і высланы за мяжу.

Выдаў на нямецкай мове мемуары "Расія 1914–1917гг. Успаміны пра вайну і рэвалюцыю. Берлін 1921г." Дзмітрый быў генералам у арміі Юдзеніча, удзельнічаў у баях на Паўночным Захадзе, потым эмігрыраваў. Такім быў лёс генерал-фельдмаршала і яго нашчадкаў.

***Залман Шнеерзон* – выдатны іудзейскі рэлігійны пісьменнік і грамадскі дзеяч другой паловы XVIII – пачатку XIX стст.**

Але, напэўна, далёка не кожны ведае, што мястэчка Лёзна - яго Радзіма. С. М. Дубноў, аўтар "Кароткай гісторыі яўрэяў", выдадзенай у 1912 годзе ў Пецярбургу, пісаў у сваёй кнізе: "Залман Шнеерзон не быў уяўным цудатворцам. Народжаны ў мястэчку Лёзна (Магілёўскай губерніі), ён у юнацтве атрымаў талмудысцкую адукацыю. У 20-гадовым узросце накіраваўся ў Мяжэрычы на Падолію і там засвоіў хасідскае вучэнне пад кіраўніцтвам равіна Бэра.


*Залман Шнеерзон*

Вярнуўшыся на Радзіму, ён стаў распаўсюджваць гэтае вучэнне ў новай, больш разумнай форме. Яго вучэнне сыходзіць з таго, што ўвесь свет з'яўляецца праяўленнем Бога. Кожны чалавек, нават злачынца, можа паднялца наверх, бо няма абсалютнага, зла самастойнага. Галоўнае – пачуццё зліцця з Богам, да якога можна дайсці з дапамогай экстатычнай, гарачай малітвы. Выхоўвай у сябе аптымістычны погляд на жыццё, добрыя адносіны да ўсіх людзей – і ты дасягнеш вяршыні ў жыцці. Вучэнне Залмана знайшло мноства паслядоўнікаў у Літве і Беларусі (1780- 1800гг.)".

Але талмудысты зрабілі так, што хасіда Залмана Шнеерзона неўзабаве арыштавалі і пасадзілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць як дзяржаўнага злачынцу. Лічыцца, што імператар Павел І, пераапрануты, каб не быць нікім заўважаным, асабіста ў змрочным каземаце меў размову з вучоным лёзненскім равінам. І пераканаўся ў бяскрыўднасці хасідскага вучэння як аднаго з накірункаў іудаізма. Неўзабаве рэбе Залман атрымаў свабоду і вярнуўся на Радзіму.

Памёр Залман Шнеерзон у **1812 годзе**, падчас напалеонаўскага нашэсця ў Расію. Тут нельга не падкрэсліць, што ў тыя трагічныя часы хворы равін звярнуўся да суайчыннікаў з адозвай на рускай мове, у якой заклікаў аказаць супраціўленне французскім захопнікам. Ён разам з сям'ёй быў у радах адступаючай рускай арміі.

У Залмана было тры сыны. Усе яны былі яго вучнямі, хасідамі. Усе трое пахаваны ў Любавічах. Самым вучоным з іх быў рэбе Доб Бэр. Пасля смерці бацькі ён стаў кіраўніком хасідаў, зрабіў Любавічы сталіцай хасідаў на цэлае стагоддзе, хаця сам пражыў не вельмі многа. Доб Бэр меў вялікі ўплыў на яўрэяў: ніводная абшчына Беларусі і Літвы не назначала свайго рэлігійнага кіраўніка без яго адабрэння. Цадзікам (вучоным і ўрачом) стаў сын Доб Бэра - Мэнахем Нахум.

У Любавічах была велізарная бібліятэка. Славілася бальніца, дзе лячылі ўсіх. Сюды ішлі і ехалі веруючыя, каб не толькі памаліцца, а і атрымаць палёгку ў час хваробы. Савецкая ўлада праводзіла палітыку знішчэння царквы і ўсяго культавага ўплыву, што існаваў у час царызму.

І вось аднойчы, **15 чэрвеня 1927 года** ў кватэру на Махавой, 22, уварваліся супрацоўнікі ГПУ у суправаджэнні шпігаў і панятых. Шосты равін Іосіф Іцхак Шнеерзон быў арыштаваны ў Ленінградзе і дастаўлены ў турму. Пасля 19-ці дзён следства Рэбе быў прыгавораны да расстрэлу. Следчы Лулаў заявіў: " Вы будзеце расстраляны на працягу 24 гадзін." Усявышні дапаможа!" - адказаў гучна цадзік. Можа быць, упершыню ў гісторыі ГПУ найшла каса на камень: уплыў сусветнай грамадскасці аказаўся настолькі моцным, што расстрэл быў заменены катаргай на Салаўкі. Потым было вырашана кіраўніка хасідаў адправіць у ссылку на тры гады ў горад Кастраму.

Але жонка пісьменніка Максіма Горкага Кацярына Пяшкова будучы тагачасным кіраўніком Расійскага Чырвонага Крыжа дабілася поўнай рэабілітацыі любавіцкага равіна.

Рэбе Іосіф выехаў за мяжу. Жыў у Прыбалтыцы, потым у Злучаных Штатах. Яго паслядоўнікі ва ўсім свеце працягваюць праводзіць вялікую дзейнасць па аказанні дапамогі яўрэйскім абшчынам у стварэнні нядзельных школ па вывучэнню яўрэйскай культуры, мовы іўрыт. Зараз хасіды адкрываюць маладзёжныая клубы і праводзяць семінары сярод яўрэяў, вядуць выдавецкую дзейнасць, наладжваюць адпачынак дзяцей у летніх лагерах, адкрываюць для малых дзяцячыя сады і яслі. Аказваюць гуманітарную дапамогу. Дарэчы, штаб-кватэра хасідаў з 1977 года знаходзіцца ў Ньюр-Йорку ў Брукліне, а шматлікія цэнтры і абшчыны паслядоўнікаў нашага земляка рассеяны па ўсяму зямному шару.

Любавічы і Лёзна – слаўныя мясціны хасідаў. Цяпер у недалёкіх ад нас Любавічах Руднянскага раёна Смаленскай вобласці ўжо вядзецца будаўніцтва Сінагогі, дзе будзе ўшанавана памяць цадзікаў Шнеерзонаў.

Хасіды вучаць: " Калі ты не за сябе, то хто за цябе? Калі ты толькі за сябе навошта ты? Калі не зробіш добрую справу сёння, то калі?"

## Цемах-Цэдэк (Менахем Мендэль Шнеерсон)

**(9 (20). 09. 1789 – 17 (29). 03. 1866 гг.)**

Цемах-Цэдэк, сапраўднае імя – Менахем Мендэль Шнеерсон 3-ці любавіцкі рэбэ з хасідскай дынастыі Шнеерсон. Унук Алтэр рэбэ па лініі маці.



*Цемах - Цэдэк*

Нарадзіўся ў мястэчку Лёзна **9 (20) верасня 1789 года**. Пры нараджэнні атрымаў імя Менахем Мендэль. З трох гадоў пасля смерці маці жыў у доме свайго дзеда і пад яго кіраўніцтвам вывучаў Біблію і Талмуд. У 14 гадоў ажаніўся са сваёй стрыечнай сястрой Хае-мушкі. У 18 гадоў напісаў багаслоўскі трактат Таамей а-міцвот (Сэнс запаведзяў).

У 1827 годзе ўзначаліў Хабад. Прыкладваў вялікія намаганні для прымірэння з мітнагдзім, а таксама перашкаджаў набору яўрэйскай моладзі ў расійскую армію. Разглядаўся як лідэр расійскага хасідызму і меў ў 1843 годзе кансультацыі з міністрам асветы Уваравым, зрэшты гэтыя кансультацыі зайшлі ў тупік і Цемах-Цэдэк быў на некаторы час арыштаваны. Памёр **17 (29) сакавіка 1866 года.**

## Шагал Марк Захаравіч – сусветна-вядомы мастак

**(7. 07. 1887 – 28. 03. 1985 гг.)**



*Марк Захаравіч Шагал*

**Марк Захаравіч Шагал** – адметная фігура ў мастацтве **XX стагоддзя**. **Мастак** пражыў **98 гадоў**, з іх больш за **60** – за межамі Расіі, СССР, пераважна ў Францыі. Таму яго часта лічаць французскім мастаком.
Раней **(да 90-хг. XXст.**) ва ўсіх энцыклапедыях, даведніках пісалася, што **Марк Захаравіч Шагал** нарадзіўся **7 ліпеня 1887 года** ў мястэчку **Лёзна.**




*Большая Советская Энциклопедия(выд.1978г.)*




*Советская энциклапедия (выд. 1978 г.)*




*Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі(выд.1987г.)*

Неўзабаве сям'я пераехала ў **Віцебск**, таму некаторыя крыніцы называюць гэты горад месцам яго нараджэння.

У Віцебску бацька яго служыў рабочым у купца-селядзечніка, маці трымала краму дробных тавараў. Марк быў старэйшы з сямі сясцёр і двух братоў вялікай сям'і Шагалаў.

Ён спачатку скончыў яўрэйскую пачатковую, потым вучыўся ў рускай сярэдняй школе. У дзіцячыя гады Марк цесна зжыўся з местачковым побытам, увабраў у сябе ўсе звычаі рэлігійнай сям'і.



*Сям'я Марка Захаравіча Шагала*

Старажытныя легенды, пачутыя ім у дзяцінстве, сталі крыніцай фантастычных твораў Шагала. Бацькі ўяўлялі свайго сына бухгалтарам або фатографам. Але яго душа прагнула творчасці. У **1906 годзе** Марк пачаў займацца малюнкам і жывапісам у мясцовай мастацкай школе **Ю. Пэна**. Потым паехаў у **Пецярбург** і паступіў у школу пры Таварыстве падтрымкі мастакоў, дырэктарам якога быў **М. Рэрых**. У **1908 годзе** ён перайшоў у школу **А. Званцавай**, дзе заняткі вялі **Л. Бакст** і **М. Дабужынскі**.

У **1910 годзе** выставіў 2 карціны на вучнёўскай выстаўцы рэдакцыі часопіса **"Аполлон"**, дапамог Л. Баксту ў рабоце над дэкарацыямі да балета "Нарцыс" у пастаноўцы трупы С. Дзягілева. Гэта былі гады пошукаў і эксперыментаў. У творах пецярбургскага перыяду адчуваюцца інтанацыі імпрэсіянізму.

У класічных традыцыях выкананы **"Аўтапартрэт з пэндзлямі"**(1908г.), "**Мая нявеста ў чорных пальчатках"** (1909г.). Блізкасць да творчых ідэй сімвалізму і разам з тым да тэатральнай стыхіі айчыннай культуры пачатку XX стагоддзя раскрываецца ў **"Вясковай ярмарцы"** (1908г.).

**Летам 1910 года** Марк Шагал паехаў у **Парыж** вывучаць французскае мастацтва. У работах парыжскага перыяду было імкненне мастака перайсці ад штодзённай прозы да нечага таямнічага, вышэйшага, касмічнага не толькі захавалася, але і пачало набываць яшчэ большую выразнасць. Разнастайныя ўражанні дзяцінства, рамантычныя ўспаміны пра Віцебск і Лёзна ператвараюцца ў арыгінальны стыль – **"Субота"**, **"Вяселле"** (1910г.), **"Расія , і вёска"**. У **1922годзе** М. Шагал выехаў за мяжу, спачатку ў **Каўнас**, потым у **Берлін**. Пазней ён пасяліўся ў **Францыі**, якую пакінуў толькі на 7 гадоў **(1941-1947гг.)**, калі падзеі другой сусветнай вайны вымусілі яго пераехаць у **Нью-Йорк**. Пасля прыходу Гітлера да ўлады фашысты, захапіўшы Францыю спалілі ў **Мангаме** яго карціны.

У **1927годзе** Шагал выканаў **96 афортаў** да **“Мёртвых душ”** Гогаля, якія перадаў у дар Траццякоўскай галерэі. Ён ілюставаў **Біблію** (1931-36гг.), афармляў балет **“Жар-птушка”** І. Стравінскага (Нью-Йорк, 1944-45гг.).





*Афорты Шагала да “Мёртвых душ” М. В. Гогаля*

У **50-70 гады** работы Шагала выстаўляліся ў вядомых галерэях **Берліна, Дрэздэна, Фларэнцыі, Нью-Йорка, Жэневы, Стакгольма, Парыжа, Цюрыха, Кёльна** і іншых гарадах свету.

Ён атрымаў вышэйшыя ўзнагароды Французскай рэспублікі, у **Ніццы** створаны яго музей. Шагал аздобіў вітражамі сабор у **Мецы** (Францыя), сінагогу і шпіталь у **Іерусаліме**, аформіў ізраільскі парламент (кнесет).

У **1973 годзе** мастак наведаў **Маскву і Ленінград**, у **Траццякоўскай галерэі** была арганізавана выстаўка яго твораў. За ўсе гады эміграцыі ў мастака не было прамых сувязей з Радзімай. Але прасякнутыя настальгіяй летуценна-лірычныя вобразы родных мясцін, імгненні дзяцінства, юнацтва заўсёды прысутнічалі на яго палотнах, размалёўках, вітражах. І ў гэтым адна з загадак творчасці мастака.

**Марк Захаравіч Шагал** памёр **28 сакавіка 1985 года ў Францыі.** Пахаваны у мястэчку **Сэн -Поль-дэ-Ванс** на поўдні **Францыі**.



*Могілкі Сэн - Поль-дэ-Ванс*



*Магіла М. З. Шагала ў Францыі*

**Піятроўскі Рыгор Віктаравіч – інструктар, выкладчык, марскі лётчык**

Нарадзіўся **8 (20) студзеня 1881 года** ў вёсцы **Міхалова** Лёзненскага раёна. Лейтэнант. Скончыў у Францыі авіяцыйную школу Луі Блер ў жніўні 1910 года (дыплом №195), стаўшы другім (пасля С. Даражынскага) марскім лётчыкам Расіі.

**5 кастрычніка 1910 года** на Усерасійскім святе паветраплавання Піятроўскі Рыгор Віктаравіч на самалёце «Блер» выканаў пералёт з Пецярбурга ў Кранштат, пакрыўшы адлегласць у 27 км за паўгадзіны. Гэта быў першы міжгародны пералёт у Расіі і першы палёт аэраплана над морам.



*Піятроўскі Рыгор Віктаравіч*



*Першы самалет*

У Качэ, у ліку першых лётчыкаў-інструктараў 1910 года, выкладчык.

З верасня 1912 года служыў на вопытных авіястанцыях ў Вяслярным порце Пецярбурга, дзе займаўся параўнальнымі выпрабаваннямі гідрасамалётаў розных тыпаў. Рэвалюцыю прыняў як непазбежнае і працягваў верна служыць Айчыне. Рэпрэсаваны.

Памёр у 1935 годзе, у г. Авоцку, Польшча.

**Струнская Ганна – пісьменніца, сацыялістка**

(21. 03. 1877 – 25. 02. 1964 гг.)

Нарадзілася Ганна Струнская ў габрэйскай сям'і ў **мястэчку Бабінавічы** (у цяперашні час - аграгарадок ў Лёзненскім раёне). Яе сям'я (бацька Эліяс Струнскі, маці Ганна Гаровіц і сястра Ружа) эмігравала ў Нью-Ёрк, калі дзяўчынцы было 9 гадоў. Правёўшы ў Нью-Ёрку некалькі гадоў, Струнскія ў 1893 годзе пераязджаюць у Сан-Францыска і пасяляюцца ў доме брата, доктара Макса Струнскага. Ганна ўступіла ў шэрагі Сацыялістычнай працоўнай партыі зусім юнай і заставалася сацыялісткай на працягу ўсяго жыцця. У 1896-1898 гадах Ганна вучылася ў Стэнфардзе, дзе пазнаёмілася і блізка пасябравала з маладым



*Ганна Струнская*

пісьменнікам **Джэкам Лонданам**. Яны праводзілі шмат часу разам, абмяркоўваючы сацыяльныя і палітычныя пытанні. Ганна і яе сястра Ружа ігралі вядучыя ролі на інтэлектуальнай сцэне Сан-Францыска мяжы XX стагоддзя і ўваходзілі ў групу радыкальных маладых пісьменнікаў і мастакоў Каліфорніі, вядомых як «The Crowd». Акрамя іх у групе былі **Джэк Лондан**, Джым Уайтекер, Джордж Стэрлінг. Першай кнігай Ганны сталі **«Лісты Кэмптона - Уэсу» (англ. The Kempton-Wace Letters**, выпушчаная ў суаўтарстве з Джэкам Лонданам і ананімна апублікаваныя ў 1903 годзе.

Пасля смерці Джэка Лондона ў 1916 годзе, Ганна Струнская апублікавала свае ўспаміны пра яго. Ганна Струнская і Джэк Лондан былі блізкія да шлюбу, але далей прапановы Лондана Струнскай справа не пайшла. У 1906 годзе Ганна з сястрой адправіліся ў Расію, каб працаваць у Уільяма Уоллинга, асвятляючы першую рускую рэвалюцыю, у тым жа годзе Ганна Струнская і Уільям Уоллинг пажаніліся, у канцы года яны вярнуліся ў Злучаныя Штаты. Ганна працягвала пісаць, і ў 1915 годзе выйшла яе новая кніга **Violette of Père Lachaise**. Уільям і Ганна разышліся падчас Першай сусветнай вайны, часткова з-за розных поглядаў на месца ЗША ў канфлікце. Ганна працягвала пісаць і абараняць сацыялізм. Яна прыняла ўдзел у акцыях квакераў і ўваходзіла ў некалькі ліберальна-левых груповак, уключаючы лігу праціўнікаў вайны, лігу ўзаемадапамогі, Амерыканскую лігу за адмену смяротнага пакарання, лігу прамысловай дэмакратыі і Нацыянальную асацыяцыю садзейнічання прагрэсу каляровага насельніцтва, якая была сфарміравана пры падтрымцы Струнскай і яе мужа. Ганна Струнская памерла **25 лютага 1964 года ў Нью-Ёрку**. У яе засталося чацвёра дзяцей: Розамунд, Ганна, Джорджыя і Хэйдэн.

## Ерамія (Мацвіевіч) – Арцыбіскуп Навазыбкаўскі, Маскоўскі і ўсяе Русі

Ерамія – старажытнаправаслаўнае імя хрысціянаў. Імя пры нараджэнні: Якаў Вінальевіч Мацвіевіч

Нарадзіўся 27 лістапада 1883 года ў вёсцы Свірбы Лёзненскага раёна ў сялянскай сям'і, атрымаў толькі хатнюю адукацыю. Да калектывізацыі працаваў у індывідуальнай гаспадарцы, затым у калгасе ў роднай вёсцы Свірбы, там жа перажыў перыяд акупацыі 1941-1944 гады. У верасні 1954 года рашэннем Куйбышаўскай архіяпіскапіі Рускай Старажытна праваслаўнай царквы быў пасвечаны ў сан святара. Пасля гэтага некалькі гадоў па-ранейшаму жыў у вёсцы Свірбы і да службы ў чыне святара прыступіў толькі ў студзені 1958 года ў Спаса-Праабражэнскім храме горада Навазыбкаў Бранскай вобласці.



*Ерамія (Мацвіевіч)*

У сакавіку 1958 года па рашэнні Сабору епіскапаў прыняў у горадзе Куйбышаве сан біскупа Навазыбкаўскага, пасля чаго па-ранейшаму выконваў

пасаду святара ў той жа царкве. Хіратанізавалі арцыбіскуп Куйбышаўскі Епіфан (Абрамаў) і біскуп Белебеевскі і Белацаркоўскі Еўсевій (самарцам).

У 1960 годзе Уладыка Ерамія ўдзельнічаў у другім пасля аднаўлення біскупства Міроварэнii. 24 сакавіка 1963 года біскуп Ерамія быў узведзены ў сан усерасійскага Архібіскупа і з гэтага моманту пры Спаса-Праабражэнскім саборы горада Новозыбкова размясцілася рэзідэнцыя Першасвяціцеля Старажытнаправаслаўнай Царквы. Памёр Арцыбіскуп Ерамія 17 чэрвеня 1969 гада, пахаваны на стараверскіх могілках у горадзе Навазыбкаў.

## Лынькоў Міхась Ціханавіч – народны пісьменнік БССР



*Міхась Лынькоў*

Нарадзіўся ў **1899 годзе** ў **вёсцы Зазыбы**, якая доўгі час знаходзілася ў межах **Лёзненскага раёна** (цяпер Віцебскі раён). Яго імя прысвоена Крынкаўскай сярэдняй школе нашага раёна, там створаны музей пісьменніка.

Тут праходзіла яго дзяцінства, у юнцкія гады будучы пісьменнік разам з бацькамі наведваў сваіх родных на Лёзненшчыне. Першыя ўражанні дзяцінства засталіся ў самай глыбіні душы, каб потым ажыць на старонках твораў, увасобіцца ў вобразах герояў аповесцей і апавяданняў. Да самых апошніх дзён жыцця народны пісьменнік не парываў сувязей з Лёзненшчынай, яе людзьмі, быў іх абраннікам у Вярхоўны Савет рэспублікі.



*Помнік М. Ц. Лынькову. Аўтар А. Анікейчык (фотазд.1997г.)*

Знаёмства літгурткоўцаў Крынкаўскай школы з М. Ц. Лыньковым пачалося ў **1955 годзе**, калі яны напісалі яму ў Мінск ліст. Пісьмо прыйшло нечакана хутка. Было яно цёплым і сардэчным, як даўнім і добрым знаёмым. З таго часу ў іх ішла перапіска. А ў **1961годзе** па запрашэнні вучняў і настаўнікаў школы народны пісьменнік прыехаў на крынкаўскаю зямлю. Сустрэча адбылася **19 мая 1961 года,** была радаснай і ўсхваляванай. У школе дзесяцікласнікі запрасілі Міхася Ціханавіча на ўрок. Пісьменнік шмат расказваў ім аб сваіх уражаннях у час паездак у ЗША і Індыю. А потым на цэнтральнай вуліцы вёскі гасцей сустракалі крынкаўцы, жыхары навакольных вёсак.

На сустрэчы з настаўнікамі Міхась Ціханавіч з гумарам расказваў пра эпізоды свайго жыцця, дзяцінства. Вельмі спадабалася тады яму невялікая інсцэніроўка па яго аповесці **“Міколка-паравоз”**. Хлопчык, які выконваў ролю Міколкі, так натуральна смяяўся (эпізод непаразумення Міколкі з папом), што пісьменнік падзякаваў яму асабіста і пацалаваў яго. Праз год Міхась Ціханавіч прыслаў ім сваю кнігу **“За акіянам”** з подпісам. **12 студзеня 1976 года** пастановай Савета Міністраў БССР Крынкаўскай школе было прысвоена

імя **Міхася Ціханавіча Лынькова**. Праз два гады адбылося адкрыццё музея. Цяпер у ім налічваецца больш за **600 экспанатаў**, у тым ліку каля **300 арыгінальных**. Сярод іх асабістыя рэчы пісьменніка – кепка, гальштук, значок **“Выдатнік народнай асветы БССР”**, дэпутацкі білет. Захоўваецца ў музеі і копія пасведчання аб заканчэнні М. Ц. Лыньковым Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі, пісьмы і паштоўкі вучням і настаўнікам крынкаўскай школы, выступленне пісьменніка на тэлебачанні. Сярод экспанатаў музея і адказ пісьменніка на пытанні па аповесці “Міколка-паравоз”, яго ўспаміны пра Янку Купалу, прысвечаныя па просьбе літгурткоўцаў для школы. У зале музея выстаўлены **макет чыгуначнай будкі**, у якой жыла сям’я пісьменніка. Макет выкананы паводле фотаздымка, дасланага старэйшай сястрой пісьменніка Пелагеяй Ціханаўнай.

У школьным музеі Міхася Ціханавіча Лынькова асаблівае месца займаюць кнігі. Сярод іх шмат кніг самаго пісьменніка з асабістымі подпісамі.










*Творы Міхася Лынькова*

Пакінулі свае творы тут з аўтографамі **Максім Танк, Янка Брыль, Еўдакія Лось, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Іван Грамовіч** і іншыя, хто наведваў крынкаўскі музей. Тут, у музеі, знаходзіцца **партрэт** Міхася Ціханавіча Лынькова, выкананы самадзейным мастаком **Паўлам Мікалаевічам Баранавым,** з якім Лынькоў пасябраваў яшчэ ў 1932 годзе ў час свайго прыезду ў горад Віцебск. У дзень нараджэння народнага пісьменніка адбылося адкрыццё **помніка М. Ц. Лынькову**, выкананага **народным мастаком БССР А. Анікейчыкам.** Шмат вершаў, успамінаў прагучала ў той дзень пра дзіцячыя гады пісьменніка, асобныя эпізоды з яго жыцця, грамадскай дзейнасці. Паэт **Уладзімір Скарынкін** сказаў: “Я прывёз шчыры паклон лынькоўскай зямлі ад нашай пісьменніцкай арганізацыі. Кожны з нас вучыцца ў яго шчырасці ў творчасці і вялікай сыноўскай адданасці Радзіме”. Памёр Міхась Ціханавіч Лынькоў 21 верасня 1975 года. Пахаваны на Усходніх могілках горада Мінска. Нейкі час Крынкаўскую школу забаранілі называць імем Міхася Лынькова, гаворачы што вядомы пісьменнік да нас ніяк не адносіцца, бо вёска Зазыбы зараз у Віцебскім раёне. Зноў ідзе скажэнне фактаў гісторыі. Навошта? Каму гэта патрэбна? Але, дзякуючы намаганням маладога дырэктара гэтай школы **Рыбчанкі Аляксандра Андрэевіча, ў 2014 годзе** імя **Міхася Лынькова** Крынкаўскай школе было вернута.

**Озалс Вальдэмар Ансавіч** – падпалкоўнік РІА , генерал інтэрбрыгад у Іспаніі, латвійскі грамадскі дзеяч

(1884/10/05 - 1949/07/12)

**Озалс Вальдэмар Ансавіч** – афіцэр, латвійскі грамадскі і ваенны дзеяч, падпалкоўнік РІА ў 1917 годзе.

Георгіеўскі кавалер з 1917 года, генерал інтэрбрыгад у Іспаніі ў 1936 годзе, кіраўнік нелегальнай рэзідэнтуры ГРУ ГШ ў Францыі з 1940 па 1945 гады.



*Озалс В. А.*

Нарадзіўся **5 кастрычніка 1884 года** ў сям'і сялян у латышскай калоніі **Выдрэя** Віцебскай губерні, куды бацькі пераехалі з акругі Піебалгі Ліфляндскай губерні пасля 1882 года.

Восенню 1895 гады сям'я пераехала ў Рыгу, дзе бацька знайшоў месца токара на Руска-Балтыйскім вагонным заводзе.

У Рызе Вальдэмар Озолс вучыцца ў школе і працуе падсобнікам на будоўлях і ў ліцейным цэху.

У школе ён прымаў актыўны ўдзел у стварэнні Клуба спорту і асветы, які ўваходзіў у склад латышскага юнацкага руху «Аусекліс».

У 1902 годзе скончыў 4-х класнае Рыжскае гарадское вучылішча імператрыцы Кацярыны II. Працягваючы сумяшчаць працу з вучобай, здаў спецыяльныя чыгуначныя экзамены і заняў пасаду памочніка начальніка станцыі "Аляксандраўскія вароты" ў Рызе. У 1903 годзе ўступае ў Латвійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю. Тым не менш, Вальдэмар Ансавіч Озолс у выніку выбірае ваенную кар'еру.

**Узнагароды Озалс Вальдэмара Ансавіча:**

Ордэн Святога Станіслава 3-й ступені арт. (1914/05/08), ордэн Святога Станіслава 2-й ступені, Ордэн Святога Станіслава 1-й ступені, Ордэн Святой Ганны 4-й ступені, Ордэн Святой Ганны 3-й ступені арт., Ордэн Святой Ганны 2-й ступені. , ордэн Святога Уладзіміра 4-й ступені, з мячамі і бантам ордэн Святога Георгія 4-й ступені. (Пр. па XII-й арміі № 161 ад 1917/02/13 г.; Паф 1917/08/28), латвійскі ваенны ордэн Лачплесіс 3-й ступені (LKOK nr.3 / 492 ў 1921 годзе за баі пад Алуксне і ў арт. Алсвікі . 1919/03/31 годзе на пасадзе НШ Паўночналатвійскай брыгады).

Па колькасці ўзнагарод за першую сусветную вайну ўваходзіць у лік лідэраў сярод усіх выпускнікоў Віленскага ваеннага вучылішча.

Памёр Вальдэмар Ансавіч Озалс **7 снежня 1949 года.**

**Кулішоў Уладзімір Іванавіч – беларускі артыст**

(1931 – 1998 гг.)

Нарадзіўся 1. 04. 1931 г. ў в. **Слабада** нашага раёна. Скончыў Беларускі тэатральна–мастацкі інстытут у 1954 годзе. Працаваў у драматычных тэатрах Расіі, Казахстана, Беларусі, у тым ліку ў Гомельскім абласным з 1954 па 1957 гады і Брэсцкім тэатре драмы і музыкі з 1960 года.

Сярод яго ролей: Мікола Сербаноўскі («Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні» па Івану Шамякіну), Даніла Антонавіч Дораш, Зоммер («Калі можаш, прабач», «Брэсцская крэпасць», «Людзі і камні» К. Губарэвіча), Лявон Зяблік («Раскіданае гняздо» Янкі Купалы), Парфён Вяршкоў («Оправдание крови» па І. Чыгрынаву), Ісаак («Патоп» А. Макаёнка), Людовіко («Сабака на сене» Лопе де Вегі), Антоніа («Жаніцьба Фігаро» П. Бомаршэ) і інш. Памёр у 1998 годзе.



Кулішоў Уладзімір Іванавіч

**Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч – спікер парламента Рэспублікі Беларусь**

Нарадзіўся **2 студзеня 1949 года** ў вёсцы **Мар'янова** нашага раёна.



*Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч*

У 1977 годзе скончыў сельскагаспадарчы інстытут у Вялікіх Луках, у 1988 годзе – Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працоўную дзейнасць пачаў у 1968 годзе пасля заканчэння Лужаснянскага саўгаса-тэхнікума аграномам калгаса "Перамога сацыялізму" Віцебскай вобласці Верхнядзвінскага раёна.

З 1968 па 1970 гады служыў у радах Савецкай Арміі. З 1970 па 1972 гг. працаваў старшым аграномам Лёзненскай райсельгастэхнікі.

У 1972 - 1974 гг. – працаваў у камсамольскіх органах: інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Лёзненскага райкама камсамола.

У 1974 - 1975 гг. – Інструктар Лёзненскага РК КПБ. З 1975 па 1981 гады – Сакратар парткама саўгаса «Адаменкі», старшыня калгаса імя Данукалава.

У 1981 - 1985 гг. працаваў начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама. З 1985 - 1987 гады – старшыня Лёзненскага райвыканкама.

У 1987 - 1991гг. – Першы сакратар Верхнядзвінскага райкама КПБ.

З кастрычніка 1991 па снежань 1991 года працаваў першым намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і забеспячэнні насельніцтва харчаваннем Віцебскага аблвыканкама, са снежня 1991 г. па лістапад 1994 года - намеснікам старшыні, старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і забеспячэнні насельніцтва харчаваннем Віцебскага аблвыканкама .

З лістапада 1994 года па кастрычнік 2008 года Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка быў старшынёй Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР дванаццатага склікання. З'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога, трэцяга скліканняў.



*Адкрыццё новага маста праз р. Мошна ў Лёзне (фотазд. 2009г.)*

**27 кастрычніка 2008 года** абраны Старшынёй (спікарам) Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання, у снежні 2008 года – першым намеснікам Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. З'яўляецца членам Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы.

У **верасні 2016 года** Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка зноў абраны спікерам Парламента. Узнагароджаны ордэнамі Айчыны II і III ступеняў, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў, удастоены ганаровага звання “Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь”.

На апошніх парламенцкіх выбарах Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка атрымаў 85 % падтрымкі выбаршчыкаў Рэспублікі Беларусь і быў зноў абраны спікерам на новы тэрмін працы парламета нашай краіны. Наш зямляк Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка даволі часта наведвае свае родныя мясціны і сустракаецца з насельніцтвам нашага раёна.

***Пытанні і заданні:***

1. *Чым і дзе праславіўся Іосіф Уладзіміравіч Гурка?*
2. *Дзе нарадзіўся іўдзейскі рэлігійны філосаф З. Шнеерзон?*
3. *Што ты ведаеш пра сусветна – вядомага мастака М. З. Шагала?*
4. *Хто зрабіў першы міжгародны пералёт у Расіі?*
5. *Хто такая Ганна Струнская і дзе яна жыла?*
6. *Якія дзіцячыя творы М. Ц. Лынькова ты ведаеш?*
7. *У якіх войнах асабліва праславіўся Озалс Вальдэмар Ансавіч?*
8. *Хто зараз з’яўляецца спікерам парламента Рэспублікі Беларусь?*

## §29. Вядомыя людзі Лёзненшчыны.

### 1. *Абаронцы Айчыны – нашы землякі*

**Фамін Яфім Майсеевіч** – ваенны афіцэр, абаронца Брэсцкай крэпасці. (1909/ 01/ 15 - 1941/ 06/ 30)



*Фамін Яфім Майсеевіч*



*Мемарыял "Брэсцкая крэпасць"(2013г.)*

Нарадзіўся 15.01. 1909 года ў вёсцы **Калышкі** Віцебскага павета ў беднай габрэйскай сям'і (бацька – каваль, маці – швачка). Пасля смерці бацькоў выхоўваўся цёткай і дзядзькам. У1921 годзе быў вучнем цырульніка, затым – шаўца ў Віцебску. У 1922 годзе яго прынялі выхаванцам у Віцебскі дзіцячы дом, праз два гады ўступіў у камсамол. З 1927 па 1929 гады навучаўся ў Пскоўскай акруговай камуністычнай партыйна-савецкай школе II ступені, у 1929 годзе Каломенскай савецкай партшколе. Па заканчэнні працаваў інструктарам Каломенскага райкама партыі. У1930 г. уступіў у рады ВКП (б), а ў 1932 годзе па партыйнай мабілізацыі накіраваны на партыйна-палітычную працу ў РККА. Сакратар камсамольскай арганізацыі зенітнага палка, палітрук роты, інструктар палітаддзела стралковай дывізіі, ваенны камісар стралковага палка. У 1938г. ён скончыў курсы пры палітупраўленні Харкаўскай ваеннай акругі. За выдатную вучобу і актыўную грамадскую працу атрымаў падзяку ад камандавання, а ад палітуправы – імянны гадзіннік з надпісам "За асаблівыя поспехі ў авалоданні бальшавізмам". Жнівень 1938года – ваенны камісар 23-й Харкаўскай ордэна Леніна Чырванасцяжнай стралковай дывізіі. У верасені 1939 года ў складзе дывізіі ўдзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Украіну. Летам 1940 года ў складзе дывізіі ўступіў на тэрыторыю Латвіі і размясціўся ў Даўгаўпілсе.

У сакавіку 1941 года па незаслужаным абвінавачванні пераведзены ў Брэст на пасаду намесніка камандзіра 84-га стралковага палка 6-й Арлоўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі.

**22 чэрвеня 1941года** Я. М. Фамін арганізаваў абарону **каля Холмскіх варот**. **24 чэрвеня** разам з капітанам **І. М. Зубачовым** стварыў зводную групу абаронцаў крэпасці. **30 чэрвеня** пасля генеральнага штурму крэпасці з удзелам авіяцыі і цяжкай артылерыі Яфім Майсеевіч Фамін быў цяжка паранены,

кантужаны. Ледзь жывога гітлераўцы выцягнулі яго з-пад завалаў казemата і расстралялі непадалёк ад Холмскіх варот.





*Холмскія вароты (фотазд.2013г.)Мемарыяльная дошка на месцы расстрэлу Фаміна Я. М.*

8 мая 1991 года па хадайніцтве ветэранаў 23-й дывізіі Міністр абароны СССР адмяніў пункт загаду 1941 года аб ужыванні да Я. М. Фаміна незаслужанага спагнання і аднавіў яго на пасадзе намесніка камандзіра дывізіі. Камісар Я. М. Фамін пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Яго імя носіць швейная фабрыка ў Брэсце, сярэдняя школа ў вёсцы Калышкі, вуліца і два завулкі ў Мінску, вуліца ў Брэсце і г.п. Лёзна. У гонар нашага выдатнага земляка на месцы яго расстрэлу, на стэле каля Холмскіх варот, усталявана мемарыяльная дошка. На алеі "Іх імёнамі названы вуліцы Брэста" змешчаны яго барэльефны партрэт. У Калышках на школе ўсталевана мемарыяльная дошка прысвечаная 100-годзяю з дня нараджэння Фаміна. На яе адкрыцці ў **2009 годзе** прысутнічаў сын Фаміна, які зараз пражывае ў Кіеве.





*Адкрыццё дошкі на школе ў Калышках (2009г.) Школа імя Яфіма Майсеевіча Фаміна (2015г.)*



Месца сядзібы Фаміных у вёсцы Калышкі нядаўна паказаў аднавяскоўцам, падчас свайго прыезду на радзіму, адзін стары яўрэй, які зараз пражывае ў Віцебску. На гэтым месцы пажадана было б устанавіць стэлу ў гонар нашага мужнага земляка (таму што школу ўжо закрылі).

*Месца былой сядзібы Фаміных. Фотаздымак Міхеенкі В. А. (2004г.)*

**Белахвосцікаў Аляксандр Яўхімавіч – кіраўнік падпольнай групы ў горадзе Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**



Нарадзіўся А. Я. Белахвосцікаў **10 жніўня 1914 года ў вёсцы Альхавік (на той час Ляхавік).** Ён быў удзельнікам Віцебскага патрыятычнага падполля ў час Вялікай Айчыннай вайны (падпольны псеўданім **Альдэмар**). Скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі ў **1938 годзе**. Да вайны працаваў у Віцебскім аблвыканкаме і пазаштатным сакратаром Кастрычніцкага райкама ЛКСМБ Віцебска. Паводле рашэння гаркама партыі быў пакінуты ў горадзе для падпольнай работы.

З **ліпеня 1941 года** па **кастрычнік 1943 года** – кіраўнік разведвальна - дыверсійнай групы.

**5 мая 1943 года** схоплены фашыстамі і расстраляны.

*Белахвосцікаў Аляксандр Яўхімавіч*



У горадзе Віцебску ў гонар кіраўніка падпольнай групы **Аляксандра Яўхімавіча Белахвосцікава** названа **вуліца**, якая знаходзіцца непадалёк ад стадыёна “Дынама”.

У **1968 годзе** на вуліцы А. Я. Белахвосцікава на доме № 29 была ўстаноўлена **мемарыяльная дошка**.

Удзельнікі гуртка “Мая Лёзненшчына” знайшлі ў Віцебску вуліцу, дом і мемарыяльную дошку, прысвечаную нашаму земляку Белахвосцікаву Аляксандру Яўхімавічу.

*Вуліца Белахвосцікава ў Віцебску (фотазд. 2004г.)*

Мінуў час… У мясцовай газеце **“Сцяг перамогі”** за **23 красавіка 2005 года** ў артыкуле **“Захаваць для нашчадкаў”**, настаўнікі - краязнаўцы, змясцілі матэрыялы пра мужнага патрыёта, каб і лёзненцы ведалі і памяталі свайго земляка.



А таксама звярнуліся да мясцовых улад з прапановай, каб на месцы былой сядзібы Белахвосцікавых у вёсцы Альхавік устанавілі мемарыяльную дошку.

Месца, дзе знаходзілася раней сядзіба Белахвосцікавых, паказаў нам старажыл вёскі Альхавік Шлюхто А. І..

*Месца былой сядзібы Белахвосцікавых. Фотаздымак Міхеенкі В. А. (2004г.)*

**Бельчыкаў Аляксандр Віктаравіч – воін-інтэрнацыяналіст. Удзельнік Афганскай вайны.**



*Бельчыкаў Аляксандр Віктаравіч*

Бельчыкаў Аляксандр Віктаравіч нарадзіўся **22 красавіка 1966 года** ў вёсцы **Альхавік**, 8 класаў скончыў у **СШ №2**, а сярэднюю адукацыю атрымаў у **СШ №1 г.п. Лёзна**. Па словах маці Яўгеніі Паўлаўны Саша рос добрым, вясёлым хлопчыкам. Да арміі працаваў трактарыстам у саўгасе **"Адаменкі"**.



*Уручэнне атэстата Трутневым К. І.(1983г.)*

У **1984 годзе** быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Служыў у Афганістане. Часта пісаў лісты дамоў. Заставалася служыць 3 месяцы. Але здарылася бяда.

**29 жніўня 1986 года**, вяртаючыся з баявога задання, экіпаж танка, у якім знаходзіўся і механік - вадзіцель Аляксандр Бельчыкаў, быў абстраляны душманамі. Варожы снарад, трапіўшы ў люк, зрыкашэціў і смяротна параніў Аляксандра ў галаву. Давесці да медсанбата танкіста не ўдалося, ён памёр па дарозе. Малодшы сяржант **Аляксандр Віктаравіч Бельчыкаў** узнагароджаны **ордэнам Чырвонай Зоркі** (пасмяротна), **медалём "За баявыя заслугі"**. Яго імем названа **вуліца ў вёсцы Альхавік**. Пажадана было б на бацькоўскім доме змясціць шыльду **вуліца Аляксандра Бельчыкава**.

На грамадзянскіх могілках (вёсак Адаменкі, Альхавік), каля дарогі Аляксандру Віктаравічу Бельчыкаву на дзяржаўныя сродкі ўсталяваны помнік, які знаходзіцца пад аховай дзяржавы.





*Помнік Бельчыкаву А. В. (2004г.)* *Дом сям'і Бельчыкавых (фотазд. Міхеенкі В. А. 2004г.)*

**Якушэнка Яўген Іванавіч – капітан 1 ранга, начальнік Ваенна-марскога політэхнічнага інстытута, спецыяліст у галіне праблем машынабудавання і працэсаў праўлення, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт РАН.**



*Якушэнка Яўген Іванавіч*

Нарадзіўся **6 студзеня 1961 года** ў вёсцы **Бабінавічы.** Скончыў з адзнакай **Вышэйшае ваенна-марское вучылішча імя Ф. Э. Дзяржынскага ў 1984 годзе.**

З **1984 па 1990 год** праходзіў службу на караблях Балтыйскага флота на пасадах камандзіра электрамеханічнай баявой часткі, намесніка камандзіра па спецыяльных вымярэннях караблёў спецыяльнага прызначэння.

У **1990 годзе** паступіў і ў **1993 годзе** з адзнакай скончыў **Ваенна-марскую акадэмію імя Н. Г. Кузняцова**.

Паралельна з вучобай падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю на тэму: **«Павышэнне стабільнасці магнітнага поля дызельных падводных лодак за кошт электрамагнітаўпругай апрацоўкі»**, якую паспяхова абараніў у дысертацыйным савеце акадэміі ў 1993 годзе. Ім упершыню даследаваны новыя спосабы давядзення да існуючых нормаў магнітнага поля дызельных падводных лодак 613, 641, 651, 629, 877 праектаў шляхам іх апускання на ўсталяваную глыбіню зададзеным курсам.

Вынікі даследаванняў дазволілі істотна павысіць стабільнасць магнітнага поля, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі дызельных падводных лодак і атрымалі практычнае прымяненне на дзеючым флоце. З 1993 па 1998 год Я. І. Якушэнка - выкладчык, дацэнт, дактарант, начальнік кафедры фізічных палёў і абароны караблёў Вышэйшага ваенна-марскога інжынернага вучылішча імя Леніна.

З 1998 года быў на пасадзе начальніка кафедры фізічных палёў і абароны караблёў Ваенна-марскога інжынернага інстытута, створанага ў выніку зліцця двух вышэйшых ваенна-марскіх вучылішчаў: ВВМІУ імя Ф. Э. Дзяржынскага і ВВМІУ імя Леніна. З 01.07. 2012 года – начальнік Ваенна-марскога політэхнічнага інстытута, утворанага ў выніку зліцця Ваенна-марскога інжынернага інстытута і Ваенна-марскога інстытута радыёэлектронікі імя А. С. Папова.

Падчас вучобы ў дактарантуры падрыхтаваў доктарскую дысертацыю на тэму: “Матэматычнае і фізічнае мадэляванне магнітаўпругага гістарэзісу ў дадатку да задач павышэння эфектыўнасці магнітнай абароны падводных лодак”, якую паспяхова абараніў у чэрвені 1998 года. Доктар тэхнічных навук (1998 г.). Прафесар (2000 г.). Член-карэспандэнт РАН (2011г.).

Ён з'яўляецца аўтарам больш за 160 навуковых прац, у тым ліку аднаго падручніка, дваццаці трох вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, дзвюх манаграфій, кіраўнік педагагічнай школы па падрыхтоўцы афіцэраў для ВМФ ў галіне фізічных палёў караблёў. Ім падрыхтаваны 1 доктар і 6 кандыдатаў навук.

**Якушэнка Яўген Іванавіч – старшыня дысертацыйнага савета, член экспертнага савета ВАК РФ па праблемах флоту і караблебудавання.**

## 2. *Вучоныя і знакамітыя людзі раёна.*

**Незлін Саламон Яфімавіч – беларускі савецкі вучоны - медык, прафесар (1892 – 1990гг.)**



*Незлін Саламон Яфімавіч*

Нарадзіўся ў **1892 годзе ў вёсцы Калышкі** . Скончыў Юр’еўскі (цяпер Тартаўскі) універсітэт, працаваў земскім урачом у Маскоўскай і Смаленскай губерніях, потым пераехаў на Віцебшчыну. У **1918-1921 гадах** працаваў намеснікам Віцебскага губернскага аддзела аховы здароўя, на працягу 1922 года **узначальваў Віцебскі супрацьтуберкулёзны дыспансер.**



*Віцебскі супрацьтуберкулёзны дыспансер (2004г.)*

Пасля грамадзянскай вайны пераехаў у Маскву і больш за 3 гады працаваў у тубдыспансеры, потым доўгі час загадваў сацыяльна - гігіенічным аддзелам, дыспансерным сектарам у Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце туберкулёзу, зрабіў вялікі ўклад у справу барацьбы супраць небяспечнай хваробы.

Асноўная яго дзейнасць – арганізацыя лячэбнай працы, дыспансерызацыя хворых, арганізацыя дзейнасці процітуберкулёзных устаноў. С. Я. Незлін узначальваў навукова-практычныя экспедыцыі ў Буратыю, Башкірскую, Татарскую і Якуцкую аўтаномныя рэспублікі. Ён напісаў каля **330 навуковых прац, сярод якіх 8 манаграфій.** Пад кіраўніцтвам **Саламона Яфімавіча Незліна абаронена 20 дысертацый**.

**Буглоў Яўген Данілавіч – Доктар медыцынскіх навук**

(1924/ 10/ 29 - 18. 11. 2011 гг.)



*Буглоў Яўген Данілавіч*

Нарадзіўся ў **вёсцы Стрыжанёва 29 кастрычніка 1924 года.** Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут у **1951 годзе**. Пасля бліскучага заканчэння медыцынскага інстытута маладога лекара накіравалі ў аспірантуру на кафедру паталагічнай фізіялогіі 1-га Ленінградскага медыцынскага інстытута імя акадэміка Паўлава. У **1955 годзе** Буглоў Яўген Данілавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю.

У тым жа годзе Міністэрства аховы здароўя СССР накіравала маладога вучонага ў Беларускі НДІ пералівання крыві ў якасці старшага навуковага супрацоўніка. У **1972 годзе Яўген Данілавіч Буглоў** стаў **доктарам медыцынскіх навук.**

Пазней ён узначаліў патафізіялагічны аддзел інстытута.



*Доктар Буглоў Я. Д. у мединстытуце*

Уся далейшая дзейнасць Буглова звязана з праблемамі крыві. Яўген Данілавіч праводзіць шырокамаштабныя даследаванні ўласцівасцяў біяпрэпаратаў на аснове акісленняў цэлюлозных сарбентаў. Ён упершыню **распрацаваў унікальны спосаб стабілізацыі крыві** і дамогся ашаламляльных вынікаў. Такіх, якія дазволілі нарыхтоўваць небывалыя раней аб'ёмы крыві для масавых пераліванняў.



**Сістэма для нарыхтоўкі сарбентнай крыві**



ПОЛУЧЕНИЕ
БЕСЦИТРАТНОЙ
КРОВИ
С ПРИМЕНЕНИЕМ
ФОСФАТА
ЦЕЛЛЮЛОЗЫ

**Вокладка кнігі Я. Д. Буглова**

**Значнасць гэтага спосабу абаронена васьмю аўтарскімі сведчаннямі, патэнтамі ЗША, Англіі, Францыі, ФРГ, Японіі і Швецыі**. Яго распрацоўкі **ўдастоены трох медалёў ВДНГ СССР і прэстыжнай у навуковых колах прэміі імя Дзмітрыя Мендзялеева. Аўтар і суаўтар 253 друкаваных прац, у тым ліку 2 манаграфій, мае 11 аўтарскіх пасведчанняў.**

Член Прэзідыума Вучонага Савета МЗ БССР, шэрагу іншых Навуковых саветаў, рэдакцыйнага савета часопіса “Гематалогія і трансфузіялогія”, Саюзных і Рэспубліканскіх праблемных камісій, Праўлення Усесаюзнага і старшыня Рэспубліканскага навуковых таварыстваў гематолагаў і трансфузіёлагаў (1974-1988 гг.), член Савета па абароне дысертацый (з 1971г.).

Інвалід Вялікай Айчыннай вайны. **Узнагароджаны Ордэнам Айчыннай Вайны 1-й ступені, двума баявымі і 10 юбілейнымі медалямі, двума Ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Граматай Міністэрства Абароны СССР, трыма медалямі ВДНГ СССР, медалём Н. І. Пірагова, прэміяй імя Д. І. Мендзялеева, медалём “Ветэран працы”.**

**Памёр Буглоў Яўген Данілавіч 18 лістапада 2011года. Пахаваны ў Мінску.**

**Ізобаў Мікалай Аляксеевіч – вядомы матэматак, прафесар**



*Ізобаў Мікалай Аляксеевіч*

Нарадзіўся **23 студзеня 1940 года ў вёсцы Красыні**. У **1958 годзе** з залатым медалём скончыў Янавіцкую сярэднюю школу, а ў снежні **1965 года** – матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта са спецыялізацыяй па дыферэнцыяльных ураўненнях. Ужо ў студэнцкія гады за атрыманыя вынікі па даследаванні будовы мностваў ніжніх паказчыкаў Перона лінейных дыферэнцыяльных сістэм на Усесаюзным конкурсе студэнцкіх прац яму быў прысуджаны медаль

**"За лепшую навуковую студэнцкую працу".**

У **1966 годзе** Мікалай Аляксеевіч паступіў у аспірантуру да прафесара Ю. С. Багданава і ў **1967 годзе** абараніў кандыдацкую дысертацыю.

З **1969 года** на працягу 22 гадоў ён з'яўляўся намеснікам галоўнага рэдактара Усесаюзнага часопіса **"Дыферэнцыяльныя ўраўненні",** з якіх першыя 12 гадоў – штатным намеснікам, застаючыся членам яго рэдкалегіі і ўвесь наступны час. Пасля абароны ў **1979 годзе** ў Ленінградскім універсітэце доктарскай дысертацыі і абрання ў **1980 годзе** членам-карэспандэнтам АН БССР працуе ў Інстытуце матэматыкі НАН Беларусі старшым навуковым супрацоўнікам (**1980-1986гг.),** загадчыкам лабараторыі тэорыі ўстойлівасці (**1986-1993гг**.) і загадчыкам аддзела дыферэнцыяльных ураўненняў (з 1993года). У **1994 годзе** абраны сапраўдным членам Акадэміі навук Беларусі, у **1996 - 1999 гг.** па сумяшчальніцтве ўзначальваў кафедру вышэйшай матэматыкі БДУ. Мікалай Аляксеевіч – вядомы матэматык, найбуйнейшы спецыяліст у галіне тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў. Асноўныя кірункі яго навуковых даследаванняў – тэорыя характарыстычных паказчыкаў Ляпунова, тэорыя ўстойлівасці па лінейным набліжанні, лінейныя сістэмы Коппель - Конці, ураўненні Эдена-Фаўлера і лінейныя сістэмы Пфафф.

Мікалаем Аляксеевічам апублікавана больш за **200 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфіі, і падрыхтавана больш за 20 кандыдатаў і дактароў навук.** З **1994** па **2004 гады** ён узначальваў Экспертны савет па матэматыцы ВАК Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час з'яўляецца яго членам, а таксама ўваходзіць у склад рэдкалегіі часопісаў **"Дыферэнцыяльныя ўраўненні", "Memoirs on Differential Equations and Mathematical Physics", "Даклады НАН Беларусі"**, "Весці НАН Беларусі. Серыя фізіка-матэматычных навук" і намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Працы Інстытута матэматыкі НАН Беларусі".

**Мікалай Аляксеевіч Ізобаў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, яму прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі ў 2000 годзе**.

## Прусаў Пётр Міхайлавіч – вядучы канструктар ВАЗ



*Прусаў Пётр Міхайлавіч*

Нарадзіўся ў **вёсцы Зубкі 1 чэрвеня 1942 года.** У **1958 годзе** пасля заканчэння 9 класаў паступіў у тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (г. Гарадок Віцебскай вобласці). З **1959 па 1960 гг**. удзельнічаў у асваенні цалінных і абложных зямель у Казахскай ССР. **Вясной – летам 1962 г.** працаваў інжынерам па механізацыі (механікам) у калгасе імя Калініна Калышанскага сельсавета. У **1962 г.** пайшоў служыць у Савецкую Армію (спачатку ў Беларускай ваеннай акрузе, а затым у складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх спецыялістаў у Алжыры, быў паранены).




*Запарожскі машынабудаўнічы інстытут*

З **1965 па 1970 гады** быў студэнтам аўтамабільнага факультэта Запарожскага машынабудаўнічага інстытута імя В. Я. Чубара.

У **1967-1970 гадах** працуе інжынерам-канструктарам ОГК завода «Камунар», становіцца інжынерам-канструктарам аддзела праектавання шасі Волжскага аўтамабільнага завода.



*Аўтамабіль ВАЗ*

А ў **1972 годзе – вядучым канструктарам праекта ВАЗ - 2121.** Праз чатыры гады Пётр Міхайлавіч - інжынер-канструктар II катэгорыі КБ перспектыўнага праектавання аўтамабіляў угк вытворчага аб'яднання **«АВТОВАЗ"**. У **1986 годзе** абараняе дысертацыю на атрыманне ступені доктара тэхнічных навук па тэме **"Тыпаж легкавых аўтамабіляў СССР"** і становіцца галоўным канструктарам АТ "АВТОВАЗ".

Прусаў П. М. у **1998 годзе** быў стваральнікам і першым старшынёй Рады галоўных канструктараў аўтамабільных заводаў Расіі.

У **2000 годзе** – тэхнічны кіраўнік праекта па выпуску аўтамабіляў ВАЗ-2110 з машынакамплектаў АўтаВАЗа ў горадзе Чаркасы (Украіна).

У **2002 годзе** – тэхнічны кіраўнік праекта па выпуску пазадарожнікаў **“Ніва” ВАЗ-21213** ў горадзе Усць-Каменагорску (Казахстан) на аўтазборачным заводзе “Азія-Аўта”. **31 сакавіка 2003 года** ў сувязі з сыходам на пенсію вызвалены ад пасады галоўнага канструктара.



*Аўтамабіль “Ніва”*

З **2003-2008 гады** Прусаў П. М. – саветнік віцэ-прэзідэнта ААТ “АўтаВАЗ” па перспектыўным развіцці. У 2004 годзе - ініцыятар стварэння і заснавальнік некамерцыйнай арганізацыі **“Дабрачынны Ніва фонд Фортэ”** (распрацоўка і ўкараненне сацыяльных праграм адукацыі), старшыня праўлення фонда.

У **2007 годзе** прыняты вядучым інжынерам-канструктарам кіравання, праектавання і суправаджэння складу аўтамабіля ДТР ААТ «АўтаВАЗ». З **2007-2011 гг**. – кіраўнік рабочай групы па праектах вытворчасці аўтамабіляў **LADA** ў Чачэнскай Рэспубліцы. Узнагароды і ганаровыя званні: **1995г.** 1 красавіка - Заслужаны канструктар Расійскай Федэрацыі, **2007год**, снежань - **Залаты медаль Пятра Вялікага** "За працоўную доблесць” ад імя Расійскай грамадскай камісіі і “За самаадданую працу на карысць Расіі”, **2008 год** – Ганаровая **ўзнагарода Амерыканскага біяграфічнага інстытута за выдатныя дасягненні ў аўтамабільнай індустрыі.** Усталяванне **імяннoй Зоркі Пятра Прусава** на Алеі тэхнічнай славы ў горадзе **Флінт (ЗША)**. У **2010 годзе** яму ўручана афіцыйна зарэгістраваная рэгалія (крыж) **Hubners Who is Who** аднайменнага Міжнароднага Швейцарскага энцыклапедычнага выдавецтва. **Біяграфія П. М. Прусава** апублікаваная ў 5-м выданні энцыклапедыі паспяховых людзей **“Who is Who ў Расіі”**. (Па дадзеных выдання “Who is Who ў Расіі” Прусаў П. М. удастоены **16 залатых, 2 срэбных і 1 бронзавага медаля ВДНГ СССР.) Пражываў у горадзе Тальяцi. Памёр 19 сакавіка 2017года.**

**Бялявіна Валянціна Мікалаеўна – кандыдат гістарычных навук**



*Бялявіна Валянціна Мікалаеўна*

Нарадзілася **25 мая 1941 года ў вёсцы Крынкі**. **Бялявіна Валянціна Мікалаеўна** скончыла БДУ ў **1966 годзе. Кандыдат гістарычных навук** (з 1985 года). Зараз працуе ў **інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі**. Даследуе матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў і этнічных груп Беларусі. Валянціна Мікалаеўна Бялявіна адна з аўтараў прац **«Беларускае народнае адзенне»** (1975г.),

**“Этнічныя працэсы і ўклад жыцця”** (1980г.), **“Помнікі этнаграфіі”** (1981г.), **“Грамадскі, сямейны побыт і духоўная культура Палесся”** (1987г.), **“Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі”** (1990г.), тамоў серыі **“Беларусы”: “Вытокі і этнічнае развіццё”** (2001г**.), “Грамадскія традыцыі “ (**2002г.) і іншыя. У **2008 годзе Бялявінай Валянціне Мікалаеўне прысуджана прэмія “ За духоўнае адраджэнне “**.

## Іваноў Уладзімір Мікалаевіч



*Іваноў Уладзімір Мікалаевіч*

Нарадзіўся ў **1977 годзе ў вёсцы Надзёжына**. З **1994 года** навучаўся ў Віцебскай ордэна "Знак Пашаны" дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, якую скончыў з адзнакай у **1999 годзе**. З **кастрычніка 1999 па кастрычнік 2002 гадоў** – аспірант кафедры ўнутраных незаразных хвароб жывёл УА ВДАВМ. У **маі 2003 года** абараніў дысертацыю на спашуканне вучонай ступені кандыдата ветэрынарных навук. З **2002 па 2004 гады** – асістэнт кафедры ўнутраных незаразных хвароб жывёл, з **2004 па 2005 гады** асістэнт кафедры эпізааталогіі і інфекцыйных хвароб.

**15. 07. 2005 года** прызначаны на пасаду дацэнта кафедры эпізааталогіі УА ВДАВМ (загад № 153). У цяперашні час з'яўляецца **намеснікам загадчыка кафедры ўнутраных незаразных хвароб жывёл.** Праводзіць навуковыя даследаванні па тэме: “Парушэнні мінеральнага абмену ў буйной рагатай жывёлы”. **Апублікавана 46 навуковых прац, у тым ліку 4 вучэбна-метадычнага характару. Пасля абароны дысертацыі апублікавана 7 навуковых прац, 23 інструкцыі і 4 вучэбна-метадычныя**.



*Кошаль Сяргей Міхайлавіч*

**Кошаль Сяргей Міхайлавіч – вядучы навуковы супрацоўнік кафедры картаграфіі і геаінфарматыкі геаграфічнага факультэта МДУ імя Міхаіла Васільевіча Ламаносава.**

Нарадзіўся ў **1960 годзе ў г. п. Лёзна.** У **1977 годзе** скончыў Калмагораўскую школу-інтэрнат №18.

У **1982 годзе –** аддзяленне матэматыкі механіка-матэматычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава (навуковыя кіраўнікі А. А. Ганчар і В. У. Вавілаў), тэма дыпломнай працы: **“Аб набліжэнні паліномамі з часткова фіксаванымі нулямі”**.

У **2004 годзе** абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці “геаінфарматыка” на тэму **“Тэарэтычнае абгрунтаванне структуры і функцый блока мадэлявання рэльефу ў ГІС**” (навуковы кіраўнік І. К. Лур'е).

Навуковыя інтарэсы – прымяненне матэматычных метадаў у навуках аб Зямлі, распрацоўка алгарытмаў для геаінфармацыйных сістэм, аўтаматызацыя ў картаграфіі.

**Сахараў Аляксандр Іванавіч – галоўны ўрач ваеннага клінічнага шпіталя імя М. М. Бурдэнкі, заслужаны ўрач Расійскай Федэрацыі, палкоўнік медыцынскай службы.**



*Сахараў Аляксандр Іванавіч*

Нарадзіўся ў **1959 годзе** ў **пасёлку Лёзна** ў сям'і настаўнікаў. Выпускнік Ваенна-медыцынскай акадэміі імя С. М. Кірава. Прайшоўшы добрую прафесійную і вайсковую школу службы ў войсках, з **1990 года** па цяперашні час у розных пасадах працуе ў падраздзяленнях **Галоўнага ваеннага клінічнага шпіталя імя М. М. Бурдэнка.** Першае месца працы - начальнік медыцынскага пункта вайсковай часці ў Групе Савецкіх войскаў у Германіі. Выкананне ім свайго медычнага і грамадзянскага абавязку не абмяжоўваецца толькі сценамі сваёй аўтарытэтнай медыцынскай установы.

А. І.Сахараў аказваў хірургічную дапамогу параненым і пацярпелым у лакальных узброеных канфліктах на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. За яго плячыма праца ў Чачэнскай Рэспубліцы, Азербайджане, Таджыкістане, дзе ён праводзіў самыя складаныя аперацыі, у прыватнасці, па выратаванні прэзідэнта Інгушэціі Еўкурава і генерала Шаманава. А. І. Сахарава называюць першым пасля Бога не таму, што ён кожную раніцу чытае малітву Опцінскіх старцаў. Яму, мужчыну, у падзяку цалуюць рукі нават жанчыны, і гэта не сорамна. Прадметам яго аперацыйнай спецыялізацыі з'яўляецца чэраўная хірургія. Укаранёны такія новыя методыкі, як пластыка сфінктара прамой кішкі, аднамомантавая эксціпрацыя стрававода і іншыя. Сярод пацыентаў палкоўнік Сахараў славіцца калі не Богам, то кімсьці блізкім да Стваральніка. Ён аперыруе хворых з чацвёртай стадыяй рака.

Такіх аперацый на яго рахунку не адна сотня. І хай пры такой стадыі хваробы немагчыма казаць аб поўным вылячэнні, але і падораныя пацыенту гады жыцця бясцэнны. **Сахараў Аляксандр Іванавіч лаўрэат нацыянальнай прэміі "Пакліканне" 2002г., лаўрэат прэміі імя В. І. Вернадскага 2004 г., лепшы ваенны ўрач 2006 г., генерал медыцынскай службы.** Свой багаты прафесійны вопыт адлюстраваны ім у больш чым 150 навуковых працах, у тым ліку 4 манаграфіях.

**Шадэка Васіль Пятровіч – кандыдат філалагічных навук, дацэнт.**



*Шадэка Васіль Пятровіч*

Нарадзіўся **27 студзеня 1955 года ў вёсцы Пушкі**, дзе скончыў пачатковую школу, вучыўся ў Лёзненскай СШ №1. У 9-м класе заняў трэцяе месца на абласной алімпіядзе па нямецкай мове, а ў 10-м – першае месца на раённай алімпіядзе. Пасля заканчэння школы **ў 1972 годзе** адправіўся ў Ленінград вучыцца на месячных курсах для сельскай моладзі, каб затым паступіць у Санкт-Пецярбургскі (у той час Ленінградскі) універсітэт.

Вытрымаўшы конкурс – 10 чалавек на месца, - Васіль

Пятровіч паступіў на заходняе аддзяленне філалагічнага факультэта, дзе вывучаў нямецкую, англійскую, лацінскую і рускую мовы, слухаў лекцыі па агульнаадукацыйных прадметах, гісторыі і мастацтве Германіі, нямецкай класічнай філасофіі, а таксама па рускай і заходнееўрапейскай літаратуры .

**Улетку 1974 года Шадэка Васіль Пятровіч** праходзіў філалагічную практыку ў Енскім універсітэце імя Фрыдрыха Шылера, дзе наведваў заняткі па нямецкай мове і слухаў лекцыі па нямецкай літаратуры, якія чытаюцца для замежных студэнтаў. Шадэка Васіль Пятровіч скончыў універсітэт па спецыяльнасці "Нямецкая мова і літаратура", з прысваеннем кваліфікацыі **"Філолаг-германіст, выкладчык, перакладчык нямецкай мовы, настаўнік англійскай мовы".**З **1977 па 1979 гады** Шадэка Васіль Пятровіч служыў у званні лейтэнанта перакладчыкам у Групе савецкіх войскаў у Германіі.

З **1979 па 1987 гады Шадэка Васіль Пятровіч** выкладаў спачатку ў школе, а затым у Індустрыяльна-педагагічным тэхнікуме, а з **1987 года пачаў працаваць у пецярбургскіх ВНУ.**

**Шэдчэнка Аляксей Канстанцінавіч – журналіст, галоўны рэдактар часопісаў "Лёгкая атлетыка" і "Masters", газеты "Віза-навіны"**

Нарадзіўся **14 кастрычніка 1951 года ў гарадскім пасёлку Лёзна. У 1969 годзе** скончыў СШ №1 у Лёзне. Захапляўся лёгкай атлетыкай, футболам, лыжамі, турызмам. Быў неаднаразовым чэмпіёнам раёна, прызёрам абласной спартакіяды школьнікаў, аблсавета ДСО "Ураджай". Адным з першых лёзненцаў пабываў у 1964 годзе ў піянерскім лагеры "Артэк". Супрацоўнічаў у піянерскім і моладзевым друку "Зорька", "Костёр", пасля заканчэння школы працаваў у раённай газеце **"Сцяг Перамогі".**



*Шэдчэнка Аляксей Канстанцінавіч*

У **1972 годзе,** адслужыўшы ў Савецкай арміі, паступіў на факультэт журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя **Міхаіла Васільевіча Ламаносава.**

Пасля яго заканчэння ў **1977 годзе** два гады ў званні лейтэнанта служыў ваенным карэспандэнтам дывізіённай газеты ў гарадах Магдэбург і Стэндаль у Групе савецкіх войскаў у Германіі. У **1979 годзе** пачаў працаваць рэдактарам ва ўсесаюзным часопісе **"Лёгкая атлетыка"**. Асвятляў у якасці спецыяльнага карэспандэнта **многія чэмпіянаты свету, Еўропы і Алімпійскія гульні.**

У **2001-2002 гадах** – галоўны рэдактар газеты **"Віза-навіны"**. З **2002 года** – заснавальнік і галоўны рэдактар усерасійскага спартовага **часопіса "Masters"**. Зараз – галоўны рэдактар выдавецтва **"Юбілейная кніга"**. Член Камісіі па падтрымцы развіцця спорту сярод ветэранаў Савета па фізічнай культуры і спорту пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Аўтар і рэдактар больш 40 кніг. Сярод іх – двухтомнік аб гісторыі засваення "газавага паўвострава" – Ямал. Член рэдакцыйнага савета выдавецтва "Пента". Жыве ў Маскве.

**Шаўцоў Віктар Аркадзьевіч – бізнесмэн, прэзідэнт “Інфабанка”, ”Трастбанка”, мецэнат**

Нарадзіўся ў **1963 годзе** ў **вёсцы Разумова**. Скончыў **БДУ, факультэт радыёфізікі і электронікі, аспірантуру.**



*Шаўцоў Віктар Аркадзьевіч*

З **1991 года** ў бізнэсе. Дырэктар па развіцці ЗАТ **"Трастбанк"**, у групу кампаній уваходзяць: **СП "МАЗ-МАН"** (вытворчасць грузавых аўтамабіляў), **"БМЕ-Дызель"** (вытворчасць дызельных генератараў і помпаў і гандаль імі), **"БМЕ- экспарт” (**забудоўшчык і дэвелапер бізнес-цэнтра " Інфа " ў Мінску, жыллёвае будаўніцтва), **турыстычна-забаўляльны комплекс “Дудуткі “** ў Мінскай вобласці, інтарэсы ў Лівіі і іншых краінах Магрыба і Блізкага Усходу.







*Турыстычна- забаўляльны комплекс “Дудуткі”(2015г.)*

Актывы: «Трастбанк», банкаўскія паслугі; **“Белзамежбуд”,** дыстрыбуцыя беларускай тэхнікі і прадукцыі ў **Венесуэле,** будаўнічыя паслугі і інвестыцыі ў нерухомасць у Венесуэле; BME - America Latina, дыстрыбуцыя беларускіх тавараў у **Аргенціну, “Бэлмэталэнэрга”, “Интерспортпроект”, “БМЕ Бізнес-цэнтр”, “БМЕ-Экспарт”, інвестыцыі ў нерухомасць, “Белсплав”, будаўнічыя паслугі ў Беларусі; “МАЗ-МАН”, вытворчасць аўтамабільнай** тэхнікі і сэрвіснае абслугоўванне, "Белтракэндбас", дыстрыбуцыя ў Беларусі аўтамабільнай тэхнікі MAN, ГД “МТЗ-Стаўраполле”, дыстрыбуцыя тэхнікі МТЗ у Расіі, "БМЕ-Дызель", вытворчасць дызельных генератараў; “Галаграфічная індустрыя”, паліграфічныя паслугі і прадукты; **“Дудуткі-тур”, забавы і адпачынак, музей народных промыслаў; Technologien & Investionenverwaltungs, інвестыцыйная кампанія ў Аўстрыі.**

Грамадская дзейнасць, захапленні: **праваслаўны мецэнат (пабудаваў некалькі цэркваў), узнагароджаны ордэнам Беларускай Праваслаўнай Царквы святога Кірылы Тураўскага**, саўладальнік патэнтаў, былы кіраўнік Таварыства беларуска-іракскай дружбы, член беларуска-лівійскай камісіі па эканамічным, гандлёвым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, міжурадавай беларуска-ліванскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, удзельнік расійска-арабскага дзелавога савета. Жыве ў Мінску.

## *3. Дзяржаўныя дзеячы і дзеячы культуры.*


*Філіпоўскі Зіновій Паўлавіч*

**Філіпоўскі Зіновій Паўлавіч – удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Беларусі.**
**(1884 – 19.07. 1966 гг.)**

Нарадзіўся ў **1884 годзе ў вёсцы Калышкі**. З сялянскай сям'і. Член КПСС з 1904 года. Удзельнік рэвалюцыі **1905-1907 гадоў.** З 1898 года быў рабочым.

У 1906 годзе арыштаваны і ў 1907 годзе асуджаны на 10 год катаргі, а ў 1908 годзе яшчэ на 6 год за ўцёкі.

У **1911-1914 гадах** быў на будаўніцтве Амурскай чыгункі, потым на пасяленні ў Іркуцкай губерніі.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года знаходзіўся на Радзіме. Удзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі **1917 года** ў Віцебской губерніі, быў **старшынёй Калышанскага рэўкама і камісарам атрада Чырвонай гвардыі.**

У **1919-1920 гадах** Філіпоўскі быў камісарам Віцебскай уезднай надзвычайнай камісіі. З **1921 па 1950 гг.** на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце на Беларусі.

**Узнагарджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.**
Памёр **Зіновій Паўлавіч Філіпоўскі 19. 07. 1966 года ў горадзе Ленінградзе,** дзе правёў апошнія гады жыцця.

**Вадэр Артур Паўлавіч – партыйны і дзяржаўны дзеяч, кандыдат гістарычных навук.**

Нарадзіўся ў **1920 годзе ў вёсцы Горбава**.


*Вадэр Артур Паўлавіч*

У 1954 годзе скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. З **1937 года** быў на выкладчыцкай і камсамольскай рабоце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З **1948 года** на партыйнай рабоце ў Эстоніі.

Быў сакратаром райкама, гаркама, старшынёй камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю, сакратаром ЦК КП Эстоніі і намеснікам старшыні Савета Міністраў Эстонскай ССР.

У **1964-1970 гадах** – другі сакратар ЦК КП Эстоніі.

З **1970 года** – старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Эстонскай ССР, адначасова **з 1971 года з'яўляўся намеснікам старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1962-1978 гадах. Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, медалямі.**
Памёр у **1978 годзе** ў Эстоніі.

## Піталенка Леанід Мікалаевіч



*Піталенка Леанід Мікалаевіч*

Нарадзіўся **19 чэрвеня 1943 года ў вёсцы Вішні**. Скончыў Дзяржаўны педагагічны інстытут імя С. М. Кірава ў Віцебску ў **1967 годзе**, настаўнік хіміі і біялогіі. З 1961 года быў настаўнікам фізкультуры ў адной са школ нашага раёна. З 1967 года – настаўнік хіміі і біялогіі СШ сяла Горны садоўнік Талгарскага раёна Алма-атынскай вобласці. З 1977 года – інспектар Міністэрства асветы Казахскай ССР. З 1986 года - дырэктар Рэспубліканскай станцыі юных натуралістаў (горада Алма-Ата). З 2000 года – старшыня савета рэгіянальнага Нацыянальна- культурнага цэнтра "Беларусь" г. Алматы, член Савета Асамблеі народа Казахстана. З **2007 года** па цяперашні час – дэпутат Мажыліса Парламента РК 4-га склікання, член Камітэта па пытаннях экалогіі і прыродакарыстанні. Узнагароджаны медалямі "За асваенне цаліны" (1964), "Ветэран працы" (1989), імя І.Алтынсарына (1992), "Беларусь Рэспублікасының тәуелсіздігіне 10 жыл" (2001), "Беларусь Канстітуциясына 10 жыл" (2005), "Астананың 10 жылдығы" (2008). Выдатнік народнай асветы Казахскай ССР (1984 года).

## Смірноў Віталь Сцяпанавіч – дыпламат, пасол СССР

Нарадзіўся **16 лютага 1930 года ў вёсцы Вялікія Сутокі.** З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ён стаў **самым юным падпольшчыкам, у 1942-1944 гадах – сынам палка, выхаванцам Савецкай Арміі.** Скончыў Мінскі юрыдычны інстытут. З **1951 па 1954 гады** працаваў другім, першым сакратаром Варашылаўскага райкама камсамола горада Мінска. З **1954 па 1957 гады** – першым сакратаром Мінскага абкама камсамола. З **1957 па 1961гады** – другім сакратаром ЦК ЛКСМ Беларусі. Неаднаразова абіраўся старшынёй прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.



*Смірноў Віталь Сцяпанавіч*

У **1969 – 1974 гадах** быў пастаянным прадстаўніком пры ААН у ЗША. З **1980 па 1985гг**. – Надзвычайны пасол СССР у Пакістане. З **1985 па 1988 гады – Начальнік Галоўнага ўпраўлення БССР па замежным турызме.** З **1988 па 1991гг**. – Пасол СССР у Народнай Рэспубліцы Бангладэш. З **1992 года** – саветнік Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па знешнеэканамічных сувязях. За шматгадовую плённую працу Віталь Сцяпанавіч быў **узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам "Знак Пашаны",медалямі, Ганаровымі граматамі Прэзідыума ВярхоўнагаСавета Беларускай ССР, Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР. Памёр Смірноў Віталь Сцяпанавіч 1 лістапада 2007 года ў Мінску.**

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч – Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, першы сакратар Віцебскага абкама КПБ, першы сакратар Лёзнескага РК ЛКСМБ**



*Шабашоў Сяргей Міхайлавіч*

Нарадзіўся ў **1923 годзе** ў станіцы **Драгуны.**

У Вялікую Айчынную вайну быў партызанам брыгады імя Аляксея Фёдаравіча Данукалава.

З 1944 года быў назначаны першым сакратаром Лёзненскага, Віцебскага РК ЛКСМБ. У верасні 1950 года Шабашоў быў накіраваны на 9-месячныя курсы пры Цэнтральнай камсамольскай школе ў Маскве.

У 1956 годзе выдатна скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педінстытута, а ў 1961годзе – Вышэйшую Партыйную Школу пры ЦК КПСС.

З 1956 года Сяргей Міхайлавіч Шабашоў займае адказныя пасады – сакратара Кастрычніцкага РК КПБ горада Віцебска, Езярышчанскага, Кобрынскага РК КПБ. З 1962 года – начальнік Кобрынскага калгасна-саўгаснага праўлення Брэсцкай вобласці, сакратар Брэсцкага сельскага, з 1965 года Брэсцкага абкама КПБ. Працаваў загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, з'уляўся членам ЦК КПБ у 1961-1965 гады і ў 1971-1985 гады. З 1971 года – першы сакратар Віцебскага абкама КПБ.

У 1971-1975 гадах – дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

У 1990 годзе Сяргей Міхайлавіч Шабашоў быў абраны народным дэпутатам БССР ад рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў вайны і працы.



*Сустрэча гурткоўцаў з Шабашовым С. М. (1998г.)*

У 1998 годзе ўдзельнікі гуртка “Мая Лёзненшчына” сустракаліся з нашым знакамітым земляком Шабашовым Сяргеем Міхайлавічам у Віцебску ў абласным аддзеле беларусазнаўства і краязнаўства. Вельмі цікавую сустрэчу нам арганізаваў загадчык гэтага аддзела Куржалаў Алег Васільевіч.

За баявыя і працоўныя заслугі перад Радзімай Шабашоў Сяргей Міхайлавіч узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Айчыннай вайны 1 і 2 ступені, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам "Знак Пашаны", шматлікімі медалямі. Ганаровы грамадзянін горада Віцебска.

Памёр у 2007 годзе. Пахаваны ў Віцебску.

## *4. Дзеячы культуры і мастацтва*

**Бондарава Ефрасіння Леанідаўна – беларускі, савецкі кіназнавец, кінакрытык. Заслужаны дзеяч навукі БССР , доктар філалагічных навук, прафесар.**



Нарадзілася **25 лістапада 1922 года** ў **вёсцы Гапонава** ў сялянскай сям’і. Спачатку вучылася ў Веляшковіцкай школе, затым у **СШ №1 г. п Лёзна.** Яшчэ ў 8 класе ўступіла ў камсамол. З гэтага часу з-за цяжкага матэрыяльнага становішча стала працаваць дыктарам мясцовага радыёвузла, затым – старшай піянерважатай у СШ №1. У **1941 годзе** выдатна скончыла школу. Яна без іспытаў была залічана ў Ленінградскі ўніверсітэт, але не на той факультэт, які хацела.

*Бондарава Ефрасіння Леанідаўна*

Бондарава Ефрасіння Леанідаўна спыняе вучобу і вяртаецца ў Лёзна, дзе да пачатку Вялікай Айчыннай вайны зноў працуе ў сваёй школе і ў рэдакцыі.

У **1941годзе** спрабуе зноў паступіць, але – вайна. Эвакуіравацца не ўдалося, прыйшлося пасяліцца ў родных у **вёсцы Новая Дуброва**, дзе вяла антыфашысцкую прапаганду. Была арыштавана і цэлы тыдзень знаходзілася ў Віцебскай турме.

У **кастрычніку 1943 года** Ефрасіння Леанідаўна ўключылася ў работу па ўзнаўленні раёна. Была сакратаром рэдакцыі райгазеты **“Ленінскі сцяг”.**
Затым паступіла ў БДУ імя Леніна на факультэт журналістыкі, які скончыла з адзнакай. З **1953 года** адначасова была галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры БССР і выкладчыкам у БДУ. Даследавала праблемы беларускага кінамастацтва, выступала ў жанры кінакрытыкі.
Аўтар твораў **“Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін”** (1960г.), **“У кадры і за кадрам”** (1973г.), **“Час, экран, крытыка”** (1975г.), **“Кіналента даўжынёю ў жыццё”** (1980г.) і іншыя. Памерла Бондарава Е. Л. **30 чэрвеня 2011 года.**




Займаючыся выкладчыцкай дзейнасцю, Ефрасіння Леанідаўна Бондарава выхавала цэлую пляяду вядомых беларускіх журналістаў, мастацтвазнаўцаў і дзеячаў кіно. Сярод яе вучняў **Ігар Дабралюбаў**, **Віктар Дашук.** Муж Ефрасінні Леанідаўны – **Аўдзееў Алег Ціханавіч** - заслужаны работнік культуры Беларусі (1976г.).

Ім зняты фільмы **“Дзяўчынка шукае бацьку”** (1959г.), **“Воўчая зграя**” (1976г.).

Яе сын **Ігар Аўдзееў** – беларускі кіназнавец, навуковы супрацоўнік ІМЭФАНРБ. Памерла ў 2011г.

*Вокладка кнігі Е. Л. Бондаравай (1993г.)*

**Ганестава Людміла Раманаўна –**
**опернная спявачка, заслужаная артыстка БССР .**



*Ганестава Людміла Раманаўна*

Нарадзілася **18 ліпеня 1923 года** ў вёсцы **Калышкі**. Бацькі рана памерлі, і з пяці год яе выхоўвала бабуля Кісялёва Марыя Лявонцеўна. Спачатку яна вучылася ў Калышках, а з пятага класа – ў СШ №1 гарадскога пасёлка Лёзна. Дырэктарам школы тады быў Угалёў Васіль Васільевіч, разам з якім **Людміла Кір'янава** (дзявочае прозвішча Ганеставай) іграла ў спектаклі Антона Паўлавіча Чэхава "Мядзведзь".
**18 чэрвеня 1941**года Л. Р. Ганестава атрымала атэстат аб сярэдняй адукацыі, а **24 чэрвеня** немцы бамбілі Лёзна.

У нашай школе быў арганізаваны шпіталь. Дзяўчынкі даглядалі параненых. Неўзабаве яна са сваімі аднакласнікамі на веласіпедах паехала на фронт у накірунку Масквы. На фронце была сувязісткай у дзеючай арміі. Пасля вызвалення Лёзна працавала літсупрацоўнікам у раённай газеце, актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. Талент спявачкі быў заўважаны яшчэ пры вызваленні Кіева на адным з канцэртаў, дзе яна спявала песню **"У лясу прыфрантавым".** Людмілу заўважыў адзін генерал, які параіў ёй пайсці вучыцца ў Мінск у кансерваторыю.

У **1955 годзе** яна скончыла **Беларускую дзяржаўную кансерваторыю.**

З **1957** па **1980гг**. з'яўлялася салісткай Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Стварыла яркія жаночыя вобразы ў творах беларускіх кампазітараў **Я. Цікоцкага, Ю. Семянякі**, выконвала многія вядучыя партыі ў оперных спектаклях рускай і замежнай класікі.









*Сцэны опернай класікі Ганеставай Л. Р.*

Ганестава Людміла Раманаўна выканала партыі нацыянальнага рэпертуару: Марысі ("Міхась Падгорны") Я. Цікоцкага), Аксаны ("Калі ападае лісце" Ю. Семянякі). З партый опернай класікі: Наташа ("Русалка" А. Даргамыжскага), Марыя, Настасся ("Мазепа" і "Чарадзейка" П. Чайкоўскага), Тамара ("Дэман" А. Рубінштэйна), Аіда, Леанора, Амелія, Дэздэмона ("Аіда", "Трубадур", "Баль - маскарад", "Атэла" Дж. Вердзі), Маргарыта ("Фаўст Ш. Гуно), Чыо - Чыо-сан, Тоска (оперы Дж. Пучыні), Джаконда ("Джаконда" А. Панк'елі). Была на гастролях у ГДР, НРБ, Фінляндыі. Памерла ў 2009 г.

**Шакінка Леанід Ісідаравіч – беларускі савецкі графік - мастак.**



*Шакінка Леанід Ісідаравіч*

Нарадзіўся **18 мая 1927 года** ў **вёсцы Старына**. У **1962 годзе** скончыў Беларускі тэаральна - мастацкі інстытут. З **1966 года** мастацкі рэдактар часопіса **"Нёман"**. Леанід Ісідаравіч Шакінка ўдзельнічаў у мастацкіх выстаўках з **1962 года**. Працуе ў станкавай і кніжнай графіцы ў тэхніках лінавюры, афорта, літаграфіі, акварэлі. Творам мастака ўласціва вобразная завершанасць, якая дасягаецца строгасцю і прастатой графічнага вырашэння.

У 90-х гадах працаваў над серыяй партрэтаў воінаў- афганцаў, якія не вярнуліся з бою.




*Каталаг выстаўкі Шакінкі Л. І. (1989г.)*

Сярод ранейшых работ вызначаюцца: **"Кастрычнік"** (1962г.), **"Веласіпедысты"** і **"У нас у двары"** (1963г.), **"Маці 1941год"** (1964г.), **"Дарога на Мінскае мора"** (1965г.), **"Залатая восень"** (1966г.), **"Коміны Хатыні"** (1967г.), **"Школьніца"** (1970г.), **"Мікалай Капернік"** і **"Зімовыя карункі"** (1973г.), **"Зімовая казка"** (1983г.), **"Да Ільіча"** ( 1984г.), серыі **"Нашы маці"** (1982г.) і **"Вайна і людзі"** (1984г.), **партрэты Героя Савецкага Саюза А. Ф. Данукалава** (1985г.), двойчы Героя Сацыялістычнай працы **В. К. Старавойтава** (1986г.). Памёр ў 1996г.



*Трыпціх."Памяці легендарнага камбрыга А. Ф. Данукалава." Мал. Шакінкі Л. І .*

## Забораў Абрам Барысавіч – савецкі мастак


*Забораў Абрам Барысавіч*

Нарадзіўся ў **лютым 1911года** ў **мястэчку Лёзна**. Яго маці, Сіфра Навумаўна, трымала тут гаспадарчую лаўку. Бацька, Барыс Абрамавіч, займаўся малым гандлем. Дзед Абрама па маці служыў прыказчыкам па лясной справе ў памешчыка **Хлюсціна.** Праз нейкі час сям'я пераехала на радзіму бацькі ў горад Веліж. Там хлопчык вучыўся ў яўрэйскай сямігодцы, дзе праявіліся яго выдатныя здольнасці да малявання. Ён пісаў лозунгі, афармляў газеты, рабіў малюнкі на тэму грамадзянскай вайны.

Пасля заканчэння школы Абрам Барысавіч паступіў у **Віцебскі тэхнікум мастацтва.** Пасля яго заканчэння **ў 1930 годзе** паехаў у Мінск. У гэтым горадзе прайшла галоўная частка яго творчага жыцця. Па дагаворах Саюза мастакоў ён афармляў стэнды і пісаў плакаты да дзяржаўных свят, маляваў партрэты правыдароў партыі. Асабліва ўдаваліся яму карціны, сюжэты, якія выдумваў сам. У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Б. Забораў быў на фронце. Пасля яе заканчэння зноў вярнуўся ў Мінск.

Працаваў у бытавым, партрэтным, гістарычным жанрах. Сярод лепшых яго карцін **“Дзе сын?”** (1939г.), **“Вечар на рэйдзе”(**1960г.), **“Салдаты Кастрычніка”** (1969г.), **“Маракі”** і іншыя. Некалькі яго карцін знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. У **1979 годзе** мастак паехаў у **Ізраіль**. Адна з яго карцін вісіць у парламенце гэтай краіны. **Абрам Барысавіч Забораў** памёр у Ізраілі, горадзе Кфар-Сава ў **1984 годзе.**

Сын яго, вядомы мастак Еўропы, **Барыс Абрамавіч Забораў** нарадзіўся ў Мінску ў **1935 годзе**. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы, а затым у Ленінградскай акадэміі мастацтва. Адтуль перавёўся ў Маскоўскі інстытут мастацтва **імя В. Сурыкава**. Праявіў сябе ў галіне станкавага жывапісу, графікі, тэатральных дэкарацый. У **1980 годзе** Барыс Абрамавіч пераехаў жыць у Парыж. У **2004 годзе** яго выставы прайшлі ў Рускім музеі ў Пецярбургу і ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве. Зараз работы мастака выстаўляюцца ў Парыжы, Токіа, Нью-Ёрку і іншых гарадах свету.


*Сустрэча з Заборавым Б. А. у Мінску (2010г.)*

**Народны музей СШ №1** падтрымлівае сувязі з Барысам Абрамавічам Заборавым.
**26 кастрычніка 2010 года** Ціхамірава Ірына Мікалаеўна разам з Ціхаміравай Анастасіяй сустракаліся з Заборавым Б. А. у Мінску, а ў **2016 годзе** ездзілі да яго ў Францыю. Мастак на Радзіму бацькі выслаў інтэрактыўную дошку, фотакамеру, 2 прынтары і ноўтбук.
Усё гэта зараз знаходзіцца ў карыстанні сярэдняй школы №1 г. п. Лёзна.

**Ягорова Кацярына – дыктар першага канала Беларускага радыё, вядучая канцэртнай залы Белдзяржфілармоніі, у мінулым – дыктар Беларускага тэлебачання,** вядомая як **Кацярына Несцяровіч.**



*Ягорава Кацярына Канстанцінаўна*

Нарадзілася **21 сакавіка 1946 года ў вёсцы Буі**. Пасляваеннае дзяцінства было нялёгкім. Жыла з мамай і бабуляй. Яны з ранніх гадоў прывівалі дзяўчынцы любоў да працы, а вязанне і кнігі сталі яе галоўнымі захапленнямі. З пятага класа Кацярына стала вучыцца ў Лёзненскай сярэдняй школе. Там яна выявіла сябе добрай вучаніцай і актыўнай удзельніцай мастацкай самадзейнасці. Яна спявала, танцавала, удзельнічала ў школьных спектаклях.

Пасля заканчэння школы працавала прадаўцом, бухгалтарам, сакратаром райвыканкама, лабарантам хімічнай лабараторыі. І па-ранейшаму ўдзельнічала ў канцэртах, зараз ужо на сцэне раённага Дома культуры.

Па запрашэнні Генадзя Цітовіча, хор якога выступаў у Лёзне, паехала ў Мінск і стала спачатку вядучай канцэртаў хора, а затым яго салісткай.

У **1975 годзе** на Беларускім тэлебачанні праводзіўся конкурс дыктараў, дзе са 150 прэтэндэнтаў адабралі 2, у тым ліку і Кацярыну Ягораву. У красавіку 1976 гада адбыўся яе першы выхад у эфір. Больш чым 20 гадоў жыцця было аддадзена тэлебачанню. З 1989 года яна працуе дыктарам беларускага радыё. Адначасова з'яўляецца вядучай беларускага канала “Культура” і канцэртнай залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

**Якімаў Ігар Віктаравіч – аператар - пастаноўшчык**

Нарадзіўся ў **1965 годзе ў г. п. Лёзна**. Пасля службы ў арміі ў 1986 годзе працаваў фатографам у горадзе Віцебску. У 1977 годзе скончыў Беларускую акадэмію мастацтва. Дыпломная стужка “З гісторыі аднаго гусара” (2ч. ч/б. Рэж. І.Паўлаў) і “Яўдока” (2ч.кал. рэж. Антон Войніч). Працаваў аператарам на к/с “Беларусьфільм” творчага аб’яднання “Белвідэацэнтр”. Аператар – пастаноўшчык у праекце “Маленькія гісторыі”, у васьмісерыйнай мастацкай стужцы “Крэст у крузе” (2008 год).

Памёр **8 сакавіка 2015 года**. Пахаваны ў г.п. Лёзна.



*Якімаў Ігар Віктаравіч*

***Пытанні і заданні:***

1. *Хто такі Белахвосцікаў А. Я.? Як можна ўвекавечыць яго імя?*
2. *Назаві маркі аўтамабіляў, створаных Прусавым П. М.*
3. *Дзе вучыліся ў школе Ганестава Л. Р., Бондарава Е. Л., Ягорава К. К.?*

## § 30. “ Алея Славы” – Героі вайны і працы

### 1. *Героі Савецкага Саюза – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны*

…Вайна засталася ў мінулым. Але гераізм, праяўлены беларускім народам, навечна застанецца ў нашых сэрцах. Мы беражліва захоўваем у памяці імёны тых, хто ваяваў і загінуў, хто стаяў насмерць дзеля жыцця на зямлі.
Людзі, якія першымі ішлі на ворага, ваявалі да апошняга дыхання, былі там, дзе вырашаўся вынік бітвы, сваім прыкладам натхняючы тысячы другіх воінаў. Бяссмяротныя подзвігі нашых землякоў заўсёды будуць дастойным прыкладам для маладога пакалення.

“Алея Славы” знаходзіцца на плошчы Леніна ў нашым пасёлку Лёзна. Створана ў **2015 годзе** да Дня Незалежнасці – 3 ліпеня. На “Алеі Славы” змешчаны выявы 5 Герояў СССР, 3-х кавалераў ордэнаў трох ступеняў Славы, 11 Герояў Сацыялістычнай Працы – ураджэнцаў Лёзненшчыны.





*“Алея Славы” у гарадскім пасёлку Лёзна (2015г.)*

**Авекаў Іван Аўдзеевіч** (19 .05. 1919 – 17 .04. 1943)



*Авекаў Іван Аўдзеевіч*

Нарадзіўся ў вёсцы Лапіцкія Бабінавіцкага сельсавета ў сям’і рабочых. У Чырвонай Арміі з 1937 года. Скончыў ваеннае авіяцыйнае вучылішча. З чэрвеня 1941 года ваяваў на Паўднёва – Заходнім, Заходнім і Цэнтральным франтах. Удзельнік абароны Масквы, Тулы. Камандзір знішчальнай эскадрыллі І. А. Авекаў здзейсніў 178 баявых вылетаў, з іх 45 на штурм войск і аэрадромаў праціўніка. Збіў 15 варожых самалётаў, 1 тараніў, 23 знішчыў на аэрадромах.

Загінуў 17 .04. 1943 года. Пахаваны ў горадзе Данкоў Ліпецкай вобласці, у брацкай магіле, на якой пастаўлены помнік.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24. 08. 1943 года.



Гарноў Ц.имафей Якаўлевіч

**Гарноў Цімафей Якаўлевіч** (1916 – 22.10. 1944)

Нарадзіўся ў 1916 годзе ў вёсцы Асіпова. У Чырвонай Арміі з 1941 года. Ваяваў на Паўночна - Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Камандзір артылерыйскай гарматы старшы сяржант Ц. Я. Гарноў вызначыўся пры вызваленні Літвы. Яго гарматны разлік у час прарыву абароны праціўніка і наступлення ў ліпені 1944 года на левым беразе Нёмана знішчыў назіральны пункт, 2 гарматы, 9 кулямётаў праціўніка.

У жніўні 1944 года разлік падбіў 3 танкі, самаходную гармату і знішчыў каля 80 варожых салдат. 17 жніўня байцы разліку першыя фарсіравалі раку Шашупе, адбіваючы контратакі праціўніка, забяспечвалі пераправу савецкіх войск.

Гарноў Ц. Я. загінуў у баі 23.10.1944 года. Пахаваны ў пасёлку Бабушкіна Несцераўскага раёна Калінінградскай вобласці. Імем героя названы рыбалоўны траўлер на Балтыцы, 8 – гадовая школа ў вёсцы Асіпова, дзе ён вучыўся, на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У вёсцы Асіпова яму пастаўлены помнік. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.03.1945 года.



Мацкевіч І. В.

**Мацкевіч Ігнат Вікенцьевіч** (15.02. 1912 – 26.09. 1943)

Нарадзіўся 28. 05. 1912 года ў пасёлку Завольша. Працаваў на будаўніцтве чыгункі ў Ленінградзе. У Чырвонай Арміі з 1932 года. На фронце з красавіка 1943 года. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. Байцы яго 6 - й роты былі вядомыя ў палку як сапраўдныя майстры фарсіравання рэк. Таму, калі нашы войскі падышлі да Дняпра і ў штабе палка вырашалася пытанне, якое падраздзяленне будзе першае фарсіраваць вялікую раку, зноў была названа рота Мацкевіча. І 22.09. 1943 года стралковая рота пад яго камандаваннем першая пераправілася цераз раку і захапіла плацдарм. І. В. Мацкевіч загінуў у баі 26.09. 1943 года. Пахаваны ў вёсцы Абалонне Каропскага раёна Чарнігаўскай вобласці.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 16. 10. 1943 года.



Чарапнёў С. М.

**Чарапнёў Сяргей Міхайлавіч** (1918 – 14.06. 1944) Нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Шніткі. У Чырвонай Арміі з 1938 года. На фронце з 1941 года. Штурман самалёта, атрада, эскадрыллі цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў гвардыі капітан Чарапнёў С. М. здзейсніў 237 начных баявых вылетаў і 94 вылеты для забеспячэння савецкіх войск боепрыпасамі і гаручым, высадзіў у глыбокім тыле праціўніка 35 дэсантнікаў, раскідаў 5 400 тысяч лістовак. У выніку баявых дзеянняў экіпажа, у складзе якога ён лятаў, разбураны 4 варожыя пераправы, 2 чыгуначныя

вузлы, 7складаў з боепрыпасамі і гаручым, знішчаны 5 самалётаў, 11 танкаў, 37 аўтамашын, створана 112 ачагоў пажару. С.М. Чарапнёў загінуў 14.06.1944 года пры выкананні баявога задання ў раёне горада Дэмблін (Польша). На будынку Высачанскай сярэдняй школы, дзе вучыўся герой, устаноўлена мемарыяльная дошка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 18.09. 1943 года.



*Янушкоўскі І. І.*

**Янушкоўскі Іван Іванавіч** (15.05. 1915 – 18.09. 1944) Нарадзіўся ў вёсцы Пыжы 15.05 1915 года. Скончыў 2-е Кіеўскае ваеннае вучылішча. У Чырвонай Арміі з 1932 года. Ваяваў на Заходнім, Ленінградскім, 2-м Украінскім франтах. У баях пад Сталінградам тройчы вадзіў у атаку стралковы батальён, пры гэтым асабіста знішчыў каля 38 фашыстаў, 12 узяў у палон. Камандзір мінамётнага палка гвардыі маёр вызначыўся ў баях на тэрыторыі Румыніі. 18.09. 1944 года з групай салдат і афіцэраў трапіў у засаду варожай роты аўтаматчыкаў.

У няроўным баі выратаваў штаб і сцяг палка, знішчыў каля 20 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. Урна з прахам пахавана ў Віцебску. Яго імем названа вуліца ў Віцебску. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24. 03. 1945 года.

## *2. Ордэнаносцы 3-х ступеняў Славы*



*Ландычэнка В. Ф.*

**Ландычэнка Віктар Фёдаравіч** (12.02. 1922 - 31.03.1980) Нарадзіўся 12 лютага 1922 года ў вёсцы Стральцоўшчына. Камандзір аддзялення разведроты гвардыі сяржант В. Ф. Ландычэнка вызначыўся ў баях на тэрыторыі Літвы і Латвіі, дзе здзейсніў тры подзвігі. Удзельнічаў у Курскай бітве, вызваленні Віцебшчыны ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. 11 жніўня 1944 года ён першы фарсіраваў раку Мемеле, прабраўся ў тыл ворага і знішчыў дзве агнявыя кропкі, 18 верасня 1944 года з групай разведчыкаў разграміў апорны пункт ворага і ўзяў "языка", 10. 10. 1944 года праявіў гераізм у час прарыву абароны праціўніка. Да 1966 года працаваў у МУС. Памёр 31 сакавіка 1980 года.



*Савуцін П. М.*

**Савуцін Пётр Мацвеевіч** (25 .04. 1925 – 24. 07. 1995) Нарадзіўся 25 красавіка 1925 года ў вёсцы Вялікае Сяло ў сям'і рабочага. У Чырвонай Арміі з 10 студзеня 1943 года. Ваяваў з гітлераўцамі на Цэнтральным Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Прымаў актыўны ўдзел у вызваленні роднай Беларусі, Польшчы, у баях на тэрыторыі Германіі. За гады вайны быў 5 разоў паранены. Захапіўшы населены пункт Бэжеце ў Польшы, узвод разведчыкаў утрымліваў яго да прыхода стралковага батальёна. У гэтым баі чырвонаармеец Савуцін знішчыў 5 немцаў і захапіў у палон некалькі

гітлераўскіх салдат. Старэйшы сяржант Савуцін П. М. адным з першых падняўся ў атаку, у жорсткім баі знішчыў звыш дзясятка немцаў, захапіў мінамёт і ўзяў у палон афіцэра. У Германіі каля горада Лебус 18 красавіка 1945 года, уварваўшыся ў траншэю ворага, гранатамі і агнём з аўтамата знішчыў звыш дзясятка немцаў, а воіны ўзвода ліквідавалі 5 варожых кулямётаў.

22 красавіка 1945 года ў раёне населенага пункта Фалькенхаген байцы пад яго камандаваннем, адбіваючы контратаку праціўніка , захапілі вышыню. Ва ўзнагародным лісце, асабіста падпісаным галоўнакамандуючым 1-м Беларускім фронтам Маршалам СССР Жукавым Г. К. адзначалася мужнасць і адвага старшага сяржанта Савуціна П. М. на завяршаючым этапе Берлінскай наступальнай аперацыі. Дэмабілізаваны ў 1945 годзе. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 15 мая 1946 года старшы сяржант Савуцін П. М. за баявыя заслугі быў узнагарджаны ордэнам Славы 1-й ступені. Стаў поўным кавалерам ордэна Славы. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, Славы 1-й, 2-й і 3-й ступені, медалямі, у тым ліку медалём "За отвагу". Жыў у горадзе Усць-Кут Іркуцкай вобласці.

Памёр 24 ліпеня 1995 года.



*Ткачоў Іван Ляеонцьевіч*

**Ткачоў Іван Лявонцьевіч** (22. 06. 1920 – 06. 06. 1985)

Нарадзіўся 22 чэрвеня 1920 года ў вёсцы Лындзіна ў сям'і селяніна. У Чырвонай Арміі з 1939 года. Удзельнік ВАВ з ліпеня 1941года. Змагаўся за Севастопаль, пасля яго здачы застаўся разведчыкам у партызанскім атрадзе ў Крымскіх гарах. Пасля вызвалення Крымскага паўвострава ён зноў у вайсковых часцях. Удзельнічаў у вызваленні Прыбалтыкі. 31 ліпеня 1944 года ў баі за горад Ленгава (Латвія ) старшы сяржант Ткачоў знішчыў 10 гітлераўцаў і падавіў 2 агнявыя кропкі ворага. 1 жніўня ён адным з першых пераправіўся праз раку Ліелу Ліелупе і знішчыў 5немцаў.

Указам ад 7 жніўня 1944 года старшы сяржант Ткачоў Іван Лявонцьевіч быў узнагароджаны ордэнам Славы 3-й ступені. 28 жніўня 1944 года ў раёне хутара Міславас (Латвія) ў час контрнаступлення ворага трапіў у месца распалажэння праціўніка, знішчыў агнявую кропку і з захопленага кулямёта знішчыў 10 гітлераўцаў і афіцэра. 16 кастрычніка 1944 года непадалёку ад хутара Муллі ( Мажэйкскага раёна, Літва) падчас боя ў крытычны момант узначаліў роту салдат і знішчыў звыш 10 гітлераўцаў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года старшы сяржант І. Л. Ткачоў быў узнагароджаны Ордэнам Славы 1-й ступені, стаў поўным кавалерам ордэна Славы. Пасля Перамогі застаўся ў арміі, стаў афіцэрам. Член ВКП(б) КПСС з 1945 года. У 1946 годзе ў званні лейтэнанта быў зволены ў запас. Жыў у горадзе Кемерава. Працаваў выкладчыкам у тэхнічным вучылішчы №3, затым у будаўнічай упраўе.

Памёр 6 чэрвеня 1985 года. Узнагароджаны І. Л. Ткачоў Ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, Славы 3-х ступеняў, медалямі.

## 3. *Героі Сацыялістычнай Працы*



Званне Героя Сацыялістычнай Працы з'яўляецца вышэйшым ганаровым званнем СССР, як і Званне Героя Савецкага Саюза. Званне Героя Сацыялістычнай Працы маглі атрымаць толькі грамадзяне СССР.

*Узнагарода Героя Сацыялістычнай Працы*

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 снежня 1938 года званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвойвалася таму, хто сваёй наватарскай дзейнасцю ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарце, гандлі, навуковымі адкрыццямі і тэхнічнымі вынаходніцтвамі праявілі асобыя заслугі перад Савецкай дзяржавай, садзейнічалі пад'ёму народнай гаспадаркі, навукі, культуры, росту магутнасці і славы СССР.

**Альсмік Пётр Іванавіч** (1907 - 1992 гг.)



*Альсмік Пётр Іванавіч*

Нарадзіўся ў вёсцы Выдрэя. У 1929 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў на Новаказыбкаўскай сельскагаспадарчай даследчай станцыі, у 1931-194гг. і ў 1944-1956гг. – навуковы супрацоўнік, загадчык групы, лабараторыі, намеснік дырэктара Беларускай селекцыйнай станцыі, з 1956 года загадчык з лабараторыі селекцыі бульбы Беларускага НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва. Навуковыя даследаванні ў галіне селекцыі і насенняводства бульбы. Распрацаваў методыку селекцыі бульбы, якая дазваляе ўстанаўліваць прагнозы паводзін новых сартоў у розных умовах, ствараць спрыяльныя рэжымы іх вырошчвання. Вывеў больш за 10 высокаўраджайных, з добрымі смакавымі якасцямі і вялікай (да 26%) колькасцю крухмалу сартоў бульбы: Агранамічная, Тэмп, Лошыцкая, Разварыстая. Аўтар навуковых прац "Лепшыя сарты бульбы для БССР" (1948г.), "Бульба", "Метады і вынікі селекцыі бульбы на павышанае ўтрыманне сухіх рэчаваў" (1966г.), "Селекцыя бульбы ў Беларусі" (1979 г.). Беларускі савецкі селекцыянер - бульбавод, акадэмік АН БССР, акадэмік УАСГНІЛ, член - карэспандэнт Акадэміі сельскагаспадарчых навук ГДР, доктар, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1951, 1974 гг.), Герой Сацыялістычнай Працы (1966 г.). Памёр у 1992 годзе. Пахаваны ў Мінску.

**Антонаў Аляксей Гаўрылавіч** (1922 – 1990 гг.)



*Антонаў Аляксей Гаўрылавіч*

Нарадзіўся 1 красавіка 1922 года ў вёсцы Вымна Віцебскага раёна. Удзельнік ВАВ. Узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені і дзесяццю медалямі, у тым ліку "За баявыя заслугі", медаллю Н. І. Пірагова, "Ветэран працы". Мінскі медыцынскі інстытут скончыў у 1948 годзе. З гэтага ж года становіцца загадчыкам Высачанскай участковай бальніцы, з 1958 года – галоўны ўрач гэтай жа бальніцы.

Пасля вайны Антонаў амаль дзесяць гадоў быў адзіным урачом на ўсю акругу: каля трыццаці кіламетраў у адзін бок, столькі ж – у другі, а ён адзін… Працаваў і ўдзень, і ўначы. У 1968 годзе яму прысвоена званне “Заслужаны ўрач БССР”. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1978 годзе за заслугі ў развіцці аховы здароўя. А. Г. Антонаў, напэўна, адзіны ўрач у былым СССР, які не проста працаваў у медустанове, а яшчэ да атрымання высокіх узнагарод з калегамі і жонкай пабудаваў новую двухпавярховую бальніцу на 50 ложкаў. Вырашылі зрабіць такі вялікі і добры падарунак высачанцам да 100 годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. А што здзіўляцца? Антонаў быў камуністам, ды такім, што нават тыя, хто і ў савецкія гады не асабліва верыў у ідэі Маркса-Энгельса-Леніна, паважалі яго, бо членам КПСС ён быў не на словах, а на справе. Так здарылася, што Аляксей Гаўрылавіч у 1950 годзе цяжка захварэў. І тады ён вырашыў пасадзіць тры дубкі, сказаў: “Калі дубы будуць жыць – і я буду…” Так і зрабіў. І дапамог сабе. Гэтыя дрэвы і зараз стаяць… Кожны год да бальніцы прывозілі саджанцы. І увесь медперсанал пад кіраўніцтвам Антонава саджаў ліпы, бярозы, сосны. Так каля бальніцы “вырас” найпрыгажэйшы сад. Побач з будынкам новай бальніцы па ініцыятыве доктара Антонава і настаўніка гісторыі Каралёва паставілі помнік мясцовым урачам і партызанам. Сярод загінуўшых – партызанскі доктар Ганна Мамонава, якую фашысты расстралялі з трыма маленькімі дзецьмі… А на фота – толькі яна з немаўляткам, бо іншых фотаздымкаў энтузіясты не знайшлі.

У 1980-85 гадах А. Г. Антонаў становіцца дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Памёр А. Г. Антонаў 31 мая 1990 года. Удава Аляксея Гаўрылавіча – Надзея Захараўна арганізавала на мансардзе дома героя прыватны музей памяці мужа. Тут захоўваюцца фотаздымкі, лісты з вайны, розныя пасведчанні, віншаванні, вялікая карціна на ваенную тэматыку, якую падарыў адзін з пацыентаў урача.

Напрыканцы 2004 года на базе Высачанскай бальніцы адкрылася аддзяленне кругласутачнага знаходжання састарэлых. Умовы для адзінокіх састарэлых людзей тут вельмі добрыя. А для мясцовых жыхароў пакінулі толькі ўрачэбную амбулаторыю.

**Барашкін Дзмітрый Іванавіч** (01.09. 1922 – 2004 гг.)

Нарадзіўся 1 верасня 1922 года ў вёсцы Шавялі ў сям’і селяніна. Закончыў 7 класаў Веляшковіцкай школы. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1940 годзе. У Вялікую Айчынную вайну быў удзельнікам партызанскага руху. Змагаўся ў атрадзе “Прагрэс” брыгады “Аляксея”. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медаллю “Партызану Айчыннай вайны” 2-й ступені.



*Барашкін Дзмітрый Іванавіч*

Пасля вызвалення Беларусі застаўся жыць у Мінску. Увесь пасляваенны час працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе, стаў сталяварам найвышэйшай

кваліфікацыі. Толькі са звышпланавай сталі, якую ён даў заводу, можна было б вырабіць 3 600 аўтамабіляў маркі МАЗ – 500 грузападымальнасцю 7 тон кожная. У 1958 годзе за высокія творчыя поспехі быў узнагароджаны ордэнам Леніна. У 1968 годзе Д. І. Барашкіну было прысвоена высокае званне Ганаровага грамадзяніна горада Мінска. У гэтай іпастасі ён трапіў у адну кампанію з такімі славутымі асобамі, як трохразовы алімпійскі чэмпіён, барэц Аляксандр Мядзведзь, удзельніца аперацыі па знішчэнні ката беларускага народа, гаўляйтара Вільгельма Кубе, падпольшчыца Марыя Осіпава.



Вокладкі мастацка-дакументальных кніг Алеся Савіцкага, прысвечаных Д. Барашкіну

Працоўныя заслугі нашага земляка, такім чынам, аказаліся не менш важкімі, чым алімпійскае золата праслаўленага спартсмена. Невыпадкова беларускі пісьменнік Алесь Савіцкі прысвяціў нашаму земляку дзве мастацка - дакументальныя аповесці.

А журналісцкія допісы пра яго наогул цяжка пералічыць.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 жніўня 1966 года за заслугі ў выкананні заданняў сямігадовага плана, актыўны ўдзел у стварэнні канструкцый і арганізацыі вытворчасці новых машын прысвоена высокае званне Герой Сацыялістычнай Працы з уручэннем яму ордэна Леніна і залатога медаля “Серп і молат”. Дзмітрый Іванавіч Барашкін у складзе афіцыйных дэлегацый пабываў у Англіі, Францыі, Швецыі, Чэхаславакіі. Чатыры гады з’яўляўся членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, членам Мінскага абкама КПБ.

У 1961 годзе быў дэлегатам XXI з’езда КПСС. На пенсію выйшаў у 1972 годзе. Памёр і пахаваны ў Мінску ў 2004 годзе.

## Гарачка Зінаіда Дзмітрыеўна


*Гарачка Зінаіда Дзмітрыеўна*

Нарадзілася ў 1931 годзе ў вёсцы Высачаны. Маці і бацька працавалі на мясцовай ільнопрадзільнай фабрыцы. Яе дзяцінства закончылася ў 10 гадоў. Пачалася вайна. Гэта былі часіны страшэннага, знясільваючага голаду, паколькі ў іх сям’і, якая засталася на акупіраванай тэрыторыі, не было нават агарода і харчавацца не было чым. Хадзілі і прасілі ў людзей … А ў лістападзе 1943 года іх увогуле выгналі з кватэры. Першыя гады пасля вызвалення былі не намнога лягчэйшымі.

Што ў тую пару ўяўляў сабой наш раён – агульнавядома. Потым Зінаіду Гарачку саслалі ў Германію, займацца цяжкай паднявольнай працай. У 12 гадоў

яна ўжо працавала на заводзе ў Зігене аўтагеншчыцай – зварвала медныя трубы. На ўзрост не глядзелі, шоў павінен быць зроблены бездакорнай елачкай, а змена – такая ж, як і ў дарослых, - 12 гадзін. Аднак медалём за працу ў Германіі яна была ўзнагароджана толькі ў 72 гады. Калі Зінаіда вярнулася ў вёску, яе проста не было. Усё спалілі. У 1946 годзе Зіна пераехала ў Мінск. За плячыма дзяўчынкі-падлетка было толькі 5 класаў, а дома засталася адзінокая маці. Таму, не раздумваючы, Зінаіда паступіла ў рамеснае вучылішча. Юнакі і дзяўчаты працавалі, дапамагалі ўзнімаць з руін разбураны ворагам горад.

Сваімі ўласнымі рукамі аднавілі фабрыку, на якой неўзабаве пачалі працаваць. Больш за тры дзясяткі гадоў налічвае працоўны стаж З. Д. Гарачка. Працавала майстрам вытворчасці на абутковай фабрыцы. З фабрыкай звязаны ўвесь жыццёвы лёс Зінаіды Дзмітрыеўны. Тут яна сустрэла свайго будучага мужа. На фабрыцы працавалі яе блізкія сябры, былыя вучаніцы. Менавіта за самаадданую працу на фабрыцы ў 1966 годзе З. Д. Гарачка была ўдастоена высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Ужо маючы дваіх дзяцей, Зінаіда Дзмітрыеўна паступіла ў тэхнікум лёгкай прамысловасці і паспяхова скончыла яго ў 1965 годзе. Яна навучала многіх маладых спецыялістаў сваёй любімай справе, працуючы майстрам вучылішча № 43 горада Мінска. Таксама Зінаіда Дзмітрыеўна працавала і ў музеі ваенна-працоўнай славы гэтага ж вучылішча. Шмат намаганняў прыкладала для папаўнення яго экспазіцый. Часта выступала З. Д. Гарачка на ўрачыстых сходах, вечарах перад юнакамі і дзяўчатамі, сярод вайскоўцаў. Пабывала ў Чэхаславакіі на міжнародным прафсаюзным семінары. Неаднаразова запрашалася для выступленняў у Маскву. У складзе розных дэлегацый пабывала ў Германіі, Венгрыі, іншых краінах.

За сваю добрасумленную працу З. Д. Гарачка была ўдастоена медаля ВДНГ за асваенне новых відаў тавараў, медаля “За працоўную доблесць”. А ў 1966 годзе разам з Залатой Зоркай Героя Сацыялістычнай Працы атрымала яшчэ і ордэн Леніна. З 1986 года З. Д. Гарачка на заслужаным адпачынку.

**Глядчанка Іван Арцёмавіч** (10 .07. 1918 – 1986 гг.)



*Глядчанка Іван Арцёмавіч*

Нарадзіўся 10 ліпеня 1918 года ў вёсцы Матушова. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працоўную дзейнасць пачаў у 1936 годзе ў калгасе “Інтэрнацыянал”, у 1950 – 1959 гадах працаваў у калгасе “Пражэктар”, з 1959 года – у калгасе імя Леніна. З 1945 года – брыгадзір паляводчаскай брыгады, з 1977 года – слесар малочнатаварнай фермы калгаса імя Леніна. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1949 годзе за высокія паказчыкі ў вытворчасці ільнопрадукцыі, зернавых і бульбы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, “Знак Пашаны”, медалямі. Памёр у 1986 годзе.

## Ігнатава Марыя Якаўлеўна



*Ігнатава Марыя Якаўлеўна*

Нарадзілася ў 1930 годзе ў вёсцы Паловікі ў сям'і сялян. Калі засталася без бацькі, у сям'і было яшчэ чацвёра дзяцей, і пятнаццацігадовая дзяўчынка вымушана была пайсці працаваць. З 1945 года яна ў калгасе імя Сталіна пасвіла цялят, авечак, а потым стала звеннявой па льну.

З 1956 года працавала ў саўгасе «Крынкі», які потым быў перайменаваны ў племзавод. Шырокае развіццё тут атрымала свінагадоўля, у галіне якой яна рабіла.

З 1957 па 1968 гады з'яўлялася жывёлаводам племзавода «Крынкі». Спачатку абслугоўвала матачнае пагалоўе, а праз год стала працаваць на адкорме свіней. Павышаючы сваю кваліфікацыю, знаёмячыся з дасягненнямі навукі і перадавога вопыту ў сельскай гаспадарцы, яна прыйшла да высновы, што трэба самой укараняць прагрэсіўны метад адкорму свіней. З прымяненнем новага метаду яна першая на Віцебшчыне атрымала ў месяц пудовыя прывагі свіней на адкорме. Па яе ініцыятыве ў вобласці разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва свінаводаў. У хуткім часе ў саўгасе была арганізавана школа перадавога вопыту. Марыя Якаўлеўна расказвала сваім таварышам пра перадавыя метады працы, перадавала ім майстэрства адкорму свіней. Праз год яна атрымала яшчэ адну працоўную перамогу. Яна адкарміла і здала дзяржаве 1120 свіней сярэднім весам па 90-100 кілаграмаў. У тыя гады гэта быў сапраўдны рэкорд. Да яе прыязджалі вучыцца майстэрству адкорму працаўнікі свінагадоўлі з усіх раёнаў вобласці. У 1960 годзе Ігнатавай было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы за самаадданую працу і высокія паказчыкі ў вытворчасці свініны. Праз некаторы час у племзаводзе ліквідавалі свінагадоўчую ферму. Гаспадарка стала спецыялізавацца ў іншым напрамку. Пасля гэтага Ігнатава працавала цялятніцай, даяркай.

А калі захварэла у 1968 годзе, тады і пайшла працаваць паштальёнам у Крынкаўскае аддзяленне сувязі. Ігнатава М. Я. у 1959 - 63 гады з'яўлялася Дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана ордэнам Леніна. З 1987 года знаходзіцца на пенсіі.

## Ільін Мікалай Карпавіч



*Ільін Мікалай Карпавіч*

Нарадзіўся ў 1931 годзе ў вёсцы Лысухі. Хутка бацькі пераехалі ў вёску Альхавік. Вучыўся ў сярэдняй школе №1 г. п. Лёзна. Да прызыва ў Савецкую Армію працаваў трактарыстам у МТС. Пяць гадоў службы ў радах Савецкай Арміі далі яму добрую закалку.

Пасля заканчэння воінскай службы ў 1956 годзе прыехаў працаваць у Мінск і працаваў на Мінскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў ваграншчыкам цэха мінеральнай ваты.



*Цэх мініральнай ваты (50-60г.г)*

Зараз гэты камбінат называецца вытворчае аб’яднанне “Керамін”. Мінеральную вату адпраўлялі ў розныя рэгіёны Беларусі і за яе межы. Ёй уцяплялі дамы, трубы і інш. Заданне трох гадоў дзявятай пяцігодкі выканаў датэрмінова, выпусціўшы зверх плана 8,4 тысячы кубічных метраў мінеральных вырабаў высокай якасці. Ільін заўсёды перавыконваў зменныя заданні на 115 -118%. Пры яго актыўным удзеле ў цаху праведзены работы па далейшаму ўдасканаленню тэхналагічных ліній і асваенню новых эфектыўных цеплаізаляцыйных матэрыялаў. З’яўляецца аўтарам кнігі “Заўсёды ў пошуку”, дзе ўдарнік камуністычнай працы дзеліцца сваімі думкамі з маладымі супрацоўнікамі.

У 1966 годзе Ільін М. К. за высокія паказчыкі сваёй працы быў узнагароджаны ордэнам Леніна.Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 студзеня 1974 года прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і Залатога медаля “Серп і молат”. У 2005 годзе гурткоўцы наведалі свайго земляка.




*Вокладка кнігі Ільіна У. К. ( 1974г.)*



*Сустрэча з Ільіным У. К. у Мінску (2007г.)*

## Кубліцкая Раіса Уладзіміраўна



*Кубліцкая Раіса Уладзіміраўна*

Нарадзілася 10 красавіка 1928 года ў вёсцы Калышкі. Бацькі працавалі ў калгасе “Профінтэрн”. Скончыла 8 класаў у мясцовай школе. Пасля вызвалення Калышак ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў добраахвотна пайшла працаваць у ваенны шпіталь. Узнагароджана медалямі “За ўзяцце Кёнігсберга” і “За перамогу над Германіяй”. У 1948 годзе пачынаецца яе калгасная працоўная біяграфія. Майстэрства і прызнанне прыйшлі не адразу.


СОЮЗ СОВЕТСКИХ СОЦИАЛИСТИЧЕСКИХ РЕСПУБЛИК

ГЕРОЮ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ТРУДА

Тов. Кублицкой Раисе Владимировне

За выдающиеся успехи, достигнутые во Всесоюзном социалистическом соревновании, и проявленную трудовую доблесть в выполнении заданий девятой пятилетки и принятых обязательств по увеличению производства и продажи государству продуктов земледелия и животноводства ПРЕЗИДИУМ ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР УКАЗОМ от 10 марта 1976 г. ПРИСВОИЛ ВАМ ЗВАНИЕ ГЕРОЯ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ТРУДА С ВРУЧЕНИЕМ ОРДЕНА ЛЕНИНА И ЗОЛОТОЙ МЕДАЛИ „СЕРП И МОЛОТ“.

Председатель Президиума Верховного Совета СССР

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР

Москва, Кремль. 10 марта 1976 г.

*Пасведчанне Героя Сацыялістычнай працы Кубліцкай Раісы Уладзіміраўны (1976 г.)*

У 1960 годзе ёй былі даверaны абавязкі звеннявой па вырошчванні лёну. На гэтай пасадзе ў калгасе імя Калініна адпрацавала да 1983 года. У 1967 – 1971 гадах абіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1975 годзе звяно Кубліцкай Раісы Уладзіміраўны дасягнула вельмі высокіх паказчыкаў у вытворчасці льнопрадукцыі: з кожнага гектара на плошчы ў 41 га было атрымана па 6 ц ільносемя і па 8,7 ц ільнавалакна. Чысты прыбытак ад вырашчанага льну склаў больш за 80 тысяч рублёў. У пераліку на тагачасны валютны курс гэта амаль 90 тысяч амерыканскіх даляраў.

У 1976 годзе за працоўныя заслугі было прысвоена званне Герой Сацыялістычнай Працы. У 1983 годзе выйшла на пенсію, але працягвала працаваць на паляводстве. Ёй прысвоена званне Заслужаны калгаснік. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.



**Самойлаў Іван Савельявіч** (05. 05. 1924 – 12. 01. 2006)

Нарадзіўся 5 мая 1924 года ў вёсцы Засігава. Працоўную дзейнасць пачаў у 1938 годзе ў сельскай гаспадарцы раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Ленінградскім фронце. З 1948 года працаваў паляводам, з 1951 года – брыгадзір поляводчай комплекснай брыгады калгаса “ Новае жыццё”. Яго брыгада з года ў год дабівалася высокіх паказчыкаў па вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і расценяводства.

*Самойлаў Іван Савельявіч*

Званне Героя Сацыялістычнай працы прысвоена ў 1973 годзе за поспехі ў павелячэнні вытворчасці і продажы дзяржаве прадуктаў земляробства. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975 – 1980 гадоў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. На заслужаным адпачынку з 1989 года, працягваў працаваць загадчыкам склада, прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна. Памёр 12 студзеня 2006 года.

**Шалупкіна Марыя Іванаўна** (15. 07. 1913 – 1994 гг.)



Нарадзілася 15 ліпеня 1913 года ў вёсцы Бржэзова. З 1943 года працавала паляводам, жывёлаводам, звеннявой па вырошчванні льну, у 1958 – 1970 гадах – брыгадзірам комплекснай брыгады калгаса "Новае жыццё". Брыгада пад яе кіраваннем дабілася высокіх паказчыкаў у вытворчасці прадукцыі, у першую чаргу льна, неаднаразова выходзіла пераможцам у спабортніцтве сярод ільнаводаў раёна і вобласці. У 1965 годзе брыгада сабрала самы багаты ўраджай далгунца, было атрымана каля 100 тысяч рублёў чыстага прыбытку. Шалупкіна М. І. з'явілася

*Шалупкіна Марыя Іванаўна*

ініцыятарам арганізацыі ўкаранення навукова – абаснаванай сістэмы ўгнаення палёў, сартавога семенаводства высокай культуры земляробства, першай у раёне асвоіла правільны севазварот і кожны год збірала па 35 – 40 ц клевернага сена з гектара.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 годзе за поспехі ў павелічэнні вытворчасці льнопрадукцыі і выкарыстанні перадавой тэхналогіі. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Калі выйшла на заслужаны адпачынак , жыла ў горадзе Віцебску. Памерла ў 1994 годзе.

**Эзерын Марыя Андрэеўна** (1911 – 05.10. 1976 гг.)



Нарадзілася ў 1911 годзе ў вёсцы Матушова.

З 1930 па 1966 гады працавала ў калгасе "1 мая" ( да 1959 года – калгас "Інтэрнацыянал") паляводам, брыгадзірам, з 1959 года – звеннявая ільнаводчага звяна. Па ініцыятыве Эзерын Марыі Андрэеўны ў калгасе быў арганізаваны збор залы пад лён, раскарчоўка і распахванне заросшых зямель.

У 1948 годзе яе звяно атрымала 7 ц ільносемя і па 8 ц ільновалакна з кожнага гектара.

Ураджай быў сабраны своечасова, паспяхова была праведзена первічная апрацоўка, перапрацавана траста на валакно і з добрай якасцю здана дзяржаве.

*Эзерын Марыя Андрэеўна*

Званне Героя Сацыялістычнай Працы Эзерын М. А. прысвоена ў 1949 годзе за самаадданую працу, высокія паказчыкі па вырошчванні льна. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Памерла 5 кастрычніка 1976 года.

***Пытанні і заданні:***

*1. Назаві вышэйшую ўзнагароду Вялікай Айчыннай вайны.*
*2. Хто быў поўным кавалерам Ордэнаў Славы?*
*3. Якая вышэйшая ўзнагарода за працу была ў СССР?*

## §31. Традыцыі роднага краю

### 1. *Народныя святы і абрады*

**Традыцыі** – павер'і ці паводзіны, якія перадаюцца ў межах групы або грамадства і маюць сімвалічнае значэнне і сувязь з мінулым. Традыцыі могуць захоўвацца і развівацца на працягу тысяч гадоў. Слова традыцыя паходзіць ад лацінскага і літаральна азначае: перадаваць ці аддаваць на захоўванне.

Наш край славіцца сваёй багатай народнай культурай, якая бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці. Паколькі асноўнымі заняткамі жыхароў былі раней земляробства і жывёлагадоўля, то абрады і звычаі людзей вельмі цесна звязаны з гадавым цыклам.

Вылучаюць зімовыя, веснавыя, летнія і восеньскія святы прысвяткі. Абрады зімовага цыкла (Каляды) былі скіраваны на тое, каб загадзя паўплываць на будучы ўраджай і звязаны з ім дабрабыт сям'і. Галоўнае месца належала каледаванню, калі вясёлы гурт пераапранутай моладзі хадзіў па хатах з пажаданнямі шчасця і дабра гаспадарам. У каталікаў быў пашыраны падобны абрад "Тры каралі".



*Свята Масленіца ў XIX стагоддзі*

На зімовыя святкі ладзілася старадаўняя гульня "Жаніцьба Цярэшкі". Канец зімы ( "Запусты", зараз "Масленіца") – моладзь адзначала катаннем на конях, на санках, зімовымі гульнямі. Вясной святкавалі Вялікдзень (Вяліканне, Велькандзень), Юр'е, Радаўніцу. Калі людзі, памінаючы памерлых, прасілі благаслаўлення для дзяцей і сябе.



*Свята Купалле ў XXI стагоддзі*

Летнія традыцыйныя святы ўслаўлялі велічнасць прыроды, божы дар жыцця. Галоўнае свята лета – Купалле. Ноччу палілася вялікае вогнішча, вакол якога моладзь вадзіла карагоды, гуляла, скакала праз агонь, танцавала.

Дзяўчаты варажылі: плялі вянкі і пускалі іх па рацэ. Адчайныя хлопцы хадзілі ў лес шукаць папараць – кветку. У гэты ж дзень збіралі лекавыя травы.

Сярод восеньскіх народных свят добра вядомы Пакровы і Асяніны – Змітраўскія дзяды. На Асяніны збіраліся родзічы і ішлі на могілкі, каб памянуць памерлых. Вечарам рабілі жалобны стол з багатай куццёй.

## *2. Традыцыі выяўленчага мастацтва і рамяства*

Традыцыі выяўленчага мастацтва на Лёзненшчыне пэўна бяруць пачатак ад нашых землякоў – мастакоў, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё мастацтву. Мабыць, ад сусветна - вядомага мастака М. З. Шагала, А. Б. Заборава, Я. А. Голубева, М. Д. Міхайлава, Л. І. Шакінкі, І. І. Собалевай. Многія з іх на сваіх палотнах змяшчаюць родныя прасторы, будынкі і людзей нашай Лёзненшчыны.

**Голубеў Якаў Андрэевіч – мастак, пейзажыст, член Ленінградскага Саюза мастакоў**



*Голубеў Якаў Андрэевіч.*

Нарадзіўся **30 снежня 1913 года** ў весцы Веляшковічы Віцебскай губерні. Ен быў малодшым сынам у вялікай і дружнай сялянскай сям'і. Любоў да мастацтва ўзнікла вельма рана. Калі яму было трынаццаць год, сястра, якая жыла ўжо ў Ленінградзе, перавезла брата да сябе. У Ленінградзе ён скончыў школу, затым некалькі год займаўся ў гуртку жывапісу пры клубе завода «Чырвоны пуцілавец», а ў 1934 годзе быў прыняты ў падрыхтоўчыя класы Інстытута жывапісу, скульптуры і архітэктуры Усерасійскай Акадэміі. З 1935 -1941 гады вучыўся ў ЛІЖА імя Рэпіна ў А. Рылава, М. Ф. Федарава. Удзельнік выставак з 1937 года. Жыццё склалася так, што ен не змог атрымаць вышэйшую мастацкую адукацыю. У гады Велікай Айчыннай вайны ен ваяваў, двойчы быў цяжка паранены. З 1947 года аддаўся сваей любімай справе: працаваў мастаком. Член Саюза мастакоў РСФСР з 1947 года. У 1960 годзе стаў членам Саюза мастакоў СССР.



*Дом мастака. Мал. Голубева Я. А. (1964г.)*



*Рэчка. Мал. Я. А. Голубева (1964г.)*

Яго карціны: «Спакойны дзень» (1951), «Авдиво» (1953), «Распогоживается» (1954), «Брамка» (1955), «Ля Белага мора», «Малая сопка», (абодва 1956), «Нюд-гара», «Домік Леніна ў Краснаярску», «Пачатак сакавіка»[7] (усе 1957), «Ускраіна Белазёрска» (1958), «Краснаярскія слупы» (1960), «Вясна на Кольскім паўвостраве» (1961), «Лясныя кветкі», «Зімовыя карункі» (абедзве 1962), «Позняя восень» (1963), «Блакітная вада» (1965), «Вясновая трава», «Веснавы матыў» (абедзве 1968), «Вербы квітнеюць», «Затока», «Ручай» (усе 1969), «Бярозавы пераснік», «Заснежаныя берагі» (абедзве 1972). Яго творы знаходзяцца ў музеях і прыватных зборах Расіі, Японіі, Італіі, Германіі, Францыі. Памёр **19 мая 1973 года** ў Ленінградзе.

**Міхайлаў Міхаіл Дзмітраевіч – беларускі мастак, член Беларускага Саюза мастакоў**

Нарадзіўся **22 лістапада ў 1922 годзе** ў вёсцы Дуброўка. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча ў 1941 годзе. Працаваў у стылі станкавага жывапісу ў жанрах тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа.



*Міхайлаў Міхаіл Дзмітраевіч*

Член Беларускага Саюза мастакоў. Жыў у Віцебску.

Сярод яго твораў: «Дзвіна» (1947 г.), «Вясенні вечар» (1950 г.), «Сувязная» (1957 г.), «Партрэт трактарыста Іваноўскага М. В.» (1960 г.), «Медсястра» (1961 г.), «Над Лучосай» (1962 г.), «Лукомль» (1967 г.), «На Дзвіне» (1968 г.), «Віцебскі мост» (1969 г.), «Жажда» (1975 г.), «Возрождение» (1978 г.), «Сонечны дзень» (1983 г.),” Рассвет” (1984 г.), «Залатая восень» (1988г.)«Пастух»,«Сосны на берагу»,«В голубой дали».

Памёр у 1993 годзе.

У канцы XX стагоддзя сярэдняя школа №2 гарадскога пасёлка Лёзна нейкі час была школай з мастацкім ухілам. У ёй працавала таленавітая настаўніца выяўленчага мастацтва **Собалева Ірына Іванаўна**.



*Собалева Ірына Іванаўна*

Яна па апісанню намалявала царкву Узнясенне Гасподня, пабудаваную яшчэ князямі Агінскімі і разбураную ў 1962 годзе. Зрабіла шмат малюнкаў да краязнаўчага маршруту “Край герояў, творцаў і вучоных”. Займалася падрыхтоўкай картаграфічнага матэрыялу да праекта.

Цікавыя карціны былі створаны Яшковым Алегам, Грабнёвай І. А. (выпускнікамі гэтай школы), А. Д. Каваленкам. Настаўнік выяўленчага мастацтва Васіленка Аляксандр Паўлавіч у кабінеце гісторыі СШ №1 намаляваў насценнае пано “Над Лёзнам” .







*Будынак СШ №2 г. п. Лёзна* *“Над горадам Лёзна ”. Карціна Собалевай І. І. ( 2011г.)*

У стылі графікі на выставу ў **2015 годзе** былі прадстаўлены карціны маладога мастака Раённага ваенна - гістарычнага музея **Ганны Кулаковай.** На яе карцінах змешчаны амаль усе галоўныя сучасныя будынкі нашага Лёзна, яны настолькі падобныя, што здаюцца сфатаграфаванымі.







*Выстава творчых работ Г. У. Кулаковай (2015г.)* *Царква і музей на вул. Леніна(2016г.)*

Вельмі цікавы чалавек зараз працуе ў Доме рамёстваў – **Седнява Тамара Аляксандраўна.**

Якія прыгожыя карціны стварае гэта таленавітая жанчына. Мала таго, яна яшчэ піша вершы і нават выдала сваю кнігу **“Восеньскі букет”**.







*Седнява Тамара Аляксандраўна.* *Карціны Седнявай Тамары Аляксандраўны ( 2014г.)*



*Калектыў Дома рамёстваў у г.п. Лёзна( 2015г.)*

Нацыянальныя традыцыі нашага раёна адраджае **Дом рамёстваў**, створаны **1 студзеня 1995 года.**

Нязменным загадчыкам яго з'яўляецца **Самусенка Іна Міхайлаўна**. Там працуе творчы, працавіты калектыў.

Зараз там шыюць касцюмы, характэрныя для нашага рэгіёну, вышываюць рушнікі, займаюцца саломапляценнем, лозапляценнем, дэкупажам.



*Аднаўленне рушнікоў*



*Выстава ў доме рамёстваў*



*На славянскім базары ў Віцебску*

Дом рамёстваў ёсць таксама і ў вёсцы Дабрамыслі, дзе займаюцца лозапляценнем і саломапляценнем.



*Выстава лазапляцення. Дабрамыслі (2016г.)*



*Бабінавіцкая цацка – свістулька*

Не страчаны ў нашым раёне традыцыі ганчарства, пачатыя **М. М. Траяноўскім** – свістулькі бабінавіцкай керамікі. У музеі Бабінавіцкай Сярэдняй школы існуе гурток па вырабу цацкі – свістулькі. Кіраўніком гуртка з'яўляецца Ірына Аляксандраўна Варона.

## 3. *Традыцыі фальклорнага і тэатральнага мастацтва*



*Агеева Раіса Сяргееўна*

Фальклорна - этнаграфічны ансамбль **"Медуніца"** быў створаны **Раісай Сяргееўнай Агеевай** у **1989 годзе**.

У склад ансамбля ўваходзілі мясцовыя жыхары розных узростаў, у тым ліку пенсіянеры і вучні 4-5 класаў. Мы з мужам нейкі час таксама былі ўдзельнікамі адаменскага хору. За 21 год працы на пасадзе загадчыка аддзела культуры Агеева Раіса Сяргееўна стварыла 17 хароў, 12 фальклорных груп, 16 вакальных ансамбляў.

У **1993 годзе** яе справу прадоўжыла **Макравусава Ганна Фёдараўна** – салістка ансамбля "Медуніца", якая спявае вельмі натуральна і непасрэдна. Такім чынам, традыцыйныя беларускія песні і сёння жывуць у народзе сваім самастойным жыццём.



*Макравусава Ганна Фёдараўна*



*Сустрэча з Георгіем Калдуном (2012г.)*

У **2012 годзе** фальклорны калектыў ДК аграгарадок Адаменкі "Медуніца" удзельнічаў у рэспубліканскім праекце **"Песні маёй краіны".**






*Фальклорны калектыў ДК аг. Адаменкі "Медуніца"(2012г.)*

Народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік ансамбля "Сябры" **Анатоль Ярмоленка** аб артыстах "Медуніцы" сказаў наступнае: "Мы вельмі ганарымся тым, што ў нашых маленькіх вёсачках ёсць такія калектывы, якія могуць выступаць на любой сцэне". І сапраўды без нашай "Медуніцы" не праходзіць ні адно свята ў раёне. Вельмі ганаровым для калектыву было выступленне на

**ОНТ** у музычнай праграме **“Эстрадны кактэйль”**, дзе ўдзельнікі калектыву сустрэліся з артыстам беларускай эстрады **Георгіем Калдуном** і пераможцамі дзіцячага Еўрабачання **Ксеніяй Сітнік** і **Андрэем Кунцом.**





*Ансамбль “Медуніца” на ОНТ. Мінск (2012г.) “Медуніца” ў РФ горадзе Дзямідаў(2014г.)*

Пад час правядзення Міжнароднага фестывалю **Славянскі базар у Віцебску ў 2015 годзе** калектыў быў удзельнікам музычнага прадстаўлення “Брэнд Лёзненшчыны”. Калектыў “Медуніца” часта выступае ў гарадах і мястэчках Расійскай Федэрацыі.

Вельмі любяць лёзненцы народны **тэатр “У пошуку…”,** кіраўніком якога з’яўляецца **Цыганкоў Генадзь Васільевіч**, які прадаўжае традыцыі народнага тэатральнага мастацтва, пачатыя настаўнікам **Вугалевым В. В.**

Тэатр **“У пошуку…”** створаны быў яшчэ ў **1998 г.**, тады і адбылася пастаноўка першай п’есы Аляксандра Галіна **“Рэтра”**. У спектаклі ўдзельнічалі лёзненцы: – настаўнікі Сухаруцкая Галіна Пятроўна, Курбацкая Ала Уладзіміраўна.



*Цыганкоў Генадзь Васільевіч*

Генадзь Васільевіч заўсёды ведае, які чалавек сыграе тую ці іншую ролю лепш за ўсіх, і ён ні разу не памыліўся. З тых часоў і па сённяшні дзень **народны тэатр “У пошуку…”** абапіраецца на сістэму Станіслаўскага, імкнецца быць шчырым і пераканаўчым. І ўвесь гэты час прыходзяць новыя ўдзельнікі, развіваюцца індывідуальныя акцёрскія



*Першая пастаноўка п’есы “Рэтра”(1998г.)*

здольнасці вопытных акцёраў. На прэм'еру, як правіла, прыходзяць паўтары – дзве сотні гледачоў, якія маюць рэдкую магчымасць "ужывую" сутыкнуцца з мастацтвам тэатра.

Усім запомніліся спектаклі **"Итальянские страсти"** (1999г.), **"Двери"** (2002г.), **"Холодное Сердце"** (2005г.), **"Страсти по Авдзею"** (2006г.), **"Забыть Герострата"** (2008г.), **"Эта странная миссис Сэвидж"** (2012г.) і шмат іншых, а таксама цудоўнае свята **"На балі ў Рыпінскага"**.








*Удзельнікі балю ў Рыпінскага* *Сцэны са спектакляў (пач.XXI ст.)*

Хочацца яшчэ нагадаць пра п'есу Людмілы Разумоўскай **"Дарагая Алена Сяргееўна"** у якой удзельнічала сама са сваімі сынамі.





*Удзельнікі п'есы "Дарагая Алена Сяргееўна". ( 2001г.)*

Пастаноўка п'есы адбывалася не на сцэне, а ў памяшканні з некалькімі пакоямі і гледачамі (амаль як у кіно). На прэм'еру спектакля былі запрошаны вучні стэрэйшых класаў школ нашага горпасёлка, і выконвалася яна ў памяшканні былой школы на вуліцы Леніна. Гэта ўсё задумкі рэжысёра Генадзя Васільевіча Цыганкова. Пастаноўка мела вялікі поспех.

Амаль кожны год рэжысёр – Цыганкоў Генадзь Васільевіч знаходзіць таленавітых народных артыстаў і ставіць усё новыя і новыя п'есы.

## *4. Літаратурныя традыцыі. Пісьменнікі і паэты Лёзненшчыны*

**Свірыдаў Сяргей Аляксеевіч – рэдактар падпольнай газеты партызанскай брыгады А. Ф. Данукалава, рэдактар раённай газеты “Ленінскі сцяг”, вядомы пісьменнік.**



*Свірыдаў Сяргей Аляксеевіч*

Свірыдаў Сяргей Аляксеевіч, адзін са старэйшых журналістаў і пісьменнікаў Беларусі, нарадзіўся **16 ліпеня 1912 года ў вёсцы Анупрыянкі** Дабрамыслінскай воласці Аршанскага павета (цяпер Лёзненскі раён) у беднай сялянскай сям’і. Скончыў сямігодку і Віцебскі педагагічны тэхнікум. Пяць гадоў настаўнічаў у родных мясцінах. У 1935 годзе паступіў у інстытут журналістыкі. Пасля заканчэння працаваў у “Піянеры Беларусі”. Тут надрукаваў першыя апавяданні. У 1938 – 1940 гадах служыў у арміі (супрацоўнік **дывізійнай** газеты).

Пасля дэмабілізацыі працаваў у газеце “Красноармейская правда”, з якой паехаў на фронт. Пад Смаленскам быў паранены і кантужаны. Не мог выйсці з акружэння. Стаў партызанам у брыгадзе Аляксея Данукалава. Рэдагаваў партызанскую газету “Кліч партызана”. Працаваў намеснікам рэдактара і адказным сакратаром падпольнай газеты “Віцебскі рабочы”, рэдагаваў лёзненскую газету “Ленінскі шлях”. Пасля вайны літсупрацоўнік і загадчык аддзела у “Звяздзе”, “Настаўніцкай газеце”, часопісе “Сельская гаспадарка Беларусі”.

Сяргей Свірыдаў працуе ў жанры мастацкай прозы, драматургіі. Напісаў 15 п’ес, з іх 5 – шматактных. Сярод іх – “**На мяжы”, “Цені знікаюць”, “Аперацыя Сабіна”, “Паланянка”**. Амаль усе п’есы друкаваліся ў зборніках, пастаўлены прафесійнымі тэатрамі ці самадзейнымі калектывамі. Сяргей Свірыдаў – аўтар зборнікаў апавяданняў **“Загадкавы стрэл”, “Праз полымя”, аповесцяў “Крылаты гальштук”, “Калі раскрываліся крылы”, “Крык душы”.** Памёр у 2004 годзе.

**Чарткоў Уладзімір Яфімавіч – член Саюза пісьменнікаў і член Саюза журналістаў Расіі**



*Чарткоў Уладзімір Яфімавіч*

Нарадзіўся ў вёсцы Зубкі ў 1934 годзе Лёзненскага раёна. Член Союза пісьменнікаў Расіі, член Союза журналістаў Расіі, празаік, публіцыст, Ганаровы палярнік СССР. Адзін з лепшых журналістаў Савецкага Саюза ў 1985 годзе. Шмат год працаваў у газеце «Правда», пісаў аб Арктыцы.
Аўтар некалькіх кніг. Жыве ў Маскве.

**Левін Барыс Міхайлавіч – совецкі пісьменнік, празаік, кінасцэнарыст.**

Нарадзіўся ў вёсцы Загарадна **5 студзеня 1899 года** Віцебскай губерні. Пад час Грамадзянскай войны ваяваў ў Чырвонай Арміі, быў палкавым камісарам, членам трыбунала – Петраградскай ваеннай акругі. Пасля вайны – журналіст і літаратар, працаваў у газеце «Известия» з 1927 па 1932 гады, з 1932 года быў літаратурным супрацоўнікам газеты «Правда». Скончыў фізіка - матэматычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта ў 1930 годзе. Член Союза псьменнікаў СССР з 1934 года. З 1939 года быў спецыяльным карэспандэнтам «Красной звезды». Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі, знаходзіўся на фінскім фронце. Загінуў **6 студзеня 1940 года** ў баю пад вёскай Суомуссалмі ў Фінляндыі, там і пахаваны.



*Левін Барыс Міхайлавіч*

Аўтар кніг “Жили два товарища” (1931год) і рамана “Юноша” 1932-33 гадоў выдання, якія падвяргаліся рэзкай крытыцы з боку РАПП. Пасля вайны амаль забыты. Апошняе кніжнае выданне выходзіла ў 1957 годзе.

**Лісіцын Уладзімір Сяргеевіч – беларускі паэт**

Нарадзіўся Уладзімір Лісіцын **13 красавіка 1944 года ў фашысцкім канцлагеры**, а павінен быў нарадзіцца ў лясной спакойнай старане на Лёзненшчыне ў вёсцы Пагосцішча. Але лясная старана забылася на спакой, яна стала партызанскім краем, бо ішла вайна. Бацька будучага паэта звязаў свой лёс з народнымі мсціўцамі.
Апошнія гады жыцця Уладзімір жыў у Джанкоі, дзе смерць застала яго за пісьмовым сталом, бо працаваў апошні час днямі і начамі, прыйшоўшы дадому са школы, ён “вёў працу”. Так, яму змалку знаёма гэтае слова. Сякера ў марозным лесе і на ўдовіным дварышчы, адбойны малаток на шахтах Данбаса, аўтаручка журналіста былі яму заўсёды блізкія, звычайныя, будзённа – святочныя…



*Лісіцын Уладзімір Сяргеевіч*

Уладзімір Лісіцын скончыў педагагічнае вучылішча, вучыўся завочна нейкі час у Літаратурным інстытуце імя Максіма Горкага ў Маскве. Завочна скончыў Беларускі тэатральна – мастацкі інстытут, напісаў дысертацыю па тэатры. Уладзімір Лісіцын мала жыў у Беларусі, але дзе б ні быў, зноў і зноў вяртаўся ў свой родны кут, дзе прайшло яго самае светлае пасляваеннае дзяцінства і юнацтва, у - вёску Пагосцішча нашага раёна.

Але жыў выдатны творца нядоўга. Ён памёр у **1973 годзе** ў горадзе Джанкой, не дажыўшы да трыццаці.

Не ўбачыў паэт і сваёй першай кнігі **"Жураўлінае вясло"**, якая выйшла пасля смерці Уладзіміра Лісіцына ў 1974 годзе. Сумную прадмову да яе пісаў Рыгор Барадулін. Уключаныя ў яе вершы прысвечаны роднаму краю, яго прыродзе, каханню. Ім уласціва яркая вобразнасць, філасафічная заглыбленасць, вялікі зарад жыццёвасці, песеннасць, афарыстычнасць.

У паэме **"Дзірваны"** апавядаецца пра цяжкі лёс беларускага хлопчыка ў гады вайны. Друкавацца пачаў у 1964 годзе: першы верш "У драмгуртку" апублікаваны ў газеце "Віцебскі рабочы". Потым яго вершы з'яўляліся ў газетах "Голас Радзімы", "Мінская праўда", "Вячэрні Мінск", часопісах "Нёман", "Вожык", "Маладосць", зборніку "Дзень паэзіі"У 1990 годзе выдадзена яшчэ адна кніга паэзіі нашага земляка **"Беларусь - мая калыска"**, куды ўвайшлі вершы з папярэдняга зборніка І многія раней не апублікаваныя творы Уладзіміра Сяргеевіча Лісіцына.

## Бандарэнка Уладзімір Карпавіч – мясцовы паэт і краязнаўца


*Бандарэнка Уладзімір Карпавіч*

Нарадзіўся **15 чэрвеня 1939 года** ў вёсцы Крынкі. Пачатковую адукацыю атрымаў у сельскай школе. У 1961 годзе скончыў гісторыка – філалагічны факультэт Мінскага педінстытута. Да 1971 года працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў гарадскім пасёлку Свіслач Пухавіцкага раёна. З 1971 па 1988 гады быў настаўнікам на рагачоўшчыне. З 1996 года жыў у г.п. Лёзна, дзе і памёр у **2001 годзе**. Уладзімір Карпавіч Бандарэнка пісаў вершы на рускай і беларускай мовах, якія выдаваліся ў Мінску, Смаленску, Рудні, у абласных цэнтрах Беларусі. Як і кожны чалавек любіў родныя мясціны, дзе прайшлі яго дзіцячыя гады. Менавіта Крынкам ён прысвячаў не адзін са сваіх вершаў.

Шмат вершаў паэт прысвяціў каханню, сярод якіх – вершы-прысвячэнні першаму каханню Уладзіміра Карпавіча – Валянціне Петрачковай, актрысе тэатра Якуба Коласа. Уладзімір Карпавіч нарадзіўся на Беларусі, ён вельмі любіў Радзіму, беларускую мову, якую ён лічыў самай прыгожай у свеце.

Але ж Уладзімір Карпавіч не толькі паэт, ён друкаваў свае артыкулы ў газеце "Сцяг перамогі". Дзякуючы яму, людзі даведаліся, што на Лёзненшчыне жылі такія цудоўныя жыхары, як І. П. Усачанка, А. Я. Шчамялёў і многія іншыя. З артыкулаў Уладзіміра Бандарэнкі можна даведацца аб цікавых звестках з гісторыі нашага краю. Напрыклад, аб тым, што славуты паэт А. С. Пушкін праязджаў праз нашы мясціны, або аб тым, што на Лёзненшчыне да прыходу славян жылі угра - фіны. Ён знайшоў спіс яўрэяў, растраляных у адаменскім гаі. Выдаў сваю кнігу **"Запаветнае".**

**Пацыенка Генадзь Барысавіч – пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Расіі і Беларусі, ганаровы акадэмік Пушкінскай Акадэміі, ганаровы грамадзянін Беларусі.**

Нарадзіўся **25 жніўня 1937 года** ў вёсцы Зубакі. Тут жа скончыў 4 класа, а затым сямігодку ў Дабрамыслях. Вучыўся ў ФЗУ чыгуначнікаў у Віцебску. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Гродна. З 1954-га па 1956-ы гады працаваў на цаліне, пасля чаго вярнуўся ў Гродна. Неўзабаве быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Служыў танкістам на Далёкім Усходзе. Далёка ад Радзімы па-новаму зірнуў на родную Беларусь, Лёзненшчыну, ацаніў яе непаўторнасць. Масквіч, але больш жыве ў радавым гняздзе, чым у расійскай сталіцы. Яго матэрыялы часта публікуюцца ў часопісе «Беларуская думка».



*Пацыенка Генадзь Барысавіч*

Аўтар больш за дзясятак кніг. Супрацоўнічаў з газетай "Гродзенская праўда». У тыя гады яе ўзначальваў Васіль Быкаў. Ён звярнуў увагу на творчасць нашага земляка і ў 1961 годзе адправіў яго на з'езд маладых пісьменнікаў Беларусі ў Мінск. У гэтым жа годзе з рэкамендацыйным лістом ад Васіля Быкава і Івана Шамякіна Г. Б. Пацыенка адправіўся ў Маскву паступаць у літаратурны інстытут імя Максіма Горкага. Нягледзячы на велізарны конкурс (85 чалавек на месца), быў залічаны на першы курс, прычым адзіны з нашай рэспублікі. Пасля Літінстытута скончыў аспірантуру.

Працаваў загадчыкам аддзела рэдакцыі часопіса «Маладая гвардыя», выкладаў у літаратурным інстытуце. З 1972-га па 1980-ы год узначальваў рэдакцыю "Раман-газеты". Нейкі час з'яўляўся дарадцам Міністэрства па справах нацыянальнасцяў Расійскай Федэрацыі. Гэты перыяд быў цесна звязаны з Паўночным Каўказам. Свае назіранні аб «чачэнскай бойні" пісьменнік выклаў у кнізе **«Дні сярод маланак»**. За гэтую кнігу ў лістападзе 1995 года наш зямляк ўдастоены звання Ганаровага акадэміка Пушкінскай Акадэміі.

Асобнай кнігай у Маскве выйшла аповесць **«Пакуль куля ляціць"**, за якую Генадзь Барысавіч быў узнагароджаны срэбным медалём Міжнароднага Саюза славянскіх журналістаў.

Па ініцыятыве Г. Б. Пацыенка быў падрыхтаваны адмысловы выпуск часопіса **"Жыццё нацыянальнасцяў"** (№ 1, 1997), прысвечаны адукацыі саюза Расіі і Беларусі. Для творчасці гэтага пісьменніка характэрна шчырасць. Яго творы пра людзей рознабаковых, маральных, мудрых, якія захоўваюць вартасці ў самыя супярэчлівыя і цяжкія часы.

У **2007 годзе** ў Віцебску быў выдадзены( дарэчы, упершыню на радзіме) двухтомнік Г. Б. Пацыенка **«Выбранае»**, куды ўвайшло ўсё лепшае, што было напісана аўтарам за гады творчай працы.

У цяперашні час Генадзь Барысавіч жыве і працуе ў родных Зубаках. Яго творы працягваюць абуджаць у нас добрыя пачуцці.

**Салодкая Надзея Стэфанаўна – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаурэат Літаратурнай прэміі Уладзіміра Караткевіча.**



*Салодкая Надзея Стэфанаўна*

Нарадзілася ў вёсцы **Шэркіна** ў **1947 годзе.** Маці, Кастрыцкая Любоў Міхайлаўна, настаўнічала ў мясцовай пачатковай школе. Бацька, Стэфан Нічыпаровіч, працаваў у калгасе. У 1864 годзе Надзея скончыла 8 класаў у беларускай сярэдняй школе №1 г.п. Лёзна. Пасля сканчэння Полацкага медыцынскага вучылішча працавала лабарантам у паліклініцы Глубокскага раёна. У 1971 годзе пераехала з сям'ёй у Полацк. Працавала машыністкай у рэдакцыі гарадской газеты "Сцяг камунізму". Першыя вершы Надзеі ўбачылі свет у 1966 годзе. За гэты год выйшлі шэсць кніг паэзіі: **"Я ішла да цябе", "На ўзлёце малітвы", "Свечка жаліцца небу", "На краю зімы", "Горсточка лета", "Апошняя квадра".** Надзея вельмі лёгка піша вершы на рускай і беларускай мовах. Вершы яе вельмі напеўныя. Песні на вершы Надзеі выконваюць Ірына Дарафеева, Георгій Калдун, Ізмаіл Капланаў, Алег Сямёнаў, Марына Васілеўская, Паліна Смолава, ансамбль "Бяседа", Анжэла Макарава і многія іншыя.

Кожны верш Надзеі Салодкай ідзе ад душы і сэрца, у кожны вобраз яна укладвае сябе і шчыра дзеліцца сваімі думкамі з чытачамі. Вершы яе звернуты да Бога, людзей, прыроды. Вершы - замалёўкі, вершы - роздумы, вершы - споведзь, вершы - крык душы – усё на спачуваннях, на эмоцыях.

**Пахолкіна Людміла Васільеўна – паэт, журналіст, рэдактар мясцовай газеты "Сцяг перамогі".**



*Пахолкіна Людміла Васільеўна*

Нарадзілася **3 студзеня 1952 года** ў горадзе Асінторф Аршанскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Скончыла Бабінавіцкую сярэднюю школу. З 90 –х гадоў Людміла Васільеўна Пахолкіна жыла ў гарадскім пасёлку Лёзна разам са сваёй сям'ёй мужам і трыма дзецьмі. Журналіст, яна была галоўным рэдактарам газеты «Сцяг перамогі", але перайшла мяжу паміж тым, што робіць газетчык, і тым, што наканавана літаратару. Сёння цяжкі час для грамадства, а для паэзіі – асабліва, таму ў ёй застаюцца тыя, хто не можа жыць без напісання вершаў, у каго асабліва баліць душа, каму ёсць што распавесці.

Больш за дваццаць гадоў яна выступала ў друку з артыкуламі і вершамі. Паэзія Людмілы Васільеўны перадае яе любоў да роднага краю, да тых месцаў, дзе яна нарадзілася і вырасла.

Яе захапленне жыццём, замілаванне прыродай, душэўнасць, пачуццё болю і перажывання за чалавека не можа не ўсхваляваць кожнага.

Памерла Пахолкіна Людміла Васільеўна **23 верасня 2015 года**.

## Сухаруцкая Галіна Пятроўна – самадзейная паэтка, настаўніца

Чарговы зборнік вершаў самадзейнай паэткі Галіны Пятроўны Сухаруцкой нездарма пабачыў свет у красавіку. Ён – як вясновая паводка, які аб'яднаў ручаі ў шырокую плынь, аб'яднаў у сабе вершы, напісаныя аўтарам у розныя гады з нагоды розных жыццёвых абставін. У іх – разважанні пра Радзіму, успаміны аб ваенным ліхалецці, разважанні аб прызначэнні чалавека. У іх – пяшчота любові і мяккі гумар, замілаванне роднай прыродай і бязмежная любоў да жыцця. Аўтар дала яму назву "Ручаіны жыцця".



*Сухаруцкая Галіна Пятроўна*

Яна так кажа пра сябе: Нарадзілася ў **1932 годзе** ў сям'і калгаснікаў. "Дзяцінства не бачыла – яно прыйшлося на вайну, за якую страціла дарагіх мне людзей."

Пасля – вучылася. У 1954 годзе скончыла Полацкі лясны тэхнікум, дзе і пачала пісаць вершы. Праца ў лясной гаспадарцы падалася занадта вузкай для мяне. Скончыла Віцебскі педінстытут. З 1969 года па 1986 год пісала мала, бо была захоплена педагагічнай працай. Затым – на дзяржаўнай працы. І толькі пры выхадзе на адпачынак зноў прыйшло жаданне пісаць. І, хоць у мяне былі і іншыя захапленні, вершы не давалі мне спакою, магчыма, таму што з'явіўся час асэнсаваць жыццё па – іншаму, убачыць яго прыгажосць і цёмныя плямы.

Не было жадання рассылаць свае вершы па газетах і часопісах: без мяне хапае. Даўно супрацоўнічаю з нашай раённай газетай "Сцяг перамогі". Вершы мае – на дзвюх мовах і, нават не таму, што жыву на мяжы Беларусі і Расіі, дзе ўклады і традыцыі нашых народаў не вельмі адрозніваюцца, але і таму, што абедзве гэтыя мовы маюць адзіную этнічную сутнасць. Пішу пра свае мясціны, нашых людзей і хачу, каб яны чыталі і былі маімі шчырымі крытыкамі ".

## Пятроў Віктар Пятровіч – журналіст, паэт



*Пятроў Віктар Пятровіч*

Пятроў Віктар Пятровіч на працягу амаль трох дзесяцігоддзяў працаваў адказным сакратаром і намеснікам рэдактара раённай газеты «Сцяг перамогі". Адначасова ўзначальваў літаб'яднанне "Світанак", створанае па яго ініцыятыве пры раённай газеце ў 1972 годзе. Цяпер ветэран – журналіст знаходзіцца на заслужаным адпачынку, але не перапыняе сувязі з роднай газетай. Усё сваё жыццё Віктар Пятроў сябруе з паэзіяй ў абласных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях, а падчас вайсковай службы – у вайсковых газетах. Некаторыя з іх пакладзены на музыку і сталі песнямі.

Першаму зборніку сваіх твораў В. П. Пятроў даў назву "Крыніца натхнення".
І невыпадкова, бо, як вядома, натхненне прыходзіць у нашы душы і сэрцы праз любоў да блізкіх, да родных мясцін, да прыроды – вечнай прыгажосці і

гармоніі свету. А менавіта гэтая тэматыка з'яўляецца галоўнай у творчасці нашага земляка.

Пятроў,В. Імгненні радасці і болю: зборнік вершаў
Пятроў,В. Раннія мроі...: зборнік вершаў
Пятроў,В. Старонкі нашага жыцця: зборнік вершаў

**Агееў Аляксей Міхайлавіч – паэт, музыкант, стваральнік клуба аўтарскай песні і паэзіі**


*Агееў Аляксей Міхайлавіч*

Нарадзіўся **11 сакавіка 1955 года ў г. п. Лёзна**. У 60-я гады сям'я пераехала спачатку ў Казахстан, затым на Далёкі Ўсход. Бацька ўсё жыццё марыў быць геолагам, але давялося працаваць прарабам на будоўлі, затым намеснікам загадчыка пераваланчай базы на ўзбярэжжы Ахоцкага мора. Мяне заўсёды ўражвала і здзіўляла веліч бязмежнай тайгі і неўтаймоўная сіла мора. Ва ўзросце 12 гадоў я напісаў свае першыя радкі аб гэтым дзіўным краі. Пасля заканчэння Хабараўскага рачнога вучылішча давялося працаваць на цеплаходах Хабараўскага параходства: прайшоў увесь Амур, быў у Благавешчанску, Амурскай, Камсамольску-на-Амуры, Мікалаеўская, на востраве Сахалін. Прырода гэтага краю – скалістыя берагі, парослыя багуном, шырокія даліны, заліўныя лугі, высокія горы і сопкі – усё гэта пакінула глыбокі след у маёй душы. Я беззапаветна палюбіў гэты край, таму большасць маіх вершаў напісаныя аб маім любімым і далёкім Далёкім Усходзе. У 1988 годзе скончыў Мінскі інстытут культуры і стаў працаваць дырэктарам Дабрамыслінскага сельскага Дома культуры. Працуючы тут, стварыў клуб аўтарскай песні і паэзіі «Гармонія», арганізаваў раённы конкурс аўтарскай песні і паэзіі **"Песні сунічных бароў"**, які прыняў статус міжрэгіянальнага.

**Кузняцоў Руслан Генадзьевіч**

Нарадзіўся ў **1970 годзе** ў горадзе Варкута. З 1971 гада сям'я пастаянна пражывае ў нашым пасёлку. Скончыў сярэднюю школу №1 г.п. Лёзна. Вершы пісаць пачаў у 1990 годзе.

На думку паэта, самае галоўнае ў творчасці – не хлусіць самому сабе. Пісаць толькі праўду пра жыццё. Бо для Руслана Кузняцова, інваліда 1-й групы дзяцінства, гэта не проста рыфмаванне радкоў, - гэта спосаб самавыяўлення, магчымасць выказаць душу. Бо пісаць можна тое, што адчуў.


*Кузняцоў Руслан Генадзьевіч*

Вобраз думак паэта неаддзельны ад яго характару. І , быць можа, незаўважна для самога паэта па пэўных вобразах, тэмах, па ледзьве прыкметных, але характэрных прыкметах стылю, мы можам уявіць сабе асобу Руслана Кузняцова. Ён кліча да высакароднасці, і сам высакародны, славіць каханне, і сам поўны любові, заклікае да мужнасці, і сам незвычайна мужны. Ён мякка, асцярожна, даверліва кладзе руку на плячо чытача, не угаворваючы, а пераконваючы яго. І хочацца верыць, што многія чытачы знойдуць у гэтым зборніку вершы, сугучныя іх душэўнаму настрою, іх светаўспрыманню. Яго зборнікі вершаў "Разважанні аб жыцці"(2000г.), **"Давай пагаворым"** (2008г.).

**Кузмянкоў Рыгор Уладзіміравіч – самабытны паэт, кіраўнік творчай гасцінай "Сузор'е"**

Нарадзіўся ў горадзе Рудня Смаленскай вобласці. З 1980 года яго лёс быў звязаны з Лёзненшчынай. Рабіў ваенруком у Калышанскай сярэдняй школе. Апошнія гады жыцця Рыгор Уладзіміравіч Кузмянкоў працаваў настаўнікам гісторыі ў нашай Лёзненскай СШ №1.

Свой першы верш напісаў у шостым класе. Любоў да паэзіі пачалася са знаёмства з творчасцю забароненага ў тую пару Сяргея Ясеніна. Пасля ўпадабаў вершы Мікалая Някрасава, Эдуарда Асадава, Роберта Раждзественскага і іншых майстроў слова. Першыя паэтычныя радкі былі ў асноўным аб каханні, жыцці.



*Кузьмянкоў Рыгор Уладзіміравіч*

Потым тэматыка пашырылася: ад востранакіраваных, філасофскіх – да жартоўных, гумарыстычных. Але тэма любові – да жанчыны, да дзяцей, да родных мясцін і жыцця – застаецца адной з асноўных у яго творчасці.

Але **8 снежня 1999 года** Рыгор Кузмянкоў памёр. Не стала аднаго з лепшых, найболш актыўных пазаштатных аўтараў раённай газеты, самабытнага паэта, сябра Беларускага літаратурнага саюза "Полоцкая ветвь". Па ініцыятыве Рыгора Кузмянкова ў СШ №1 для старшакласнікаў была створана творчая гасціная "Сузор'е. **" Так уж легла судьба"**: зборнік вершаў Р. У. Кузьмянкова.

Раней у Дабрамыслінскіх барах праводзілася абласное свята паэзіі і аўтарскай песні пад назвай **"Песні сунічных бароў"**. Яго ўдзельнікі чыталі там свае вершы, спявалі песні пад гітару. Зараз гэта свята праводзіцца ў гарадскім пасёлку Лёзна. На плошчы нават ўстаноўлена сунічная брама, а ў 2015 годзе зацвержана ганаровая прэмія **"Сунічка"**. Кожнае лета на ім таленавітыя людзі "ад мала - да вяліка" дэманстрыруюць сваю творчасць. Неаднаразова на гэтым святе выступаў яго заснавальнік Агееў А. М. , Кузняцоў Руслан і іншыя.

## Селязнёва Таццяна Валянцінаўна

Нарадзілася Таццяна 12 снежня 1981г. у вёсцы Адаменкі Лёзненскага раёна. Вучылася ў СШ №1 г.п. Лёзна. З 1993г. па 1999г. ўваходзіла ў склад творчай гасцёўні «Сузор'е» пад кіраўніцтвам Г. В. Кузьмянкова. У 1997г. выступала на Віцебскім фестывалі «Пёстрый мир» з паэмай «Кліч продкаў», дзе заняла прызавое месца. Прымала ўдзел у абласным конкурсе самадзейных паэтаў і кампазітараў "Песні сунічных бароў», міжрэгіянальным паэтычным конкурсе «Руднянскія зоры» (горад Рудня). У 2015г. Таццяна стала лаўрэатам абласнога конкурсу «Факел Памяці» прысвечаны 70-годдзю Вялікай перамогі, з творам «Я з вайной не знаёмая асабіста ...».



*Селязнёва Таццяна Валянцінаўна*

Вершы маладой паэтэсы носяць у асноўным лірычны характар, але прагледжваюцца і філасофскія матывы, а яе зборнік «Душа из тонких нитей» прыадчыняе дзверцы ў таемны свет яе творчасці.

## Гілавеня Вольга Мікалаеўна

Вольга нарадзілася ў г.п. Карма Гомельскай вобласці ў сям'і служачых 6 жніўня 1977 года. У 1989 годзе пасля Чарнобыльскай трагедыі пераехала ў г.п. Лёзна. Тут скончыла сярэднюю школу №1. Працуе майстрам у Лёзненскім раённым доме рамёстваў, вядзе гуртковую працу ў Цэнтры дзяцей і моладзі. Акрамя вершаў захапляецца экохобби (жывапіс шэрсцю).



*Гілавеня Вольга Мікалаеўна*

Вольга намінаваная на суісканне літаратурнай прэміі «Паэт года 2015», «Паэт года 2016», «Спадчына 2017» . Вершы маладой паэткі апублікаваныя ў альманаху конкурсу «Верш і я» і ў газеце «Чыгуначнік Беларусі». Мае сваю уласную кнігу “Обнимая небо».

## Даговіч Пётр Сямёнавіч

Пасля заканчэння інстытута Пётр Сямёнавіч працаваў 7 год у Чарніцкай школе-інтэрнаце Лёзненскага раёна. У 2001 годзе яго прызначалі на пасаду дырэктара Цэнтра карэкцыйна - развіваючага навучання і рэабілітацыі "Вясёлка". Паэт прымаў удзел у міжнародным паэтычным конкурсе «Руднянскія зоры», дзе быў адзначаны дыпломам у намінацыі вершаў пра прыроду. Мае два зборнікі вершаў. “Цветной мир” и “За окном”. Кожны яго верш адрозніваецца трапным і дакладным падборам слоў, даходлівасцю, арыгінальнасцю.



*Даговіч Пётр Сямёнавіч*

У 2007 годзе на базе Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі створана **аматарскае літаратурнае аб'яднанне "Пад абажурам"**, якое аб'ядноўвае 19 паэтаў, узрост і прафесійная дзейнасць якіх вельмі разнастайная. У 2018 годзе яно атрымала званне **Народнага.** Асноўнымі напрамкамі дзейнасці з'яўляюцца: павышэнне і развіццё творчага патэнцыялу членаў аб'яднання, культурнага ўзроўню насельніцтва шляхам правядзення творчых сустрэч з мясцовымі паэтамі.

Аматарскае аб'яднанне займаецца выдавецкай дзейнасцю. З 2015 года выдадзена больш 20 паэтычных зборнікаў мясцовых паэтаў. Усе яны былі прэзентаваны жыхарам гарпасёлка. Гэта: "Белый дым" Р. Кузняцова, "Без фальши" Т. Седневай, "Душа из тонких нитей" Т. Селязнёвай, "Цветной мир" і "За окном" П. Даговіча, "Игра в слова" В. Пячонавай, "Обнимая небо" В.Гілавейні, "В моих мечтах и в снах, и в жизни наяву" Я.Саламацінай, "Люблю я жить открыто» Г. Варам'ёвай і іншыя.

Кіруе аб'яднаннем **Алена Аляксееўна Бахмацкая**, бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Удзельнікі аб'яднання жывуць актыўна, іх творчасць дазваляе падтрымліваць становучы пазітыў у жыцці. Шмат цікавых мерапрыемстваў і пасяджэнняў, выстаў і творчых сустрэч прайшло за гады існавання літаратурнага аб'яднання.



*Бахмацкая Алена Аляксееўна*

Усе сустрэчы заўсёды праходзяць у цёплай сяброўскай атмасферы. Паэты Лёзненшчыны неаднаразова прымалі ўдзел у міжнародным конкурсе "Руднянские зори" і "БиблиоПарнас". А таксама у абласным свяце-конкурсу самадзейных паэтаў і кампазітараў "Песні сунічных бароў", якое раней праводзілася у Дабрамыслінскіх барах Яго ўдзельнікі чыталі там свае вершы, спявалі песні пад гітару. Зараз гэта свята праводзіцца ў гарадскім пасёлку Лёзна. На плошчы нават ўстаноўлена сунічная брама, а ў 2015 годзе зацвержана ганаровая прэмія **"Сунічка"**. Кожнае лета на ім таленавітыя людзі "ад мала - да вяліка" дэманстрыруюць сваю творчасць. Неаднаразова на гэтым свяце выступаў яго заснавальнік Агееў А. М. , Кузняцоў Руслан і ўсі астатнія члены літаратурнага аб'яднання "Пад абажурам".

***Пытанні і заданні:***

1. *Якія народныя святы, абрады і традыцыі ты ведаеш?*
2. *Якімі культурнымі традыцыямі багаты наш край?*
3. *Якіх мастакоў роднага краю ты можаш назваць?*
4. *Назаві сучасных пісьменнікаў і паэтаў нашага краю.*
5. *Падрыхтуй паведамленне пра творчасць аднаго з дзеячаў культуры.*


Раздзел IV
"Я спадчыну
ад продкаў атрымаў..."
Мая сям'я

## §32. Маё ўласнае “ Я”

### 1. *Твае адметныя прыкметы і ролі.*

Кожны чалавек – адзіны і непаўторны на планеце Зямля. Ён мае шэраг вонкавых і ўнутраных прыкмет, якімі адрозніваецца ад іншых людзей. Гэта рост, вага, пульс, крывяны ціск, колер валасоў, колер і форма вачэй, форма вушэй, радзімыя плямкі, памер адзення і абутку, характар, тэмперамент, а таксама імя і прозвішча.

Некаторыя прыкметы чалавек мае з часу нараджэння, іншыя набывае на працягу жыцця. (Прывядзі прыклады прыкмет, якія чалавек набывае ад нараджэння, а якія – на працягу жыцця.)

Акрамя гэтага кожны жыхар планеты Зямля выконвае шмат розных абавязкаў або роляў, якія ўплываюць і на яго знешні воблік, і на паводзіны.

Напрыклад, вучань можа быць географам (калі добра вывучае прадмет геаграфія), турыстам (калі ўдзельнічае ў паходах), музыкантам (калі добра іграе на музычным інструменце), спеваком (калі спявае ў школьным хоры) і г. д.

З усіх гэтых прыкмет і асблівасцяў складаецца ўласнае ”Я”.

На працягу жыцця ролі чалавека не застаюцца пастаяннымі, бо ён расце, сталее, атрымлівае адукацыю, прафесію. Таму паступова ў кожнага чалавека мяняюцца яго ролі ў сям’і і ў грамадстве. (Прывядзі прыклады змены роляў чалавека на прцягу жыцця ў сям’і і ў грамадстве).

### 2. *Таямніцы твайго імя.*

Адным з самых дарагіх і любімых слоў для чалавека з’яўляецца ўласнае імя. Яго выбіраюць бацькі пасля нараджэння дзіцяці, і яно ідзе з чалавекам па жыцці да скону. Па імёнах мы запамінаем людзей, па імёнах мы звяртаемся да іх. А які сэнс маюць нашы імёны і як яны ўтварыліся? У даўнія дахрысціянскія часы імёны не толькі служылі для абазначэння асобы і вылучэння яе з ліку іншых, але і павінны былі абараняць чалавека ад злых сіл. Старажытныя людзі верылі ў магічную сілу слова і былі ўпэўнены, што жывёлы, дрэвы, розныя з’явы прыроды, назвы якіх узяты ў якасці імён, становяцца апекунамі, абаронцамі іх носьбітаў. У тыя часы ўжываліся такія імёны, як Воўк, Ліс, Заяц, Гром, Лебедзь, Бабёр, Рыбы, Крывы і ім падобныя. Многія з тых старажытных імёнаў сталі асновай сучасных прозвішчаў. (Прывядзі прыклады).

Некаторыя імёны адлюстроўвалі пачуцці і жаданні людзей: Надзея, Любоў, Уладзімір, Ярамір, Яраполк, Багдан. (Паспрабуй растлумачыць сэнс гэтых імёнаў). Такія славянскія імёны былі распаўсюджаны ў XI – XVIII стагоддзях, а зараз яны сустракаюцца даволі рэдка.

З хрысціянствам на Беларусь прыйшлі каталіцкія і праваслаўныя імёны, як уласна грэчаскія, так і старажытнарымскія, старажытнаяўрэйскія, сірыйскія, егіпецкія. У дзень хрышчэння дзіця звычайна атрымлівала імя, якое запісана ў святцах – царкоўных кнігах, дзе пералічваліся ўсе святыя і царкоўныя святы ў каляндарным парадку. Прычым па форме імя можна было даведацца, да якой

хрысціянскай канфесіі належыць чалавек. Калі ў католікаў сустракаліся імёны Базыль, Ян, Барбара, Стэфан, Гелена, то ў праваслаўных адпаведна Васіль, Іван, Варвара, Сцяпан, Алена. У вёсках, калі некалькі чалавек мела адно імя, то ўжываліся розныя яго формы, напрыклад, Ян – Янка – Янук – Івась; або Петра – Пятрусь – Пятрук. Кожнае імя нясе ў сабе нейкі сэнс, які можна вызначыць, калі перакласці яго на беларускую мову. Напрыклад, Васіль – “царскі”, Андрэй – “мужны”, Генадзь – “радавіты”, Марына – “марская”, Алег – “святы”, Алена – “сонечная, светлая”. ( Пра сэнс некаторых найбольш распаўсюджаных імён можна даведацца ў слоўніках імёнаў).

### 3. *Таямніцы твайго прозвішча.*

Каб адрозніць людзей з аднолькавымі імёнамі або ахарактарызаваць асобу ў старажытныя часы ўзнікла патрэба ў дадатковых сродках для абазначэння таго ці іншага чалавека. Такімі сродкамі і сталі другое імя, імя па бацьку, мянушка, назва мясцовасці, якія далі пачатак прозвішчам.

Прозвішчы ўтвараліся рознымі шляхамі і прыйшлі на нашу тэрыторыю з розных моў. Найбольш пашыранамі былі наступныя спосабы:

а) ад дахрысціянскіх імён і мянушак ( Рысь, Воўк, Зайцаў, Бабровіч, Собаль);

б) ад прафесіі чалавека ( Каваль, Лавец, Шапавал, Кравец, Бондар);

в) ад паселішча, дзе чалавек нарадзіўся ( Палачанін, Віцьбіч, Свірскі, Тураўскі);

г) ад мясціны, дзе знаходзіўся фальварак, маёнтак, зямельны надзел (Падгайскі, Залескі, Падліпскі, Лесавік);

д) ад характэрнай прыкметы знешнасці, характару, звычкі (Маўчан, Піскуновіч, Таўкач, Крывенькі, Весялоўскі);

е) ад назваў старажытных багоў, міфалагічных істот ( Гром, Бажок, Лель, Марозаў, Пярун);

ё) ад хрысціянскіх імён (Іваноў, Александровіч, Барысюк, Паўлоўскі);

ж) ад назваў народаў або этнічных груп ( Палячок, Лях, Маскалёў, Прус, Швед, Турак).

Многія беларусы маюць тыпова рускія, польскія, нямецкія, татарскія, літоўскія прозвішчы: Іваноў, Пятроў, Дзянісаў, Трафімаў, Дзёмін, Козыраў, Альшэўскі, Стахоўскі, Янкоўскі, Панятоўскі, Фурман, Шанц, Фунт, Бут – Гусаім, Тумас, Мажэйка, Хільман.

***Пытанні і заданні:***

*1. Па якіх прыкметах адрозніваюцца людзі паміж сабой?*
*2. Як утварыліся імёны і прозвішчы?*
*3. Даведайся гісторыю свайго імя і прозвішча.*
*4. Якія сучасныя імёны табе падабаюцца?*

# § 33. Мая сям’я

## 1. *Сямейны побыт*

Амаль да сярэдзіны ХХ стагоддзя на Лёзеншчыне шырока былі распаўсюджаны вялікія сем’і, якія аб’ядноўвалі некалькі шлюбных пар, звычайна бацькоў і жанатых сыноў. Такая сям’я вяла адну гаспадарку, у якой праца дэтальна размяжоўвалася на жаночую і мужчынскую. Галавой вялікай сям’і быў бацька, а калі ён паміраў, то яго месца займаў старэйшы сын.



*Сялянская сям’я XIX - XX стст..*

У сем’ях існаваў строгі падзел працы па полу і ўзросту. Кожны член сям’і добра ведаў свае абавязкі. Дзеці дапамагалі маці чысціць бульбу, няньчыць дзяцей, пасвілі гусей, курэй. Падлеткам давяралі пасвіць не толькі птушак, але і буйную жывёлу: кароў, коней, валоў, авечак.

У сялянскіх сем’ях дзеці пачыналі працаваць вельмі рана.

З 7 – 8 гадоў яны пасвілі жывёлу, зграбалі сена, баранавалі. Падлеткаў, якім было каля 15 гадоў прывучалі касіць, араць, малаціць. У 5 гадоў дзяўчынкі няньчылі дзяцей, а ў 16 умелі шыць, вышываць адзенне, ткаць, жаць.



*Славянскія ўзоры( вышыўка)*

Старыя часцей за ўсё вялі хатнюю гаспадарку: кармілі хатнюю птушку, даглядалі скаціну, а таксама выхоўвалі дзяцей і дапамагалі маладзейшым у полі. Мужчыны і юнакі апрацоўвалі зямлю, аралі, засявалі, касілі сенажаці, раскарчоўвалі лес, рубілі хаты, нарыхтоўвалі дровы на зіму, рабілі драўляны посуд, плялі корабы і кошыкі.

Дзяўчаты, як і жанчыны, мылі бялізну, посуд, варылі ежу, даглядалі агарод, палолі грады, жалі, сушылі сена, ірвалі і адбівалі пранікам лён, мялі льнотрасту, трапалі і часалі кудзелю, пралі, ткалі і шылі вопратку.

Дзяцей даглядала і выхоўвала маці, якой дапамагалі дзед і бабуля. Яны перадавалі малым свой жыццёвы вопыт, свае навыкі, уменні майстраваць тыя ці іншыя рэчы і вусна – паэтычную спадчыну (казкі, песні, загадкі, байкі, прыказкі і прымаўкі).

## 2. *Сямейныя святы і абрады.*

Кожная сям'я – гэта вялікі свет са сваімі ўнутранымі законамі і ўзаемаадносінамі, сваімі святамі і традыцыямі, захапленнямі і ладам жыцця. Але ёсць шэраг святаў і абрадаў, якія ўласцівы амаль кожнай сям'і, бо адпавядаюць галоўным этапам чалавечага жыцця. Гэта радзіны, вяселле і хаўтуры.

**Радзіны** – гэта свята нараджэння дзіцяці. У даўнія часы роды звычайна прымала бабка – пажылая спрактыкаваная жанчына. Таму на радзінах ёй адводзілася самая ганаровая роля: яе ўшаноўвалі, адорвалі, славілі словам, урачыста праводзілі да дому.

Асноўнай старадаўняй абрадавай стравай была бабіна каша, якую яна гатавала з круп на малацэ, дадаючы масла, цукар, упрыгожвала галінкамі, кветкамі, цукеркамі. Пасля нараджэння дзіцяці жанчыны з радні парадзіхі, выбраўшы вольную часіну, пяклі аладкі або яешню, і кожная самастойна ішла ў адведкі.

Царква з радзінамі звязала абрад хрышчэння дзіцяці, таму яны і атрымалі яшчэ адну назву – "хрэсьбіны". Калі хрысцілі дзіця, то давалі яму імя, якое было ў святцах у дзень хрышчэння малога.

**Вяселле** – свята ўступлення ў шлюб жаніха і нявесты. Сярод усіх свят, якія адзначалі нашы продкі, яно было найбольш маляўнічым і прыгожым, насычаным абрадамі і песнямі.



*Абрад вяселле*

Само вяселле ўключала некалькі абавязковых этапаў. Спачатку было сватанне, калі ў хату да дзеўкі ішлі 2 – 3 мужчыны, звычайна хросны бацька або дзядзька жаніха, яго бацька, іншы раз старэйшы брат. Яны вялі перамовы з бацькамі нявесты наконт вяселля, дамаўляліся аб пасагу. Пасля бацькі засватанай дзяўчыны або і сама маладая ішлі да жаніха паглядзець на гаспадарку жаніха.

Праз адзін – два тыдні былі заручыны, калі да дзеўкі на конях з шархунамі прыязджалі сват, жаніх і яго бацька. Мэта заручын – публічнае заяўленне аб сватанні і аб згодзе нявесты і бацькоў на шлюб. Напярэдадні вяселля была зборная субота. Заручаная хадзіла да сваіх сяброўак і клікала іх да сябе дамоў віць вянок. Звіўшы вянок, яго прымяралі на маладую, а тая ў вянку кланялася бацькам, сяброўкам і ўсім прысутным. У той жа дзень спраўляўся

кавалерскі вечар у доме жаніха, куды ён запрашаў сваіх сяброў і вясковых дзяўчат. Звычайна перад вяселлем, у суботу, пяклі каравй – цэнтральную страву на вяселлі. Караваем і песняй, як правіла, пачыналі і заканчвалі вяселле. Шлюбавіны – дзень, у які заключаўся шлюб. Раней вянчаліся ў царкве, але ў народзе прызнаваўся толькі шлюб, які афармляўся вяселлем.

На шлюбавінах выконвалі такія абрады: пасад, расплятанне касы, благаславенне, выкуп маладой, абмен каравая̆ў або вяночкаў, злучэнне каравая̆ў, абход вакол стала. Само вяселле магло доўжыцца амаль тыдзень з суботы да чацвярга. У нядзелю маладыя вянчаліся, а пасля гэтага яны раз’язджаліся па сваіх хатах. У панядзелак малады са сваёй дружынай на канях ехаў да маладой, “выкупляў” яе, забіраў пасаг і вёз у сваю хату. І там 2 – 3 дні гуло вяселле.

Абавязковымі ўдзельнікамі яго былі музыкі: скрыпач і дудар, а пазней – гарманіст, цымбаліст і бубніст. У наступную нядзелю пасля вяселля маладыя з блізкай раднёй ездзілі ў госці да бацькоў нявесты.

**Пахаванне** – абрад пахавання памерлых. Паводле традыцыі, славяне ў дахрысціянскі перыяд спальвалі нябожчыкаў, радзей хавалі ў зямлю, насыпаючы курган. Хаваць памёршых у дашчанай труне на могільніку ў сельскай мясцовасці пачалі ў XIII - XIV стагоддзях.



*Пахавальны абрад*

На магіле насыпалі невялічкі ўзгорак і ля галавы ставілі крыж. Вярнуўшыся з могільніку, усе старанна мылі рукі і садзіліся за жалобны стол. На памінках выконвалі пэўныя рытуалы, успаміналі памёршага, елі канун – кашу з вадою, падсалоджаную мёдам або цукрам, клёцкі, бліны, пакідалі яду нябожчыку.

Памінкі паўтараліся ў памінальныя дні: трэці, шосты, дзявяты, саракавы, паўгодкі, гадавіна пасля смерці, а таксама абавязкова на радаўніцу і на дзяды.

***Пытанні і заданні:***

*1. Якую работу ў сямейнай гаспадарцы выконвалі дзеці твайго ўзросту?*
*2. Назаві галоўныя сямейныя святы і абрады.*
*3. Чым адрозніваюцца сучасныя святы і абрады ад даўнейшых?*

## §34. Мой радавод

### 1. *Што такое род?*

**Род** – гэта калектыў кроўных родзічаў, якія вялі сваё паходжанне па адной лініі (мацярынскай або бацькоўскай), усведамлялі сябе патомкамі агульнага продка і мелі агульнае родавае імя.

Узніклі роды ў Беларусі ў глыбокай старажытнасці і ўяўлялі сабой некалькі вялікіх сем'яў, якія былі звязаны роднаснымі сувязямі. У кожнага роду быў свой татэм – жывёла ці птушка, імем якой ён называўся і якой пакланяўся. Членам роду забаранялася паляваць на татэмную жывёлу. У кожнага роду было родавае свята, якое спраўлялася ў гонар татэма, і родавы татэмістычны цэнтр – месца, дзе захоўваліся свяшчэнныя родавыя рэчы. Муж і жонка павінны былі быць з розных родаў. Старажытная родавая арганізацыя знікла на позняй стадыі першабытнага ладу, але яна зрабіла вялікі ўплыў на побыт і духоўную культуру людзей, што адлюстроўвалася ў рэлігійных вераваннях, міфалогіі, фальклоры. Сляды родавай арганізацыі ў беларусаў захаваліся пераважна ў вясельных абрадах. У цяперашні час родам называюць рад пакаленняў блізкіх па крыві людзей, якія паходзяць ад аднаго продка.

### 2. *Родзічы і сваякі*

У сучасных сямейных адносінах выдзяляюць роднасць па прамой лініі (бацькі і дзеці, продкі і нашчадкі) і па бакавой (браты і сёстры, дзядзькі, цёткі і пляменнікі). Для абазначэння ступені роднасці ўжывюцца розныя словы – тэрміны: тата, мама, дачка, сын, дзед, баба, прадзед, прабабка, унук, унучка. Выдзяляюць некалькі ступеняў роднасці і сваяцтва. Да першай ступені кроўнай роднасці ў беларусаў адносяць бацьку (тату), маці (матку, маму), сына, дачку. Да другой ступені – дзеда, бабу, унука і ўнучку; да трэцяй – прадзеда, прабабку, праўнука, праўнучку. Значна радзей ужываецца чацвёртая ступень роднасці: прапрадзед, прапрабабка, прапраўнук, прапраўнучка. Далейшыя ступені кроўнай роднасці называюцца агульна: продкі, дзяды, дзяды – прадзеды, нашчадкі. Назвы роднасці першай ступені бакавой лініі: брат, сястра, пляменнік, пляменніца; другой ступені – дзядзька, цётка, дваюрадны (стрыечны) брат, дваюрадная (стрыечная) сястра. Назвы трэцяй і наступных ступеняў бакавой лініі ужываюцца рэдка і падаюцца звычайна апісальна. Асобую групу сваякоў складаюць хросныя бацькі, хросная маці, хросныя дзеці – хроснік (хрэснік), хросніца (хрэсніца), а таксама назвы кум і кума. Усе яны звязаны з царкоўным абрадам хрышчэння. У гаворках паміж людзьмі часта ўжываюцца розныя агульныя назвы роднасці: радня, родзічы, радзіна, сваякі, свае, адроддзе, род.

У старажытнай Беларусі існаваў такі звычай. Калі хлопчык вырастаў, то мусіў даказаць, што меў права называцца мужчынам. Для гэтага ён павінен быў пераплысці хуткую і глыбокую раку, здабыць на паляванні тура, мядзведзя або зубра, распаліць пад дажджом вогнішча, а яшчэ – абавязкова ведаць, кім былі ягоныя дзяды, прадзеды і прапрадзеды. Таго, хто не ведаў, часам выганялі з сялібы, бо лічылася, што такі чалавек лёгка можа зрабіцца здраднікам.

## *3. Радавод*

**Радавод** – гэта гісторыя роду, якая гаворыць аб паходжанні, аб пераемнасці пакаленняў і крэўнай повязі паміж сямейнікамі. Для яго складання карыстаюцца як пісьмовымі, так і вуснымі сведчаннямі. Збіраючы матэрыял для радавода, у першую чаргу распытваюць бліжэйшую радню, выяўляюць ступень роднасці або сваяцтва. Каб даведацца пра родзічаў, якія жылі ў XIX стагоддзі і раней, трэба карыстацца пісьмовымі крыніцамі. Гэта могуць быць метрычныя кнігі храмаў, перапісы насельніцтва, інвентары маёнткаў і іншыя гістарычныя дакументы. Радаводы дваранскіх і шляхецкіх сем'яў можна адшукаць у радаслоўных разрадных кнігах, баярскіх спісах, польскіх гербоўніках, якія вяліся з сярэдзіны XVI стагоддзя.

Спецыялісты складаюць радаводныя дрэвы – графічныя выявы радаводаў. Яны дазваляюць прасачыць развіццё пэўнай галіны роду, вызначыць ступень роднасці з іншымі родзічамі. Гэта вельмі старая традыцыя, бо шляхта здаўна і ва ўсіх краінах цаніла веды аб сваіх продках, ганарылася старажытнасцю і славутасцю сваіх родаў. Але, каб мець радавод, неабавязкова быць шляхціцам – памятаць пра сваіх продкаў варта кожнаму.

## *4. Як скласці радавод?*

Радаводы складаюцца па мужчынскай і жаночай лініях, ці, як раней казалі, "па мячу" і "па кудзелі".

**Каб скласці радавод, трэба ісці наступным шляхам:**

1. Намаляваць радаводнае дрэва (генеалагічную схему). Уверсе мусіць быць ваш прадзед (а калі ведаеш, і прапрадзед са сваёю жонкаю (пазнач даты жыцця), ад іх павінны ісці лініі да дзяцей (пазнач і іх даты жыцця), адзнач шлюбныя сувязі. Гэтаксама зафіксуй звесткі пра вашых бацькоў, іхніх братоў і сясцёр. А потым – пра сябе, больш далёкіх братоў і сясцёр. Такая схема дапаможа табе лепш арыентавацца ў сваіх сваяцкіх сувязях.
2. Паспрабуй запісаць, што ты ведаеш пра сваіх продкаў кароткую біяграфію пра кожнага асобна.
3. Пагавары з бацькам і маці, запішы тыя звесткі, якія яны табе паведамяць.
4. Пагавары з бабуляй і дзядулем, запішы іх расказы.
5. Збяры фотаздымкі, пісьмы, успаміны і іншую інфармацыю пра бліжэйшую радню.
6. Выпішы назвы вёсак і гарадоў, дзе жылі і зараз жывуць блізкія родзічы.
7. Зрабі картасхему населеных пунктаў сваёй радні.

***Пытанні і заданнні:***

1. *Што такое род?*
2. *Што такое радавод?*
3. *Чаму шляхта вяла радаводы?*
4. *Якія крыніцы інфармацыі патрэбны, каб сабраць звесткі свайго радавода?*
5. *Складзі свой радавод.*

## §35. Мая родная мясціна

### 1. *”Мой родны кут, як ты мне мілы…”*

Гэтыя радкі з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля” напэўна ведае кожны жыхар Беларусі, бо ў кожнага з нас ёсць свая маленькая Радзіма – вёска, вуліца, горад, - месца, дзе пачалося жыццё, праходзілі гады маленства і юнацтва. Менавіта там, у невялікім родным куточку, чалавек пачынае шлях у вялікае жыццё, крок за крокам вывучае і спазнае багацце навакольнага свету, знаёміцца з прыродай, гісторыяй, культурай і тым самым далучаецца паступова да агульначалавечай цывілізацыі. З усяго гэтага вырастае шчымлівае і пяшчотнае пачуццё да роднага краю, да родных і блізкіх людзей, да ўсяго, што ёсць на планеце Зямля. Аднак, бывае, даводзіцца чуць, што нейкая вёска нецікавая, бо там няма ні рэчкі, ні возера, ні помнікаў гісторыі…

Але не бывае нецікавых мясцін. Нецікавасць існуе ад няведання, вывучэнне ж геаграфіі і гісторыі родных мясцін нараджае ў душы пачуццё любові і жаданне працаваць на карысць сваёй Радзімы. Матэрыялаў пра Лёзненскі раён вельмі мала. Можна сказаць толькі кніга “ Памяць. Лёзненскі раён”. Вялікае багацце спадчыны Лёзненшчыны не ўсе вывучана, апісана, сфатаграфавана.

У нашым краі раней існавала каля 500 населеных пунктаў, а ўласныя летапісы маюць усяго адзінкі. Навукоўцы не ў стане вывучыць усе вёсачкі і хутары Беларусі, таму ёсць спадзяванне на тое, што гэтым зоймуцца школьнікі.

### 2. *Твая родная вёска*

Кожная вёска ў любой цывілізаванай краіне павінна мець свой летапіс. Напрыклад, у Чэхіі ў сельскіх паселішчах ёсць людзі, якія вядуць запісы аб падзеях і здарэннях, якія там адбываюцца. У Беларусі такога пакуль што няма, а з кожным годам невялікія населеныя пункты змяншаюцца ў памерах, а некаторыя і зусім знікаюць. Паспрабуй стаць летапісцам сваёй вёскі або вёскі, у якой жывуць твае бабуля і дзядуля ці проста родзічы. **Як гэта зрабіць?**

**Памятка па вывучэнні родных мясцін:**

- Назва вёскі (сучасная і ранейшая), ад чаго паходзіць, даты змен і г. д. Назвы зніклых вёсак, іх геаграфічныя каардынаты, абставіны і даты знікнення. Назвы і месцы маёнткаў, якія былі ў вашым наваколлі, хто і калі быў іх гаспадаром, архітэктарам будаўніцтва;
- Якія цікавыя забудовы з мінулых часоў захаваліся ў вашым рэгіёне? Ці ведаеце вы руіны старых замкаў, палацаў, гаспадарчых забудоў (млыны і гэтак далей)? Вельмі важна запісаць успаміны старажылаў, адшукаць звесткі пра гісторыю аб’ектаў, зрабіць фотаздымкі;

- Якія пейзажныя паркі засталіся ў вашым наваколлі з мінулых часоў? Якія незвачайныя пароды дрэў і хмызнякоў можна адшукаць у старых парках?
- Звярніце ўвагу на могілкі. Прыміце ўдзел у добраўпарадкаванні магіл удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, барацьбітоў за нацыянальнае вызваленне. Якое пахаванне на могілках лічыцца самым старым? Дзе знаходзяцца яўрэйскія, латышскія могілкі, старыя пахавальныя курганы?
- Пазнаёмцеся ўважліва з рэлігійным жыццём вашага наваколля. Ці маюцца ў вас месцы, звязаныя з рэлігійным культам: капліцы, крыжы, крыніцы? Якія існуюць апавяданні пра гэта старэйшых людзей?
- Настойліва шукайце старыя газеты, часопісы, на любых мовах, старыя кнігі і падручнікі, старыя фотаздымкі, альбомы. Не дапускайце, каб гэтыя каштоўнасці былі выкінуты на смецце. Шукайце іх у старэйшых людзей, вядзіце з імі гаворку аб гісторыі іх жыцця і працы;
- Якія былі цікавыя падзеі ў вашай акрузе падчас войн? Як праходзіла калектывізацыя? Запішыце ўважліва ўспаміны сведкаў і ўдзельнікаў гэтых падзей;
- Як вучыліся вашы дзяды і бацькі? На якой мове і што гэта каштавала? Занатуйце назвы школ, дзе яны існавалі, хто быў з выкладчыкаў і які пра іх успамін? Каго з выдатных лекараў сустрэлі вашы родныя на сваім жыццёвым шляху?
- Хто быў пацярпелы, арыштаваны з вашых мясцін да 1939 года?

Іх далейшы лёс? Запішыце ўважліва ўспаміны рэпрэсіраваных людзей.
Ці ёсць пахаванні рэпрэсіраваных у вашым раёне?

- Запішыце ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны пра іх баявую дзейнасць. Што вы ведаеце пра дзейнасць партызанскіх атрадаў?

Як да іх адносілася вясковае насельніцтва?

- Што вядома вам пра гісторыю прадпрыемстваў, калгасаў (саўгасаў) у вашым рэгіёне? Якіх выдатных дзеячаў прамысловасці і вясковай гаспадаркі вы ведаеце? Запішыце іх успаміны;
- Якія помнікі прыроды ёсць у вашым раёне? Што вам вядома пра іх з легендаў, успамінаў? Якія вы ведаеце валуны, крыніцы, рэчышчы, балоты? Што гавораць пра іх старажылы?
- Ці ведаеце вы старыя дрэвы, паркі, азёры, з якімі звязана жыццё і творчасць славутых людзей? Запішыце ўспаміны старэйшых людзей і інфармацыю краязнаўцаў;
- Што вядома вам пра жыццё нацыянальных меншасцей на Беларусі? Якія асабістасці ўкладу жыцця і працы, рэлігіі былі і засталіся ў літоўцаў, яўрэяў, палякаў, татар? Даведайцеся пра асноўныя рэлігійныя і культурныя каштоўнасці іх жыцця;
- Звярніце асаблівую ўвагу на свой радавод.

Хто вашы бацькі і дзяды, прадзеды. Адкуль паходзяць, які быў іх жыццёвы лёс, дзе пахаваны старэйшыя пакаленні, чым займаліся і дзе працавалі. Якімі былі іх мова і веравызнанне? Якія сямейныя рэліквіі захаваліся ў вашай сям'і? Зрабіце іх здымак, апісанне і занатуйце ў краязнаўчым дзённіку. Аформі свой

асабісты радавод, у якім пазначце месцы, даты нараджэння (смерці) вашых продкаў;

- Паспрабуйце зрабіць герб сваёй вёскі, карыстаючыся правіламі стварэння герба.

### *3. Мая вуліца*

Для школьнікаў, якія нарадзіліся і жывуць у гарадах, аб'ектам вывучэння можа быць вуліца або гарадскі пасёлак.

З'яўленне вуліц звязана з разрастаннем вёсак, пераўтварэнні іх у мястэчкі і гарады. Першыя беларускія гарады ўзніклі як апорныя пункты абароны (назва "горад" паходзіць ад слова" гарадзіць, умацоўваць паселішча" па берагах буйных рэк ці ў сутоках дзвюх рэк, на высокім мысе або пагорку.

Вуліцы звычайна разыходзіліся ад цэнтра ў напрамку бліжэйшых населеных пунктаў. У цэнтры горада яны масціліся бярвеннем, плашкамі ці дошкамі. З XVII стагоддзя ў гарадской забудове і планіроўцы адбываліся змены, бо з'явіўся яшчэ адзін цэнтр – ратушная плошча з гандлёвымі радамі. Ратушы пачалі будаваць у гарадах, якія мелі магдэбургскае права (права на самакіраванне). Ад гандлёвай плошчы вуліцы разыходзіліся ў напрамку на бліжэйшыя буйныя гарады і вёскі (радыяльная або веерная планіроўка).

У канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя беларускія гарады былі ўключаны ў агульны план перабудовы гарадоў Расійскай імперыі. Перапланіроўка раздзяліла гарады на цэнтральную частку і прадмесці, на раёны і кварталы, у якіх усталёўваліся абавязковыя правілы забудовы.

Зараз у большасці старых гарадоў спалучаецца радыяльная забудова цэнтра з квартальнай забудовай новых гарадскіх ускраін.

Паводле характару забудовы вуліцы падзяляюцца на аднарадныя і двухрадныя. На аднарадных вуліцах хаты стаяць толькі на адным баку дарогі, а з другога боку можа знаходзіцца лес, возера, рака ці які іншы прыродны аб'ект.

На вуліцах могуць знаходзіцца толькі жылыя дамы, а на некаторых, асабліва на цэнтральных, размяшчаюцца грамадскія будынкі – магазіны, установы, арганізацыі і інш.

У вялікіх гарадах пераважаюць шматпавярховыя дамы, у невялікіх – адна – і двухпавярховыя.

Зараз ў гарадскіх пасёлках – пяціпавярховыя дамы.

***Пытанні і заданні:***

1. *Чаму важна ствараць летапісы населеных пунктаў?*
2. *Якія крыніцы трэба выкарыстоўваць пры складанні летапісаў вёсак?*
3. *Як з'явіліся вуліцы?*
4. *Якія віды планіроўкі характэрны для беларускіх гарадоў?*
5. *Зрабі планіроўку сваёй вуліцы.*


Раздзел V
ЛЁЗНЕНСКІ
РАЕН
Турысцка-краязнаўчыя
магчымасці Лёзненшчыны
(з вопыту педагагічнай работы)
ШАГАЛ
Моя жизнь

## 1. Турыстычныя магчымасці краю. Месцы адпачынку.

### *1. Дзейнасць турысцка – краязнаўчага гуртка “ Мая Лёзненшчына” па распрацоўцы турыстычных маршрутаў па роднаму краю.*

**“Чужое ведаць цікава, а сваё – абавязкова”** – такі дэвіз узяў сабе краязнаўчы гурток **“Мая Лёзненшчына”**. Гурток узнік ў **1995 годзе**.




*Гурткоўцы (2008г.)*

Уваходзілі ў яго вучні сярэдняй школы №1. г. п. Лёзна. У наступным годзе быў распрацаваны **краязнаўчы курс,** які спачатку быў для вучняў 5-7 класаў і выкладаўся на занятках турысцка-краязнаўчага гуртка, а затым курс стаў вывучацца і ў старэйшых класах. Вучні старэйшых класаў тройчы былі ўдзельнікамі абласных і рэспубліканскіх семінараў па краязнаўству настаўнікаў, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам Куржалава Алега Васільевіча – загадчыка абласнога аддзела беларусазнаўства і краязнаўства.

Гурток “Мая Лёзненшчына” з **1998 года** заўсёды прымаў актыўны ўдзел у **Эстафеце патрыятычных спраў,** арганізаваны абласным клубам **“Пошук”**, кіраўніком якога была **Бруева Ларыса Навумаўна**.







*Удзельнікі эстафеты патрыятычных спраў* *“Мір у XXI стагоддзі” (2003г.)*

У **2003 годзе** члены гуртка прымалі ўдзел у **Эстафеце “Мір у XXI стагоддзі”**. Праводзілася эстафета ў дэсантнай воінскай часці Лосвіда.



*У дэсантнай воінскай часці “Лосвіда” (2003г.)*

Тут былі прадстаўлены каманды з усіх раёнаў вобласці. Гэта была сапраўдная **Школа выжывання** ( палова месяца жыцця ў лесе з палаткамі і вогнішчам, на дні па 5-6 конкурсаў, марш-кідок разам з дэсантнікамі і ваінізіраваная гульня **“А заўтра была вайна”**).

Гэту школу выжывання гурток “Мая Лёзненшчына” прайшоў на выдатна. Пры падвядзенні вынікаў мы неаднаразова былі ў ліку пераможцаў і акрамя грамат былі ўзнагароджаны падарожжам у Бярэзінскі запаведнік.

У **2004 годзе** гурток “Мая Лёзненшчына” прымаў удзел у абласным краязнаўчым конкурсе візітак пра свой край **“Галасы роднай зямлі**”. Трэба было на конкурс прадставіць інсцэніраваную візітную картку нашай Лёзненшчыны. Аўтарам вершаў да гэтай візіткі стала ўдзельніца нашага гуртка **Надзея Мешкурова**. Візітка ўдалася і сярод 21 раёна вобласці заняла прызавое 3-е месца.



*Конкурс “Галасы роднай зямлі” (2004г.)*



Былі гурткоўцы і на рэспубліканскім злёце краязнаўцаў на Мінскай абласной турбазе **“Нача”.** Неаднаразова адпачывалі ў рэспубліканскім летніку горада Мінска на рэспубліканскай турбазе, а таксама – у лагеры “Зубраня” на возеры “Нарач”.

*Выступленне каманды “ ДэсБат “ (2000г.)*

Гуртком “Мая Лёзненшчына” створаны **герб СШ №1**, аказана дапамога ў рабоце над **гербам** нашага пасёлка **Лёзна.** У **2005 годзе** на рэспубліцы наш гурток заняў 1-е месца ў абароне турысцка-краязнаўчага праекта **”Край герояў, творцаў і вучоных”.** Гэта турыстычны маршрут па паўночна - ўсходняй частцы Лёзненскага раёна.





*Абарона краязнаўчага праекта. Падарожжа “ Лёзна – тур”. Перадача матэрыялаў музею*

На валанцёрскіх умовах гурткоўцамі быў створаны помнік у вёсцы Пагосцішча **“У гонар незалежнай Беларусі”.** Звесткі пра атрад Ігната Будзіловіча, загінуўшага ў Пагосцішчы, наша краязнаўчая група настаўнікаў знайшла ў абласной бібліятэцы ў **1997 годзе**. Захацелася яшчэ больш даведацца пра гэты атрад. Вучні сталі браць гэту тэму для напісання сваіх рэфератаў па краязнаўству. Хлопчыкаў стала цікавіць, за што аддалі свае жыццё такія маладыя юнакі, як Ігнат Будзіловіч (22 гады) і Кастусь Каліноўскі (26 год).

Калі жыццё толькі пачынаецца, і ўсё магло быць інакш.” Мабыць, не трэба лезці на барыкады ?”.

**Васіль Кулакоў (выпускнік 2001года)** у сваім рэфераце піша так: “За што загінуў 22-гадовы юнак з Валынскай губерні на нашай Лёзненскай зямлі? Скептыкі скажуць – гэта лёс, рок, але я не згодзен з імі. Я лічу, што адказ на гэта пытанне знаходзіцца ў глыбіні душы кожнага з нас. Сам чалавек вырашае, як яму жыць і дзеля чаго не шкада аддаць сваё жыццё. Напэўна, унутраны свет гэтых юнакоў быў напоўнены пачуццём любові да Радзімы, жаданнем таго, каб зямля, на якой яны ўзраслі, стала незалежнай, каб усе людзі жылі ў радасці і свабодзе. Гэтыя маладыя людзі ў свае гады зрабілі больш, чым некаторыя робяць за 70 – 80, або 100 гадоў свайго жыцця”.

Мясцовы краязнаўца **Бандарэнка Уладзімір Карпавіч** у артыкуле “Паўстанцы на Лёзеншчыне” пісаў: “На маю думку, добра было б у Пагосцішчы паставіць нейкі мемарыяльны знак у выглядзе крыжа ці невялікай капліцы ў памяць пра Ігната Будзіловіча і яго паплечнікаў, загінуўшых у далёкім 1863 годзе”. Гурток “Мая Лёзненшчына” адгукнуўся на гэту прапанову. Спачатку мы працавалі над праектам будучага помніка. Было прадстаўлена 2 вучнёўскія праекты (**Кулакова Васіля** і **Бурака Максіма**).



*Праект В. Кулакова (2001г.)*



*Праект М. Бурака (2005г.)*

Мясцовыя ўлады далі дазвол і паказалі месца ўстаноўкі помніка. Гэта было месца былой самай старажытнай царквы нашага раёна Святога Міколы. Далей помнік ствараўся на валанцёрскіх умовах.

Мы паехалі ў саўгас “ Выдрэя”, дзе кіраўнік гэтай гаспадаркі даў нам трактар, і мы хадзілі па палях і збіралі камяні.



*Збор камянёў для помніка (1998г. )*



*Устаноўка помніка ў Пагосцішчы.( 2006 г.)*

Узяўшы за аснову праект Максіма Бурака і знайшоўшы крыж, устанавіць помнік мы не змаглі, таму што нехта забраў сабранае намі каменне (напэўна на фундамент свайго будучага дома).

І толькі **19 жніўня 2006 года** помнік быў устаноўлены. У гэты дзень было дрэннае надвор’е, ранкам ішоў вельмі моцны дождж, але як толькі мы прыехалі ў Пагосцішча, ён спыніўся і даў нам зрабіць сваю справу. Дапамагаў устанаўліваць помнік **Піскуноў Сяргей** (бацька вучня **Піскунава Александра),** разам з сынам, **Рудабельскай Віалетай і Садомавай Ганнай**.




*Надпіс на помніку*

Дапамагалі нам і мясцовыя жыхары.

На мармуровай дошцы змешчаны словы Кастуся Каліноўскага. А на крыжы мы самі напісалі: **“За незалежную Беларусь”**. Мы лічым, што Кастусь Каліноўскі і Ігнат Будзіловіч змагаліся за незалежнасць.

Мы, сённяшняя моладзь, жадаем, каб наша краіна была незалежнай, суверэннай дзяржавай.

А потым было адкрыццё нашага помніка. Кожны год мы прывозілі сюды вучняў на экскурсію. Наведваюць наш помнік і аршанцы, бо Ігнат Будзіловіч быў расстраляны ў Оршы, і таму яны адносяць яго да славутых людзей аршаншчыны.

З 2013 года (150-годдзе паўстання К. Каліноўскага) яны кожны год 28 жніўня наведваюць нашага героя.



*Помнік у Пагосцішчы*



*Адкрыццё помніка ў 2006 годзе*



*28 жніўня 2014 года*

У **2010 годзе** гурткоўцамі быў распрацаваны і абаронены турысцка – краязнаўчы праект па маршруце паўночна - заходняй частцы Лёзненшчыны , які атрымаў назву **“Па слядах гістарычных падзей”**.

Да **70-годдзя** вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у **2012 годзе** быў распрацаваны і здзейснены паход 3-й ступені складанасці па

маршруту **158-й стралковай Лёзненска – Віцебскай дывізіі** ( гэта пешы , 2-х дзённы паход ад Лёзна да Віцебска).




*Паход па баявому шляху 158-й стралковай дывізіі (2012г.)*

Спрабавалі мы распрацаваць турыстычны маршрут **“ Шлях з варагаў у грэкі”**, які ў старажытнасці праходзіў праз нашу мясціну.

На веласіпедах з групай гурткоўцаў мы праехалі па Расійскай Федэрацыі (Мікуліна, Пераволочча, Круглаўка) і да Бабінавіч, уздоўж ракі Лучоса, але справу не давялі да канца. Мабыць гэта справа будучыні.





*Па сухапутнаму шляху “з варагаў у грэкі” (2012г.)*

А колькі яшчэ было паходаў і экспедыцый па роднаму краю. Напісана некалькі дзясяткаў вучнёўскіх рэфератаў па краязнаўству, зроблены буклеты, стэнды, карты-схемы. І ўсё гэта пра нашу Лёзненшчыну.

Хочыцца паведаміць мары гурткоўцаў. На пытанне: якім я бачу Лёзна ў **2125 годзе,** маладыя лёзненцы адказалі, што жадаюць бачыць у раёне басейн, лядовы палац, тэатр юнага гледача, Спаса-Вазнясенскую царкву і кандытарскую фабрыку **“Грыльёзка”.** Хочуць, каб наш гарадскі пасёлак Лёзна стаў **Лёзнаградам,** у якім будзе Дом-музей М. Шагала, а вуліца Леніна стане вуліцай Марка Шагала (бо Лёзна яго малая Радзіма). Хацелася б каб мары іх збыліся !!!




***Выступленне гуртка з візіткай “Галасы роднай Зямлі”***

## 2. Месцы адпачынку на Лёзеншчыне

Лёзеншчына – край дзіўнай прыгажосці. Прырода шчодра адарыла яе незвычайнымі лясамі, багатымі лугамі, узгоркамі, рэкамі і азёрамі. Заўсёды можна адпачыць самастойна на кожным з азёр і рачулак нашага краю.
Але на Лёзеншчыне ёсць і месцы адпачынку, створаныя мясцовымі ўладамі і прадпрымальнікамі. У раёне існуе паляўнічая гаспадарка вядомая за межамі краіны, добраўпарадкаваныя базы адпачынку і некалькі аграэкасядзібаў.



*“Лясныя кар’еры” у Лёзне*

Цікава можна правесці час на ўскраіне нашага пасёлка Лёзна, на берагах 3-х кар’ераў.
Зона адпачынку **“Лясныя кар’еры”** прыстасавана для масавага адпачынку насельніцтва. Тут можна купацца, загараць, катацца на лодках і катамаранах. Кожнае лета на першым кар’еры праходзіць свята “Купалле”.

Побач з кар’ерам размяшчаецца прыгожы дэндрапарк, дзе ёсць дрэвы розных парод нашага краю.



*Вадаём каля шашы Віцебск – Смаленск (2013г.)*

Каля шашы Віцебск – Смаленск таксама створана зона адпачынку, дзе можна парыбачыць і адпачыць. Раней масавым месцам адпачынку лёзненцаў быў **Адаменскі гай**, дзе праводзіліся ўсе святочныя гулянні. Хаця і зараз многія наведваюць яго і адпачываюць на прыгожым беразе ракі Машна.

Зараз амаль усе дзяржаўныя і народныя святы праходзяць на плошчы Леніна нашага пасёлка Лёзна і ў **парку “Школьны”**.



*У парку “ Школьны” (2016г.)*

Ёсць добраўпарадкаваная зона адпачынку на Буёўскім возеры і Дабрамыслінскім вадасховішчы. У Дабрамыслях ёсць крыніца і купель.



*База адпачынку ў Дабрамыслях*



*Купель у Дабрамыслях*

У Дабрамыслях на беразе вадасховішча  побач з ГЭС ёсць пансіянат, які належыць раённым электрасеткам. Там таксама можна добра адпачыць.

Дом паляўнічага **“Кардон лесніка”** знаходзіцца ў 20 км ад Лёзна  ў вёсцы **Стар**, Крынкаўскага сельсавета на беразе ракі.  Гэта аднапавярховы дом з броўнаў, абкладзены цэглай. У доме два памяшканні на 4 спальных месца, абустроеная кухня, душ, туалет. Ёсць гарачая і халодная вада. На тэрыторыі ёсць баня і саўна. Памяшканне для раздзелвання дзічыны, стралковы тір і аўтамабільная стаянка.



*Дом паляўнічага “Кардон лясніка” у  в. Стар*

**Аграэкасядзібы** на Лёзненшчыне  зараз ёсць на тэрыторыі  4-х сельсаветаў:  Лёзненскага, Бабінавіцкага, Дабрамыслінскага і Крынкаўскага.

У вёсцы Асёткі Крынкаўскага сельсавета суб’ектам аграэкасядзібы з’яўляецца  **Звяркова Людміла Леанідаўна**.

У аграгарадку Бабінавічы  суб’ектам аграэкасядзібы з’яўляецца **Багдановіч Наталля Іванаўна**.

У аграгарадку Дабрамыслі  ёсць аграэкасядзіба “Бабіна Гара” , гаспадыняй  якой з’яўляецца  **Макеевіч Таццяна Міхайлаўна.**

І ў Лёзненскім сельсавеце ў аграгарадку Пушкі ёсць аграэкасядзіба **“У Нінэль”**, суб’ектам аграэкатурызму з’яўляецца **Ніканава Ніна Міхайлаўна**.



*Аграэкасядзіба “У Нінэль” (2014г.)*



*Ніканава Ніна Міхайлаўна*

Аграэкасядзіба **“У Нінэль”** аказвае паслугі сельскага быта, збіранне грыбоў і ягад, экалагічна чыстая ежа, руская баня, пешыя прагулкі,  лоўля рыбы  і карпаратыўны адпачынак.

## 2. Экскурсія “Шагалаўскія мясціны ў Лёзне”

### *1. Дачыненне Марка Шагала да Лёзненшчыны*



Імя сусветна вядомага мастака Марка Захаравіча Шагала цесна звязана з Лёзнам. Па-першае, ён нарадзіўся ў нашым мястэчку 7 ліпеня 1887 года. Аб гэтым сведчаць розныя энцыклапедыі і даведнікі. Але віцябляне сталі аспрэчваць гэты факт. І зараз у розных крыніцах месца нараджэння Марка Шагала значыцца па-рознаму. Калі з’явіліся Шагалы ў Лёзне дакладна невядома, вядома толькі, што бацькі і ўся яго радня былі ўраджэнцамі нашага мястэчка.



*Дзед Мордух - Давыд*



*Бабушка Башэва*

Тут жыў **род Шагалаў**. За ракой Мошной, на яўрэйскіх могілках пахаваны дзед і бабка Марка Шагала. **Дзед Мордух-Давыд** быў настаўнікам у хэдэры (яўрэйская школа для хлопчыкаў), памёр яшчэ ў **1886 годзе**.

У гэтым жа годзе бацькі Марка Шагала толькі што пажаніліся. А ў наступным годзе **7 ліпеня 1887года** нарадзіўся Марк, дзе яго дзядзька Зусман трымаў цырульню (младзенца адразу адвезлі ў Віцебск).

У **2002 годзе** выходзе брашура **А. М. Падліпскага** пад назвай **“ Другая Радзіма Марка Шагала”** (гэта пра Лёзна), у якой ідзе аправяржэнне даты і месца нараджэння мастака. У ёй пісалася, што Марк Шагал нарадзіўся **6 ліпеня 1887 года** ў горадзе **Віцебску**. На- конт даты нараджэння згодны, бо нарадзіўся ён ноччу, а вось наконт месца нараджэння – не зусім.



ФРАНЦИЯ

**Кончина М. Шагала**

ПАРИЖ, 29 марта. (ТАСС). На 98-м году жизни в местечке Сен-Поль-де-Ванс на юге Франции скончался широко известный живописец и график Марк Шагал.

Он родился в Лиозно, неподалеку от Витебска. Художественное образование получил в Петербурге. В начале 20-х годов в течение некоторого времени руководил школой искусств в Витебске, участвовал в работе коллегии изобразительных искусств. С 1923 года постоянно жил во Франции.

М. Шагал оставил большое художественное наследие. Последняя крупная ретроспективная выставка его работ была организована во Франции летом прошлого года. В 1973 году в связи с выставкой своих литографий художник посетил СССР.

*Газета “Известия” 1985 года*

Калі ў **1985 годзе з Францыі** прыйшла трывожная вестка. Газета **“Известия” за 29 сакавіка 1985 года** апублікавала паведамленне пра канчыну славутага мастака, у некралозе было напісана , што **нарадзіўся ён у Лёзне, непадалёку ад Віцебска**. Пэўна ж сваякі абапіраліся на нейкія яго дакументы, якія сведчаць пра месца нараджэння мастака Шагала.Таму зараз у розных крыніцах месца нараджэння Марка Шагала значыцца па -рознаму: дзе – горад Віцебск, а дзе – мястэчка Лёзна. З якой мэтай гэта трэба было рабіць? Нават назвы карцін Шагала былі названы па- іншаму. **“Аптэка ў Лёзне”** стала называцца “Аптэка

ў Віцебску”, карціна **“Над горадам”** – Над Віцебскам” (хаця ляцяць Шагал з Бэлай **над нашым мястэчкам Лёзна**).





*Аптэка ў Лёзне. Мал. М. Шагала (1914г.)  Над горадам. Мал. М. Шагала (1914-1918гг.)*

А рабілася ўсё гэта таму, што Шагал прызнанне на Радзіме атрымаў толькі ў 90-х гадах XXст., калі краіна стала на дэмакратычны шлях развіцця.

Таму Віцебск адразу пажадаў стаць Радзімай **сусветна вядомага мастака**. Хутка з дапамогай замежных мецэнатаў у Віцебску ўзнікае **Музей Марка Шагала** (зараз Арт-цэнтр Шагала), затым **Дом-музей** на Пакроўскай вуліцы ( дзе жыла сем’я ), а яшчэ пазней помнікі і вуліца яму ў **Віцебску.**







*Арт- цэнтр Шагала ў Віцебску  Дом - музей на Пакроўскай  Помнік Шагалу. ГвоздзікаўА. Н.*

Усё гэта вельмі добра, але не трэба забываць і пра **Лёзна**, якое мастак заўсёды размяшчаў на сваіх палотнах. У нашым жа раённым музеі змесцілі толькі маленькі куточак прысвечаны вядомаму мастаку.

Марк Шагал ў дзяцінстве вельмі часта наведваў сваіх родных у нашым мястэчку, якім прысвяціў шмат сваіх карцін – **“Мяснік”(**1910г.), **“Прадавец ската”** (1912г.), **“Зал дзеда”**(1911г), **“Парыкмахер**” (1912г**.). ”Музыкант”**, **“Скрыпач на даху**”, **”Зялёны яўрэй”**, **“Цырульня (дзядзька Зусман”).** Шмат карцін прысвечана нашаму Лёзна і яе жыхарам **“Па дарозе ў Лёзна”** (1910г.), **“Ферма ў Лёзне”** (1909г.), **“Лёзна”** (1914г.), **“Заснуўшае мястэчка”**, **“Дом у мястэчку Лёзна”**, **“Прагулка”** (1914г**.**), **“Аптэка ў Лёзне”.**




На першы погляд карціны Шагала зразумець цяжка, але прачытаўшы яго манаграфію **“Маё жыццё”** ўсё становіцца на сваё месца. Тут уся яго душа, адносіны да сваякоў, нават колер гаворыць за яго (фіялетавы тон - самае дарагое, сіні - чужы край, зялёны – перамены).

Знаходзячыся ў далёкай ад нас Францыі, разам з Эйфелевай вежай ён амаль заўсёды змяшчае наша Лёзна.

*Вокладка кнігі М. Шагала “Маё жыццё”(1922г.)*

… “Гарадок як на карцінцы, высокая белая царквушка адзіная на ўсю акругу” - піша ён пра наша Лёзна.


*Новабрачныя на фоне Эйфелевай башні*


*Прыезд да дзеда з бабкай Мал. М. Шагала (1915г.)*


*Я і вёска Мал. М. Шагала*

Карціны Шагала даюць нам, лёзненцам, магчымасць уяўляць сабе, якім Лёзна было ў пачатку XX стагоддзя, бо ў гады Вялікай Айчыннай вайны яно ўсё было разбурана нямецка - фашысцкімі захопнікамі.

Галоўны вобраз мастака – Чалавек, які ідзе наперад, з тварам павернутым назад – на Радзіму. Вельмі даспадобы нам словы пра творчасць нашага земляка ў той час У. У. Маякоўскага: “Дай Бог, каб кожны так шагаў як Шагал”.

У **2003 годзе Падліпскі А. М. і Ціхамірава Н. К.** дабіліся толькі ўстаноўкі **мемарыяльнай дошкі** на РДК (наконт сядзібы Шагалаў), але нам гэтага здаецца мала.



*Дошка на РЦК. Фотаздымак Міхеенкі В. А.(2004г.)*

Лёзненцам хацелася б, каб і ў Лёзне таксама быў **Дом-музей Шагала** і прычым на тым месцы і ў тым доме, дзе ён нарадзіўся.

Гэты дом змешчаны на яго карціне **“Дом у мястэчку Лёзна”**.


*Дом у мястэчку Лёзна.Мал. М.Шагала*


*Насценнае пано ў сш№1 Мал. А. П.Васіленкі (2005г.)*

Адначасова было жаданне: адной з вуліц нашага пасёлка (Леніна або Гагарына) даць **імя Марка Шагала.** Свае мэты мы разам з мастаком **Васіленкам А. П.** змясцілі на насценным пано, якое назвалі **“Над Лёзнам”**.

У **2008 годзе** нам паказалася, што мара з Домам- музеем магла б і здзейсніцца. Бо французскія банкіры далі Віцебску грошы на пабудову Шагалаўскага дома ў мястэчку Лёзна. (газета ” Віцьбічы” №8, 22 мая 2008 г.).

Хутка быў створаны праект гэтага дома з кафэ, гасцінай і з музеем. Але ажыццявіць праект **“Дом ў мястэчку Лёзна”** ў жыццё хацелі зноў ( Дзе б вы думалі?) – у Віцебску. Парадокс! Пасля спрэчак праект быў прапанаваны і нашаму раёну, але каб раён купіў яго за свае і вельмі вялікія грошы.

Затым ён наогул завіс у інтэрнэце (прадаваўся). І ўсё на гэтым…





*Праект дома ў мястэчку Лёзна (2008г.)* *Помнік М. Шагалу ў Лёзне* (*2013 г.*)

Аднак праз нейкі час, у **2013 годзе,** у нашым гарадскім пасёлку Лёзна з’явіўся **помнік Марку Захаравічу Шагалу**.

Устаноўлены ён каля раённага ваенна-гістарычнага музея, пэўна замест праекта “Дома ў мястэчку Лёзна”.

Гэта размова толькі пра Лёзна, але не трэба забываць і пра вёску Завольша, дзе Марк Шагал з Бэлай, а затым і з Ідай адпачываў на іх дачы . Якія прыгожыя карціны стварыў мастак у гэты перыяд свайго жыцця!

Гурток “Мая Лёзненшчына” неаднаразова наведваў вёску Завольша (іх зараз – 3), але знайсці месца дачы бацькоў Розенфельдаў нам так і не ўдалося. Шмат часу прайшло….

Затое добра ведаюць у Германіі, Ізраілі, якое дачыненне мае Марк Шагал да нашага краю, бо яны неаднаразова прыязджалі да нас і сустракаліся з насельніцтвам. Японцы ў **2001 годзе** здымалі нават фільм у нас пра Шагала.







*М. Шагал. Мал. Ю. Пэн (1914г.)* *Здымкі фільма пра Шагала японцамі.(2001г.)*

Мы спадзяёмся, што калісьці наш гарадскі пасёлак Лёзна стане **Лёзнаградам,** у якім будзе **Дом-музей** і вуліца Марка Шагала (бо Лёзна яго малая Радзіма).

Галоўнае, каб моладзь раёна ведала праўду, што мы нараўне з Віцебскам маем права называць яго сваім земляком, бо Радзіма ў нас адна – Беларусь.

## *2. Сцэнарый экскурсіі “Шагалаўскія мясціны ў Лёзне”*

Мы, краязнаўцы Лёзненшчыны, лічым, што Марк Захаравіч Шагал нарадзіўся ў мястэчку Лёзна. У дзяцінстве і юнацтве ён кожны год з Віцебска прыязджаў да сваёй радні ў Лёзна, а ў маладосці (“мядовыя месяцы” жыцця з Бэлай) праводзіў на дачы ў вёсцы Завольша.

У Лёзне з даўніх пор жыў род Шагалаў, прадстаўнікі якога ў даволі вялікай колькасці пакояцца тут ў магіле ахвяр фашызму і на яўрэйскіх могілках за ракой Машной. На Лёзненшчыне маецца шмат мясцін звязаных з жыццём продкаў мастака. Акрамя гэтага, Марк Шагал прысвяціў нашаму краю і шмат сваіх карцін. І ў любым выпадку Шагал мае дачыненне, прычым самае непасрэднае, да нашага краю. Мы лічым яго сваім земляком і жадаем, каб памяць аб ім захоўвалася і не скажалася. Мясцовыя краязнаўцы склалі план шагалаўскіх мясцін у гарадскім пасёлку Лёзна. Яны звязаны як з іменем самаго мастака і яго родных, так і з яго малюнкамі. На жаль на месцах, адлюстраваных на малюнках Шагала, зараз зусім іншыя пабудовы, але ж усё гэта можна сабе ўявіць, ведаючы што і дзе было раней.



У першаю чаргу гэта месца, дзе размяшчаўся двухпавярховы драўляны **дом-сядзіба сям’і Шагалаў** ( дзеда і бацькі будучага мастака). Знаходзіўся ён паміж вуліцамі Леніна (раней Вакзальная) і Гагарына (раней Бабінавіцкая) за раённым Домам культуры. Гэты Дом-сядзіба згарэў. Дошка з надпісам: “На гэтым месцы знаходзілася сядзіба сям’і , з якой паходзіў мастак Марк Шагал 1887 – 1985 гг.” размешчана на РЦК.



Адсюль ( з плошчы Леніна, РЦК) мы і пачынаем сваю экскурсію. Спачатку знаёмім экскурсантаў з біяграфіяй вядомага мастака. Затым расказваем якое дачыненне гэта асоба мае да Лёзна, паказваем план-схему і праводзім іх па мясцінам нашага пасёлка, звязаных з яго іменем.



Пасля ідзём на вуліцу Гагарына (раней Бабінавіцкая), дзе раней знаходзіўся **хэдэр** (яўрэйская школа).

У хэдэры працаваў дзед Марка Шагала – Мордух-Давыд. Недалёка ад хэдэра была **сінагога** (малітоўны дом яўрэяў), якую наведвала ўсё яўрэйскае насельніцтва нашага мястэчка.

Паміж РЦК і кінатэатрам “Світанак” раней стаяла прыгожая праваслаўная **царква Узнясенне Гасподня**, узведзеная яшчэ князямі Агінскімі. Мастак даволі часта размяшчаў яе на сваіх палотнах.



Побач з цяперашнім кінатэатрам “Світанак” і Райвыканкамам на вуліцы Чарняхоўскага ( раней Стара-Віцебская) знаходзіліся **шагалаўскія лаўкі**, дзе яго шмітлікая радня мела лаўкі і вяла разнастайны гандаль. Тут жа знаходзіўся і магазін “Гастраном”, якім валодаў яго дзядзька Елісей Шагал.



А калі прайсці ўніз да мастка праз раку Машна, то на яе левым беразе можна ўбачыць **яўрэйскія могілкі.** Крыху ніжэй былі пахаваны продкі Шагала. Там захавалася некалькі мацейваў, але невядома каму яны належаць (надпіс зроблены на іўрыце).



На месцы сучаснага райвыканкама, крыху правей ад яго ( у садзе), жыў цырульнік дзядзька Зусман, на другім паверсе жыла яго сям’я. Гэты факт адлюстраваны ў карцінах Марка Шагала **“Дом у мястэчку Лёзна”, “Цырульня (Дзядзька Зусман)”.**



Далей, калі б мы пайшлі ў бок вёскі Калышкі, наш шлях праходзіў бы па вуліцы Камсамольскай (раней Мікулінская). На гэтай вуліцы і побач з ёй на вуліцах Валадарскага і Калгаснай у гады Вялікай Айчыннай вайны было **адкрытае гета** (месца ўтрымання яўрэяў фашыстамі), дзе знаходзіліся і родныя Шагала.





➧ Мы ідзем далей па вуліцы Леніна ( раней  Папоўская). На месцы прыватнай крамы “Бярозка” ў шагалаўскі час знаходзілася аптэка. Адна з карцін Марка Шагала так і называецца —**“Аптэка ў Лёзне”.**



➧ Помнік Марку Шагалу каля Раённага ваенна-гістарычнага музея. Аўтары яго Гвоздзікаў А. Н. і Азат Тарасян. Установлены помнік  ў  2013 годзе.



➧ Пераходзім шашу Віцебск – Смаленск. За  бальніцай у Адаменскім рове пакояцца ахвяры халакоста Вялікай Айчыннай вайны. На гэтым месцы ўстаноўлены **помнік ахвярам фашызму** (1200 чалавек).

Некалькі гадоў  таму з Іерусаліму нашаму краязнаўцу У. К. Бандарэнка перадалі спісы растраляных у Лёзне яўрэяў.

Сярод іх пахавана 17 чалавек з прозвішчам Шагал. Гэтыя спісы Уладзімір Карпавіч перадаў і нам. Мы лічым, што зараз гэтыя спісы ахвяр халакоста можна было б змясціць на  плітах помніка.

➧ Знаходзячыся каля  шашы Віцебск – Смаленск,  экскурсантам можна паведаміць пра Завальшанскі перыяд творчасці Шагала, бо да вёскі  Завольша 10 км, калі ехаць на Смаленск..



*Аўтамабільная дарога Віцебск–Смаленск*



*Вакно ў Завольшы Мал. М. Шагала(1915г.)*

## 3. Турыстычны паход па баявому шляху двойчы Чырвонасцяжнай ордэна Суворава Лёзненска – Віцебскай 158-й Стралковай дывізіі

З велізарнай мужнасцю і ўпартасцю адстойвалі нашы воіны кожны кавалачак роднай зямлі. З франтоў не вярнулася каля 8-мі тысяч нашых землякоў, больш за 5 тысяч мірных жыхароў былі знішчаны падчас акупацыі.

Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто ў гады вайны адстаяў свабоду і незалежнасць цаной свайго жыцця. Мы павінны быць ўдзячнымі, што наша пакаленне і пакаленне нашых дзяцей не бачыла страху вайны. Мы проста абавязаны памятаць і шанаваць подзвіг і гераізм нашых дзядоў і прадзедаў, каб не паўтарыліся памылкі мінулага. Мы павінны ўносіць свой уклад у захаванне памяці аб іх подзвігу, ведаць самі і расказваць сваім дзецям пра людзей, якія не шкадавалі свайго жыцця ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Вясной **2011 года** мне пашчасціла трапіць на XIV Межнародны злёт школьных музеяў, які праводзіўся ў Цвярской губерні РФ (в. Аленіна). Адтуль пачынаўся баявы шлях 158-й стралковай дывізіі пад кіраўніцтвам генерал - маёра Бязуглага Івана Сямёнавіча, якая вызваляла нашу Лёзненшчыну.



*Удзельнікі XIV межнароднага злёту музеяў (2011г.)*



*Бязуглы І. С*



*Дэлегацыя злёту з СШ №1*

У 2010 годзе маскоўскія школьнікі здзейснілі паход па шляху гэтай дывізіі. З Масквы да Рудні яны ехалі на цягніку, а затым 60 км пешшу да Віцебска. Вось і атрад “ДесБат” вырашыў таксама прайсці шляхам вайны. Прасачыў шлях дывізіі па ваеннай карце і распрацаваў маршрут пахода.

**22 чэрвеня 20012 года** роўна ў 4 гадзіны раніцы атрад “ ДесБат” пачаў свой рух. Пачаткам шляху была сярэдняя школа № 1, канцом – плошча Перамогі ў горадзе Віцебску. Мы прайшлі па месцах баявой, гістарычнай славы 158-ай Стралковай дывізіі. Прайшоўшы 40 км мы зразумелі , як гэта было цяжка, ішоўшы толькі 2 дні, а воіны 158-ай стралковай дывізіі ішлі 8 месяцаў і тысячы з іх не дайшлі: загінулі..



*Помнік каля в. Смародзіна*



*Афіцэрскія могілкі*



*Помнік у в. Вялікае Сяло*

## 4. Падарожжа па паўночна-ўсходняй частцы раёна “Край герояў, творцаў і вучоных”.

### *1. Характарыстыка адметнасцяў аўтобуснай экскурсіі па маршруце*

***Узрост экскурсантаў — 13-17 гадоў. Характар экскурсіі — агульна-азнаямляльны. Склад і спецыфіка групы — 25-35 чалавек, вучні звычайных, няпрофільныых класаў.***

**Зместавыя і форматворчыя асаблівасці экскурсіі**

У працэсе правядзення дадзенага варыянту экскурсіі прапануецца сцісла пазнаёміць яе ўдзельнікаў з жыццём і дзейнасцю **12 вядомых асоб Лёзненшчыны**.

Сярод іх — 2 героі працы (у галіне прамысловасці — сталявар Д. І. Барашкін, у галіне сельскай гаспадаркі — ільнавод Р. У. Кубліцкая), 4 героі вайны (падпольшчык А. Я. Белахвосцікаў, партызанскі камбрыг А. Ф. Данукалаў, палітработнік рэгулярнай арміі Я. М. Фамін, воін-інтэрнацыяналіст А. В. Бельчыкаў), 4 вучоных, даследчыкі (у галіне кінематаграфіі — Е. Л. Бондарава, у галіне медыцыны — Я. Д. Буглоў, у галіне беларускай этнаграфіі — М. Я. Нікіфароўскі, у галіне літаратуразнаўства — А. Ф. Рыпінскі), 2 прадстаўнікі творчых прафесій (мастак М. Шагал і оперная спявачка Л. Р. Ганестава). Падбор персанажаў для насычэння зместу экскурсіі актуальнай выхаваўчай праблематыкай досыць разнастайны, што павінна садзейнічаць захаванню ўвагі ва ўдзельнікаў падарожжа на працягу ўсяго маршруту. Але з другога боку **большасць** пералічаных вышэй **фігур практычна незнаёмыя шырокай аўдыторыі**. Безумоўнае выключэнне адно: мастак Марк Шагал, сусветна вядомае імя. Усе іншыя, акрамя палкавога камісара Фаміна, нават не згадваюцца на старонках школьных падручнікаў. Школьнікі, якія, мяркуецца, будуць асноўнымі спажыўцамі турпрадукту дадзенай экскурсіі, могуць ведаць таксама пра Аляксандра Белахвосцікава і Аляксея Данукалава, паколькі ў іх гонар названы вуліцы ў абласным цэнтры, і пра Мікалая Нікіфароўскага, рэльефны партрэт якога ўпрыгожвае мемарыяльную дошку на адным з будынкаў непадалёк ад былой ратушы. Сярод астатніх больш распрапагандаванай персонай з’яўляецца, зразумела, А. Рыпінскі, але і гэтае імя прысутнічае толькі ў школьнай праграме профільных філалагічных класаў.

Такая сітуацыя вымагае правільнага падыходу **да вызначэння зместу і формы падачы краязнаўчага матэрыялу**. Нельга перагрувашчваць экскурс новай інфармацыяй, увесь час трэба абапірацца на вядомыя дзецям факты, звесткі, паняцці. Нават выдатнае валоданне словам і акцёрскія здольнасці экскурсавода наўрад ці засцерагуць ад няўдачы, калі падарожжа будзе ўяўляць сабой суцэльны маналог чалавека з мікрафонам.

Варта прадугледзець змену экскурсаводаў на маршруце, перыядычна весці дыялог з аўтобуснай аўдыторыяй, шырока ўжываць разнастайныя гульнёвыя формы працы з турыстамі, перш за ўсё акцэнтаваць іх увагу на важным краязнаўчым матэрыяле.

Першаступеннае месца ў дадзенай экскурсіі павінна займаць **дэманстрацыя відэазапісаў**. І для таго, каб зрабіць менш насычаным маналагічны гукарад, і для ілюстравання слоў экскурсавода, і для замацавання ўбачанага і пачутага, і для розных іншых мэтаў. Асабліва ўзрастае роля відэакадраў на тых прыпынках маршруту, дзе практычна адсутнічаюць аб'екты паказу (зніклыя вёскі і да т.п.) І канешне ж, адзняты відэаматэрыял дазваляе скласці значна больш поўнае і трывалае ўяўленне пра героя экскурсійнага аповеду, чым самы лепшы фотаздымак. Дзеля таго, каб любая экскурсія атрымалася, важна, акрамя яе пазнавальнай складаючай, звярнуць увагу і **на пачуццёвы бок**. Чым больш перажыванняў зведаюць дзеці на маршруце, тым больш цікавым і запамінальным будзе для іх падарожжа.

Маршрут "Край герояў, творцаў і вучоных" адкрывае для рэалізацыі гэтай мэты багатыя магчымасці. Край сапраўды незвычайны, насычаны гістарычнымі падзеямі, нарадзіўшы і прыцягнуўшы да сябе значную колькасць неардынарных людзей. Тут ёсць чым ганарыцца і захапляцца, ёсць ад чаго здзіўляцца, радавацца і смуткаваць. Ды і для смеху знойдзецца дастаткова розных нагод. Для ўзмацнення эмацыянальнага ўздзеяння на турыстаў у працэсе экскурсій прадугледжваецца шырокае выкарыстанне музычнага матэрыялу.

**Выхаваўчы патэнцыял** дадзенай экскурсіі грунтуецца перш за ўсё на яркіх фактах біяграфій выдатных людзей, узорах іх высакародных учынкаў, прыкладах самаадданага служэння гуманістычным прынцыпам, Радзіме, абранай справе, пра якія паведамляць экскурсантам трэба жыва, цікава, даходліва і без ментарства. У распараджэнні экскурсавода маецца шмат матэрыялу, які зможа садзейнічаць фарміраванню ў школьнікаў патрыятычных пачуццяў і памкненняў.

У многіх месцах маршруту прадугледжваецца аповед пра подзвігі герояў. Яркімі фарбамі жывапісных твораў і пранікнёных слоў пра любоў да роднай зямлі дазваляе ўпрыгожыць тканіну экскурсіі фігура Марка Шагала. Пра важнасць у жыцці мэтанакіраванай працы даюць магчымасць паразважаць лёсы Я. Буглова, М. Нікіфароўскага, Д. Барашкіна. У шэразе эпізодаў падарожжа варта закрануць і такія актуальныя для моладзі пытанні, як сяброўства, каханне, маральныя прыярытэты рэчаіснасці і інш. Досыць павучальныя сведчанні ўтрымліваюцца ў некаторых аўтабіяграфіях, анкетах нашых выдатных землякоў.

Вельмі важным сродкам выхавання гонару за свой край з'яўляюцца ацэначныя выказванні ў адрас яго прадстаўнікоў, ураджэнцаў з боку шырока прызнаных аўтарытэтаў — дзеячоў навукі, культуры, дзяржаўнага кіравання і да т.п. Значная ўвага ў ахарактарызаваным варыянце экскурсіі (схема яго сцэнару змяшчаецца праз абзац) надаецца **замацаванню набытага досведу**. Пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца магчымасці відэатэхнікі і, на заключным этапе, прадугледжваецца праца з матэрыяламі Лёзненскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага музея. Замацаванне атрыманай вербальнай і візуальнай інфармацыі ажыццяўляецца галоўным чынам у гульнёвай форме.

## *2. Сцэнарная схема аўтобуснай экскурсіі “Край герояў, творцаў і вучоных”*

| № п/п | Ход і змест экскурсіі, форма падачы краязнаўчага матэрыялу | Выкарыстанне відэа- і аўдыёматэрыялаў |
|---|---|---|
| 1 | Знаёмства з групай турыстаў. Паведамленне пра мэты і праграму экскурсіі. Арганізацыйны момант. | |
| 2 | ***Прыпынак №1*** (на вул. Леніна ў Лёзне).<br><br>Аповед пра мастака Марка Шагала, яго дачыненне да Лёзненшчыны, пранесеную прызнаным майстрам праз усё жыццё адданасць Радзіме і дараванае яму лёсам шчасце вялікага кахання да Бэлы Розенфельд.<br>Паказ месцаў былога знаходжання ў пасёлку Лёзна будынкаў цырульні, аптэкі, сінагогі, звязаных з асобай М. Шагала (ні адзін з гэтых будынкаў, на жаль, не захаваўся да нашага часу нават фрагментарна). | Дэманстрацыя відэакадраў (шагалаўскія мясціны ў Віцебску, творы Шагала, на якіх адлюстраваны пасёлак Лёзна і муза мастака Бэла Розенфельд). |
| 3 | Пры выездзе з Лёзна звяртаецца ўвага экскурсантаў на тое месца, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны фашыстамі праводзілася знішчэнне тутэйшага яўрэйскага насельніцтва. | |
| 4 | ***Прыпынак №2*** (ля могілак вёскі Альхавік).<br><br>Аповед пра воіна-інтэрнацыяналіста Аляксандра Бельчыкава (ён нарадзіўся значна пазней за Марка Шагала, але загінуў амаль адначасова з тым, як смерць напаткала старога майстра), пра яго дзяцінства, школьныя гады, удзел у афганскай вайне, якая дачасна абарвала многія маладыя жыцці. Некалькі меркаванняў на афганскую тэму з выкарыстаннем ацэнак Святланы Алексіевіч, змешчаных у яе кнізе “Цынкавыя хлопчыкі”.<br>Паказ месцаў знаходжання на вясковых кладах магіл Аляксандра Бельчыкава і яго бацькі, які ненадоўга перажыў свайго сына. | Пры пад’ездзе да могілак гучыць урывак з песні “Камбат-бацяня”.<br><br>Дэманстрацыя відэакадраў (памяць пра А.В.Бельчыкава ўшаноўваецца ў музеі СШ №1 гарадскога пасёлка Лёзна і ў Віцебскім музеі воінаў інтэрнацыяналістаў). |

| | | |
|---|---|---|
| 5 | ***Прыпынак №3*** (на вуліцы Аляксандра Бельчыкава ў вёсцы Альхавік).<br><br>1) Працяг аповеду пры А. В. Бельчыкава ля дома, дзе ён нарадзіўся і пражыў большую частку свайго кароткага жыцця. Зараз тут жыве яго адзінокая маці.<br>2) Паказ месца ў вёсцы, дзе знаходзілася калісьці сядзіба сямейства Белахвосцікавых, гаспадыні якога давялося пераджыць шмат гора: да вайны аплакаць страту мужа (з прычыны палітычных рэпрэсіяў), а ў час вайны — смерць чатырох сваіх дзяцей.<br>Аповед пра Героя Вялікай Айчыннай вайны Аляксандра Белахвосцікава, пра агітацыйна-прапагандысцкую, разведвальную, дыверсійную дзейнасць у Віцебску падпольнай групы, якой ён кіраваў, пра ўвекавечванне нашчадкамі памяці адважнага патрыёта, загінуўшага ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. | Дэманстрацыя відэакадраў (успамін маці пра сына).<br><br>Дэманстрацыя відэакадраў (мясціны ў Віцебску, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Аляксандра Белахвосцікава). |
| 6 | ***Прыпынак №5*** (на шашы Лёзна-Веляшковічы, ля звароту на вёску Новая Дуброва).<br><br>Правядзенне з турыстамі, падзеленымі на 2 групы, пазнавальнай гульні.<br>Яе мэта — прыгадаць, прадстаўнікі якіх прафесій прымаюць удзел у стварэнні мастацкіх кінафільмаў, засвоіць, што ўраджэнка вёскі Гапонава (вёска зараз не існуе, знаходзіцца прыкладна за 5 км на захад ад месца прыпынку) Ефрасіння Бондарава з'яўляецца вядомым беларускім кіназнаўцам і кінакрытыкам.<br><br>Правядзенне з тымі ж дзвюма групамі падарожнікаў кінавіктарыны з мэтай высветліць, пра якія фільмы, знятыя па творах пісьменнікаў-землякоў, пісала ў сваіх кнігах Ефрасіння Леанідаўна Бондарава. | На экране тэлевізара дэманструюцца тры, знятыя ў розны час, фатаграфіі Еўфрасінні Леанідаўны Бондаравай. Прапануецца: паспрабаваць вызначыць па знешніх прыкметах фотапартрэтаў яе прафесію.<br>Дэманстрацыя ўрыўкаў з кінафільмаў "Міколка-паравоз" (па аповесці Міхася Лынькова), "Альпійская балада" (па аповесці Васіля Быкава), "Дзікае паляванне караля Стаха" (па аповесці Уладзіміра Караткевіча). |

| | | |
|---|---|---|
| 7 | ***Прыпынак №6*** (у вёсцы Веляшковічы, ля сярэдняй школы).<br><br>Аповед вучня-экскурсавода з мясцовай школы пра вядомага беларускага этнографа Мікалая Нікіфароўскага (у адрозненне ад Аляксандра Бельчыкава, Аляксандра Белахвосцікава і Ефрасінні Бондаравай — выхадцаў з сялянскіх сем'яў, Мікалай Нікіфароўскі — сын царкоўнага служкі), яго дачыненне да Веляшковіччыны. Знаёмства са зместам галоўных прац даследчыка, прысвечаных матэрыяльнай культуры і фальклору беларусаў Віцебшчыны, адбываецца на падставе матэрыялаў школьнай этнаграфічнай калекцыі і экспазіцыі, якая адлюстроўвае легенды, прыкметы, павер'і, загадкі і г.д., запісаныя аўтарам згаданых прац на Лёзненшчыне.<br>У школьнай сталоўцы экскурсантам прапануецца пакаштаваць беларускія стравы, апісаныя Нікіфароўскім у кнізе "Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии…" | |
| 8 | На шляху да наступнага прыпынку экскурсантам паведамляюцца дадатковыя цікавыя звесткі пра Нікіфароўскага (аб яго працы "Дудар і музыка", увекавечванні памяці выдатнага земляка ў Віцебску). | Дэманстрацыя відэакадраў (знаёмства з канструкцыяй дуды і ігра на ёй; памятныя мясціны ў Віцебску, звязаныя з імем Мікалая Нікіфароўскага). |
| 9 | ***Прыпынак №7*** (на шашы Веляшковічы-Кавалі; арыенцір наступны: з правага боку, крыху наперадзе, на адлегласці 1 км бачна вёска Гарадок).<br><br>Аповед пра вучонага-медыка Яўгена Буглова (у адрозненні ад Мікалая Нікіфароўскага, Буглоў нарадзіўся ў вёсцы Стрыжанёва Лёзненскага раёна, якая зараз не існуе. Яна знаходзілася прыкладна ў 4 км на захад ад месца прыпынку), пра вельмі каларытную фігуру яго дзеда — праваслаўнага святара ў Веляшковічах, пра ролю, якую адыграла ў жыцці будучага | Дэманстрацыя відэакадраў (фатаграфіі і дакументы з асабістага архіву доктара медыцыны; рэбус, у якім зашыфравана яго прозвішча) і ўрыўка з навукова-папулярнага фільма пра вынайдзены групай вучоных пад кіраўніцтвам Яўгена Данілавіча Буглова спосаб атрымання бесцытратнай("чыстай") донарскай крыві. |

| | | |
|---|---|---|
| | вучонага цяжкое раненне на фронце, пра выдатнае навуковае адкрыццё слаўнага земляка, зробленае ім у галіне трансфузіялогіі. | |
| 10 | ***Прыпынак №8*** (на шашы Веляшковічы - Кавалі, ля павароту на вёску Шавялі).<br><br>Прадметам размовы на гэтым прыпынку з'яўляецца асоба Героя Сацыялістычнай Працы, Ганаровага грамадзяніна горада Мінска Дзмітрыя Барашкіна (родам з вёскі Шавялі). Звяртаецца ўвага на тое, што ніводнаму з ураджэнцаў Лёзненшчыны, з кім адбываецца знаёмства экскурсантаў на маршруце, не прысвечана столькі літаратурных і публіцыстычных твораў, колькі Барашкіну.<br><br>Праводзіцца пазнавальная гульня, мэты якой:<br><br>а) засвоіць, што знакаміты зямляк працаваў сталяварам на Мінскім аўтазаводзе,<br><br>б) падкрэсліць важкасць яго працоўных заслуг. Турыстам правага і левага бакоў аўтобуса прапануецца вызначыць па фотавыявах, дзе сярод іншых марак грузавых аўтамабіляў машыны сямей МАЗ-200 і МАЗ-500, у выпуску якіх прымаў удзел Дзмітрый Барашкін. | Пры пад'ездзе да месца прыпынку гучыць урывак з песні пра Мінск "Широким проспектом шагаю…"<br><br>Дэманстрацыя відэакадраў (кнігі, прысвечаныя Дзмітрыю Барашкіну, яго фотапартрэт, выявы МАЗаў і іншых грузавікоў). |
| 11 | Пры пад'ездзе да наступнага прыпынку, дзе размова пойдзе пра партызан Лёзненшчыны, у першую чаргу пра камбрыга народных мсціўцаў Аляксея Данукалава.<br><br>Экскурсантам паведамляецца, што Дзмітрый Барашкін у гады Вялікай Айчыннай вайны быў кулямётчыкам у брыгадзе "Аляксея", у адным з баёў атрымаў раненне ў нагу. | Гучыць урывак з песні "Память сердца" ("Не спится только ветерану, войны минувшей парти-зану…") |

| | | |
|---|---|---|
| 12 | ***Прыпынак №9*** (у вёсцы Кавалі, ля школы).<br><br>Турысты падзяляюцца на дзве групы, для якіх папераменна праводзяцца дзве кароткія (па 10 хвілін) экскурсіі: адна — тутэйшай бібліятэкаркай у мемарыяльным музеі А. Ф. Данукалава, другая — школьным экскурсаводам ля помніка партызанам-аляксееўцам.<br><br>Слухачам паведамляецца, што Аляксей Данукалаў родам з Саратаўскай вобласці, кадравы ваенны танкіст (гэта нагода ўспомніць Аляксандра Бельчыкава), стваральнік партызанскай брыгады, якая мацней за іншыя фарміраванні народных мсціўцаў звязана з Лёзненшчынай. Загінуў пры прарыве блакады на Ушаччыне ў 1944 годзе.<br><br>Трэба звярнуць увагу кавалёўскіх экскурсаводаў на тое, каб:<br><br>а) і ў музеі, і ля помніка паўтаралася інфармацыя пра колькасць партызан-данукалаўцаў і лік панесеных імі за тры гады вайны людскіх страт;<br><br>б) пры аповедзе пра баявую дзейнасць аляксееўцаў (дыверсіі на дарогах, напады на варожыя гарнізоны і г.д.) падбіраліся факты, якія так ці інакш звязаны з персанажамі, аб'ектамі распрацаванай аўтобуснай экскурсіі, размешчанымі ўздоўж яе маршруту населенымі пунктамі (вядома, напрыклад, што з брыгадай Аляксея падтрымлівала сувязь віцебская падпольная група Аляксандра Белахвосцікава). | Пасля выезду аўтобуса з Кавалёў дэманструюцца відэакадры (працы скульптараў, жывапісцаў, графікаў, у якіх адлюстраваны вобраз Аляксея Фёдаравіча Данукалава).<br>Падкрэсліваецца думка, што з усіх персанажаў дадзенай экскурсіі А. Ф. Данукалаў — найбольш папулярны герой твораў беларускага выяўленчага мастацтва. |

| | | |
|---|---|---|
| 13 | ***Прыпынак №10*** (у вёсцы Страганы, насупраць старой сажалкі).<br><br>Аповед пра лёзненскі перыяд жыцця былога палітэмігранта, рознабакова таленавітага чалавека, шляхціча па паходжанні Аляксандра Рыпінскага (родам з Віцебскага раёна), пра стварэнне ім у Страганах першай беларускай хрэстаматыі і першай гісторыі беларускай літаратуры (гэтыя працы, верагодна, не захаваліся, вядомы па апісаннях, ускосных звестках).<br>Экскурсанатам прапануецца: а) вызначыць назвы беларускіх паэм, уключаных Рыпінскім у хрэстаматыю (“Тарас на Парнасе” і “Энеіда навыварат”) па вельмі вядомых урыўках з гэтых твораў;<br>б) па кавалку тэксту з рукапісу Рыпінскага зрабіць выснову пра мову яго прадмоў да згаданых і іншых твораў хрэстаматыі (мова польская). Трэба падкрэсліць, што без інфармацыі Рыпінскага сучасным літаратуразнаўцам наўрад ці ўдалося б высветліць імя найбольш верагоднага аўтара паэмы “Тарас на Парнасе”. | Пры пад’ездзе да Страганоў пачынае гучаць музыка славутага паланэзу Міхаіла Клеафаса Агінскага “Развітанне з Радзімай”.<br><br>Дэманструюцца відэакадры (падчас вялікага купальскага свята, арганізаванага абласнымі і раённымі ўстановамі культуры. На паверхню вады страганоўскай сажалкі апускаецца вянок памяці Аляксандра Рыпінскага). |
| 14 | ***Прыпынак №11*** (у вёсцы Калышкі, ля помніка знішчаным фашыстамі яўрэям).<br><br>Аповед пра аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці, палкавога камісара Яўхіма Фаміна, пра яго паходжанне, нялёгкае дзяцінства, якое не папсавала, аднак, характар будучага героя.<br>Саслужыўцы адзначалі справядлівасць свайго палітычнага важака, уважлівае стаўленне да іншых і нязменную патрабавальнасць да сябе. Пры размове пра подзвіг абаронцаў крэпасці трэба падкрэсліць мужнасць, стойкасць Я. Фаміна, рашучасць яго камандзірскіх дзеянняў.<br>Імя героя дастойна ўшанавана ў Брэсце, Мінску і на Лёзненшчыне. Экскурсантам паказваецца месца, дзе была сядзіба Фаміных. | Дэманструюцца відэакадры (партрэт Я. М. Фаміна, мастацкія творы, прысвечаныя подзвігу бессмяротнага гарнізона Брэсцкай крэпасці). |

| | | |
|---|---|---|
| 15 | ***Прыпынак №12*** (у вёсцы Калышкі, ля сярэдняй школы).<br>1) Аповед пра оперную спявачку, заслужаную артыстку Беларусі Людмілу Ганеставу (як і Фамін, яна нарадзілася ў Калышках і зазнала дзяцінства без бацькоў). Гучыць яе вельмі цёплы ўспамін пра гады вучобы ў школе. Хаця ў атэстаце Людмілы Кір’янавай (дзявочае прозвішча артысткі) даволі шмат пасрэдных адзнак, падкрэсліваецца, што для сапраўднага таленту — гэта не перашкода ў кар’еры.<br>Праводзіцца відэа - і аўдыёвіктарына, мэты якой:<br>а) засвоіць, што голас Ганеставай — лірыка-драматычнае сапрана, што да выхаду на пенсію яна была артысткай Дзяржаўнага тэтра оперы і балета БССР;<br>б) вызначыць па прапанаваных урыўках папулярных жаночых вакальных партый (з дапамогай навадных пытанняў), у якіх шырока вядомых оперных спектаклях спявала наша зямлячка;<br>в) высветліць, у якіх краінах свету яна была на гастролях (выкарыстаць для гэтага выявы дзяржаўных сімвалаў — гербаў і сцягоў).<br>2) Аповед пра Героя Сацыялістычнай Працы, ільнавода Раісу Кубліцкую вядзе экскурсавод школьнага музея. Для турыстаў будзе цікава пачуць успаміны Кубліцкай пра школьныя гады, пра тое, як яны з сястрой-блізняткай падманвалі на ўроках настаўнікаў. Але вайна перарвала шчаслівае дзяцінства і ўжо з 15 гадоў сёстры пачалі працаваць у ваенным шпіталі. Найбольш важнай з’яўляецца інфармацыя пра тое, за кошт чаго Раісе Уладзіміраўне ўдавалася дасягаць высокіх паказчыкаў у вытворчасці ільнопрадукцыі і забяспечваць уражвальны ўнёсак яе звяна ў агульны даход калгаснага калектыву.Экскурсанатам паказваецца дом, у якім жыла Раіса Уладзіміраўна Кубліцкая да пераезду ў Мінск. | Дэманстрацыя відэакадраў (фотаздымкі і дакументы Людмілы Раманаўны Ганеставай, фотавыявы Мінскага тэатра оперы і балета, дзяржаўных сцягоў і гербаў шэрагу краін).<br>Праслухоўванне аўдыёзапісаў урыўкаў з папулярных жаночых арый класічнага опернага рэпертуару.<br><br>Праслухоўванне аўдыёзапісу ўспамінаў Раісы Кубліцкай. |

| | | |
|---|---|---|
| 16 | Па дарозе з Калышак на Лёзна ў гульнёвай форме праводзіцца замацаванне пачутага і ўбачанага, пры гэтым шырока выкарыстоўваецца відэазапіс. Адзін з прыёмаў гульні наступны. Трэба пазнаць асоб, пра якіх ішла гаворка ў час экскурсіі, у відэакадрах нядаўніх сустрэч з імі. Пэўная складанасць тут у тым, што сённяшні ўзрост гэтых людзей значна больш сталы, чым іх выгляд на фотапартрэтах, якія дэманстраваліся на прыпынках маршруту. | Дэманстрацыя відэаматэрыялу. |
| 17 | ***Прыпынак №13*** (ля раённага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага музея).<br>У музеі па выніках экскурсій праводзіцца краязнаўчая гульня “Слабае звяно”.<br>Яе пераможца і іншыя актыўныя ўдзельнікі пазнавальнага спаборніцтва, якое на працягу ўсяго падарожжа вялося паміж краязнаўцамі правага і левага бакоў аўтобуса, узнагароджваюцца падборкай буклетаў пра выдатных людзей Лёзненшчыны. | |









*Падарожжа па паўночна-усходняй Лёзненшчыне (2007г.)*

## 5. Падарожжа па паўднёва - заходняй частцы раёна
## “Па слядах гістарычных падзей”

### *1. Характарыстака адметнасцяў аўтобуснай экскурсіі па маршруце*

Турысцка-краязнаўчы маршрут **“Па слядах гістарычных падзей”**, распрацаваны ў якасці базавага варыянту аўтобуснай экскурсіі па паўднёва - заходняй частцы Лёзненшчыны. Экскурсія разлічана на 6 гадзін. Яна прадугледжвае падарожжа па ўсёй адлегласці маршруту і знаёмства з жыццём і дзейнасцю пераважнай большасці згаданых знакамітых асоб. Выбар персанажаў для ўключэння ў сцэнарый экскурсіі залежыць ад складу экскурсантаў і мэтаў падарожжа турысцкай групы. Прапанаваны варыянт аўтобуснай экскурсіі разлічаны на школьнікаў 7 - 11 класаў.




Яго характэрныя асаблівасці: шырокае выкарыстанне відэакадраў, музычнага суправаджэння і гульнёвых форм засваення краязнаўчага матэрыялу. Распрацоўка і стварэнне турысцка-краязнаўчых маршрутаў па тэрыторыі ўсёй Лёзненшчыны і выкарыстанне іх у турысцка-краязнаўчай дзейнасці (экскурсій для вучняў і для агратурызму).

*Буклеты падарожжа па Лёзненшчыне(2005г.,2008г.)*

Нітка маршруту ўяўляе сабой замкнёную лінію працягласцю каля 75 км, якая нагадвае ў плане чатырохкутнік з крывымі або ламанымі бакамі.
Краязнаўчыя аб’екты (помнікі, будынкі, магілы, музеі ці проста мемарыяльныя мясціны) размешчаны непасрэдна на трасе маршруту ці на нязначнай адлегласці ад яго (да трох - пяці кіламетраў).

Персанажы, знаёмства з жыццём і дзейнасцю якіх можа адбывацца падчас вандроўкі па маршруце, у большай частцы гістарычныя асобы, нябожчыкі, але ёсць і жывыя сучаснікі. На распрацаваным маршруце аўтобуснай экскурсіі прадугледжваецца 12 прыпынкаў.

Прычым разглядаць іх трэба не проста як месца спынення аўтобуса, а як нагоду для размовы пра аднаго, двух ці некалькіх выдатных людзей, якіх нарадзіла, прытуліла або натхніла тутэйшая зямля. У гэтым сэнсе ўсе 12 прыпынкаў маршруту могуць быць выкарастаны і пры правядзенні пешых, веласіпедных і іншых турысцкіх паходаў і экскурсій.

На некаторых з прыпынкаў ёсць цікавыя краязнаўчыя аб`екты - помнікі, музеі, мемарыяльныя будынкі, а таксама выдатныя суразмоўцы, апавядальнікі, спецыяльна падрыхтаваныя вучні - экскурсаводы.

**Персанажы, пра якіх ідзе размова ў праекце і мясціны на Лёзненшчыне, звязаныя з гэтымі персанажамі:**

1. Гурка І. У. – генерал-фельдмаршал Расійскай імперыі. Вёска Высачаны
2. Лынькоў М. Ц. – вядомы беларускі пісьменнік. Вёска Крынкі
3. Шагал М. З. – сусветна вядомы мастак. г. п. Лёзна. Вёска Завольша
4. Акцябрская М. В. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Крынкі
5. Ціхмянаў Л. П. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Асіпенкі
6. Смірноў У. Я. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Вялікае Сяло
7. Судакоў М. П. – Герой Савецкага Саюза. Г. п. Лёзна
8. Арлоў Ц. М. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Стасева
9. Рэшатаў П. Д. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Смародзіна
10. Ліціцын У. С. – беларускі паэт, журналіст. Вёска Пагосцішча
11. Пальмбах А. А. – вядомы вучоны – цюрколаг. Г. п. Лёзна
12. Чарапнёў С. М. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Шніткі
13. Мацкевіч І. В. – Герой Савецкага Саюза. Вёска Завольша
14. Антонаў А. Г. – Герой Сацыялістычнай Працы. Вёска Высачаны
15. Альсмік П. І. – Герой Сац. Працы, селекцыянер-бульбавод. Вёска Выдрэя
16. Ігнатава М. Я. – Герой Сац. Працы, жывёлавод племзавода. Вёска Крынкі
17. Свірыдаў С. А. – журналіст і пісьменнік Беларусі. Вёска Анупрыенкі
18. Пацыенка Г. Б. – сучасны пісьменнік. Вёска Зубакі (г. Масква)
19. Сплашная Ларыса – сучасны драматург. Вёска Касцяёва
20. Смірноў В. С. – савецкі дыпламат. Пасол СССР і РБ. Вёска Вялікія Сутокі
21. Цімчанка Г. А. – краязнаўца, стваральнік музея. Вёска Бабінавічы
22. Шакінка Л. І. – мастак- графік. Вёска Старына
23. Гарачка З. Д. – Герой Сац. Працы, швачка-загатоўшчыца. Вёска Высачаны
24. Грэкаў У. А. – ганаровы грамадзянін Лёзненскага р-на. Вёска Дабрамыслі.
25. Шабашоў С. М. – 1-ы сакратар раённага і абласнога РК. Вёска Драгуны

* Разпрацаваная аўтобусная экскурсія мае несумненныя перспектывы для працяглага існавання і развіцця.

*Яна істотна адрозніваецца ад схемы ажыцяўлення традыцыйнага аўтобуснага падарожжа, эффект якога амаль цалкам залежаў ад вартасцяў аповяду чалавека з мікрафонам.

*Ужо ў недалёкай будучані загарадныя экскурсіі будуць праводзіцца выключна на камфартабельным транспарце, абсталяваным добрай аўдыё і відыё апаратурай.

*А ўмелае карыстанне інтэрактыўнымі методыкамі зносін з дзіцячымі турысцкімі групамі стане важнейшым паказчыкам прафесійнай сталасці экскурсавода.

## *2. Сцэнарная схема аўтобуснай экскурсіі “Па слядах гістарычных падзей”*

| № | Ход і змест экскурсіі | Выкарыстанне фотаздымкаў |
|---|---|---|
| 1 | Знаёмства з групай турыстаў. Паведамленне пра мэты і праграму экскурсіі. Арганізацыйны момант. | Дэманстрацыя буклета, карт і схем маршруту. |
| 2 | **Прыпынак №1** Лёзна.<br>Аповед пра Лёзна, пра вядомых асоб, якія наведалі наша мястэчка, пра вызваліцеляў пасёлка ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Канышкава К. Ф., Судакова М. П., Бязуглага І. С. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br>- вядомых асоб, якія наведалі Лёзна.<br>- вызваліцелі Лёзна<br>- вайсковыя могілкі<br>- танк Т-34<br>- помнік Бязуглаву І. С.<br>- царква |
| 3 | **Прыпынак №2** вёска Уна.<br>Аповед пра былую сядзібу пана ў вёсцы Адаменкі, пра стаянку першабытных людзей паміж Адаменкамі і Альхавіком, пра вёску балцкага паходжання, пра запалкавую фабрыку, пра ямскую станцыю. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- былая сядзіба пана<br>- герой Сацыялістычнай працы Ігнаценка Р. М.<br>- герой Савецкага Саюза Рэшатаў<br>- магіла Рэшатава П. Д.<br>- латышскія паселішчы |
| 4 | **Прыпынак №3** вёска Стасева.<br>Аповед пра адзіныя афіцэрскія могілкі ў РБ, пра герояў Савецкага Саюза: Арлова Ц. М., Смірнова У. Я., Янушкоўскага І. І., пра вучонога-матэматыка Ізобава М. А. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- афіцэрскія могілкі<br>- вайсковыя могілкі<br>- ў вёсцы Вялікае Сяло. |
| 5 | **Прыпынак №4** вёска Пагосцішча.<br>Аповед пра П. М. Наследнікава – камісара зямельнага аддзела Высачанскай воласці, пра пісьменніка Лісіцына У. С. , пра заслужаную настаўніцу Агінскую А. С., пра касінера І. М. Будзіловіча. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- помнік партізанскай брыгадзе «Алексея»<br>- помнік «У гонар незалежнай Беларусі»<br>- вайсковыя могілкі |
| 6 | **Прыпынак №5** в. Малыя Міснікі.<br>Аповед пра зніклую вёску Красыншчыну, пра героя Сац. працы Альсміка П. І., пра пісьменніка Пацыенка Г. Б. і пра палітычнага дзеяча БССР Шабашова С. М. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- брацкая магіла ў Малых Місніках<br>- зніклая вёска Красыншчына<br>- помнік вязням фашызму ў вёсцы Мар’янава |

| | | |
|---|---|---|
| 7 | **Прыпынак № 6** вёска Крынкі. Аповед пра пісьменніка Міхася Лынькова, пра герояў Савецкага Саюза М. В. Акцябрскую, Галецкага П. А., пра юнага героя нашага краю Мікалая Гарэлашава і пра героя Сацыялістычнай працы Ігнатаву М. Я. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- помнік Леніну<br>- манеж<br>- помнік Міхасю Лынькову<br>- помнік Марыі Акцябрскай<br>- помнік 99 гаўбічнаму палку |
| 8 | **Прыпынак №7** вёска Высачаны. Аповед пра фельдмаршала І У. Гурку, пра герояў Сацыялістычнай працы Антонава А. Г., Гарачка З. Д., пра героя Савецкага Саюза Чарапнёва С. М., пра мастака - графіка Шакінку Л. І. і пра сучасную паэтэсу Ларысу Сплашную. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- гара-Швейцарыя (гурачкі)<br>- помнік савецкім войнам<br>- помнік урачам<br>- (творчасць)мастака Шакінкі Л. І. |
| 9 | **Прыпынак №8** вёска Асіпенкі. Аповед пра герояў Савецкага Саюза, якія адстаялі вышыню: Ціхмянава Л. П., Багамолава С. А. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- Ціхмянаўская вышыня<br>- верш Агеевай Р. С. |
| 10 | **Прыпынак №9** Бабінавічы. Аповед пра горад Бабінавічы, пра герб горада, пра школьны музей, які заснавала краязнаўца Цімчанка Г. А., пра стаянкі першабытных людзей Бабінавічы- І, Бабінавічы- ІІ, пра шлях «з варагаў у грэкі», пра герояў Савецкага Саюза: Гарнова Ц. Я., Авекава І. А. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- герб горада Бабінавічы<br>- помнік воінам вызваліцелям<br>- матэрыял пра археалагічныя раскопкі<br>- матэрыялы заказніка «Бабинавический» |
| 11 | **Прыпынак №10** в. Дабрамыслі. Аповед пра музей Вялікай Айчыннай вайны ў школе, пра яго заснавальнікаў Багамолава М. М. і Кавалеўскага С. В.; пра ганаровага грамадзяніна Лёзненшчыны Грэкава У. А., пра дыпламата БССР і РБ Смірнова В. С. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- помнік каля школы воінам вызваліцелям<br>- помнік Савецкім войнам каля бальніцы<br>- помнік у вёсцы Перамонт<br>- ГЭС<br>- дача Смірнова В. С. у в. Сутокі |

| | | |
|---|---|---|
| 12 | **Прыпынак №11** вёска Чарніцы. Аповед пра шпіталь і санаторый, пра лётчыка героя Савецкага Саюза Кальцова А. І. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- магіла Кальцова А. І.<br>- аграсядзіба ” У Нінэль”. |
| 13 | **Прыпынак №12** вёска Завольша. Аповед пра дачу бацькоў Бэлы Розэнфельд – жонку М. З. Шагала, пра карціны, якія былі напісаны ў гэтым месцы, пра героя Савецкага Саюза Мацкевіча І. В., пра пісьменніка Свірыдава С. А. | Дэманстрацыя фотаздымкаў:<br><br>- Акно на дачы ў Завольшы<br>- М.З. Шагал |
| 14 | **Прыпынак №13**<br><br>Раённы ваенна-гістарычны музей. Правядзенне краязнаўчай віктарыны. | Агляд экспазіцый музея. |










*Падарожжа па паўднёва - заходняй Лёзненшчыне (2004г., 2007г., 2012г.)*

# Дададак



*Як зорачка на небасхіле*
*Святлом нягаснучым заззяй,*
*Часцінка Беларусі мілай*
*Мой Лёзненскі цудоўны край.*

*Тваёй красой зачараваны,*
*Ты - і пачатак, і працяг.*
*Ад Кавалёў да Высачанаў*
*Старонкі нашага жыцця.*

*Тут што ні крок - легенда, казка,*
*Сівой даўніны пераказ.*
*Гучаць тут словы: "Калі ласка",*
*"Добро пожаловать" - ў адказ.*

*В. Пятроў*







# ДАДАТАК №1

## Асноўныя даты і падзеі гісторыі раёна:

**Каля X тыс. гадоў да н.э.** – з'яўленне першых людзей у Беларускім Падзвінні.
**IX–V тыс. г. да н.э.** – узнікненне першых паселішч у нашым краі (мезаліт).
**I –V тыс.г. да н.э.** – стаянкі Бабінавічы-1, Бабінавічы-2, Украішча ( неаліт).
**IV ст. да н.э.** – гарадзішчы жалезнага веку: Буракі, Выхадцы, Чарнышы, Гарадзец, Калінавічы, Касцяёва.
**I-я пал. 840–х г.** – захаванне Добрынскага скарба.
**862 год** – заснаванне гарадоў Полацка і Смаленска.
**980 –1015 г г.** – наш край пад уладай Кіева.
**980 – сяр. XIII ст.** – час існавання Полацкага Княства.
**1320 год** – пераход нашых зямель да князя Альгерда.
**1345 год** – уваход Віцебскага Княства ў склад ВКЛ.
**1527 год** – пабудова царквы Святога Міколы ў Пагосцішчы.
**1539 –1900 г г.**— існаванне роду Гуркаў-Рамейкаў у нашым краі.
**1569 – 1772 г г.** – Лёзненшчына ў складзе Рэчы Паспалітай
**1593 год** – першае ўпамінанне Лёзна ў летапісе.
**1625–1870 гг.** – род Агінскіх валодаў мястэчкам Лёзна.
**1650 год** – афіцыйная дата заснавання Лёзна.
**1656 год** – у Лёзне знаходзіўся стан цара Аляксея Міхайлавіча Раманава.
**1772 год** – далучэнне нашых зямель да Расійскай імперыі. Першы падзел РП.
**1772 – 1919 гг.** – наш край у складзе Расіі. (Паўночна-Заходні край).
**1781 год** – з'яўленне герба горада Бабінавічы.
**1786 год** – пабудова царквы Узнясенне Господне ў Лёзне.
**1800 год** – сенатар Г. Р. Дзяржавін наведаў наш край
**жнівень – кастрычнік 1812 года** – Напалеон і яго армія ў нашых мясцінах.
**1828–1901гг.** – гады жыцця нашага земляка Іосіфа Уладзіміравіча Гуркі.
**1863 год** – паўстанне Кастуся Каліноўскага (Ігнат Будзіловіч у Пагосцішчы) .
**1863–1865 гг.** – дзейнасць запалкавай фабрыкі ў вёсцы Уна.
**1866–1867 гг.** – увядзенне Рыга - Арлоўскай чыгункі.(Станцыя Шыбекіна).
**1865 год** – адкрыта народнае вучылішча ў Лёзне.
**1902 год** – пачала працаваць ільнопрадзільная фабрыка ў Высачанах
**22 ліпеня 1905 года** – забастоўка на фабрыцы ў Высачанах.
**Верасень 1917 года** – аднаўленне групы РСДРП(б) у Калышках на чале з З. П. Філіпоўскім.
**30 мая 1918 года** – забойства камісара земаддзела П. М. Наследнікава.
**лістапад 1918 года** – расправа над Калышанскімі чырвонагвардзейцамі.
**20 ліпеня 1919 года** – забойства старшыні валвыканкама Шляхценкі І. Г.
**1918–1919 гг.** – першыя саўгасы на Лёзненшчыне: Крынкі, Адаменкі.
**17 ліпеня 1924 года** – утварэнне Лёзненскага раёна.
**30 ліпеня 1932 года** – разгляд тройкай справы № 23398
**1935 год** – ліквідацыя Калышанскага яўрэйскага нацыянальнага сельсавета.

**красавік 1936 года** – Якуб Колас і Кандрат Крапіва ў Лёзне.
**1938 год** – уваход Лёзненскага раёна ў склад Віцебскай вобласці.
**3–10 ліпеня 1941г.** – штаб СНК БССР і ЦК КП(б)Б знаходзіўся ў в. Чарнаручча.
**17 ліпеня 1941года** – акупацыя Лёзненскага раёна.
**Жнівень 1941г**. – стварэнне падпольнай групы на чале з Д.А.Дубоўка (Тамара).
**Май 1942года** – стварэнне партызанскай брыгады “Аляксея” (А.Ф.Данукалава).
**10 кастрычніка 1942 года** – расстрэл юнага героя Сярожы Расленка.
**30 верасня 1943 года** – спалена немцамі вёска Асташэва.
**10 кастрычніка 1943 года** – вызваленне Лёзна.
**Кастрычнік 1943 – ліпень 1944 гг.** – Лёзеншчына на перадавой лініі фронту.
**23 чэрвеня 1944 года** – вызваленне астатняй часткі Лёзненскага раёна.
**1954 года** – аднаўленне народнай гаспадаркі раёна.
**1955 года** – адкрыццё кансервава-агароднінасушыльнага камбіната ў Лёзне.
**1957 года**– калгас “Чырвонаармеец” стаў калгасам-мільянерам.
**2003 год –** узнікненне малога прадпрыемства “БІГІВ”.
**Верасень 2011 года** – абласное свята “Дажынкі” ў Лёзне.
**2015 год** – увядзенне прэміі “Сунічка”

# ДАДАТАК №2

## Спіс населеных месцаў Магілёўскай губерні (1910 год ). “Опыт апісання Магілёўскай губерні” Дембавіцкі А. М. 1884 г.

| название населен.места | при жел., шоссейн.дор. реке, озере | кому принадл. земли | колич земли в десятинах | | | число жителей | | приход | раст.от Могил. --------- от вол. правл. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Удобных | Лес | Всего | Дворов | Всего | | |
| м. Лиозно в нём вол.прав. | РОЖД | Лиозн. с.о. | 635 | -- | 665 | 304 | 1987 | правос. евр.иуд. | 155 - |
| имение Адаменки | шоссе р. Мошна | дв. Н.Д. Хлюстину правосл. | 5310 | 2515 | 9168 | 1 | 96 | Лиозно правос. | 150 2 |
| усадьба Антонова | - - | барон Эльснер лютер. | 14 | -- | 18 | 2 | 9 | -\\ - | 148 2 |
| имение Альхимково | - болото | дв. Слежанов-ский католич. | 200 | 3 | 213 | 9 | 41 | рим. кат. | 145 5 |
| усадьба Боровка | - колодец | барон Эльснер | 25 | 15 | 40 | 1 | 5 | -- | 155 5 |
| усадьба Бобки | просёл. -\\- | с.о. Клитенку правосл. | 9 | 1 | 10 | 2 | 12 | Лиозн. правос. | 148 7 |

| название населен. места | при жел., шоссейн.дор. реке, озере | кому принадл. земли | колич земли в десятинах | | | число жителей | | приход | раст.от Могил. ---------- от вол. правл. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | удобных | Лес | Всего | дДворов | Всего | | | |
| урочище Багуты | -\\ -\\- | дв. Хорашчо каталич. | 12 | 1 | 13 | 2 | 8 | Лиозн. правос. | 142 | 8 |
| имение Бржезово | -\\- -\\- | Б.М.Рубин католич. | 580 | 75 | 695 | 29 | 135 | Бельс. правос. | 162 | 12 |
| усадьба Бель Богдановка | -\\- -\\- | Бел.кр.т.ву | 7 | 1 | 11 | 3 | 11 | -\\- | 162 | 12 |
| усадьба Бель | -\\- -\\- | мещ. Озолину лют. | 25 | 3 | 30 | 1 | 6 | -\\- | 162 | 12 |
| фольварок Буи | -\\- оз. Буёвское | дв. Хлюстину | 556 | 10 | 607 | 21 | 154 | Лиозн. правос. | 145 | 5 |
| имение Зоольша | РО ж\д болото | дв. Хорошчо католич. | 541 | 640 | 1500 | 10 | 75 | рим. кат. | 143 | 7 |
| полустанок Зоольша | -\\- река Черница | РО ж\д | -- | -- | -- | 2 | 13 | Лиозн. прав. | 159 | 9 |
| урочище Крупени | просёл. колодец | кр. Константи-нову прав. | 167 | 29 | 197 | 11 | 68 | Бельск. прав. | 115 | 15 |
| посёлок Кулятино | -\\- -\\- | Романову прав. | 397 | 92 | 449 | 15 | 66 | -\\- | 155 | 15 |
| Карпово | -\\- -\\- | кр. Карпов прав. | 15 | 1 | 16 | 2 | 16 | -\\- | 158 | 8 |
| заст. Костечино | -\\- -\\- | мещ. И.Г.Пчёлко правосл. | 375 | 12 | 54,5 | 2 | 6 | -\\- | 149 | 1 |
| заст. Ловяги | РО ж\д -\\- | мещ. М. Юрганову ур. прав. | 105 | 11 | 141 | 5 | 53 | Лиозн. правос. | 155 | 10 |
| фольварок Лешаки | РО ж\д река Черница | Дв.Н.О. Куцевичу католич. | 177 | 95 | 279 | 4 | 18 | рим. кат | 156 | 6 |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| усадьба Мальково | просёл. -\\- | к р. В.С. Сидоренку правос. | 45 | 15 | 75 | 3 | 31 | Бельск. правосл. | 160 | 10 |
| имение Мартюшково | тракт р. Черница | мещ. Кедрову кат. лют. | 268 | 42 | 329 | 9 | 35 | Лиозн. правос. | 148 | 4 |
| усадьба Максимово | просёл. колодец | С.Д.Ресницу правос. | 25 | 10 | 38 | 1 | 11 | Бельск. правос. | 161 | 16 |
| фольварок Макаренки | -\\- -\\- | В.Д. Торопыне правос. | 65 | 25 | 96 | 2 | 16 | -\\- | 157 | 17 |
| усадьба Макаренки | -\\- -\\- | Н. Блюму и др. правос. | 85 | 35 | 136 | 4 | 15 | -\\- | 158 | 16 |
| имение Матушова | -\\- -\\- | А. Клявину и др.прав.и лют. | 1218 | 304 | 1620 | 44 | 309 | -\\- | 160 | 16 |
| поселение Ветохма | шоссе колодец | дв.Хлюстин правос. | 71 | 8 | 79 | 3 | 18 | Лиозн. правос. | 148 | 2 |
| Гороватка | просёл. | ему же | 41 | -- | 41 | 2 | 14 | -\\- | 155 3 | 3 |
| имение Городок | -\\- -\\- | кр. Е. Сидорову | 186 | 46 | 310 | 9 | 45 | Бельск. правос. | 144 | 6 |
| Грищенки | -\\- -\\- | кр. Подовалов | 207 | 32 | 265 | 43 | 66 | Стасев. правос. | 150 | 7 |
| Будка №298 | РО ж\д -\\- | Риго-Орловской ж\д -\\- | | | | 1 | 5 | Лиозн. правос. | 140 | 10 |
| Дом при водокачке ст. Заолище | РО ж\д -\\- | | | | | 1 | 6 | -\\- | -\\- | -\\- |
| Будка №300 | -\\- | Риго-Орловской ж\д -\\- | | | | 1 | 4 | Лиозн. правос. | | |
| Будка №301 | РО ж\д -\\- | Риго-Орловской ж\д -\\- | | | | 1 | 9 | Лиозн. правос. | -\\- | -\\- |
| Будка №302 | -\\- | -\\- | | | | 1 | 7 | -\\- | | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Будка №303** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **11** | **-\\-** | | |
| **Будка №304** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **7** | **-\\-** | | |
| **Будка №305** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **6** | **-\\-** | | |
| **Будка №306** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **6** | **-\\-** | | |
| **Будка №307** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **5** | **-\\-** | | |
| **Будка №308** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **3** | **-\\-** | | |
| **Будка №309** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **6** | **-\\-** | | |
| **Будка №310** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **5** | **-\\-** | | |
| **Будка №311** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **6** | **-\\-** | | |
| **Будка №312** | **-\\-** | **-\\-** | | | | **1** | **10** | **-\\-** | | |
| **поселение «Заровье»** | **просёл. болото** | **пр. Еванову правос.** | **43** | **--** | **49** | **7** | **58** | **Бельск. правос.** | **143** | **7** |
| **фольварок Мальково** | **просёл. колодец** | **дв. А.Н. Реуту лют.** | **63** | **5** | **70** | **3** | **7** | **лют.** | **153** | **10** |
| **корчма Новка** | **ж\д р. Мошна** | **м. Лиозно крест.** | | | | **1** | **6** | **Лиозн. правос.** | **155** | **10** |
| **выс. Поддубье** | **просёл. колодец** | **кр. Т. Луговскому правос.** | **110** | **40** | **150** | **4** | **21** | **-\\-** | **150** | **9** |
| **усадьба Плаксино** | **-\\- -\\-** | **кр.Кольмаку и др.прав.** | **127** | **17** | **157** | **8** | **63** | **Бельск. правос.** | **166** | **12** |
| **пос. Бельская Пустошь** | **-\\- -\\-** | **скл. Вишнякову правос.** | **47** | **15** | **66** | **2** | **4** | **Бельск. правос.** | **166** | **11** |
| **усадьба Поташня** | **-\\- -\\-** | **И . Денисо-вичу правос.** | **25** | **2** | **27** | **2** | **3** | **Лиозн. правос.** | **152** | **2** |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **фольварок Прудище** | **-\\- -\\-** | **С.А. Витковской католич.** | **307** | **30** | **390** | **4** | **31** | **рим.кат** | **160** | **6** |
| **усадьба Пасеки** | **-\\- -\\-** | **кр. В. Мирскому и др. прав.** | **24** | | **24** | **3** | **18** | **Лиозн. правос.** | **154** | **4** |
| **усадьба Ровы** | **тракт болото** | **кр. С.Н. Высоцкому прав.** | **60** | **25** | **85** | **1** | **11** | **-\\-** | **150** | **9** |
| **усадьба Розумово** | **просёл. р.Черница** | **дв. Н.Д . Хлюстину правосл.** | **419** | **1830** | **2779** | **2** | **6** | **-\\-** | **160** | **8** |
| **имение Станиславово** | **просёл. болото** | **Е.Корницкой кат.** | **100** | **30** | **140** | **4** | **19** | **рим.кат** | **157** | **7** |
| **усадьба Старино** | **тракт река Черница** | **19 земл. прав. лют.** | **409** | **72** | **524** | **24** | **57** | **Лиозн. правосл** | **150** | **4** |
| **усадьба Смовка** | **просёл. болото** | **мещ. Е. Стелко и др. лют.** | **36** | **11** | **56** | **3** | **20** | **лют.** | **164** | **13** |
| **усадьба Сороки** | **-\\- -\\-** | **Лебедеву правосл.** | **39** | **4** | **45** | **1** | **8** | **Лиозн. правос.** | **155** | **10** |
| **усадьба Строги** | **просёл . болото** | **кр. Горяченко и др.рпа в.** | **9** | **2** | **17** | **3** | **22** | **Бепльск правос.** | **157** | **11** |
| **фольварок Соколовка** | **-\\- -\\-** | **дв. М.А. Соколовский кат.** | **50** | **8** | **58** | **2** | **9** | **рим.кат** | **157** | **7** |
| **усадьба Тересполь** | **-\\- -\\-** | **кр. Н. Варкулевич прав.** | **31** | **-** | **66** | **2** | **13** | **Лиозн. правос.** | **158** | **7** |
| **имение Уно** | **шоссе болото** | **Я.Бояру и др. прав. и лат.** | **1249** | **233** | **1686** | **59** | **385** | **-\\-** | **150** | **5** |
| **ус. при пол. Заольша** | **РО ж\д болото** | **купцу Горкову прав.** | **363** | **313** | **636** | **3** | **15** | **-\\-** | **153** | **11** |
| **урочище Холмы** | **просёл. -\\-** | **дв. Хорощо правос.** | **10** | **1** | **11** | **1** | **7** | **рим.кат** | **-** | **-** |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| усадьба Черница | тракт р. Черница | дв. И.З. Хорощо и бар. Эльснеру | 200 | 1022 | 1222 | 3 | 9 | -\\- | 150 | 5 |
| имение Черноручье | тракт колодец | бар. Эльснеру лют. | 202 | | 252 | 4 | 58 | -\\- | 147 | 3 |
| пос. Шломки | -\\- -\\- | дв. Хорощо лют. | - | - | - | 42 | 68 | -\\- | 147 | 6 |
| ст. Шебекино | РО ж\д -\\- | Риго-Орловской ж\д | 3 | - | 3 | 6 | 24 | -\\- | 157 | 11,5 |
| фол. Яськовщина большая | просёл. -\\- | кр. Е. Сычёвой правосл. | 30 | 58 | 146 | 1 | 7 | Бельск. правос. | 156 | 16 |
| фол. Яськовщина малая | -\\- -\\- | А. и З. Морчевичам кат. | 36 | 8 | 76 | 3 | 37 | -\\- | 157 | 15 |
| село Бель | -\\ -\\- | Замошен – ский сельск. общ. | 124 | 16 | 155 | 12 | 96 | -\\- | 156 | 14 |
| дер. Боровая | -\\- -\\- | -\\- | 167 | 10 | 194 | 13 | 139 | Лиозн. правос. | 156 | 5 |
| дер. Грищенки | прос. колодец | Шиховскому с.о. | 174 | 40 | 234 | 17 | 118 | Лиозн. правос. | 156 | 5 |
| дер. Гербли | -\\- -\\- | Слободскому с.о. | 75 | 7 | 102 | 10 | 71 | -\\- | 142 | 8 |
| дер. Дрозды | шоссе р. Черница | Замошен – скому с.о. | 198 | - | 225 | 8 | 64 | -\\- | 162 | 7 |
| дер. Дубровка | прос.колодец р. Черница | Лиозно с.о. | 150 | - | 163 | 22 | 154 | Лиозн. правос. | 162 | 7 |
| дер. Жуково | прос. колодец | Шаховскому с.о. | 133 | - | 143 | 13 | 91 | Лиозн. правос. | 145 | 10 |
| дер Жар | -\\- -\\- | Слобода с.о. | 72 | - | 82 | 5 | 62 | -\\- | 147 | 5 |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| дер Замошье | -\\- болото | Замош. с. о. | 264 | - | 284 | 23 | 192 | Бельск. правос. | 158 | 9 |
| дер.Засилово | -\\- -\\- | Замош. с.о. | 231 | 30 | 318,5 | 12 | 89 | -\\- | 168 | 13 |
| дер. Зуи | -\\- -\\- | -\\- | 151 | - | 221 | 28 | 242 | Лиозн. правос. | 140 | 12 |
| дер. Заольша | РО ж\д -\\- | -\\- | 508 | - | 570 | 69 | 603 | -\\- | 152 | 9 |
| дер. Зубки | РО ж\д р. Мошна | Лиознен. с.о. | 284 | - | 304 | 38 | 264 | -\\- | 154 | 1 |
| дер. Корениха | прос. колодец | Мольк. с.о. | 206 | - | 236 | 22 | 135 | Бельск. правос. | 154 | 4 |
| дер. Конашково | шоссе -\\- | Шиловскому с.о. | 109 | - | 117 | 16 | 182 | Стасевс. правос. | 150 | 12 |
| дер. Мальково | прос. колодец | Мальк. с.о. | 280 | - | 323 | 27 | 204 | Бельск. правос. | 163 | 10 |
| дер. Макаренки | прос. -\\- | Мальк. с.о. | 208 | - | 238 | 14 | 102 | -\\- | 155 | 15 |
| дер. Новины | прос. колодец | Заольш. с.о. | 40 | - | 45 | 8 | 58 | Лиозн. правос. | 144 | 9 |
| дер. Низы | -\\- р. Мошна | Слободск. с.о. | 113 | - | 125,5 | 13 | 96 | -\\- | 150 | 5 |
| дер. Озерок | шоссе колодец | Заольш. с.о. | 171 | - | 201 | 12 | 73 | -\\- | 152 | 2 |
| дер. Ольховка | прос.колодец | Шиховс. с.о. | 25 | - | 31 | 2 | 12 | Лиозн. правос. | 147 | 8 |
| дер. Пронские | -\\- -\\- | Заольш. с.о. | 78 | - | 88 | 8 | 60 | -\\- | 155 | 5 |
| дер. Пунище | -\\- -\\- | Шиховск. с.о. | 160 | - | 177 | 21 | 154 | -\\- | 150 | 4 |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **дер. Рубежница** | **-\\- -\\-** | **Замошан. с.о.** | **85** | **-** | **135** | **26** | **198** | **Бельск. правос.** | **189** | **9** |
| **дер. Сазонова** | **-\\- -\\-** | **Мальк. с.о.** | **44** | **-** | **63** | **6** | **59** | **-\\-** | **162** | **20** |
| **дер Сосны** | **прос. р. Осковлянка** | **Шиховск. с.о.** | **226** | **-** | **246** | **16** | **143** | **Вознес. правос.** | **150** | **8** |
| **дер Сутоки большие** | **-\\- р. Мошна** | **Слободск.. с.о.** | **75** | **-** | **90** | **17** | **171** | **-\\-** | **144** | **8** |
| **дер. Сутоки малые** | **-\\- колодец** | **Слободск. с. о.** | **89** | **-** | **98** | **6** | **52** | **Лиозн. правос.** | **150** | **7** |
| **дер. Солонец** | **РО ж\д колодец** | **-\\-** | **265** | **-** | **280** | **22** | **154** | **-\\-** | **150** | **5** |
| **дер. Слобода** | **прос -\\-** | **-\\-** | **132** | **-** | **142** | **15** | **96** | **-\\-** | **144** | **6** |
| **дер. Тимошки** | **-\\- -\\-** | **Заольш. с.о.** | **40** | **-** | **45** | **8** | **58** | **-\\-** | **147** | **7** |
| **дер. Ушивка** | **-\\- -\\-** | **-\\-** | **225** | **-** | **262** | **19** | **64** | **Бельск. правос.** | **158** | **8** |
| **дер. Титовичы** | **-\\- -\\-** | **Слободск. с.о.** | **57** | **-** | **63** | **12** | **87** | **Лиозн. правос.** | **145** | **5** |
| **дер. Чернышенки** | **-\\- -\\-** | **Мальк. с.о.** | **65** | **-** | **74** | **6** | **61** | **Бельск. правос.** | **160** | **20** |
| **дер. Шавники** | **прос. -\\-** | **Мальк. с.о.** | **160** | **-** | **173** | **12** | **74** | **Бельск. правос** | **151** | **12** |
| **дер. Шихи** | **-\\- -\\-** | **Шиховск. с.о.** | **203** | **-** | **223** | **13** | **218** | **Лиозн. правос.** | **145** | **9** |
| **дер. Яськовщина Б** | **-\\- -\\-** | **Мальк. с.о.** | **95** | **19** | **114** | **6** | **55** | **Бельск. правос.** | **156** | **14** |
| **дер. Яськовщина М** | **-\\- -\\-** | **-\\-** | **22** | **-** | **22** | **4** | **31** | **-\\-** | **155** | **14** |
| **дер. Якубовщина** | **прос. колодец** | **Замошен. с.о.** | **335** | **-** | **190** | **45** | **383** | **-\\-** | **160** | **11** |

# ДАДАТАК №3

## *СПІС НАСЕЛЁНЫХ ПУНКТАЎ ЛЁЗНЕНСКАГА РАЁНА 2003 год*

## *“ Продкамі названа ” Пячонава В. У.*

### 1. ЛИОЗНО ЛЁЗНА гарадскі пасёлак

### 2. БАБИНОВИЧСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Бабиновичи | Бабінавічы | Осипенки | Асіпенкі |
| Бель | Бель | Рублево | Рублева |
| Вишни | Вішні | Рыжики | Рыжыкі |
| Заборы | Забары | Степаненки | Сцяпаненкі |
| Костеёво | Касцяёва | | |

### 3. ВЕЛЕШОВИЧСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Бесково | Бяскова | Михайлово | Міхайлова |
| Велешковичи | Веляшковічы | Михалиново | Міхалінава |
| Вордевье | Вордзеў’е | Новая Дуброва | Новая Дуброва |
| Городок | Гарадок | Пнёво | Пнёва |
| Горшево | Гаршэва | Полёновка | Палёнаўка |
| Горяне | Гаране | Реуты | Рэуты (Равуты) |
| Гребенники | Грабенікі | Симоново | Сіманава |
| Гущено | Гушчына | Титово | Цітова |
| Заверино | Заверына | Шустево | Шусцева |
| Замшено | Замшына | | |

### 4. ГОРБОВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Барсеево | Барсеева | Горбово 1 и 2 | Горбава 1 і 2 |
| Белый Бор | Белы Бор | Мальково | Малькава |
| Бондоры | Бандоры | Остров | Востраў |
| Выходцы | Выхадцы | Ситно | Сітна |

### 5. ДОБРОМЫСЛИНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Артёмово | Арцёмава | Жаденово | Жадзенава |
| Бураково | Буракова | Желудово | Жалудова |
| Вишняк | Вішняк | Зачерня | Зачэрня |
| Горелики | Гарэлікі | Зубаки | Зубакі |
| Добромысли | Дабрамыслі | Лындино | Лындзіна |
| Парихи | Парыхі | Село | Сяло |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Перемонт | Перамонт | Слободище | Слабадзішча |
| Розумово | Разумова | Старь | Стар |
| Рублево | Рублева | Тихоново | Ціханава |

## 6. КОВАЛЕВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Барсуки | Барсукі | Кожуровщина | Кажуроўшчына |
| Бураки | Буракі | Красыни | Красыні |
| Глоданки | Глоданкі | Лапино | Лапіна |
| Горы | Горы | Никоновщина | Ніканаўшчына |
| Емельяново | Емел’янова | Селище | Сялішча |
| Загородно | Загарадна | Строганы | Страганы |
| Залесье | Залессе | Толпа | Таупа |
| Ковали | Кавалі | Шевели | Шавялі |

## 7. КРЫНКОВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Асётки | Асёткі | Мятли | Мятлі |
| Бор | Бор | Новое Село | Новае Сяло |
| Братково | Браткава | Ордеж | Ордзеж |
| Большая Выдрея | Вялікая Выдрэя | Осипово | Асіпова |
| Малая Выдрея | Малая Выдрэя | Погостище | Пагосцішча |
| Б. Калиновичи | В. Калінавічы | Речки | Рэчкі |
| М. Калиновичи | М. Калінавічы | Рудаки | Рудакі |
| Большие Мисники | Вялікія Міснікі | Симашково | Сімашкава |
| Малые Мисники | Малыя Міснікі | Сосновая Наспа | Соснавая Наспа |
| Высочаны | Высачаны | Соловьёво | Салаў’ёва |
| Добрино | Добрына | Старина | Старына |
| Заболотье | Забалоцце | Хотемля | Хоцемля |
| Загоряне | Загаране | Черкасы | Чаркасы |
| Иваньково | Іванькава | Черныши | Чарнышы |
| Крынки | Крынкі | Чиковщина | Чыкаушчына |
| Куртёнки | Курцёнкі | Шведы | Швяды |
| Кучинщина | Кучыншчына | Шнитки | Шніткі |
| Марьяново | Мар’янова | Шугаёво | Шугаёва |
| Мерзляково | Мерзлякова | | |

## 8. ЛИОЗНЕНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Адаменки | Адаменкі | Ацковая | Ацкавая |
| Альховик | Альхавік | Боровая | Баравая |
| Буи | Буі | Пунище | Пунішча |
| Вагоровщина | Вагароўшчына | Пушки | Пушкі |
| Дрозды | Дразды | Слобода | Слабада |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Дубровка | Дуброўка | Станиславово | Станіслававa |
| Замошье | Замошша | Старины | Старыны |
| Заольша | Завольша | Сутоки | Сутокі |
| Зубки | Зубкі | Уно | Вуна |
| Зуи | Зуі | Черницы | Чарніцы |
| Низы | Нізы | Черноручье | Чарнаруччa |
| Поддубье | Поддуб’е | Шахі Шахі | |
| Пронское | Пронскае | | |

## 9. <u>СТАСЕВСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:</u>

| | | | |
|---|---|---|---|
| Бояры | Баяры | Осиповщина | Асіпоўшчына |
| Бычково | Бычкава | Пыжи | Пыжы |
| Великое Село | Вялікае Сяло | Смородино | Смародзіна |
| Заболотье | Забалоцце | Стасево | Стасева |
| Клевцы | Кляўцы | Шарики | Шарыкі |
| Конашково | Канашкава | Шеркино | Шэркіна |
| Красыни | Красыні | Шумщино | Шумшчына |
| Новоротье | Навароцце | | |

## 10. <u>ЯСЬКОВЩИНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ:</u>

| | | | |
|---|---|---|---|
| Асташево | Асташэва | Надёжино | Надзёжына |
| Бржезово | Бржазова | Новь | Ноу |
| Запоженки | Запожанкі | Пацево | Пацава |
| Засигово | Засігава | Рубежница | Рубяжніца |
| Колышки | Калышкі | Таранки | Таранкі |
| Кулятино | Куляціна | Тупики | Тупікі |
| Луги | Лугі | Шлехово | Шлэхава |
| Макаренки | Макаранкі | Якубовщина | Якубаўшчына |
| Матушёво | Матушова | Яськовщина | Яськаўшчына |

Список населённых пунктов, которые уже не суеществуют, опубликован в книге “Память. Лиозненский район” – Мн., 1992. – с. 19-20

# ДАДАТАК №4

## Рэкі Лёзненшчыны

**Ардзяжанка,** рака ў нашым і Віцебскім р-нах, левы прыток Сухадроўкі (бас. Заходняй Дзвіны). Даўжыня 16 км. Пачынаецца каля в. Сосновая Наспа, цячэ па Лучоскай нізіне. Упадае ў Сухадроўку (правы прыток Лучосы каля в. Ільічоўка Віцебскага р-на.

**Ардышэўка**, рака ў Сененскім і нашым р-нах, левы прыток р. Лучосы (бас. Заходняй Дзвіны). Даўжыня 16 км. Выцякае з возера Ардышэва. Цячэ па Лучоскай нізіне.
Упадае ў Лучосу каля в. Кучыншчына нашага раёна.

**Брыжоўка**, рака ў нашым раёне, левы прыток р. Мошна (бас. Заходняй Дзвіны). Даўжыня 15,8 км. Пачынаецца за 1 км на Пдз ад в. Зосіна, вусце за 1 км на З ад в. Бяскова.

**Выдрэя**, рака ў нашым раёне, правы прыток Сухадроўкі (бас. Зах. Дзвіны).
Даўжыня 10 км. Пачынаецца за 2 км на Пдз ад в. Пагосцішча, цячэ па Лучоскай нізіне. Упадае ў Вольшу (назва ў верхнім цячэнні Сухадроўкі) каля в. Бор.

**Вярхіта**, рака ў Дубровенскім і нашым раёнах у бас. Заходняй Дзвіны. Даўжыня 28 км. Пачынаецца за 1 км на Пзг ад в. Пятрыкі Дубровенскага раёна цячэ па Лучоскай нізіне праз азёры Афанасьеўскае і Казённае, пераважна ў лясістай мясцовасці.
Упадае ў возера Зяленскае.

**Заальшанка, Альшанка**, рака ў Смаленскай вобласці і нашым раёне, левы прыток р. Чарніца (бас Зах. Дзвіны). Даўжыня 17 км. Пачынаецца за 1 км на Пд ад в. Пяскі Руднянскага раёна Смаленскай вобласці, вусце за 1 км на Пдз ад в. Дразды нашага раёна.

**Ласасіна**, рака ў Віцебскім і нашых раёнах, правы прыток ракі Сухадроўка (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 30 км. Пачынаецца на заходніх схілах Віцебскага ўзвышша, возера Залецкае за 1,8 км на З ад в. Цішкава Віцебскага раёна, вусце за 0,3 км на Пн ад в. Буракі.

**Лучаоса**, рака ў нашым і Віцебскім раёнах, левы прыток Заходняй Дзвіны. Даўжыня 90 км. Выцякае з возера Зяленскае каля вёскі Бабінавічы, цячэ па Лучоскай нізіне і ў межах Віцебскага ўзвышша, вусце ў межах паўднёвай ускраіны Віцебска.
Асноўныя прытокі: Чарніца, Сухадроўка (справа), Ардышаўка, Чарнічанка (злева).

**Машна**, рака ў нашым раёне, правы прыток ракі Чарніца (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 33 км. Пачынаецца за 1,5 км на Пдз ад вёскі Шэркіна, вусце каля в. Сутокі. Цячэ ў межах Віцебскага ўзвышша. Асноўныя прытокі: Брыжоўка, Рубяжніца (злева), Скулянка (справа).

**Рубяжніца**, рака ў нашым раёне, левы прыток р. Мошна (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 19 км. Пачынаецца за 0,6 км на Пдз ад возера Шэлахава, вусце за 0,8 км на Пн ад г. п. Лёзна.

**Сухадроўка, Сухадраўка**, рака ў нашым і Віцебскім раёнах правы прыток р. Лучоса (бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 66 км. Пачынаецца каля паўночна- усходняй ускраіны вёскі Свірбы нашага раёна вусце за 1 км на Пнз ад вёскі Кузьменіцы Віцебскага раёна. Цячэ ў межах Віцебскага ўзвышша. Асноўныя прытокі: Выдрэя, Ласасіна (справа), Ардзяжанка (злева).

**Скулянка, Ацкаўлянка**, рака ў нашым раёне, правы прыток ракі Мошна (бас.Заходняй Дзвіны). Даўжыня 15 км. Пачынаецца за 0,3 км на У ад вёскі Канашкава, вусце насупраць вёскі Сутокі, размешчан на левым беразе Мошны.

**Узменка**, рака ў нашым раёне ў ( бас. Зах. Дзвіны). Даўжыня 12 км. Пачынаецца за 1,5 км на Пду ад в. Старына, упадае ў возера Зяленскае з Пд за 1км У ад в. Бабінавічы.
Цячэ па Лучоскай нізіне па лясістай мясцовасці.

**Узменка**, рака ў нашым раёне. Даўжыня 7 км. Пачынаецца за 0,5 км на Пду ад в. Бандоры, упадае ў возера Зяленскае з Пн за 1 км на У ад в. Бабінавічы. Цячэ па Лучоскай нізіне.

**Чарніца**, рака ў Смаленскай вобласці і нашым раёне, правы прыток р. Лучоса.
Даўжыня 74 км ( па Беларусі). Пачынаецца за 1 км на Пд ад в. Ваўкі Смаленскай вобласці Руднянскага раёна, вусце каля в. Бабінавічы. Цячэ ў межах Віцебскага ўзвышша. Асноўныя прытокі: Ціхута, Заальшанка (злева) і Машна (справа).

# ДАДАТАК №5

*Карта. Помнікі гісторыі і культуры Лёзненскага раёна “Памяць;  Лёзненскі раён” Шамякін І. П. і іншыя. 1992 г.*



# ДАДАТАК №6

## Вёскі Лёзненскага раёна, знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1944 гады (інтэрнэт)

| .№п/п | Название | Год разру-ше-ния | Дата | Домов до войны | Людей до войны | Разру-шено домов | Убито людей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адаменки | 1943 | октябрь 1943 г. | 32 | 150 | 32 | 0 |
| 2 | Альховик | 1943 | октябрь 1943 г. | 112 | 450 | 104 | 0 |
| 3 | Артемово | 1943 | октябрь 1943 г. | 47 | 206 | 47 | 0 |
| 4 | Асташево | 1943 | октябрь 1943 г. | 40 | 180 | 40 | 120 |
| 5 | Бабиновичи | 1943 | октябрь 1943 г. | 376 | 1618 | 376 | 48 |
| 6 | Бандоры | 1943 | сентябрь 1943 г. | 59 | 284 | 58 | 12 |
| 7 | Барсеево | 1943 | сентябрь 1943 г. | 66 | 294 | 66 | 17 |
| 8 | Барсуки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 37 | 165 | 36 | 4 |
| 9 | Белый Бор | 1943 | сентябрь 1943 г. | 13 | 87 | 13 | 4 |
| 10 | Бель | 0000 | | 16 | 48 | 16 | 26 |
| 11 | Бесково | 1943 | сентябрь 1943 г. | 27 | 120 | 26 | 11 |
| 12 | Большая Выдрея | 1943 | октябрь 1943 г. | 84 | 420 | 52 | 164 |
| 13 | Большие Мисники | 1943 | октябрь 1943 г. | 35 | 170 | 29 | 60 |
| 14 | Бор | 1943 | июнь 1943 г. | 33 | 169 | 24 | 80 |
| 15 | Боровая | 1943 | октябрь 1943 г. | 30 | 85 | 27 | 1 |
| 16 | Бояры | 1943 | октябрь 1943 г. | 62 | 366 | 59 | 0 |
| 17 | Братково | 1943 | октябрь 1943 г. | 60 | 250 | 37 | 120 |
| 18 | Буи | 1943 | октябрь 1943 г. | 94 | 470 | 93 | 0 |
| 19 | Бураки | 1943 | октябрь 1943 г. | 36 | 186 | 27 | 71 |
| 20 | Бураки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 42 | 185 | 42 | 5 |
| 21 | Бычково | 1943 | май 1943 г. | 68 | 205 | 67 | 42 |
| 22 | Бычково | 0000 | | 45 | 230 | 0 | 0 |
| 23 | Вагровщина | 1943 | октябрь 1943 г. | 10 | 30 | 10 | 0 |
| 24 | Великое Село | 1943 | октябрь 1943 г. | 49 | 186 | 40 | 4 |
| 25 | Вишни | 1943 | октябрь 1943 г. | 54 | 187 | 54 | 0 |
| 26 | Вишняк | 1943 | октябрь 1943 г. | 32 | 139 | 32 | 0 |
| 27 | Высокое (Горелыши) | 1943 | октябрь 1943 г. | 29 | 122 | 29 | 11 |
| 28 | Выходцы | 1943 | сентябрь 1943 г. | 107 | 534 | 107 | 23 |
| 29 | Глинки | 1943 | октябрь 1943 г. | 31 | 61 | 31 | 8 |
| 30 | Глоданки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 28 | 121 | 28 | 4 |
| 31 | Горбово 1-е | 1943 | сентябрь 1943 г. | 43 | 198 | 43 | 4 |
| 32 | Горбово 2-е | 1943 | сентябрь 1943 г. | 37 | 219 | 37 | 3 |
| 33 | Горелики | 1943 | октябрь 1943 г. | 34 | 145 | 34 | 0 |
| 34 | Горшево | 1943 | октябрь 1943 г. | 58 | 180 | 56 | 14 |
| 35 | Горы | 1943 | октябрь 1943 г. | 22 | 147 | 22 | 30 |
| 36 | Горы | 1943 | сентябрь 1943 г. | 25 | 111 | 15 | 0 |
| 37 | Добрино | 1943 | октябрь 1943 г. | 40 | 210 | 33 | 115 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 38 | Добромысль | 1943 | сентябрь 1943 г. | 122 | 407 | 119 | 150 |
| 39 | Дрозды | 1943 | октябрь 1943 г. | 62 | 165 | 62 | 0 |
| 40 | Емельяново | 1943 | сентябрь 1943 г. | 30 | 133 | 30 | 0 |
| 41 | Жаденово | 1943 | октябрь 1943 г. | 34 | 152 | 34 | 0 |
| 42 | Желудово | 1943 | октябрь 1943 г. | 25 | 103 | 25 | 0 |
| 43 | Жуковка | 1943 | октябрь 1943 г. | 36 | 119 | 36 | 6 |
| 44 | Заболотье | 1943 | сентябрь 1943 г. | 44 | 430 | 34 | 290 |
| 45 | Заболотье 2-е | 1943 | октябрь 1943 г. | 19 | 112 | 17 | 3 |
| 46 | Заверино | 1943 | сентябрь 1943 г. | 43 | 172 | 41 | 20 |
| 47 | Загородно | 1943 | сентябрь 1943 г. | 93 | 426 | 93 | 15 |
| 48 | Загоряне | 1943 | сентябрь 1943 г. | 34 | 170 | 26 | 85 |
| 49 | Зазыбы 1-е | 1943 | август 1943 г. | 52 | 189 | 52 | 0 |
| 50 | Залесье | 1943 | сентябрь 1943 г. | 27 | 131 | 27 | 0 |
| 51 | Замошье | 1943 | октябрь 1943 г. | 40 | 151 | 40 | 8 |
| 52 | Заольша (ж.-д. ст.) | 1943 | октябрь 1943 г. | 35 | 111 | 35 | 5 |
| 53 | Заольша 1-я | 1943 | октябрь 1943 г. | 43 | 130 | 43 | 4 |
| 54 | Заольша 2-я | 1943 | октябрь 1943 г. | 71 | 220 | 71 | 5 |
| 55 | Заровляны | 1943 | сентябрь 1943 г. | 34 | 154 | 34 | 0 |
| 56 | Зачерня | 1943 | октябрь 1943 г. | 43 | 228 | 43 | 0 |
| 57 | Зори | 1943 | январь 1943 г. | 64 | 280 | 64 | 22 |
| 58 | Зубаки | 1943 | октябрь 1943 г. | 76 | 308 | 76 | 0 |
| 59 | Зубки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 67 | 263 | 64 | 3 |
| 60 | Зуи | 1943 | сентябрь 1943 г. | 53 | 140 | 53 | 1 |
| 61 | Иваньково | 1943 | октябрь 1943 г. | 90 | 280 | 36 | 150 |
| 62 | Иструбище | 1942 | сентябрь 1942 г. | 22 | 67 | 22 | 8 |
| 63 | Калинковичи | 1943 | октябрь 1943 г. | 45 | 225 | 34 | 117 |
| 64 | Клевцы | 1943 | октябрь 1943 г. | 38 | 176 | 38 | 1 |
| 65 | Климченки | 1944 | май 1944 г. | 35 | 170 | 24 | 66 |
| 66 | Ковали | 1943 | 7 мая 1943 г. | 39 | 153 | 39 | 1 |
| 67 | Кожуровщина | 1943 | сентябрь 1943 г. | 27 | 98 | 27 | 2 |
| 68 | Костеево | 1943 | октябрь 1943 г. | 112 | 372 | 112 | 12 |
| 69 | Красыни | 1943 | октябрь 1943 г. | 35 | 155 | 33 | 4 |
| 70 | Красыни | 1943 | сентябрь 1943 г. | 54 | 209 | 54 | 9 |
| 71 | Красынщина | 1943 | октябрь 1943 г. | 45 | 127 | 45 | 0 |
| 72 | Кулятино | 1942 | октябрь 1942 г. | 43 | 185 | 43 | 7 |
| 73 | Куртенки | 1944 | май 1944 г. | 39 | 190 | 31 | 112 |
| 74 | Куряки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 50 | 196 | 44 | 35 |
| 75 | Лапино | 1943 | сентябрь 1943 г. | 38 | 147 | 38 | 4 |
| 76 | Лапицкие | 1943 | октябрь 1943 г. | 16 | 45 | 16 | 6 |
| 77 | Лобаны | 1943 | август 1943 г. | 16 | 64 | 16 | 0 |
| 78 | Лындино | 1943 | октябрь 1943 г. | 31 | 120 | 29 | 0 |
| 79 | Маклаки | 1943 | август 1943 г. | 34 | 173 | 34 | 4 |
| 80 | Малькова | 1943 | октябрь 1943 г. | 70 | 320 | 70 | 13 |
| 81 | Мальково | 1943 | сентябрь 1943 г. | 62 | 304 | 62 | 14 |
| 82 | Манулки | 1942 | 16 июля 1942 г. | 117 | 455 | 117 | 48 |
| 83 | Мерзляково | 1943 | октябрь 1943 г. | 90 | 475 | 60 | 180 |
| 84 | Михайлово | 1943 | май 1943 г. | 47 | 188 | 46 | 17 |
| 85 | Низы | 1943 | сентябрь 1943 г. | 50 | 198 | 47 | 0 |
| 86 | Никоновщина | 1943 | сентябрь 1943 г. | 60 | 239 | 56 | 3 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 87 | Новины | 1943 | октябрь 1943 г. | 13 | 39 | 13 | 0 |
| 88 | Новоротье | 1943 | октябрь 1943 г. | 4 | 15 | 4 | 0 |
| 89 | Новый Стан | 0000 | | 5 | 20 | 5 | 20 |
| 90 | Озерище | 1943 | сентябрь 1943 г. | 31 | 179 | 31 | 6 |
| 91 | Ордеж | 1943 | октябрь 1943 г. | 50 | 300 | 44 | 102 |
| 92 | Осетки | 1943 | октябрь 1943 г. | 50 | 215 | 432 | 118 |
| 93 | Осипенки | 1943 | октябрь 1943 г. | 48 | 192 | 48 | 0 |
| 94 | Осипово | 1943 | октябрь 1943 г. | 160 | 310 | 112 | 300 |
| 95 | Осиповщина | 1943 | октябрь 1943 г. | 28 | 126 | 28 | 13 |
| 96 | Остров | 1943 | сентябрь 1943 г. | 27 | 194 | 27 | 0 |
| 97 | Оцковая | 1943 | октябрь 1943 г. | 50 | 132 | 50 | 0 |
| 98 | Перемонт | 1943 | октябрь 1943 г. | 65 | 327 | 65 | 0 |
| 99 | Пнево | 1943 | октябрь 1943 г. | 63 | 317 | 55 | 43 |
| 100 | Погостище | 1943 | октябрь 1943г. | 60 | 340 | 50 | 120 |
| 101 | Поддубье | 1943 | январь 1943 г. | 50 | 155 | 49 | 3 |
| 102 | Пунище | 1943 | октябрь 1943 г. | 46 | 159 | 45 | 0 |
| 103 | Пыжи | 1943 | октябрь 1943 г. | 7 | 21 | 7 | 0 |
| 104 | Реуты | 1943 | октябрь 1943 г. | 45 | 156 | 45 | 21 |
| 105 | Речки | 1943 | октябрь 1943 г. | 48 | 240 | 26 | 125 |
| 106 | Рублево | 1943 | октябрь 1943 г. | 39 | 173 | 39 | 0 |
| 107 | Рублево | 1943 | октябрь 1943 г. | 47 | 281 | 47 | 0 |
| 108 | Рудаки | 1943 | октябрь 1943 г. | 60 | 300 | 37 | 125 |
| 109 | Рыжики | 1943 | октябрь 1943 г. | 22 | 69 | 22 | 2 |
| 110 | Свирбы | 1943 | октябрь 1943 г. | 20 | 136 | 20 | 2 |
| 111 | Селище | 1943 | сентябрь 1943 г. | 24 | 90 | 24 | 15 |
| 112 | Селище | 1943 | сентябрь 1943 г. | 38 | 146 | 38 | 1 |
| 113 | Село | 1943 | октябрь 1943 г. | 36 | 153 | 36 | 0 |
| 114 | Симашково | 1943 | октябрь 1943 г. | 45 | 213 | 39 | 120 |
| 115 | Ситно | 1943 | сентябрь 1943 г. | 57 | 263 | 57 | 18 |
| 116 | Слобода | 1943 | май 1943 г. | 40 | 150 | 37 | 0 |
| 117 | Слободище | 1943 | октябрь 1943 г. | 35 | 137 | 35 | 0 |
| 118 | Смородино | 1943 | октябрь 1943 г. | 61 | 192 | 61 | 0 |
| 119 | Сосновая Наспа | 1943 | октябрь 1943 г. | 45 | 210 | 38 | 85 |
| 120 | Станиславово | 1943 | октябрь 1943 г. | 18 | 54 | 18 | 0 |
| 121 | Старина | 1943 | октябрь 1943 г. | 63 | 324 | 63 | 58 |
| 122 | Старины | 1943 | сентябрь 1943 г. | 36 | 182 | 33 | 5 |
| 123 | Старь | 1943 | октябрь 1943 г. | 60 | 237 | 60 | 0 |
| 124 | Степаненки | 1943 | октябрь 1943 г. | 56 | 239 | 56 | 4 |
| 125 | Строганы | 1943 | сентябрь 1943 г. | 28 | 122 | 28 | 0 |
| 126 | Сутоки | 1943 | сентябрь 1943 г. | 38 | 152 | 38 | 0 |
| 127 | Тихоново | 1943 | октябрь 1943 г. | 19 | 84 | 19 | 0 |
| 128 | Толкуны | 1943 | 7 мая 1943 г. | 26 | 117 | 26 | 0 |
| 129 | Толпа | 1943 | декабрь 1942 г. | 30 | 116 | 30 | 0 |
| 130 | Уно | 1943 | октябрь 1943 г. | 85 | 287 | 85 | 0 |
| 131 | Хотемля | 1943 | октябрь 1943 г. | 85 | 450 | 45 | 190 |
| 132 | Черкасы | 1943 | октябрь 1943 г. | 60 | 300 | 50 | 260 |
| 133 | Черницы | 1943 | октябрь 1943 г. | 16 | 303 | 16 | 0 |
| 134 | Черныши | 1943 | октябрь 1943 г. | 80 | 325 | 76 | 180 |
| 135 | Шарики | 1943 | октябрь 1943г. | 40 | 159 | 40 | 1 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 136 | Шахи | 1943 | летом 1943г. | 47 | 157 | 47 | 0 |
| 137 | Шведы | 1943 | октябрь 1943 г. | 40 | 200 | 28 | 140 |
| 138 | Шевели | 1943 | январь 1943г. | 35 | 141 | 34 | 0 |
| 139 | Шеркино | 1943 | октябрь 1943г. | 30 | 139 | 29 | 3 |
| 140 | Шнитки | 1943 | октябрь 1943 г. | 51 | 205 | 43 | 90 |
| 141 | Шугаево | 1943 | октябрь 1943 г. | 60 | 350 | 40 | 220 |
| 142 | Шустево | 1943 | октябрь 1943г. | 40 | 161 | 40 | 16 |
| 143 | Якубовщина | 1943 | январь 1943г. | 75 | 297 | 75 | 17 |

# ДАДАТАК №7

## Праваслаўныя храмы на Лёзненшчыне да 1917 года

Справочник Лиозненского Благочиния,Тихомирова Н.К., иерей Вячеслав, 2012год.

**Лиозненская волость Оршанского уезда Могилёвской епархии**

1. Храм Вознесения Господня (каменный, холодный) – г. п. Лиозно
2. Храм Святой равноапостальной Марии Магдалины (тёплый, деревянный) – г.п. Лиозно

**Высочанская волость:**

3. Храм Святога Духа (каменный) – Высочаны
4. Храм Святога пророка Илии (каменный) – д. Высокое
5. Храм Святителя Николая Чудотворца (деревянный) – д. Половики
6. Храм Святителя Николая Чудотворца (деревянный) – д. Погостище
7. Храм (каменный) – д. Крынки
8. Храм (деревянный) – д. Новая Бель

**Микулинское благочиние Бабиновического уезда:**

9. Храм Иоанна Предтечи (деревянный) – город Бабиновичи
10. Храм Покрова Пресвятой Богородицы (каменный) – д. Добромысли
11. Храм (деревянный) – д. Добрино

**Витебского уезда:**

12. Храм Покрова Пресвятой Богородицы – д. Стасево
13. Храм “ Положение честных риз Пресвятой Богородицы” – д. Стасево

**Сурожского уезда:**

14. Храм Святителя Николая Чудотворца (каменный) – д. Велешковичи
15. Храм Святого великомученика Георгия Победоносца – д. Замшено
16. Храм Святого Архангела Михаила (деревянный) – д. Колышки.

# ДАДАТАК №8

## *Карта. Маёнткі Агінскіх на Беларусі*



# ДАДАТАК № 9

## “Прастанародныя прыкметы і павер’і, суеверныя абрады і звычаі” Нікіфароўскі М. Я. (1895 г.)

## “Свадебные обряды Велишковской волости”

“Съ самаго ранняго утра вънчальнаго дня женихъ безотлучно остаётся при своёмъ “дружкъ ”, который какъ бы оберегаеть его и физически, и морально. “Дружко” часто напоминает жениху, что онъ не долженъ засматриваться на посторонихъ женщинь. Дружко есть что-то въ родъ повъренного невъсты. Увъдомленные о предстоящемъ торжествъ, родственники и друзья дома жениха таинственно спрашивают “ а ти ёсь жа знаток?”. Получивъ родительское благославение и пожелание о счастливомъ пути, жених ъдеть къ вънцу вмъстъ съ “дружкой”.

Невъстинъ поъзд состоить изъ особъ женского пола. Впередъ ъедеть невъста съ ближайшей подругой-дъвушккой; за нею двъ или три сватьи, молодыя, но уже замужния женщины, далъе – знающая брачныя церемонии сватья, родственницы невъсты и почетныя гостьи.

Находясь подъ вънцом, невъста ставитъ сваю ногу на ногу жениха и держитъ её такъ во время вънчания. Послъ вънца новобрачные идутъ въ свой домъ порознь. С наступлениемъ поздняго въчера, около 10 часовъ, женихъ отправляется въ дом невъсты съ избранными гостями.

Перед ужиномъ, послъ пляски и разгула, женха надълястъ деньгами.

За сталомъ новабрачнымъ подается лишь зажаренная курица, которую они съедаютъ лишь вполовину.

Через неделю, т. е . по окончании “веселья”, молодые уезжаютъ въ мужний домъ.”

# ДАДАТАК № 10

## Старажытныя каштоўнасці раёна. ( Інтэрнэт)

## Лиозненский район

### Всего обьектов 15, из них проиллюстрировано: 11.

| Населённый пункт | СР | Обьект | Дата строительства | Фото |
|---|---|---|---|---|
| Адаменки | 4 | усадьба: | XIX – нач. XX вв. | - |
| | 4 | усадебный дом (руины) | XIX вв. | 7 |
| | 4 | хоз. постройка | XIX – нач. XX вв. | 14 |
| | 4 | парк ( фрагменты) | XIX вв. | - |
| Бабиновичи | 4 | кладбище еврейское | | 13 |
| Бол. Выдрея | 4 | церковь св. Тихона | | - |
| Заольша | 4 | почтовая станция | середина XIX в. | 1 |
| Крынки | 4 | манеж конный | начало XX в. | 1 |
| Лиозно | 4 | церковь Крестовоздвиженская (в приспособл. здании) | 2-я половина XX века | 3 |
| | 4 | церковь Вознесенская ( в приспособл. здании) | 2-я половина XX века | 1 |
| Погостище | 4 | мемориальный крест участникам восстания 1863 – 1864гг. | 2006 год | 4 |
| Станиславова | 4 | усадьба: | 2-я пол. XIX в. | |
| | 4 | часовня – усыпальница | 2-я пол. XIX в. | 4 |
| | 4 | хоз. постройка | 2-я пол. XIX в. | 4 |
| Уно | 4 | почтовая станция | середина XIX в. | 3 |

Примечания:

- СР: субьективный рейтинг объекта по мнению автора сайта от 1 (высший) до 4
- Фото: количество выложенных на сайте изображений объекта (фотографий, рисунков, схем и т.п.).
- ГЦ: официальная ценность объекта для государства от 0 (высшая) до 3 согласно (“Дзяржаўнаму спісу гісторыка – культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь”).

# ДАДАТАК №11

## Схема “Шагалаўскія мясціны ў Лёзне”Собалева І.І. 2005г.



# ДАДАТАК №12

## Схема маршруту па паўночна- усходняй Лёзненшчыне “Край герояў, творцаў і вучоных” Собалева І. І. 2005 г.



# ДАДАТАК № 13

## Прыпынкі на маршруце падарожжа па паўднёва-заходняй Лёзненшчыне “ Па слядах гістарычных падзей”
## Магілевец Юля. 2010 год.

# Прыпынкі на маршруце:

- 1- Лёзна
- 2- Уна
- 3- Стасева
- 4- Пагосцішча
- 5- Малыя Міснікі
- 6- Крынкі
- 7- Высачаны
- 8- Асіпенкі
- 9- Бабінавічы
- 10- Дабрамыслі
- 11- Чарніцы
- 12- Завольша



# ДАДАТАК № 14

## Мой  Радавод



# ДАДАТАК № 15

## Схема маршруту падарожжа па вёсцы Высачаны Міхеева Г. М., 2003 год.



# ДАДАТАК №16

# Вахта Памяці

## “ 70 год Вялікай Перамогі ” *(2015г.)*

## Аўтобусныя экскурсіі па месцах ваенных баёў у нашым раёне

4 мая – Чарніцы, Дабрамыслі – 5-я класы
5 мая – Асташэва, Калышкі – 6-я класы
6 мая – Стасева, Вялікае Сяло – 7-я класы
7 мая – Веляшковічы, Кавалі – 8-я класы
8 мая – Крынкі, Бабінавічы – 9-я класы
9 мая – удзел у мітынгу – 10-11-я класы

## Наведванне воінскіх могілак ў сваіх вёсках раёна

( вучні 1 - 11 класаў з настаўнікамі)

## Пешыя экскурсіі на воінскія пахаванні для начальных класаў школ гарадскога пасёлка Лёзна:

1. Вуліца Бязуглага І. С., Акцябрскай М. В., плошча Леніна( першы сцяг Перамогі на Віцебшчыне),
2. Воінскія могілкі на вуліцы Леніна,
3. Танк – т- 34
4. Помнік ахвярам фашызму ў Адаменскім рву
5. Мемарыял воінам - вызваліцелям,
6. Помнік 158-й стралковай Лёзненска-Віцебскай дывізіі, якая вызваляла наш край ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## Спіс літаратуры, артыкулаў па гісторыі, культуры краю:


1. Агнищенко,Г.Т. Лиозненщина – родина моя /Геннадий Тимофеевич Агнищенко //Сцяг перамогі – 1999. – №31.

2. Агнищенко,Г.Т. Край ты мой заброшенный…: населенныя пункты раёна, которые исчезли /Геннадий Тимофеевич Агнищенко //Сцяг перамогі. – 2004. – 17 жн.; 21 жн.

3. Арлоў,У.А. Таямніцы Полацкай гісторыі /У.А.Арлоў – 2-е выд. – Мінск: Полымя, 2002. – 464 с.

4. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал. В.В.Гетаў і інш. - Мінск: БелЭн, 1994. – 702 с.іл.

5. Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік /рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск: БелЭн,1993. – 620 с.іл.

6. Афтаназі, Раман. Сядзібы на былых крэсах Рэчы Паспалітай. Т1: 1914г.

7. Бандарэнка,У.К. Знаходкі з–пад Альхавіка /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Сцяг перамогі - 1999. – 26 студз.

8. Бандарэнка,У.К. Марцыян Міхал з роду Агінскіх /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Сцяг перамогі – 2000. – 25студз.

9. Бандарэнка,У.К. Паўстанцы на Лёзненшчыне (1863г.) /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Сцяг перамогі. – 1998. – 2 чэрв.

10. Бандарэнка, У.К. Станіславоўскія муры /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Народнае слова. – 1999. – №62. – С.5.

11. Бандарэнка,У.К. Тут жыў славуты філосаф: З. Шнеерзон /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Сцяг перамогі – 1999. – 14 верас.

12. Бандарэнка,У. К. У пошуку каранёў сваіх: з гісторыі жыцця угра-фінаў на Лёзненшчыне /Уладзімір Карпавіч Бандарэнка //Сцяг перамогі –1996. – 20 жн.

13. Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах – Мінск: БелЭн, 1996-2004.

14. Беларусь: энцыклапедычны даведнік /рэдкал.: Б.І.Сачанка і інш. – Мінск: БелЭн, - 1995. – 800 с.

15. Большая Советская энциклопедия. В 30-т. Т.29: Чаган-Экс-Ле-Бен /гл. ред. А.М. Прохоров . – 3- изд., – Москва: Сов. Энциклопедия, – 1978 - 640с. ил.

16. Бондарева,А.М. Евреи на Лиозненщине / Елена Михайловна Бондарева // Сцяг перамогі. – 2005. – 9 жн.

17. Бондарева,А.М. Латыши на Лиозненщине /Елена Михайловна Бондарева // Сцяг перамогі. – 2004. – 20 лістап.

18. Бондарава,А.М. Поляки на Лиозненщине / Елена Михайловна Бондарева // Сцяг перамогі. – 2005 –10 верас.

19. Васілевіч У. А. Міфы бацькаўшчыны. – Мінск: БелЭн, - 1994. – 112 с.

20. Грачышнікава,А.І. Ёсць такая вёска – Красыншчына /Алена Іванаўна Грачышнікава // Сцяг перамогі. – 2002. – 1 студз.

21. Грачышнікава,А.І. Захаваць для нашчадкаў /Алена Іванаўна Грачышнікава // Сцяг перамогі. – 2005. – 23 крас.

22. Гречишникова,Е.И Руководитель подпольной групы / Елена Ивановна Гречишникова // Сцяг перамогі. – 2005. – №44.

23. Гречишникова,Е.И. Царь Алексей Михайлович в Лиозно / Елена Ивановна Грачишникова // Сцяг перамогі. - 1999. – 13 лістап.

24. Дембовецкий, А.С. Опыт описания Могилёвской губернии - Могилев на Днепре: Типография губернского правления,1884.

25. Зайкоўскі Э. М. Першабытныя помнікі паўночнай Беларусі /Э.М.Зайкоўскі - Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 44 с.

26. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць /гл. рэд. С.В.Марцэлеў - Мінск: БелЭн, 1984 – 496 с.іл.

27. Ермолаева,М.Д. В мрачные годы фашистской аккупацыи /Мария Даниловна Ермолаева //Сцяг перамогі. – 1998. – №№ 88; 90.

28. Ермолаева,М.Д. Спасённая праведниками мира /Мария Даниловна Ермолаева // Сцяг перамогі. – 2005. – №№ 81; 83; 84.

29.Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды /М.Ермаловіч – Мінск: Маст. літ., 1990. – 366 с.

30.Карпекін,К.Р. Лёс калышанскай царквы Архістраціга Міхаіла (1917 – 1930-я гг.) /Канстанцін Рыгоравіч Карпекін // Сцяг перамогі. – 2006. – 9 верас.; 12 верас.

31.Карпекін,К.Р. Як на Лёзненшчыне зачыняліся цэрквы /Канстанцін Рыгоравіч Карпекін // Сцяг перамогі. – 2005. – 22 кастр.

32.Касцюк М. П. Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. /М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш. - Мінск: Беларусь, 1994.

33.Космыкаў,М.М. Скарбы нашай зямлі /Міхаіл Міхайлавіч Космыкаў // Спадчына. – 2001. – №№ 2; 5.

34.Космыкаў,М.М. Хвала Бацькаўшчыне: з вопыту педагагічнай творчасці: / Міхаіл Міхайлавіч Космыкаў – Віцебск, 2001. – 55 с.

35.Ліцьвінка,А. П. Святы і абрады беларусаў /А.П.Ліцьвінка - Мінск: Беларусь, 1999. – 190с.

36.Надзюк,Я. Беларусь: учора і сёння: папулярныя нарысы з гісторыі Беларусі /Я.Надзюк, І.Касяк – Мінск: Навука і тэхніка, - 1993.- 414 с.

37.Памяць : гісторыка-дакум. хроніка Лёзненскага раёна / рэдкал. І.П. Шамякін і інш. – Минск: БелЭн, 1992. – 591 с. іл.

38.Печенова,О.В. Предками названо: происхождение названий населённых пунктов, рек и озёр Лиозненского района /Ольга Всеволодовна Печенова –Лиозно: ГУК "Лиозненская ЦБС", 2003. – 43с. ил.

39.Печенова, О.В. Фамилии белорусского городка /Ольга Всеволодовна Печенова //Наука и жизнь. – 2005. – №11. – С.109.

40.Цітоў,А. Геральдыка беларускіх местаў. XVI-XXст. /Анатоль Цітоў – Мінск: Полымя, 1998. – 288 с.

41.Ціхамірава,І.М. Настаўнік, этнограф, краязнаўца: 160 год М. Я. Нікіфароўскаму /Ірына Мікалаеўна Ціхамірава // Сцяг перамогі. – 2005. – 17 мая.

42.Ціхамірава,І.М. Ні ў агні не гарыць, ні ў вадзе не тоне: 155 год М. Я. Нікіфароўскаму /Ірына Мікалаеўна Ціхамірава // Сцяг перамогі. - 2001. - 12 мая.

43.Тихомирова, И.Н. Белорусский парижанин покорил Европу: художник Борис Заборов /Ирина Николаевна Тихомирова // Сцяг перамогі. – 2008. – 17 чэрв.

44.Ціхамірава,Н.К. Хрысціянскі подзвіг княжацкага роду Агінскіх /Ніна Канстанцінаўна Ціхамірава // Сцяг перамогі. – 2001. – 22 мая.

45.Тихомирова,Н.К. Адреса Марка Шагала /Нина Константиновна Тихомирова //Сцяг перамогі. – 2001. – 27 сак.

46.Тихомирова,Н.К. Справочник Лиозненского Благочиния /Нина Константиновна Тихомирова – Лиозно: 2012. – 46 с.

47. Шагал М. З. “ Моя жизнь” Москва ЛЛИЗ Лак 1994.М.: Элис лак с.77

48.Энцыклапедыя гісторыя Беларусі ў 6-ці т. /рэдкал. Г.П.Пашкоў – Мінск: БелЭн, 1994 - 2006.

49.Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5-ці т. Т.5: Скамарох-Яўур /рэдкал.: І.П.Шамякін і інш. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 703с., 32с.іл.

50.Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / рэд. І.П.Шамякін і інш. – Мінск: БелЭн, 1989 – 575с. іл.




**Алена Іванаўна Грачышнікава (Шыдлоўская) нарадзілася 22 верасня 1956 года ў вёсцы Сарья Верхнедзвінскага раёна Віцебскай вобласці БССР у сямьі служачых. У 1974 годзе закончыла сш №1 г.п. Лёзна.**

**Адукацыю настаўніка гісторыі і грамадазнаўства атрымала ў М Г П І імя Аркадзя Куляшова. Спачатку працавала ў Першамайскай сш (1979-1981гг.), затым ў сш №2 г.п. Лёзна (1981- 1984 гг.), а з 1985 па 2013 гады ў сваёй роднай сш №1 г.п. Лёзна.**

**У 1995 годзе стварыла турысцка-краязнаўчы гурток “Мая Лёзненшчына” і акрамя педагагічнай працы пачала займацца краязнаўствам. З 2015 па 2018 гады працавала над стварэннем краязнаўчага дапаможніка “Мая Лёзненшчына”.**

**Дэвіз майго жыцця: “ Чужое ведаць цікава, а сваё – абавязкова”.**